ПАМЯЦЬ



ПАМЯЦЬ

ГОМЕЛЬСКІ РАЁН

У 2 кнігах

Кніга 1-я

МІНСК
БЕЛТА
1998

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
М.З.БАШЛАКОЎ, Т.А.КАРАСІК, А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ, І.А.ПРОЦКІН, В.А.САБКО

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В.А.САБКО (старшыня камісіі), А.І.БАКАРАС, В.С.БАРАНАЎ, І.К.БРУХАВЕЦКІ,
В.І.ЖАЛЯЗНЯК, У.У.КАЗЛОЎ, М.А.КАН, Т.А.КАРАСІК, А.В.КАРЧЭЎСКІ,
М.В.КОСТАЧКА, П.Ф.МАРОЗАЎ, М.Д.РЫЧКОЎ, Л.І.ШУРХАВЕЦКАЯ,
І.Г.ШЫЦІКАЎ, Ф.І.ШЭРМАН

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), М.З.БАШЛАКОЎ,
У.І.ЛЕМЯШОНАК, Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА

Укладальнікі:
М.З.БАШЛАКОЎ, Т.А.КАРАСІК

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-09-9

© БЕЛТА, 1998

Маляўнічы куток на беразе р. Сож. Кліматычны курорт Чонкі.

100—40 тысяч гадоў таму.	Магчымы час паяўлення чалавека на тэрыторыі Гомельшчыны.
9—6-е тысячагоддзі да н. э.	Гэтым часам датуюцца самыя старажытныя знаходкі эпохі мезаліту на тэрыторыі раёна каля в. Плёсы.
6—3-е тысячагоддзі да н. э.	Да гэтага перыяду адносяцца археалагічныя помнікі эпохі неаліту каля вёсак Раманавічы, Старыя і Новыя Цярэшкавічы.

Курганны могільнік каля в. Раманавічы.

IX ст. да н. э. — I ст. н. э.	Гэтым часам датуюцца археалагічныя знаходкі мілаградскай культуры з гарадзішчаў каля вёсак Уза, Прыбар, Чарацянка.
VI—VIII ст. н. э.	Засяленне Гомельшчыны славянамі. Археалагічныя знаходкі калочынскай культуры з курганных могільнікаў каля вёсак Гадзічава, Калінаўка, Клёнкі.
VIII—IX ст. н. э.	Рассяленне на тэрыторыі раёна радзімічаў.
XI—XIII ст. н. э.	Гомельшчына ў складзе Чарнігаўскага княства.
1142 г.	Першае летапіснае ўпамінанне пра г. Гомель.
1363 г.	Гомельшчына ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

Упрыгожанні, знойдзеныя ў час раскопак курганнага могільніка радзімічаў каля в. Сасноўка.

1508 г.	Першыя ўпамінанні пра вёскі Целяшы, Цярэнічы.
1633—1684 гг.	Казацкія набегі на Гомельшчыну.
1640 г.	Упамінанні пра вёскі Галавінцы, Валатава, Воўкавічы (Урыцкае), Дзятлавічы, Маркавічы, Плёсы, Прыбыткавічы, Раманавічы, Сеўрукі, Цярэшкавічы.
Канец XVII ст.	Першыя пасяленні раскольнікаў-старавераў у Гомельскім старостве.
1735 г.	Першая «выганка» расійскімі войскамі старавераў з Гомельшчыны.

Мікалаеўская царква ў в. Старая Беліца.
Помнік архітэктуры XVIII ст.

1772 г.	Тэрыторыя Гомельскага староства ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Утвораны Беліцкі павет.
1773 г.	Першы перапіс насельніцтва.
1775 г.	Гомель з навакольнымі вёскамі падараваны генерал-фельдмаршалу П.А.Румянцаву.
1777 г.	Цэнтрам Беліцкага павета стала Новая Беліца.
16 жніўня 1781 г.	Горад Беліца (Новая Беліца) атрымаў герб.

Герб г. Беліца (Новая Беліца), атрыманы ў 1781 г.

1791 г.	У г. Беліца адкрыта першае ў павеце народнае вучылішча.
1820 г.	Адкрыты першыя ланкастэрскія школы ў вёсках Маркавічы і Пакалюбічы.
1820 г., 1824 г.	Праз Беліцкі павет праязджаў А.С.Пушкін.
1834 г.	Гомель і навакольныя вёскі сталі ўласнасцю князя І.Ф.Паскевіча.
1850 г.	Праз павет пракладзена шаша Пецярбург — Кіеў.

**Свята-Кацярынінская царква ў в. Гадзічава.
Помнік архітэктуры XIX ст.**

1852 г.	Цэнтр павета перанесены з г. Беліца ў г. Гомель.
1861 г.	У в. Прыбыткі адкрыта царкоўнапрыходскае вучылішча.
1864 г.	У вёсках Бабовічы, Глыбоцкае, Грабаўка, Дзятлавічы, Жарэбнае (Чкалава), Зябраўка, Краснае, Краўцоўка, Маркавічы, Старая Беліца, Целяшы, Цярэшкавічы, Чарацянка, Яроміна адкрыты народныя вучылішчы.
Верасень 1873 г. — студзень 1874 г.	Праз павет пракладзена першая чыгунка Мінск — Гомель — Бахмач.

Прадметы побыту з экспазіцыі этнаграфічнага музея, в.Краўцоўка.

1881 г.	Першая забастоўка на тэрыторыі павета ў Лібава-Роменскіх чыгуначных майстэрнях.
1903 г.	Адкрыта павятовая бальніца. Створана Гомельская група РСДРП.
1905—1907 гг.	Адбыліся сялянскія хваляванні ў павеце.
6 сакавіка 1917 г.	Створаны Гомельскі Савет рабочых дэпутатаў.
21 сакавіка 1917 г.	Створаны Гомельскі Савет сялянскіх дэпутатаў, які аб'яднаўся з Саветам рабочых дэпутатаў.
30 кастрычніка — 22 лістапада 1917 г.	У Гомельскім павеце ўстаноўлена савецкая ўлада.

Сядзібны дом («паляўнічы домік») у в. Каранёўка. Помнік архітэктуры XIX ст.

1 сакавіка 1918 г. — 14 студзеня 1919 г.	Акупацыя Гомельскага павета войскамі кайзераўскай Германіі.
26 красавіка 1919 г.	Гомельская губерня і Гомельскі павет уключаны ў склад РСФСР.
8 мая 1919 г.	Пачатак мабілізацыі добраахвотнікаў у Чырвоную Армію.
Сакавік— май 1920 г.	Абарона павета ад польскіх інтэрвентаў.
1924—1925 гг.	Масавае перасяленне малазямельных сялян у Паволжа, Сібір, на Далёкі Усход, Украіну, Паўночны Каўказ.

Рачны вакзал на р. Сож.

Снежань 1926 г.	Тэрыторыя Гомельскага павета перададзена БССР. Утвораны Гомельскі раён у складзе Гомельскай акругі.
1 кастрычніка 1929 г.	У раёне 12 калгасаў, 7 саўгасаў.
1929—1930 гг.	Праз раён пракладзена чыгунка Гомель — Чарнігаў.
1930 г.	Арганізаваны калгас «Камунар» (в. Старыя Цярэшкавічы), які быў першым у раёне ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Парк XIX ст. у в. Грабаўка.

1 студзеня 1931 г.	Стала выходзіць раённая газета «Сталінскі сцяг».
1931 г.	У раёне была арганізавана першая машынна-трактарная станцыя.
7 ліпеня 1941 г.	Паводле дырэктывы СНК БССР і ЦК КП(б)Б пачалося фарміраванне народнага апалчэння.
14—19 жніўня 1941 г.	Жорсткія абарончыя баі на тэрыторыі раёна.
17 жніўня 1941 г.	Гомельскім гаркомам КП(б)Б створаны партызанскі атрад «Бальшавік».
23—24 жніўня 1941 г.	Чырвоная Армія пакінула апошнія вёскі Гомельскага раёна Бабовічы, Клімаўку, Пясочную Буду.

Мемарыял «Партызанская крынічка» на месцы базіравання партызанскага атрада «Бальшавік».

Жнівень 1941 г.	Створаны Гомельскі сельскі партызанскі атрад. Створана падпольная група ў в. Міхалькі.
Жнівень 1941 г. — лістапад 1943 г.	Перыяд акупацыі Гомельскага раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
Кастрычнік 1941 г.	На базе партызанскага атрада «Бальшавік» створана аднайменная брыгада.
6 лістапада 1941 г.	Падпольшчыкі в. Заліп'е правялі першую баявую аперацыю.

Мемарыял савецкім воінам, якія загінулі пры вызваленні Гомельскага раёна, в. Чонкі.

20 чэрвеня 1942 г.	Нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Гомельскага падполля І.Б.Шылава, ураджэнца в. Бабовічы.
7 кастрычніка 1942 г.	На тэрыторыі раёна ў партызанскай брыгадзе «Бальшавік» загінуў адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на Гомельшчыне Герой Савецкага Саюза (1944) А.Л.Ісачанка.
Восень 1942 г.	Гітлераўцы расстралялі падпольшчыкаў в. Заліп'е.
Верасень 1943 г.	Нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі разам з жыхарамі вёскі Аляксееўка, Вясёлае Поле, Галавінцы, Галееўка, Цераха.

ДА ЧЫТАЧА

Гомельская зямля... Адзін з самых прыгожых маляўнічых куткоў Палесся. Велічна нясе свае чыстыя воды блакітны Сож, як бы падзяляючы раён на дзве часткі. Шырока раскінуліся абапал ракі мурожныя заліўныя лугі са шматлікімі затонамі і азёрцамі, якія расквечаны сярэбранымі лілеямі і жоўтымі гарлачыкамі. Высокія сасновыя бары, паэтычныя бярозавыя гаі і сонечныя дубровы шумяць, гамоняць удзень і ўночы, апавядаючы пра мінулыя стагоддзі.

У даўнія часы жылі радзімічы, якія пакланяліся сваім язычніцкім багам. Спрадвеку за гэту зямлю ішла жорсткая барацьба паміж суседнімі княствамі і дзяржавамі. Колькі спусташальных войнаў пракацілася па ёй...

Глыбокія незагойныя раны пакінула тут і апошняя самая кровапралітная вайна. Актыўна змагалася з ворагам насельніцтва раёна. Магчыма, адсюль і такія вялікія людскія страты.

Пра ўсё гэта апавядае Хроніка Памяці Гомельскага раёна, якая стваралася на працягу некалькіх гадоў. Яна выходзіць у дзвюх кнігах. Першая кніга ахоплівае перыяд гісторыі ад старажытных часоў да 1943 года (да падзей, звязаных з вызваленнем раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў). У яе ўключаны таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час абароны і вызвалення Гомельскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі.

Пры падрыхтоўцы кнігі выкарыстаны многія цікавыя дакументы і матэрыялы з фондаў айчынных і замежных архіваў, з рэдкіх выданняў, газет і часопісаў. Раённая камісія па напісанні Хронікі Памяці і выдавецтва выказваюць шчырую падзяку ўсім, хто прымаў удзел у рабоце над кнігай і садзейнічаў яе выданню.



ГОМЕЛЬСКІ РАЁН размешчаны на ўсходзе Гомельскай вобласці. Утвораны 8.12.1926 г. Плошча 2,1 тыс. км^2. Насельніцтва 76,2 тыс. чалавек, з іх 73,3 тыс. сельскіх жыхароў (1996). Населеных пунктаў 186, у тым ліку р.п. Бальшавік. Цэнтр раёна г. Гомель. 25 сельсаветаў: Аздзелінскі, Бабовіцкі, Глыбоцкі, Грабаўскі, Давыдаўскі, Даўгалескі, Дзятлавіцкі, Зябраўскі, Красненскі, Маркавіцкі, Пакалюбіцкі, Прыбарскі, Прыбыткаўскі, Рудня-Марымонаўскі, Старабеліцкі, Улукаўскі, Урыцкі, Целяшоўскі, Цярухскі, Цярэніцкі, Цярэшкавіцкі, Чарацянскі, Чонкаўскі, Шарпілаўскі, Яромінскі.

Тэрыторыя раёна ў межах Прыдняпроўскай нізіны. Пераважная вышыня 120—140 м над узроўнем мора. Найвышэйшы пункт 160,3 м каля в. Зябраўка. Пашыраны пясчаныя дзюны і грывы. У поймах Дняпра і Сажа шмат заліўных лугоў. Карысныя выкапні: торф, гліна для грубай керамікі, пясок. Сярэдняя тэмпература студзеня - 6,9 °С, ліпеня 18,6 °С. Ападкаў 590 мм за год. Вегетатыўны перыяд 193 дні. Галоўная рака Сож з прытокамі Іпуць, Вуць, Цэруха (левыя), Уза (правы). Пад лясамі, якія адносяцца да шыракаліста-хваёвых, 34,9% тэрыторыі раёна. Склад лясоў: хваёвыя — 70%, дубовыя — 10%, асінавыя — 2,3% і іншыя. Балоты займаюць 14,1 тыс. га. Пад сельгасугоддзямі 46,4% тэрыторыі раёна. Глебы дзярнова-падзолістыя (33,1%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (27,5%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (13,4%) і іншыя.

Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі — мяса-малочная жывёлагадоўля, агародніцтва, бульбаводства. Развіта птушкагадоўля. У раёне 14 калгасаў, 14 саўгасаў, 3 птушкафабрыкі, 8 падсобных гаспадарак, 2 навучальна-доследныя гаспадаркі; 3 прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, 24 сярэднія, 13 базавых дзевяцігадовых, 6 пачатковых, 9 музычных школ, 1 школа-інтэрнат, 1 дзіцячы дом, 36 дашкольных устаноў; 35 дамоў культуры, 9 клубаў, 2 аўтаклубы, 49 бібліятэк; 7 бальніц, 37 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 13 амбулаторый, 2 медпункты, раённая паліклініка; 1 камбінат і 9 майстэрань бытавога абслугоўвання, 8 комплексна-прыёмных пунктаў, 3 цырульні, 14 лазняў; 6 кафэ, 35 сталовых, 227 магазінаў.

Раён перасякаюць чыгункі Брэст — Бранск, Санкт-Пецярбург — Кіеў, Гомель — Бахмач, аўтадарогі на Брэст, Бранск, Магілёў, Мінск, Чарнігаў. Суднаходства па Сажы. Выдаецца раённая газета «Маяк».

Населеныя пункты Гомельскага раёна

Аздзелінскі сельсавет: вёскі Аздзеліна, Рагі; пасёлкі Апанасаўка, Бук, Зялёны Гай, Зялёны Востраў, Зялёны Сад, Курачэнкаў, Манееў, Моладзь, Паўднёвы, Пятроў, Прыволле-1, Прыволле-2.

Бабовіцкі сельсавет: вёскі Бабовічы, Цыкуны.

Бальшавіцкі пасялковы Савет: р.п. Бальшавік; пасёлкі Пясчаны, Рассветны.

Глыбоцкі сельсавет: вёска Глыбоцкае; пасёлак Зімні.

Грабаўскі сельсавет: вёскі Грабаўка, Жураўлёўка, Пясочная Буда, Хутаранка; пасёлкі Апалонаўка, Баштан, Дубіна, Красны.

Давыдаўскі сельсавет: вёскі Асаўцы, Давыдаўка, Сасноўка, Уза.

Даўгалескі сельсавет: вёскі Васілева, Даўгалессе, Карналін, Міхалькі, Стукачоўка; пасёлкі Дубавец, Межы, Мірны, Нагорнае, Някрасава.

Дзятлавіцкі сельсавет: вёскі Новыя Дзятлавічы, Старыя Дзятлавічы, Чкалава.

Зябраўскі сельсавет: вёскі Зябраўка, Кантакузаўка; пасёлкі Ваявода, Граза, Зарніца, Каранёўка, Чырвонае Селішча.

Красненскі сельсавет: вёскі Краснае, Новая Мільча; пасёлкі Забіяка, Красны Багатыр, Мічурынскі, Пралетарый.

Маркавіцкі сельсавет: вёскі Гадзічава, Маркавічы; пасёлкі Паддабранка, Рагі-Ілецкі, Халмы.

Пакалюбіцкі сельсавет: вёскі Лапаціна, Пакалюбічы, Плёсы; пасёлкі Востраў, Грыва, Залінейны, Калініна, Масцішча, Прудок, Ржавец, Светлая Зара, Царкоўе, Чырвоны Маяк, Янтарны.

Прыбарскі сельсавет: вёскі Новая Буда, Прыбар, Рандоўка, Шчэрбаўка; пасёлкі Піянер, Усход.

Прыбыткаўскі сельсавет: вёскі Дуянаўка, Клімаўка, Прыбыткі, Прыбыткаўская Рудня; пасёлкі Будзілка, Каравышань, Цагельня.

Рудня-Марымонаўскі сельсавет: вёскі Жыгальская Рудня, Рудня-Марымонава; пасёлкі Гарадок, Добруш, Папанін.

Старабеліцкі сельсавет: вёскі Астравы, Галееўка, Зялёныя Лукі, Старая Беліца; пасёлкі Аляксандраўка, Аляксееўка.

Улукаўскі сельсавет: вёскі Бярозкі, Галавінцы, Раманавічы, Улукаўе; пасёлкі Будацін, Заляддзе, Ільіч, Іпуць, Мядзведжы Лог, Перамога, Прыазёрнае, Сцяг Працы, Чырвоны Маяк, Юбілейны, Ярохава.

Урыцкі сельсавет: вёскі Заліп'е, Урыцкае; пасёлкі Барок, Чырвоны Маяк.

Целяшоўскі сельсавет: вёскі Жытоўля, Задораўка, Целяшоўская Рудня, Целяшы; пасёлкі Грыва, Іванькаў, Калінаўка, Курганы, Малінаўка, Мураўчы, Нікольск, Пераход, Фашчаўка, Яўстратаўка.

Цярухскі сельсавет: вёскі Дзікалаўка, Краўцоўка, Новая Гута, Студзёная Гута, Сямёнаўка, Церуха, Шутаўка; пасёлкі Епіфань, Каралін, Кустарны, Лядцы.

Цярэніцкі сельсавет: вёскі Іванаўка, Цярэнічы; пасёлкі Вішнёўка, Малінаўка, Прасвет, Рубеж.

Цярэшкавіцкі сельсавет: вёскі Альхоўка, Новая Бухалаўка, Новыя Цярэшкавічы, Старая Бухалаўка, Скіток, Цярэшкавічы; пасёлкі Арленск, Асавіно, Барэц, Высокая Грыва, Куты, Калініна, Прыстараны, Сож.

Чарацянскі сельсавет: вёскі Будзішча, Займішча, Залессе, Макаўе, Пракопаўка, Чарацянка; пасёлкі Вадапой, Чаплін.

Чонкаўскі сельсавет: вёскі Сеўрукі, Чонкі; пасёлкі Паляна, Хутар.

Шарпілаўскі сельсавет: вёска Шарпілаўка; пасёлкі Войцін, Міхайлаўскі, Мядзведзіца, Някрасаў, Пуцяводная Зорка.

Яромінскі сельсавет: вёскі Касцюкоўка, Яроміна; пасёлкі Бардзіна, Вішанскі, Клімаўскі, Новае Жыццё.

Населеныя пункты Гомельскага раёна, якія не існуюць

Аздзелінскі сельсавет: пасёлкі Курыцкі, Чырвоная Гара, Чырвоная Паляна.

Бабовіцкі сельсавет: пасёлкі Падбуглак, Планы Рэвалюцыі, Сцяпана Разіна, Шлях Ільіча.

Грабаўскі сельсавет: пасёлак Топаль.

Давыдаўскі сельсавет: вёскі Лешчынец, Падгорная; пасёлкі Паўлава, Сонечны.

Даўгалескі сельсавет: пасёлак Белы Бераг.

Дзятлавіцкі сельсавет: пасёлкі Бялынь, Чарнічны, Чырвоная Даліна.

Красненскі сельсавет: вёска Верхні Брылёў, Старая Мільча; пасёлкі Громкі, Камунар, Ніжні Брылёў, Светлы, Ціцянкі.

Пакалюбіцкі сельсавет: вёскі Валатава, Прудок; пасёлкі Арол, Будзённы, Грамавы, Красны Акцябр, Навікі, Саколін.

Старабеліцкі сельсавет: пасёлкі Калінін, Пабеда, Ясная Паляна.

Улукаўскі сельсавет: вёска Якубоўка; пасёлкі Назарэт, Новы Двор, Чапаева.

Урыцкі сельсавет: вёска Вясёлае Поле.

Цярэшкавіцкі сельсавет: вёска Фёдараўка.

Чарацянскі сельсавет: пасёлак Данец.

Чонкаўскі сельсавет: пасёлкі Масціша, Хутар.

Яромінскі сельсавет: пасёлак Высокі.

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Археалагічныя старажытнасці Гомельскага раёна

Сапраўднае даследаванне старажытнасцей сучаснага Гомельскага раёна пачалося не раней XVIII—пачатку XIX ст. Штуршком, напэўна, паслужыла шырока распаўсюджаная тады мода на антыкварыят і рарытэты, якія спецыяльна шукаліся для прыватных калекцый. Была такая калекцыя і ва ўладальнікаў буйнейшых на Гомельшчыне маёнткаў — князёў Паскевічаў. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваўся цікавы дакумент — «Опись предметов, пожертвованным князем Паскевичем в Могилевский музей». Адпаведна з гэтым вопісам, каля сярэдзіны мінулага стагоддзя ў прыватны збор старажытнасцей Паскевіча былі дастаўлены выпадкова знойдзеныя каля некаторых вёсак сучаснага Гомельскага раёна (Заляддзе, Бабовічы, Шарпілаўка) рэшткі маманта...

У тыя ж часы сярод адукаванай часткі грамадства вельмі папулярнымі зрабіліся раскопкі шматлікіх на той час курганоў. Мноства курганоў гомельскага наваколля было раскапана ў 1890-я гады землямерам Філонавым. Курганныя раскопкі наладжвалі таксама генерал Турбін, памешчык Гершнер, мастак Струкаў і інш. Напэўна, ці не найбуйнейшы ўклад у даследаванне помнікаў радзімічаў, як і ва ўсю ранюю археалогію Беларусі, унёс энтузіяст навукі і гарачы патрыёт, выдатны вучоны Еўдакім Раманавіч Раманаў, які з'яўляўся ўраджэнцам былога «заштатнага» горада Навабеліца, і таму асаблівая ўвага даследчыка да навакольных археалагічных помнікаў зусім невыпадковая. Е.Р.Раманаву належыць таксама і ці не першая па археалогіі Гомельшчыны праца, якая не страціла свайго значэння да нашых дзён[1]. Трэба сказаць, што Раманава цікавілі практычна ўсе эпохі археалогіі Гомельшчыны. Ён збіраў звесткі аб зробленых у павеце знаходках касцей маманта, насарога, першабытнага быка і крамянёвых прылад каменнага веку, спрабаваў вылучыць мясцовыя помнікі эпохі бронзы, асабіста вывучаў славянскія старажытнасці ранняга сярэдневякоўя, цікавіўся ўмацаваннямі і праблемай паходжання гарадоў Пасожжа... Прадаўжальнікамі справы Е.Р.Раманава ў 1920—1930-я гады сталі К.М.Палікарповіч і А.М.Ляўданскі. К.М.Палікарповіч з'яўляўся спецыялістам у галіне старажытнакаменнага веку — палеаліту. Але пад час даследаванняў у межах сучаснага Гомельскага раёна ім былі адкрыты ці абследаваны шматлікія помнікі як каменнага, так бронзавага і жалезнага вякоў[2]. А.М.Ляўданскі ў 1936 г. разам з А.Д.Каваленем ажыццяўляюць вя-



Карта археалагічных раскопак на тэрыторыі Гомельскага раёна. Лічбамі пазначаны месцы раскопак.

лікую археалагічную экспедыцыю па Сажы. Пад час гэтай экспедыцыі даследаваліся гарадзішчы — умацаваныя паселішчы эпохі ранняга жалезнага веку. У архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі захаваліся зробленыя гэтымі даследчыкамі планы гарадзішчаў Уза, Скіток, Чонкі і інш.[3]

З пасляваенных часоў у наваколлі Гомеля пачалі разгортвацца планамерныя даследаванні археалагічных помнікаў. Старажытнасці каменнага і бронзавага вякоў вывучаліся А.Г.Калечыц, якая правяла таксама раскопкі адпаведнага паселішча каля в. Рамановічы. Помнікі эпохі пачатку жалезнага веку вывучаліся С.Я.Рассадзіным. Даследаванне старажытнасцей радзімічаў ажыццяўляў У.У.Багамольнікаў. У цяперашні час разнастайныя помнікі раёна вывучаюцца гомельскімі археолагамі — супрацоўнікамі універсітэта і краязнаўчага музея на чале з А.А.Макушнікавым і А.І.Драбышэўскім.

Каменны век

Эпоха каменю — самая старажытная і самая працяглая ў гісторыі чалавецтва. Чалавек пачаў засяляць тэрыторыю сучаснай Беларусі і цяперашняй Гомельшчыны яшчэ ў палеаліце, старажытным каменным веку. Існуе меркаванне, што ў Пасожжы можна вылучыць знаходкі ўжо сярэднепалеалітычнай ці мусцьерскай эпохі, якая пачалася каля 100 тысяч гадоў таму. На думку К.М.Палікарповіча, некаторыя каменныя прылады з Гомельшчыны, у прыватнасці, скрабло, знойдзенае ў 1929 г. настаўнікам П.М.Чайкоўскім на Каменнай гары каля Свяцілавіч у Веткаўскім раёне, варта аднесці да эпохі мусцье[4]. Верхнепалеалітычныя помнікі Гомельшчыны, стаянкі каля вёсак Бердыж Чачэрскага і Юравічы Калінкавіцкага раёнаў былі даследаваны таксама К.М.Палікарповічам[5]. Адкрыты рэшткі трывалых жытлаў з буйных костак мамантаў, прытулак паляўнічых, што 40—10 тысяч гадоў таму ўжо насялялі халодныя тундры каля краю ледавіка, якія займалі тады паўднёвую частку цяперашняй Беларусі. Такім чынам, верхне-, а, верагодна, нават і сярэднепалеалітычны чалавек, напэўна, некалі наведваў тэрыторыю сучаснага Гомельскага раёна. Слядоў трывалага пражывання тут пакуль не знойдзена. Але ёсць сведчанні засялення гомельскага наваколля ў наступны пасляледавіковы перыяд — у сярэднекаменным веку, або мезаліце (на Беларусі — 9—6-е тысячагоддзі да н.э.). Асноўнымі аб'ектамі паляванне ў мезаліце былі паўночныя алені, за статкамі якіх і вандравалі ўзброеныя ўжо лукамі і стрэламі тагачасныя паляўнічыя. Наканечнікі стрэл, а такса-

ма крамянёвыя скрэблы, скрабкі, разцы мезалітычнага тыпу знойдзены Ю.У.Абадэнкам на стаянцы каля в. Плёсы. Знаходкі мезалітычных прылад зроблены яшчэ ў некаторых пунктах Гомельскага раёна. Значна больш помнікаў эпохі неаліту (6—3-е тысячагоддзі да н.э.). У неалітычных паселішчах знойдзены абломкі глінянага посуду, багата аздобленага разнастайным арнаментам. Посуд з гліны навучыліся вырабляць менавіта ў эпоху неаліту. Тады ж была значна ўдасканалена тэхніка апрацоўкі крэменю, пашыралася выкарыстанне прылад для вырабу косці і г.д. Галоўнае ж, што здзейснілася так званая «неалітычная рэвалюцыя», г.зн. пачаўся паступовы пераход ад збіральніцтва, палявання, рыбалоўства да вытворчай гаспадаркі — жывёлагадоўлі і земляробства. У гомельскім наваколлі рэшткі неалітычных паселішчаў адкрыты каля вёсак Васілеўка, Каменка, Старыя і Новыя Цярэшкавічы і інш., але раскопкі праводзіліся толькі ва ўрочышчы Селішча каля Раманавіч, дзе апрача неалітычных знойдзены таксама рэчы бронзавага веку.



Інвентар пасяленняў каменнага веку з курганнага могільніка Клёнкі (скрабкі, вастрыё, разец, нуклеус і інш.).

Эпоха бронзы

Здаўна вядомы ў гомельскім наваколлі таксама і старажытнасці бронзавага веку. У прыватнасці, яшчэ Е.Р.Раманавым зафіксаваны даволі шматлікія знаходкі каменных сякер, свідраваных і шліфаваных. Свідраваныя «малаткі», звычайна вельмі прыгожыя на выгляд, нярэдка траплялі ў прыватныя зборы гомельскіх калекцыянераў. Так, каменны «малаток» з в. Куптараўка захоўваўся ў Карпоўскага, а знойдзены каля в. Яроміна — у Патона. Вялікі «молат» з шэрага граніту быў падабраны ў 1889 г. Філонавым каля в. Студзёная Гута і трапіў у музей князя Паскевіча. Фатаграфія адной свідраванай сякеры з в. Целяшоўская Рудня была нават апублікавана ў археалагічным нарысе Гомельскага павета... Але Е.Р.Раманаў адносіў гэтыя знаходкі не да бронзавай, а да каменнай эпохі, і звязваў з неалітам. Толькі пазней удалося ўстанавіць, што да помнікаў бронзавага веку зусім неабавязкова адносяцца толькі вырабы з бронзы. Радовішчаў, неабходных для вырабу бронзы, медзі, волава ці мыш'яку ў раёне Гомеля, як і на Беларусі, няма. З завазной каштоўнай сыравіны нашы старажытныя майстры маглі адліваць галоўным чынам упрыгожанні. Але ад пачатку бронзавага веку вельмі ўскладнілася тэхніка апрацоўкі спрадвечнага матэрыялу — каменю. Укараніліся невядомыя раней прыёмы пілавання, шліфоўкі, свідравання. Знакамітыя свідраваныя ці так званыя «баявыя» сякеры лічацца характэрнай



Шкляныя ўпрыгожанні, бочкападобныя пазалочаныя пацеркі з курганнага могільніка радзімічаў IX ст., в. Сасноўка Гомельскага раёна.

прыкметай культуры старажытных індаеўрапейцаў. У 3-м тысячагоддзі да н.э. шматлікія роднасныя плямёны шырока рассяліліся па Еўразіі. Гэтаму спрыяла не толькі авалодванне вытворчасцю грознай зброі — баявых свідраваных сякер. Галоўным жа заняткам узброеных тымі сякерамі людзей былі жывёлагадоўля і земляробства. Вялікія статкі даводзілася ахоўваць, заваёўваць для іх новыя пашы... Сякерамі новага тыпу зручней было расчышчаць лясы пад раллю.

Да пачатку бронзавага веку на Гомельшчыне належыць сярэднедняпроўская археалагічная культура (2-е тысячагоддзе да н.э.)[6]. Багатыя пахаванні сярэднедняпроўскай культуры былі даследаваны І.І.Арцёменкам каля в. Хадосавічы Рагачоўскага і в. Рудняшлягіна Веткаўскага раёнаў. Падобных могільнікаў у межах Гомельскага раёна пакуль што не знойдзена. Але яшчэ ў 1931 г. каля в. Якубоўка быў знойдзены гаршчочак, які адносіцца да сярэднедняпроўскай культуры. Каля в. Валатава выяўлены рэшткі паселішча гэтай культуры. Эпоха сярэдняга бронзавага веку прадстаўлена ў археалогіі Гомельшчыны так званай сосніцкай культурай (сярэдзіна — канец 2-га тысячагоддзя да н.э.). Паселішча са знаходкамі і сярэднедняпроўскай, і сосніцкай культур даследавалася каля в. Раманавічы Гомельскага раёна. Менш вывучаны самы канец бронзавага веку — лебядоўская культура. Яе помнікі яшчэ толькі спрабуюць вызначыць, напрыклад, па выніках даследаванняў каля в. Прыбар.

Эпоха жалеза

Эпоха жалеза прадстаўлена ў археалогіі гомельскага наваколля шматлікімі і разнастайнымі помнікамі. Трэба падкрэсліць, што нават самыя ранніе з выяўленых на тэрыторыі Беларусі жалезных вырабаў былі знойдзены менавіта ў межах сучаснага Гомельскага раёна. У 1930 г. каля в. Крупец Воўкавіцкі (зараз в. Урыцкае) быў выяўлены скарб з дзвюх бронзавых сякер і жалезнага наканечніка дзіды.

На жаль, гэтыя знаходкі не захаваліся, і ўдакладніць іх узрост з дапамогай сучасных метадаў датавання немагчыма. Але па-ранейшаму іх варта адносіць да мяжы эпох бронзы і жалеза, прыблізна да самага пачатку 1-га тысячагоддзя да н.э. Не выключана, што менавіта тады насельніцтва наваколля сучаснага Гомеля зрабіла першыя крокі па авалодванні выплаўкай жалеза. Мясцовых рэсурсаў для гэтага хапала: шматлікія дубравы забяспечвалі вытворчасць высакаякаснага драўнянага вугалю, а распаўсюджанасць радовішчаў балотнай і лугавой руд дазваляла атрымліваць «сырое» жалеза практычна ў любым пункце

Човен-даўбёнка 1—2-га тысячагоддзяў н.э., знойдзены ў р. Сож каля в. Старая Валатава.

раёна. Дарэчы, аб магутнасці мясцовай сыравіннай базы сведчыць таксама наступнае. Яшчэ ў канцы XVIII ст. у Гомельскім старостве, што належала тады графу Румянцаву, дзейнічала некалькі жалезных «заводаў», ці «рудзен»: Дзятлаўскі, Прыбарскі, Сямёнаўскі і інш.[7] Лічыцца, што навыкі здабычы і апрацоўкі жалеза былі запазычаны старажытнымі насельнікамі Беларусі ў паўднёвых суседзяў, тых, якія пакінулі старажытнасці скіфскага тыпу ў лесастэпавай Украіне. Калі гэта так, то ў гомельскае наваколле адпаведныя запазычанні маглі трапіць даволі проста, дзякуючы зручным водным шляхам на Дняпры і Сажы.

Самыя раннія помнікі Гомельскага раёна, дзе ёсць вырабы з жалеза, належаць да мілаградскай* археалагічнай культуры (IX ст. да н.э. — I ст. н.э.). Стваральнікі гэтай культуры насялялі ў адпаведны час вялікія абшары на поўдні Беларусі і поўначы Украіны[8]. Для беларускага Падняпроўя характэрнымі з'яўляюцца мілаградскія ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы. Пад гарадзішча выбіраўся круты высокі рог па-над ракой (в. Уза) ці выспа сярод нізіны (вёскі Чарацянка, Прыбар). Вакол пляцоўкі насыпаўся вал, дзе трэба выкопваўся роў, а ўнутры будаваліся некалькі жытлаў. Жыхары мілаградскіх гарадзішчаў разводзілі жывёлу: кароў, коней, свіней, авечак; ведалі і земляробства, магчыма, нават ворнае. Даволі высокага ўзроўню ў іх дасягнула кавальства, якое нароўні з атрыманнем жалеза з балотнай руды практыкавалася бадай што на кожным паселішчы. Звычайным жаночым занятkам з'яўлялася ткацтва (знойдзены нават адбіткі тканіны на сырой, потым абпаленай гліне). Масавай таксама была вытворчасць ляпнога глінянага посуду, асабліва характэрнай для мілаградскай культуры кругладоннай формы. Адпаведныя рэшткі матэрыяльнай культуры былі знойдзены пры раскопках гарадзішча каля в. Уза ў 1987 г. Там удалося знайсці фрагментаваную падковападобную спражку — «сюльгаму» з бронзы і жалезны наканечнік стралы скіфскага тыпу. Увогуле рэчаў скіфскага тыпу, прывезеных са Скіфіі ці выраблены на месцах па іх узорах, даволі шмат сярод беларускіх помнікаў мілаградскай культуры. Відаць, яе носьбіты мелі трывалыя сувязі з паўднёвымі суседзямі.

Прыкладна ў II—I ст. да н.э. па Сажы пачынае распаўсюджвацца іншая культура жалезнага веку, так званая зарубінецкая. Раней меркавалася, што яе стварылі прамыя нашчадкі носьбітаў мілаградскай культуры. Паступова высветлілася, што зарубінецкае насельніцтва — гэта новыя прышэльцы. На ўсходняй Гомельшчыне яны, відаць, распаўсюджваліся зверху ўніз па цячэнні Сажа і дасягнулі пункта сучаснага Гомеля. Далей на поўдзень утрымалася мілаградскае насельніцтва: на гарадзішчах каля вёсак Прыбар, Уза, Цярэшкавічы, Прыбыткі, Чарацянка і інш. зарубінецкіх знаходак няма. Зарубінецкія комплексы, абарончыя збудаванні, жытлы і пахаванні сталі

*Назва ўтворана ад в. Мілаграды Рэчыцкага раёна, дзе яшчэ ў 1950-я гады быў даследаваны адзін з адпаведных помнікаў.

добра вядомымі пасля раскопак каля в. Чапліна Лоеўскага раёна[9]. Увогуле яны вельмі падобныя да мілаградскіх, але посуд пласкадонны, шмат фібул так званай латэнскай культуры. Зарубінецкае насельніцтва падтрымлівала сувязі не з поўднем, а галоўным чынам з захадам, з тагачаснымі старажытнымі кельтамі і германцамі.

Мілаградскую і зарубінецкую культуры ў межах сучаснага Гомельскага раёна змяняе кіеўская (II—V ст. н.э.), але адпаведныя помнікі тут яшчэ вельмі слаба даследаваны. Кіеўская культура з'яўлялася ў пэўным сэнсе пераходнай з'явай паміж зарубінецкай і калочынскай культурамі.

Эпоха сярэдневякоўя

Помнікі ранняга сярэдневякоўя гомельскага наваколля належаць да так званай калочынскай археалагічнай культуры (VI—VIII ст. н.э.). Сваю назву яна атрымала ад гарадзішча-сховішча каля в. Калочын Рэчыцкага раёна. Умацаваныя сховішчы ўвогуле характэрныя для гэтай культуры. Цэлы шэраг іх быў адкрыты і ў басейне Сажа[10]. Каля гарадзішча-сховішча размяшчалася звычайна адкрытае, неўмацаванае паселішча, часам і могільнік. Матэрыяльная культура селішчаў і рытуал могільнікаў з пахаваннямі па абрадзе трупаспалення калочынскай культуры добра вывучаны дзякуючы шматгадовым раскопкам каля г. Быхаў Магілёўскай вобласці. Могільнік на Радышавай гары пачаў даследаваць яшчэ Е.Р.Раманаў, вялізнае селішча каля в. Тайманава вывучалася Л.Д.Побалем.

У Гомельскім раёне ёсць шмат пунктаў са знаходкамі характэрнай грубаляпной калочынскай керамікі. Фрагменты вялікіх гаршкоў-зернавікоў знойдзены пры раскопках гарадзішча каля в. Прудок. Калочынскія селішчы былі адкрыты А.А.Макушнікавым каля вёсак Калінаўка, Клёнкі, Гадзічава.

Частка даследчыкаў звязвае этнас носьбітаў калочынскай культуры з раннімі славянамі, у Пасожжы — з радзімічамі, аб якіх у «Аповесці мінулых гадоў» сказана наступнае: «Радзімічы прыйшлі і селі... па Сажу».

Але сувязі паміж калочынскімі і радзіміцкімі старажытнасцямі пакуль што дакладна не вызначаны.

Увогуле матэрыяльная культура розных усходнеславянскіх плямён мела няшмат адрозненняў. На селішчах ранняга сярэдневякоўя ў розных кутках тагачаснай Русі знаходзяць асколкі аднолькавага ганчарнага посуду з хвалістым арнаментам, аднолькавыя шыферныя прасліцы, крэсівы і г. д. У Гомельскім раёне такія селішчы адкрыты каля вёсак Бабовічы, Дзікалаўка, Сасноўка і інш. Менавіта з культуры ранняга сярэдневякоўя паступова развівалася культура мясцовых беларусаў — прамых нашчадкаў колішніх радзімічаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Романов Е.Р. Археологический очерк Гомельского уезда // Записки Северо-Западного отдела Русского географического общества. Кн. 2. Вильно, 1910.

2. Палікарповіч К.М. Дагістарычныя стаянкі сярэдняга і ніжняга Сажа // Працы кафедры археалогіі. Т. 1. Мн., 1928.

3. Каваленя А.Д. Дневник за 1936 г. Р. Сож // Архіў Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. № 457.

4. Поликарпович К.М. К вопросу о мустьерской культуре в Верхнем Поднепровье // Материалы по археологии БССР. Т. 1. Мн., 1957.

5. Поликарпович К.М. Палеолит Верхнего Поднепровья. Мн., 1968.

6. Артеменко И.И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1967.

7. Варкоўскі С., Скардзіс В. Аб жалезнай прамысловасці на Беларусі // Савецкая краіна. 1931. № 1.

8. Мельниковская О.Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.

9. Третьяков П.Н. Чаплинское городище // Памятники зарубинецкой культуры. М.; Л., 1959.

10. Рассадзін С.Я. Гарадзішча-сховішча Залатаміно ў Беларускім Пасожжы // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1983. № 2.

С.Я.Рассадзін.

Човен-даўбёнка 1—2-га тысячагоддзяў н.э., знойдзены ў р. Сож каля в. Старая Валатава.

раёна. Дарэчы, аб магутнасці мясцовай сыравіннай базы сведчыць таксама наступнае. Яшчэ ў канцы XVIII ст. у Гомельскім старостве, што належала тады графу Румянцаву, дзейнічала некалькі жалезных «заводаў», ці «рудзен»: Дзятлаўскі, Прыбарскі, Сямёнаўскі і інш.[7] Лічыцца, што навыкі здабычы і апрацоўкі жалеза былі запазычаны старажытнымі насельнікамі Беларусі ў паўднёвых суседзяў, тых, якія пакінулі старажытнасці скіфскага тыпу ў лесастэпавай Украіне. Калі гэта так, то ў гомельскае наваколле адпаведныя запазычанні маглі трапіць даволі проста, дзякуючы зручным водным шляхам на Дняпры і Сажы.

Самыя раннія помнікі Гомельскага раёна, дзе ёсць вырабы з жалеза, належаць да мілаградскай* археалагічнай культуры (IX ст. да н.э. — I ст. н.э.). Стваральнікі гэтай культуры насялялі ў адпаведны час вялікія абшары на поўдні Беларусі і поўначы Украіны[8]. Для беларускага Падняпроўя характэрнымі з'яўляюцца мілаградскія ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы. Пад гарадзішча выбіраўся круты высокі рог па-над ракой (в. Уза) ці выспа сярод нізіны (вёскі Чарацянка, Прыбар). Вакол пляцоўкі насыпаўся вал, дзе трэба выкопваўся роў, а ўнутры будаваліся некалькі жытлаў. Жыхары мілаградскіх гарадзішчаў разводзілі жывёлу: кароў, коней, свіней, авечак; ведалі і земляробства, магчыма, нават ворнае. Даволі высокага ўзроўню ў іх дасягнула кавальства, якое нароўні з атрыманнем жалеза з балотнай руды практыкавалася бадай што на кожным паселішчы. Звычайным жаночым заняткам з'яўлялася ткацтва (знойдзены нават адбіткі тканіны на сырой, потым абпаленай гліне). Масавай таксама была вытворчасць ляпнога глінянага посуду, асабліва характэрнай для мілаградскай культуры кругладоннай формы. Адпаведныя рэшткі матэрыяльнай культуры былі знойдзены пры раскопках гарадзішча каля в. Уза ў 1987 г. Там удалося знайсці фрагментаваную падковападобную спражку — «сюльгаму» з бронзы і жалезны наканечнік стралы скіфскага тыпу. Увогуле рэчаў скіфскага тыпу, прывезеных са Скіфіі ці выраблены на месцах па іх узорах, даволі шмат сярод беларускіх помнікаў мілаградскай культуры. Відаць, яе носьбіты мелі трывалыя сувязі з паўднёвымі суседзямі.

Прыкладна ў II—I ст. да н.э. па Сажы пачынае распаўсюджвацца іншая культура жалезнага веку, так званая зарубінецкая. Раней меркавалася, што яе стварылі прамыя нашчадкі носьбітаў мілаградскай культуры. Паступова высветлілася, што зарубінецкае насельніцтва — гэта новыя прышэльцы. На ўсходняй Гомельшчыне яны, відаць, распаўсюджваліся зверху ўніз па цячэнні Сажа і дасягнулі пункта сучаснага Гомеля. Далей на поўдзень утрымалася мілаградскае насельніцтва: на гарадзішчах каля вёсак Прыбар, Уза, Цярэшкавічы, Прыбыткі, Чарацянка і інш. зарубінецкіх знаходак няма. Зарубінецкія комплексы, абарончыя збудаванні, жытлы і пахаванні сталі

*Назва ўтворана ад в. Мілаграды Рэчыцкага раёна, дзе яшчэ ў 1950-я гады быў даследаваны адзін з адпаведных помнікаў.

Яны даследавалі помнікі археалогіі Гомельскага раёна

АБАДЭНКА Юрый Уладзіміравіч (н. 2.11.1954 г., г. Гомель), беларускі археолаг. Віцэ-прэзідэнт Палескага археалагічнага таварыства. Даследуе помнікі эпохі палеаліту і неаліту Верхняга Падняпроўя. Выявіў і абследаваў стаянкі каля пасёлкаў Ільіч і Плёсы.

АРЦЁМЕНКА Іван Іванавіч (15.9.1924 г., с. Гаўрылаўка Новаваранцоўскага р-на Херсонскай вобл. — 27.4.1989 г.), украінскі археолаг. Член-карэспандэнт АН Украіны, доктар гістарычных навук. Даследаваў праблемы гісторыі насельніцтва Усходняй Еўропы эпохі неаліту, меднага і бронзавага вякоў. У 1957—1958 гг. абследаваў паселішча каля в. Раманавічы.

БАГАМОЛЬНІКАЎ Уладзімір Уладзіміравіч (23.4.1941 г., г. Гомель — 6.9.1992 г.), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. Даследаваў межы рассялення радзімічаў і іх суседзяў. Распрацаваў тыпалагічную класіфікацыю радзіміцкага пахавальнага абраду і храналогію радзіміцкіх старажытнасцей, выявіў асаблівасці адзення радзімічаў. Абследаваў гарадзішчы каля вёсак Аздзеліна, Бабовічы, Васілева, Глыбоцкае, Клімаўка, Новыя Цярэшкавічы, Уза, Чарацянка, курганны могільнік каля пас. Калінаўка і селішча каля в. Сасноўка.

БЕЛЯШЭЎСКІ Мікалай Фядотавіч (12.10.1867 г., г. Умань Чаркаскай вобл. — 21.4.1924 г.), украінскі археолаг, этнограф і мастацтвазнаўца. Акадэмік АН Украіны. Адзін з першых даследчыкаў паселішчаў на Гомельшчыне, Заходнім Бугу і ў Сярэднім Падняпроўі. У 1890 г. выявіў паселішча каля в. Раманавічы.

КАВАЛЕНЯ Аляксандр Дзмітрыевіч (5.3.1895 г., в. Кашніцы Гродзенскага пав. — 27.8.1937 г.), беларускі археолаг. Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР. Даследаваў стаянкі палеаліту і жалезнага веку, помнікі розных эпох Тураўшчыны. У 1936 г. абследаваў гарадзішчы каля вёсак Бабовічы, Пакалюбічы, Прудок і Уза.

КАЛЕЧЫЦ Алена Генадзьеўна (н. 12.3.1940 г., г. Нальчык), беларускі археолаг. Кандыдат геаграфічных навук. Даследуе пытанні палеаграфіі, экалогіі плямён каменнага веку. У 1975 г. выявіла і абследавала паселішча каля пас. Калініна, у 1976 г. даследавала гарадзішча каля в. Раманавічы.

ЛЯЎДАНСКІ Аляксандр Мікалаевіч (10.9.1893 г., в. Юр'ева Смалявіцкага раёна — 27.8.1937 г.), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. Загадчык секцыі археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР. Зрабіў класіфікацыю гарадзішчаў жалезнага веку, вызначыў іх культурна-археалагічную прыналежнасць і арэалы археалагічных культур, акрэсліў асноўныя рысы матэрыяльнай культуры, гаспадаркі і патрыярхальна-радавога ладу плямён, што насялялі тэрыторыю Беларусі ў жалезным веку. У 1936 г. абследаваў гарадзішчы каля вёсак Бабовічы, Пакалюбічы, Прудок і Уза.

МАКУШНІКАЎ Алег Анатолевіч (н. 15.6.1960 г., г. Гомель), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. Дырэктар Гомельскага абласнога археалагічнага цэнтра. Даследаваў помнікі 2-й пал. 1-га тысячагоддзя н. э. Ніжняга Пасожжа. Абследаваў селішчы каля населеных пунктаў Бабовічы, Гадзічава, Ільіч, Калінаўка, а таксама могільнік каля пас. Ільіч.

ПАЛІКАРПОВІЧ Канстанцін Міхайлавіч (18.3.1889 г., в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на — 20.2.1963 г.), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. Даследаваў стаянкі палеаліту і мезаліту, помнікі бронзавага веку. Першым выказаў думку пра засяленне тэрыторыі Беларусі першабытным чалавекам у старажытнакаменным веку. У 1925 г. выявіў і даследаваў селішчы каля вёсак Асаўцы і Сасноўка.

ПОБАЛЬ Леанід Давыдавіч (н. 28.5.1924 г., в. Мікалаева Іўеўскага р-на), беларускі археолаг. Доктар гістарычных навук. Член Міжнароднай уніі славянскай археалогіі. Даследаваў гісторыю старажытных славян у Еўропе, у т.л. на Беларусі. Адкрыў і абследаваў гарадзішча каля в. Васілева і селішча каля в. Рудня-Марымонава, а таксама абследаваў селішча каля в. Асаўцы і гарадзішча каля в. Рудня-Марымонава.

РАМАНАЎ Еўдакім Раманавіч (11.9.1855 г., Навабеліца — 20.1.1922 г.), беларускі археолаг, фальклярыст, этно-

граф, краязнавец, педагог. Працаваў над стварэннем археалагічных картаў Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерній. Даследаваў археалагічныя помнікі Падняпроўя і Пасожжа. У 1910 г. абследаваў гарадзішчы каля вёсак Бабовічы, Глыбоцкае, Клімаўка, Новыя Цярэшкавічы, Пакалюбічы, Прудок, Рудня-Марымонава, Уза, Цераха, Чарацянка.

РАССАДЗІН Сяргей Яўгенавіч (н. 30.7.1958 г., г. Гомель), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. Вывучае ўзаемадзеянне старажытнага насельніцтва Беларусі і скіфаў у VIII—III ст. да н.э., гісторыю беларускай археалогіі. Абследаваў гарадзішчы каля вёсак Пакалюбічы, Прыбар, Чарацянка.

М.З.Башлакоў.

Тут жылі радзімічы

З'яўленне славян на Беларусі стала вынікам апошніх хваль вялікага перасялення народаў, якімі былі рух готаў (II—III ст. н.э.) і нашэсці гунаў (IV ст. н.э.) і аваараў (сярэдзіна VI ст. н.э.).

Пытанне паходжання славян — вельмі складанае і заблытанае, пакуль што далёкае ад навуковага вырашэння. Магчыма, галоўная прычына гэтага ў познім з'яўленні пісьмовых сведчанняў пра іх — у сярэдзіне VI ст. н.э. Бясспрэчнымі трэба лічыць толькі паказанні старажытных аўтараў, што «славяне былі мнагалюдным народам» (Іардан), які займаў «непамерную прастору» (Пракопій Кесарыйскі), бо без гэтага нельга растлумачыць, чаму славяне змаглі рассяліцца на вялікай тэрыторыі, асіміляваўшы шматлікія плямёны і народнасці.

Прарадзімай славян называліся і называюцца розныя мясцовасці: гэта і Сярэдняе і Ніжняе Падунайе, і Паўночнае Прычарнамор'е, і Паўночнае Прыкарпацце, і нават Закаўказзе і Паўночны Іран. У апошні час найбольш верагоднымі месцамі фарміравання славян указваюцца Вісла-Одэрскае міжрэчча і паўднёвая частка лясной зоны Усходняй Еўропы (сюды ўваходзіць і поўдзень Беларусі). Цяжка аддаць перавагу якой-небудзь з гэтых апошніх гіпотэз, абедзве яны маюць аднолькавае права на часовае існаванне. Але калі нават і пагадзіцца з тым, што і на Беларусі была прарадзіма славян, то ўсё ж аўтары гэтай гіпотэзы гавораць аб поўным адыходзе славянскага насельніцтва адсюль у канцы V—пачатку VI ст. на Дунай і прасоўванні на яго месца балтаў, аб чым ужо гаварылася вышэй. Вось чаму можна лічыць, што масавы прыход славян на Беларусь і іх канчатковае ўкараненне тут пачалося на рубяжы VI—VII ст. н.э.

Трэба зазначыць, што славянскае засяленне Беларусі, як і іншых усходнееўрапейскіх земляў, не было аднаразовай падзеяй: яно расцягнулася на доўгі перыяд, магчыма, на некалькі стагоддзяў. Доўгі час у навуцы існавала думка, што славяне ішлі на Беларусь толькі з поўдня. Але ўжо Я.Карскі заўважыў, што «галоўная маса славянаў, якія склалі беларускае племя, рушыла з поўдня (з Прыпяці і яе прытокаў) і захаду (можа быць, з Зах. Буга і Нарвы) спачатку да Нёмана, а адсюль да Зах. Дзвіны на поўначы і да Дзясны на ўсходзе».

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 21—22.

* * *

Вучоныя мяркуюць, што продкі радзімічаў і вяцічаў на самай справе да вялікай вандроўкі народаў, а дакладней да III ст. н.э., жылі па сярэднім цячэнні Вісты і па ніжнім Бугу і Нарве, на тэрыторыі сённяшніх Цеханоўскага, Астралэнцкага, усходняй часткі Тарунскага, паўночнай ускраіне Варшаўскага і заходняй Ламжынскага ваяводстваў. Гэта было праславянскае (венедскае) насельніцтва, якое знаходзілася ў блізкіх сувязях на поўначы з продкамі прабалтаў, асабліва прусаў, а на ўсходзе — з продкамі ўсходнеславянскага племя дрыгавічоў. Як ужо згадвалася папярэдне, пад націскам вандраваўшых на поўдзень, да рубяжоў Візантыі, германскіх готаў, або больш верагодна — гепідаў, продкі радзімічаў і вяцічаў перасяліліся на землі па верхнім Днястры, на Падолле, і жылі там да IV ст. Затым пад ударамі аваараў-абраў падаліся на паўночны ўсход,



Карта рассялення радзімічаў у IX–XII ст.

за раку Дняпро. У VIII ст. яны там сталыя насельнікі.

Няма сумнення, што пад час гэтага прабывання сярод іншых народаў — германскіх готаў і гепідаў, праславянскіх дулебаў, антаў, дрыгавічоў і на ўзмежку стэпавых качэўнікаў — продкі радзімічаў шмат страцілі са сваіх першапачатковых мовы, культуры, традыцый, але таксама шмат чаго набылі ад іх і паступова ператварыліся ў іншыя плямёны, якімі яны былі перад вандраваннем.

Як паказваюць найноўшыя навуковыя адкрыцці, радзімічы былі саюзам васьмі невялікіх плямён або нават разросшых родаў. Жылі яны па левым дняпроўскім прытоку — рацэ Сажы і яе прытоках Беседзі і Іпуці. Гэта значны абшар, на межах якога знаходзяцца гарады Магілёў, Мсціслаў, Рослаўль, Бранск, Трубчэўск, Рэчыца, Рагачоў, Быхаў — разам каля 30 тысяч квадратных кіламетраў тэрыторыі.

Радзімічы з усходу межавалі з вяцічамі, з поўдня — севяранамі, з захаду — дрыгавічамі, з поўначы — крывічамі.

... Радзімічы пакінулі вельмі трывалыя, незнішчальныя сляды свайго прабывання над Віслай, Бугам і Нарвай, а затым над Днястром і ўжо назаўсёды — на Пасожжы. Такімі пасведчаннямі з'яўляюцца іхнія магілы і знойдзеныя там рэчы (перш за ўсё сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, якія насілі колішнія радзімічанкі), а таксама назвы азёр, рэк, ручаёў, урочыш-



Упрыгожанні радзімічаў: 1 — бранзалетападобнае кольца; 2 —сяміпрамянёвае скроневае кольца; 3 — гронкавая падвеска; 4 —сяміпрамянёвае скроневае кольца; 5 — эліпсоідная падвеска; 6 — буйназярністая пацерка; 7 — язычковая падвеска; 8 —пласткаватая грыўня; 9 — пятлістая падвеска.

чаў, мясцовасцей. Аказалася, што такія назвы з Павіслення, Пабужжа і Панароўя, як Быдгашч, Хотам, Чэрукі, Радзім, Сырска, Унецк, а таксама Бранск на Беласточчыне, і шэраг іншых радзімічы перанеслі на Пасожжа, і там па сённяшні дзень стаяць гарады Будагошч, Хацімль, Чэрыкаў, Радзімль, Сырск, Унеча і іншыя, а таксама вялікі... Бранск! Вядома, каб пакапацца глыбей і дакладней, знайшлося б сярод старажытных радзіміцкіх назваў значна болей з Ніжняга Пабужжа і Панароўя найменняў. І гэта якраз узмацняла б доказ, што сярод продкаў радзімічаў былі таксама выхадцы і з заходніх земляў Славяншчыны.

На Пасожжы продкі радзімічаў стварылі хоць невялікае па колькасці, але моцнае племянное аб'яднанне. Усё часцей выказваецца меркаванне, што яго мог узначальваць племянны правадыр Радзімір або Радзімер. Ён даў пачатак панаваўшаму там значны час княжацкаму роду. Ад гэтага імя і атрымала назву ўсё племя — радзімічы.

Неўзабаве пасля прыходу сюды і стварэння свайго княства яны прымушаны былі плаціць даніну суседняй магутнай Хазарскай дзяржаве, якая прасціралася ад Волгі да Дняпра. Але ў той жа час праз хазараў радзімічы наладзілі сувязь з тагачаснымі высокаразвітымі дзяржавамі Сярэдняй Азіі, і гэта спрыяла развіццю іхняй гаспадаркі і культуры.

Праз зямлю радзімічаў праходзіла адно з напружаных адгалінаванняў вельмі важнага гандлёвага шляху з Харэзма — старажытнай дзяржавы на рацэ Амудар'я ў Сярэдняй Азіі — на ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Якраз на радзіміцкую зямлю і яе багацці паквапіўся кіеўскі князь Алег...

Аднак гэта зусім не азначала поўнага падпарадкавання Алегам радзімічаў. Яны захавалі незалежнасць сваёй дзяржавы, а кіеўскаму князю пасылалі толькі даніну і дапаможныя атрады ваяўнікоў. Такі стан, мабыць, пратрываў цэлае стагоддзе, за якое радзімічы добра ўзмацніліся. У іх развілося цікавае грамадскае жыццё. «...Наладжваліся гульні паміж сёламі, і сыходзіліся на гэтыя гульні, на танцы і на ўсялякія д'ябальскія песні, — піша богабаязны манах у «Аповесці мінулых гадоў», — і там выкрадалі сабе жонак па змове з імі, а мелі ж па дзве і па тры жонкі. Калі ж хто памірaў, то наладжвалі па ім трызну, а потым рабілі вялікую калоду і клалі на яе нябожчыка, спальвалі, а потым, сабраўшы косці, складвалі іх у невялікую пасудзіну і ставілі на слупах пры дарогах...» Так памяць аб продках узмацняла жывых нашчадкаў.

Пад час чарговага крызісу ў Старажытнарускай дзяржаве пасля смерці князя Святаслава і барацьбы паміж яго сынамі за кіеўскі велікакняжацкі пасад радзімічы, відаць, цалкам вызваліліся ад залежнасці ад Кіева. Толькі ў 984 годзе князь Уладзімір, добра ўмацаваўшыся на бацькоўскім пасадзе ў Кіеве і сабраўшы неабходныя вайсковыя сілы, рашыўся на паход супраць радзімічаў. Крывавая і жорсткая бітва адбылася на рацэ Пяшчане. Перамаглі шматлікія сілы кіеўскага

князя пад кіраўніцтвам ваяводы Воўчы Хвост. Мабыць, тады якраз радзімічы страцілі незалежнае сваё княжанне і дынастыю. Аднак памяць пра сваю племянную адасобленасць захавалі яны даволі доўга, да XII ст. Апошні раз пра «радзіміцкія» гарады гаворыцца ў летапісе пад 1169 годам. Першым з іх трапіў у летапіс Гомій (сённяшні Гомель) у 1142 г., другім — Чачэрск у 1159 г.

Гайдук М. Паратунак. Мн., 1993. С. 28—30.

* * *

На думку гісторыка Э.М.Загарульскага, радзімай усходніх славян былі раёны паўночнай Украіны і паўднёвай Беларусі каля ракі Прыпяць. Адсюль у сярэдзіне IX ст. славяне пачалі перасяляцца на поўнач, дзе ўжо жылі балцкія плямёны. Заходняя Валынь, а таксама Малая Польшча, аб якой пойдзе гаворка ніжэй, былі кантактнымі раёнамі, дзе адбываўся сінтэз антычнасці і варварства. Страціўшы большую частку насельніцтва пасля масавага перасялення, Валынь і Малая Польшча аказаліся ў цяжкім становішчы.

Вялікамараўскі князь Расціслаў, заручыўшыся падтрымкай Візантыі ў барацьбе з Людовікам Германскім і прыняўшы хрысціянства, спрабаваў уключыць у сферу свайго ўплыву насельніцтва Валыні. Адначасова ён мячом і крывёй вёў захопніцкія войны ў Малой Польшчы. Перамога была на яго баку, і пераможаныя, але не скароныя воіны, сабраліся ў 877 г. каля ўмацаванага гарадка Радам на ваенны савет, на якім вырашаўся лёс народа.

Прызнаць уладу Расціслава і прыняць чужую рэлігію ці працягваць барацьбу і гераічна загінуць? Ці пакінуць зусім сваю радзіму і накіравацца ў новыя землі?

Думкі племянных правадыроў падзяліліся. Большая частка выказалася за падпісанне міру на ўмовах пераможцаў, а меншая, найбольш непрымірымая, вырашыла пакінуць радзіму і накіравацца ў выгнанне.

Шлях перасялення заставаўся адзіны — па рацэ Прыпяць у вярхоў'і рэк Дняпра і Сажа. Такі накірунак вымусіла выбраць прыроднае асяроддзе і адсутнасць свабодных зямель. На поўнач ад Прыпяці ўжо жылі дрыгавічы, а на поўдзень — валыняне. Сам рачны шлях вымусіў іх плысці на ўсход і потым на поўнач, у раёны, якія былі перыферыяй тагачаснага ўсходнеславянскага свету. Верхняе Пасожжа не ведала яшчэ масавай славянскай каланізацыі і нават мясцовыя абарыгены — калочынцы — не мелі тут значнай колькасці паселішчаў. Да таго ж трэба дадаць, што левабярэжжа Дняпра належала Хазарскаму каганату. Радзімічы згадзіліся плаціць каганату даніну, захаваўшы пры гэтым палітычную і рэлігійную незалежнасць.

Археалагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што месцам пасялення выгнаннікаў стаў левы бераг Дняпра, насупраць сучаснага Рагачова.

У «Аповесці мінулых гадоў» апавядаецца пра тое, што першым князем радзімічаў быў Радзім. Але ўмовы жыцця перасяленцаў і менавіта абрады пахавання нябожчыкаў сведчаць аб тым, што яны жылі ва ўмовах ваеннай дэмакратыі. Усе пытанні вырашаў савет родаў. На беразе Дняпра ўзнікла некалькі ўмацаваных гарадкоў — Збораў, Гарадзец, а таксама гарады каля сучасных вёсак Гадзілавічы і Юдавічы. Аб'яднальным цэнтрам родавых паселішчаў выступала капішча Перуна на беразе возера Святога, вядомага цяпер як Ходасавіцкае.

Перасяленне радзімічаў супала з узмацненнем агрэсіўнай палітыкі кіеўскіх князёў. Аснову гэтай палітыкі заклаў яшчэ легендарны князь Алег. «Аповесць мінулых гадоў» пералічвае шматлікія захопніцкія паходы князя:

«Год 882. И пошел Олег... к Смоленску с кривичами, и взял город и посадил в нем мужа своего».

«Год 882. Начал Олег воевать против древлян и покорил их».

«Год 885. Послал к радимичам, спрашивая: «Кому дань даёте?» Они ответили: «Хазарам». И сказал им Олег: «Не давайте хазарам, но дайте мне». И дали Олегу по шелегу, как раньше хазарам давали...»

Чаму да радзімічаў былі накіраваны паслы, а не войска? Верагодна, Алег меў нейкія іншыя погляды на радзімічаў? На

жаль, не захавалася летапісных звестак аб гэтых падзеях. Але яны, магчыма, былі вядомы гісторыку В.М.Таціщчаву, які ў сваёй «Гісторыі Расійскай» (1768) паведамляе: «Радимичи, славяне, переведённые из Польской области, жили частично по Суле...» (Р.Сула — прыток Дняпра каля Кіева.) А Л.М.Максімовіч у гісторыка-геаграфічным даведніку «Лексікон» (1789) дадае: «Радимичи, народ, произошедший от поляков и поселившийся на р. Сож. Часть их была в Переяславской области на реке Песчань, переселена, может быть, с Сожа...»

Магчыма, Алег прапанаваў частцы радзімічаў перасяліцца ў ваколіцы Кіева, каб ахоўваць сталіцу княства ад качэўнікаў і прымаць удзел у ваяўнічых паходах. Што і было, відаць, зроблена, бо аб удзеле радзімічаў у ваяўнічых паходах Алега і Святаслава маюцца звесткі ў летапісах.

Археалагічныя даследаванні сведчаць, што ў пачатку X ст. узніклі ўмацаваныя гарадкі ў Пераяслаўскай зямлі: Гарадзец на р. Асцёр, Пясочань на р. Пясчань, Пераяслаў на р. Трубеж.

У 978 г. да ўлады ў Кіеве прыйшлі князь Уладзімір і яго паплечнікі: дзядзька Уладзіміра Дабрыня, ваявода Воўчы Хвост, здраднік Блуд.

У 978 г. князь Уладзімір пайшоў разам з дружынай у паход на яцвягаў. Пад час паходу паміж старой і новай знаццю пачаліся спрэчкі. Ды і сам паход закончыўся безвынікова. Яцвягі захавалі сваю самастойнасць амаль да часоў утварэння Вялікага княства Літоўскага. Праз некалькі гадоў пасля яцвяжскага паходу радзіміцкія правадыры паднялі мяцеж супраць князя. Гэта адбылося пасля таго, як князь вырашыў усіх жыхароў зрабіць хрысціянамі. Супраць непакорных радзімічаў Уладзімір накіраваў свайго ваяводу Воўчы Хвост. Іпацьеўскі летапіс сведчыць аб тым:

«Год 984... И послал Владимир Волчего Хвоста впереди себя, и встали радимичи на реке Пишчань и победил радимичей Волчий Хвост. Тем и Русь (киевляне — М.Х.) корячатся, радимичам говоря: Пишчанцы Волчего Хвоста бегают».

А тым часам частка радзімічаў працягвала асвойваць першабытны Пасожскі край. На Чачоры, Добрычы, Покаці, Узе будаваліся ўмацаваныя гарадкі-сховішчы. Вакол іх узніклі невялікія вёсачкі (весі). Да канца X ст. радзімічы засялілі вярхоўі Дняпра, Сажа, Беседзі, Іпуці.

Горад Гомель, які яшчэ ў VII ст. выконваў ролю купецкай факторыі і быў месцам збору даніны, ператварыўся ў вялікі цэнтр Кіеўскай зямлі, а пазней Чарнігаўскага княства, і стаў нефармальнай сталіцай радзімічаў.

М.М.Халюшкоў.

* * *

Гомій XI ст. быў адміністрацыйна-палітычным, эканамічным і ваенным цэнтрам вялікай акругі-воласці, населенай нашчадкамі радзімічаў. Да горада падступалі малыя вёскі і шматлюдныя сёлы, раскіданыя па берагах Сажа, Іпуці, Узы, Церухі, Вуці. Буйнейшыя паселішчы былі каля сучасных вёсак Шарсцін, Хальч, Маркавічы, Глыбоцкае, Целяшы, Старая Беліца, Дзям'янкі, Гардуны, Уваравічы. Тут жылі сяляне, якія кармілі не толькі сябе і сваіх гаспадароў, але і пэўную частку насельніцтва Гомія. Вёска займалася земляробствам, ляснымі промысламі, паляваннем, прадзеннем і ткацтвам, здабычай балотнай руды. «Лішнія» людзі гомійскіх сяленняў папаўнялі гарадское насельніцтва.

У XI ст. у Гоміі і наваколлях разгортваецца ўпартая барацьба за душы людзей паміж прадстаўнікамі старой язычніцкай веры — вешчунамі — і хрысціянскімі місіянерамі, якіх актыўна падтрымлівала велікакняжацкая ўлада. Ужо тады ў горадзе было шмат хрысціян, ці людзей, якія знаходзіліся пад уплывам хрысціянскага веравучэння: сярод знаходак археолагаў сустракаюцца нацельныя крыжыкі.

Гомійскія сёлы прымалі новую веру без ахвоты, і язычніцкія традыцыі ў светапоглядзе сялян панавалі амаль да першай паловы XII ст. Падставы для такой высновы даюць матэрыялы пахавальных помнікаў XI ст. — курганоў.

Яшчэ і сёння курганныя могільнікі, якія налічваюць дзесяткі земляных насыпаў паўсферычнай у плане формы дыяметрам ад 5 да 12 м і вышынёй да 2,5—

З м, можна сустрэць у Гомельскім, Добрушскім, Буда-Кашалёўскім і Веткаўскім раёнах. Пад курганнымі насыпамі вучоныя знаходзяць пахаванні старажытных жыхароў гомійскіх сёл, якія здзейснены па канонах язычніцкага пахавальнага рытуалу. Звычаі мясцовага насельніцтва даволі рэзка адрозніваліся ад хрысціянскіх. Ужо само ўзвядзенне кургана ішло ў разрэз з патрабаваннямі царквы. Калі хто-небудзь паміраў — сваякі і супляменнікі выбіралі на абшчынным могільніку месца для пахавання. Пляцоўка старанна выпальвалася — каб адагнаць варожых чалавеку духаў. На гэтае месца клалі нябожчыка, а разам з ім — рэчы, якія служылі яму пры жыцці і маглі спатрэбіцца ў замагільным свеце: мужчынам — нож, крэсіва з крэменем, гліняную пасудзіну для ежы, калі-нікалі — касу ці іншыя прылады працы, жанчынам — верацёны і праселкі, каралі са шкляных, каменных пацерак і металічных прывесак, скроневыя кольцы, шыйныя грыўні, іншыя прыналежнасці адзення і ўбораў. Нябожчыка закопвалі зямлёй з раўчукоў вакол месца пахавання, а пасля дасягнення насыпам пэўнай вышыні разводзілі над ім, у раўках, рытуальныя вогнішчы, рабілі хаўтуры.

У першай палове XI ст., у сувязі з распадам палітычнага адзінства Кіеўскай Русі, землі Ніжняга Пасожжа разам з Гоміем і Чычэрскам (сучасны Чачэрск) адыходзяць да Чарнігаўскага княства, а з канца стагоддзя замацоўваюцца ў якасці вотчыннага валодання чарнігаўскага князя Давыда Святаславіча і яго нашчадкаў.

А.А.Макушнікаў.

* * *

Радзімічы, усходнеславянская этнічная супольнасць. Жылі ў міжрэччы Дняпра і Дзясны па цячэнні Сажа і яго прытоках. Паводле летапісу, назва паходзіць ад імя Радзім, на чале з якім прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. Папярэднікамі радзімічаў у Пасожжы былі носьбіты калочынскай культуры. Займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, рамёствамі (жалеза- і дрэваапрацоўчае, ювелірнае, ганчарнае, гарбарнае), паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам, прадзеннем, ткацтвам. Найбольш даследаваныя археалагічныя помнікі X—XII ст. Абідавічы, Ветачка, Вішанька, Гадзілавічы, Каласы, Мадора, Нісімкавічы, Ходасавічы, Шапчыцы, Юдзічы, Эсьмоны і інш. Асаблівасцю радзіміцкага арэала з'яўляецца наяўнасць пахавальных курганоў з трупаспаленнем (VIII—X ст.) і трупапалажэннем (канец X—пачатак XII ст.). Характэрная адзнака — наяўнасць попельна-вугальнага пласта ў форме «вогненнага круга», у цэнтр якога і клалі нябожчыка. Сярод пахавальнага інвентару шмат упрыгожанняў, прадметаў побыту, радзей сустракаюцца прылады працы. Для мужчынскіх пахаванняў характэрны паясныя кольцы, інш. дэталі паяснога набору, зрэдку зброя. Характэрныя племянныя адзнакі радзімічаў — бронзавыя або сярэбраныя 7-прамянёвыя і 7-лапчастыя скроневыя кольцы, біэліпсоідныя, язычковыя, пятлістыя, гронкавыя падвескі, пласціністыя грыўні. У жаночым касцюме спалучаліся 7-прамянёвыя і пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы, зоркападобныя спражкі, дробны бісер, залатыя пацеркі і падвескі, якія сімвалізавалі нябесныя святілы. Знаходкі з курганоў радзімічаў даследчыкі падзяляюць на 22 катэгорыі: прылады працы, каля 15 катэгорый упрыгожанняў, прадметы гаспадарчага ўжытку, побыту, конскага рыштунку, зброя, цацкі, посуд. Знойдзены манеты, якія выкарыстоўваліся як падвескі ў маністах: дырхемы (Бацвінава, Чабатовічы), срэбранікі Уладзіміра X ст. з вушкамі (Вотня), брактэаты (Гадзілавічы). У знаходках вылучаюць 3 перыяды: 2-я палова X—пачатак XI ст., большая частка XI ст. і канец XI—1-я чвэрць XII ст. Археалагічныя даследаванні пацвярджаюць, што завяршэнне славянізацыі радзімічамі ўсходнябалцкага насельніцтва адбывалася ва ўмовах фарміравання Кіеўскай Русі.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 531.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Вераванні нашых продкаў

... На той час, калі з'явіўся навуковы інтарэс да пантэона язычніцкіх багоў, з іх ранейшага мноства больш-менш захаваўся ў народнай памяці бадай што толькі Пярун. Імёны і прызначэнне іншых былі амаль забытыя, і галоўнымі крыніцамі ведаў пра іх сталі летапісныя паведамленні, абрадавая паэзія, казкі і асобныя легенды. Найбольш поўна язычніцкія паданні, абраднасць, прымхі захаваліся ў тым асяроддзі і ў той сферы, кантраляваць якую хрысціянству было цяжка: гэта сялянская сям'я і лад сялянскага жыцця. Сялянства як самая аддаленая ад цэркваў, засяроджаная на гаспадарчых работах частка жыхарства шмат чаго зберагло з язычніцкага светапогляду.

І ў язычніцтве, і ў хрысціянстве светам кіруе найвышэйшая сіла, яна знаходзіцца недзе на небе. Апроч яе існуе мноства сіл меншага рангу, якія валодаюць агнём, маланкай, дажджом, ураджаем і г.д.

У абедзвюх рэлігіях ёсць духі дабра і зла. Акрамя рэальнага свету існуе яшчэ незямны, дзе жывуць душы. Сілы дабра і зла можна схіліць да сябе просьбай, малітвай, заклінаннем, асабліва ж праз ахвяры, запрашэнне на трапезу. Лічылася, што і ў язычніцтве, і ў хрысціянстве бажаство памірае і адраджаецца.

Так наканаваў лёс, каб прыняцце хрысціянства ў 988 г. здзейсніў князь, які крыху раней уславіў сябе спробай адрадзіць моц язычніцтва, зрабіць яго дзяржаўнай рэлігіяй, іерархічна паправіць, паставіўшы вярхоўным богам Перуна. Князем гэтым быў Уладзімір Святаславіч, названы царквой у наступных пакаленнях святым. У 981 г. ці 982 г. па яго загадзе недалёка ад княжага палаца ў Кіеве ўзнеслі на капішчы язычніцкіх багоў. Лаўрэнцьеўскі летапіс пералічвае іх у наступным парадку: Пярун, Хорс, Дажбог, Стрыбог, Сымаргл, Мокаш. У Гусцінаўскім летапісе спіс старадаўніх ідалаў шырэйшы, да названых прылічваюцца яшчэ Лада, Купала, Каляда, Пераплут.

Даследаванне другіх дакументаў старажытнасці, розных павучанняў царквы супраць язычніцкіх перажыткаў, вераванняў і абрадаў дазволіла выявіць і іншых багоў.

У цэлым язычніцкая сістэма багоў выглядае так. Найвышэйшыя: Дзіў, Род, Сварог, Стрыбог, Святавіт. Гэты шэраг імён азначае развіццё вобраза Бога ад агульнага ўсім індаеўрапейскім народам вытоку да розніцы славянскіх племянных уяўленняў пра яго. Далей ідуць народжаныя старэйшым бажаством: Дажбог, Каляда, Ярыла, Сура, Велес — гэта ўсё Сонца пад рознымі назвамі; Пярун — бог грому і маланкі; Купала — бог дастатку і ўраджаю; Вярба — багіня вясны, абуджэння прыроды; Тур — бажаство дзікіх звяроў (па назве самага дужага з іх); Лада — багіня кахання; Цёця (у беларусаў) — багіня асенняга ўраджаю; Парадзіха — жаночы пачатак жыцця; Жыжаль — бог агню; Пераплут — бог весялосці; магчыма, што існаваў бог вайны і магіі зброі Кава (адсюль — каваць, каваль). Яшчэ адным богам вайны, богам бязлітаснага знішчэння ворагаў, мог быць Кара (адсюль — карнікі). У глыбокай старажытнасці існавалі атрады найбольш лютых ваяроў, якія называліся «кара». Сваім татэмам яны лічылі ваўка.

Бліжэй да рэальнага жыцця чалавека дзейнічалі яшчэ духі дабра і зла: Жыцень — жытны дух; Аўсень — дух авечак (лічаць, што так называлі і каляднага казла), а таксама дамавікі, лесавікі, вадзянікі, русалкі, ваўкалакі і іншыя істоты, пра якія будзе прыгадана ніжэй. Далей ішлі багі смерці і замагільнага існавання: Баба-Яга — багіня смерці; Зніч — у беларусаў бог пахавальнага агню.

* * *

Галоўным бажаством усходніх славян пад час хрышчэння лічыўся Пярун. Па беларускіх уяўленнях ён выглядаў сівавалосым волатам, які трымае ў адной руцэ лук (вясёлку), у другой — стрэлы (маланкі). Пярун працуе над зямлёй, тут усё падпарадкавана яго неабмежаванай сіле; той, каго ён пазначае для пакарання, не можа схавацца ад Перуна, забівае ж ён імгненна і страшна. Ды і як было не баяцца той магутнасці, якая расколвала неба, раздзірала яго плоць вогненным разрывам, грукат разбурэння разносіўся над зямлёй на дзесяткі вёрст. Перуна страшыліся і стараліся яго ўлагодзіць, зберагчыся ад яго смяротнай кары. Для гэтага выпрацаваўся спецыяльны сімвал — грамавы знак — круг з абазначэннем шасці радыусаў. У

Язычніцкі ідал на беразе ракі. Летапісная мініяцюра.

беларускіх вёсках яго ставілі на дзвярных шалёўках для захавання хаты ад удару маланкі. Перуну прыносілі крывавыя ахвяры. Ахвярнай жывёлай лічыўся бык, які сімвалізаваў жыццёвую магутнасць.

* * *

Валодаючы забойнымі стрэламі, Пярун ваяваў з іншымі багамі; у прыватнасці, згодна з беларускім павер'ем, ён імкнуўся знішчыць Жыжаля — падземнага бога агню, што высушвае зямлю, падпальвае лясы і балоты. Пярун быў страшным богам і меў вялікую ўладу. Але час яго дзеяння вызначаўся мяжой — з першых да апошніх навальніц (з мая да сярэдзіны жніўня), а потым ён засынаў да наступнай вясны. Пярун меў сваё свята, якое адзначалася 20 ліпеня. (Пазней на язычніцкае свята хрысціянства наклала сваё — Ільіпрарока, на якога і перайшлі многія рысы язычніцкага папярэдніка.) Звяртанне да Перуна было абумоўлена тым, што пад канец ліпеня пачыналася жніво — патрабаваліся пагодлівыя дні, а дажджы нішчылі ўраджай, і сялянам хацелася ўлагодзіць валадара, каб не насылаў непагадзь. Адсюль узнікла і адпаведная абрадпасць з ахвяраваннем.

Пярун — не хлебны бог; хлеб, статак — не яго клопат. Гэта грозны, караючы бог агню і мяча. На язычніцкім Алімпе, які стварыў князь Уладзімір, Пярун, безумоўна, вяршэнстваваў, бо адзіны быў упрыгожаны золатам і срэбрам (сярэбраная галава, залатыя вусы). Уладзімір вылучыў яго як княжацкага бога — заступніка дружыны, ваенных поспехаў. Раней Перуна галоўным бажаством не лічылі, яму нават не ставілі ідалаў. Культ Перуна — справа князя Уладзіміра і яго дзядзькі Дабрыні, які прывёў да пакланення Перуну гарады Ноўгарад і Уладзімір. Прывёў, зразумела, сілай. Усе вядомыя ідалы, у тым ліку і знакаміты Збручанскі, — прысвечаны богу Роду. Вылучэнне Перуна на вяршыню Алімпа тлумачыцца тагачаснай палітыкай Кіева, накіраванай на пашырэнне кіеўскіх зямель, на тэрытарыяльныя прырашчэнні, на падначаленне суседніх плямён.

Вярхоўным бажаством славян быў Род (а яшчэ раней — Дый, Дзіў) — бог неба, прабацька ўсяго — і свету, і багоў, і людзей. Пануючая яго роля праглядваецца і ў славянскай лексіцы: прырода, радзіць, ураджай, парода, радзіма, родны, ражданіца (лёс).

Тымі ж якасцямі, што і Род, надзяляўся Сварог. Яго вытворнымі (дзяцьмі — Сварожычамі) былі сонца і агонь. Бог сонца — Дажбог — выступаў і пад іншымі назвамі, у якіх адчуваліся ці яго тэрытарыяльнае, племянное паходжанне (напрыклад, стэпавае — конны бог Хорс), ці асаблівасці культавага разумення: Ярыла — бог урадлівасці. На Ярыліну ноч прыходзіліся оргіястычныя рытуалы (як высмейвалі рускія хрысціянскія аўтары: «отрокам осквернение, девам растление»). Пра салярны сэнс Ярылы гаворыць тое, што выведзена гэтае імя са старажытнага абазначэння года — рок — поўнага абароту сонца. Гэты бог уяўляўся малайцом у белай вопратцы на белым кані; у адной

Беларускі селянін. Малюнак Я.Матэйкі.

яго руцэ чалавечы чэрап, у другой — пук каласоў. Ярыла на сваім кані ездзіць па нівах, глядзіць жыты; ён бог урадлівасці, апладняе зямлю, ад яго ярыцца зямля, ён дае жыццё хлебу, ураджаю. Яшчэ адзін з яго клопатаў — прыносіць дзяцей. Але Ярыла — і бог пажадлівасці, ён распаляе юр, цялесны запал. У беларусаў на гэтае свята самую прыгожую дзяўчыну апраналі Ярылай, садзілі на каня, вадзілі па вёсцы, вакол яе гулялі і пелі.

Бажаством сонца ў славян, у прыватнасці ў беларусаў, выступала таксама Каляда. Свята гэтае (звалася яшчэ Божык, Божыч) прыходзілася на зімні сонцаварот. Святкуюць яго і сёння. Старыя калядныя песні данеслі да нас мелодыі тысячагадовай даўнасці. Цяжка сказаць, якая назва больш позняя — Каляда ці Божыч. Першым славянскім словам, якое абазначала бога, было Дыў; яно брала пачатак у індаеўрапейскай моўнай агульнасці. Каля тысячагоддзя да новай эры ўвайшло ў славянскія мовы з іранскай — бог. Слова гасподзь было запазычана ў готаў ужо ў новую эру — у III—IV ст. Беларуская калядная абраднасць захавалася амаль што без змен. Трэба адзначыць, зімнія святы адражэння сонца адзначалі ўсе еўрапейскія народы. Наогул, салярныя святкаванні аднолькавыя і па часе і па сутнасці абрадаў па ўсёй Еўропе.

На Беларусі яшчэ ў мінулым стагоддзі захоўваліся магічныя абрады, прызначаныя забяспечыць ураджай наступнага года, менавіта ў калядны час. На каляды па дварах хадзілі калядоўнікі, вадзілі з сабой «казла» ці «казу», «бусла», «мядзведзя». Апраналіся калядоўнікі і ў воўчыя скуры, што абазначала ваўкалакаў — пярэваратняў. Вобраз гэты вельмі старажытны, ён узнік, пэўна, яшчэ ў палеаліт — 30—35 тысяч гадоў назад. Ваўкалак прысутнічае ў беларускіх вераваннях і казках. Стаць ім няцяжка: варта ўваткнуць у пень лязом дагары нож і перакуліцца над ім.

Калядаванне мела распрацаваную абраднасць, і не дарэмна, відаць, сцвярджаюць некаторыя даследчыкі, што раней яно лічылася формай чарадзейства. Калядоўнікамі ў старажытнасці былі вешчуны; гэтым тлумачыцца і прысутнасць у абрадзе «казла». Згодна з вераваннямі і абрадамі, «казёл», «каза» паміралі і адраджаліся, што ў язычніцкім разуменні адпавядала смерці бажаства сонца і яго аднаўленню, наогул аднаўленню жыводзячай сілы. Казёл, каза ў гэтым рытуале выступалі духам ураджаю, жыта, уваскрашэнне яго абяцала ўраджай у новым сонечным годзе. У беларускіх калядках так і пяецца:

Дзе казёл ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе казёл хвастом,
Там жыта кустом.
Дзе казёл нагою,
Там жыта капою.
Дзе казёл рагамі,
Там жыта стагамі.

Ці:

Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе каза не ходзіць,
Там жыта не родзіць.

Казёл прысутнічае і ў абраднасці дажынак, калі з апошняга пука каласоў «завівалі бараду» духу жыта Жыценю — казлападобнай істоце: некалькі каласоў

перавязвалі чырвонай стужкай, побач клалі хлеб-соль, пелі жніўныя песні.

Гуканне добрых духаў складала сутнасць большасці язычніцкіх святкаванняў; асаблівае месца сярод іх займаў вялікдзень — вясенняе свята, прысвечанае сонцу, ажыванню прыроды пасля смерці — зімовага сну. Хрысціянства перакрыла яго пасхай, але на Беларусі ў адрозненне ад іншых славянскіх народаў захаваліся старажытныя абрады, што называюцца валачобнымі. Валачобнікі апраналіся пад «багоў», хадзілі па дварах, пяючы святочныя, рытуальныя песні. Дарункі, якімі гаспадары адплачвалі іх дружыне, у старажытнасці лічыліся, мусіць, ахвяраю, якую ўручалі валачобнікам — вешчунам, што здзяйснялі сувязь з багамі. Якому бажаству пакланяліся на вялікдзень — невядома. Хоць гэта і было свята сонца, але вялікае свяціла з'яўлялася пад рознымі імёнамі, якія адлюстроўвалі яго разнастайныя функцыі ці магчымасці ў розную пару года: узімку — Каляда, на пачатку лета — Ярыла, на летні сонцаварот — Купала. Культ сонца — самы старажытны, ён — прыналежнасць усіх рэлігій, нават самых прымітыўных. Сімвалічным відарысам сонца былі круг, крыж, круг з кропкай, круг з крыжам, круг с шасцю спіцамі (так званае «кола Юпіцера»), кола. Невыпадкова ў беларускіх вёсках, запрашаючы на жыхарства каля хаты бусла — святую птушку, на дрэва, вызначанае пад гняздо, устанаўлівалі кола. Яно, як і грамавы знак, абяцала сядзібе ўдачу і ахову ад Перуна.

Шмат чаго згубілася пад хрысціянскімі напластаваннямі, імёны Сварога і Дажбога выветрыліся з народнай памяці, а Каляда, Купала і некаторыя іншыя засталіся. Гэта тлумачыцца тым, што засталіся ў памяці, у паданні, у спрошчаным абрадзе тыя багі і духі, якія былі мацней звязаны з практычнымі клопатамі насельніцтва, што жыло ад зямлі. Багі ж вышэйшай ступені, неабходныя раней для тлумачэння светабудовы, адышлі пад націскам ваяўнічага хрысціянства і забыліся.

Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мн., 1993.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Паданні мінулых часоў

СОЖ І ДНЯПРО

Сярод глухіх пушчаў, цёмных бароў, на прыгорку, стаялі калісь старыя-старыя харомы вялікага валадара, сівавалосага старога Рыдана. З канца ў канец зямлі слыў Рыдан багацеем з багацеяў, а над усім багаццем славілася схаваная за дванаццацю дзвярамі, дванаццаццю замкамі залатая Рыданава карона. Як адмыкалі замкі, адчынялі дзверы і выносілі тую карону, то, калі на свеце была ноч, яна днём станавілася, а калі была зіма, то перамянялася ў лета — так зіхацелі дарагія каменні на залатой Рыданавай кароне.

Зайздросцілі суседнія валадары і князі Рыдану і пастанавілі здабыць карону. Зазвалі варажбітоў і знахароў і загадалі ім прыдумаць спосаб, каб украсці карону з Рыданавага скарбца.

Варажбіты і знахары думалі тры дні і тры ночы і прыдумалі разрыў-траву, якой, калі дакрануцца замкоў, то самі адчыняцца, ды сон-траву, зярняткамі якой калі пасыпаць, то ўсё жывое наўкола засне. Прыдумаўшы гэта, паслалі зладзеяў красці залатую Рыданаву карону. Тыя, прыйшоўшы пад харомы, сыпнулі сон-зелля, і ўся варта паснула; кранулі разрыў-травой замкоў, і замкі паспадалі. Тады ўзялі яны залатую Рыданаву карону і пусціліся назад.

Устаў раніцой сівы Рыдан, падышоў да акна, ажно глядзь — уся варта покатам спіць, увесь народ у сне беспрабудным валяецца. І зразумеў стары адразу, што няма ў скарбцы ў яго залатой кароны. Падышоў ён тады да звона, ударыў раз, ударыў два, і прачнуліся два Рыданавы сыны: Сож і Дняпро.

Звярнуўся бацька да Дняпра і кажа:

— Вазьмі, сынок, сталёвую зброю, каваны меч і бяжы садамі, лугамі аж да скалістых гор, дагоніш цікунцоў з каронай.

Схапіўся Дняпро і чым хутчэй пабег, а Сож застаўся пры бацьку.

Сеў на залаты пасад стары Рыдан і кажа сыну:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай, ці бяжыць Дняпро?

Прылажыў Сож вуха да зямлі і кажа:

перавязвалі чырвонай стужкай, побач клалі хлеб-соль, пелі жніўныя песні.

Гуканне добрых духаў складала сутнасць большасці язычніцкіх святкаванняў; асаблівае месца сярод іх займаў вялікдзень — вясенняе свята, прысвечанае сонцу, ажыванню прыроды пасля смерці — зімовага сну. Хрысціянства перакрыла яго пасхай, але на Беларусі ў адрозненне ад іншых славянскіх народаў захаваліся старажытныя абрады, што называюцца валачобнымі. Валачобнікі апраналіся пад «багоў», хадзілі па дварах, пяючы святочныя, рытуальныя песні. Дарункі, якімі гаспадары адплачвалі іх дружыне, у старажытнасці лічыліся, мусіць, ахвяраю, якую ўручалі валачобнікам — вешчунам, што здзяйснялі сувязь з багамі. Якому бажаству пакланяліся на вялікдзень — невядома. Хоць гэта і было свята сонца, але вялікае свяціла з'яўлялася пад рознымі імёнамі, якія адлюстроўвалі яго разнастайныя функцыі ці магчымасці ў розную пару года: узімку — Каляда, на пачатку лета — Ярыла, на летні сонцаварот — Купала. Культ сонца — самы старажытны, ён — прыналежнасць усіх рэлігій, нават самых прымітыўных. Сімвалічным відарысам сонца былі круг, крыж, круг з кропкай, круг з крыжам, круг с шасцю спіцамі (так званае «кола Юпіцера»), кола. Невыпадкова ў беларускіх вёсках, запрашаючы на жыхарства каля хаты бусла — святую птушку, на дрэва, вызначанае пад гняздо, устанаўлівалі кола. Яно, як і грамавы знак, абяцала сядзібе ўдачу і ахову ад Перуна.

Шмат чаго згубілася пад хрысціянскімі напластаваннямі, імёны Сварога і Дажбога выветрыліся з народнай памяці, а Каляда, Купала і некаторыя іншыя засталіся. Гэта тлумачыцца тым, што засталіся ў памяці, у паданні, у спрошчаным абрадзе тыя багі і духі, якія былі мацней звязаны з практычнымі клопатамі насельніцтва, што жыло ад зямлі. Багі ж вышэйшай ступені, неабходныя раней для тлумачэння светабудовы, адышлі пад націскам ваяўнічага хрысціянства і забыліся.

Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мн., 1993.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Паданні мінулых часоў

СОЖ І ДНЯПРО

Сярод глухіх пушчаў, цёмных бароў, на прыгорку, стаялі калісь старыя-старыя харомы вялікага валадара, сівавалосага старога Рыдана. З канца ў канец зямлі слыў Рыдан багацеем з багацеяў, а над усім багаццем славілася схаваная за дванаццацю дзвярамі, дванаццаццю замкамі залатая Рыданава карона. Як адмыкалі замкі, адчынялі дзверы і выносілі тую карону, то, калі на свеце была ноч, яна днём станавілася, а калі была зіма, то перамянялася ў лета — так зіхацелі дарагія каменні на залатой Рыданавай кароне.

Зайздросцілі суседнія валадары і князі Рыдану і пастанавілі здабыць карону. Зазвалі варажбітоў і знахароў і загадалі ім прыдумаць спосаб, каб украсці карону з Рыданавага скарбца.

Варажбіты і знахары думалі тры дні і тры ночы і прыдумалі разрыў-траву, якой, калі дакрануцца замкоў, то самі адчыняцца, ды сон-траву, зярняткамі якой калі пасыпаць, то ўсё жывое наўкола засне. Прыдумаўшы гэта, паслалі зладзеяў красці залатую Рыданаву карону. Тыя, прыйшоўшы пад харомы, сыпнулі сон-зелля, і ўся варта паснула; кранулі разрыў-травой замкоў, і замкі паспадалі. Тады ўзялі яны залатую Рыданаву карону і пусціліся назад.

Устаў раніцой сівы Рыдан, падышоў да акна, ажно глядзь — уся варта покатам спіць, увесь народ у сне беспрабудным валяецца. І зразумеў стары адразу, што няма ў скарбцы ў яго залатой кароны. Падышоў ён тады да звона, ударыў раз, ударыў два, і прачнуліся два Рыданавы сыны: Сож і Дняпро.

Звярнуўся бацька да Дняпра і кажа:

— Вазьмі, сынок, сталёвую зброю, каваны меч і бяжы садамі, лугамі аж да скалістых гор, дагоніш цікунцоў з каронай.

Схапіўся Дняпро і чым хутчэй пабег, а Сож застаўся пры бацьку.

Сеў на залаты пасад стары Рыдан і кажа сыну:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай, ці бяжыць Дняпро?

Прылажыў Сож вуха да зямлі і кажа:

— Бегма бяжыць і не стаміўся яшчэ.

І другі раз кажа бацька:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай.

Прылажыў сын вуха да зямлі і кажа:

— Бяжыць, але ўжо цяжка дыхае — шум зямлёй ідзе.

І ў трэці раз сказаў бацька паслухаць сыну. Сын прылажыў вуха да зямлі і кажа:

— Гул зямлёй ідзе і крык вялікі.

Тады ўстаў Рыдан з пасада і кажа:

— Бяжы ж ты, сынку, імхамі, балотамі на падмогу яму, бо сам адзін не праб'ецца ён праз скалістыя горы.

Пусціўся Сож імхамі, балотамі на падмогу брату, а стары бацька застаўся чакаць сыноў.

Доўга чакаў стары. Не дачакаўся, з маркоты вялікай пачаў плакаць:

— Бадай нам, дзеткі мае, слязамі разліцца.

Ды ўлучыў ён такі момант, што сапраўды разліліся слязамі браты і стары бацька: у рэкі ўсе трое змяніліся.

Дняпро плыве садамі ды лугамі, Сож — імхамі ды балотамі, а Рыдан — куды вочы глядзяць.

Дрэва кахання: Легенды, паданні, сказы. Мн., 1980. С. 81—82.

КУРГАН ІРВІДУБА

Па берагах Сажа, Іпуці, Беседзі і Проні ў дрымучых лясах жылі радзімічы. І былі ў іх свае гарады: Радомля з непрыступным замкам, Крычаў з храмам бога Перуна, Прапошаск, вядомы сваімі волатамі, Жалезнікі, слаўны майстрамі кавальскай справы, Гомій, вежы якога былі бачны за шмат вёрст. Жылі яны самастойнымі родамі, і ў кожнага роду быў свой старэйшына — князь. А сярод старэйшын найбольш вядомы і багаты быў гомельскі князь Радзька. Нівам і лясам яго не было канца і краю. Ягоныя статкі пасвіліся на неабсяжных прысожскіх лугах. На дваццацівёсельных княжацкіх чаўнах везлі ў Кіеў і Царград мёд, воск і футра, а ў Чарнігаў, Полацк і Смаленск — крэмень і крэсіва. Але яшчэ больш, чым сваім багаццем, славіўся князь Радзька прыгажуняйдачкой. Прыгажэй за Хоць, так звалі яе, не было нікога ні ў зямлі радзіміцкай, ні ў суседніх землях. Калі Хоць з'яўлялася на гульбішчах, усе, як царыцу, акружалі яе і любаваліся яе прыгажосцю. Цёмна-русыя валасы яе былі заплецены ў доўгую густую касу і ўпрыгожаны рознакаляровымі шаўковымі каснікамі. Ля скроней зіхацелі сярэбраныя сяміпрамянёвыя кольцы. На шыі з бурштыну, сердаліку і горнага крышталю пераліваліся тонкай работы каралі і пацеркі і перавітыя жгутамі срэбра-бронзавыя грыўні. На руках Хоць насіла бранзалеты і пярсцёнкі. Слава аб яе прыгажосці разышлася далёка-далёка. Ад жаніхоў не было адбою. Прыязджалі прасіць яе рукі слаўныя князі радзіміцкія, дрыгавіцкія і крывіцкія. Але ні адзін з іх не запаланіў яе сэрца. Вярталіся яны дадому і, зачараваныя прыгажосцю Хоці, будавалі новыя селішчы, называючы іх у яе гонар: Хоцімск, Хоцімка, Хоцішча, Хоцемля, Хаціславічы, Хаценава, Хацежына, Хацімеж, Хатовічы, Хатомель, Хатоўня, Хатляны...

З усіх жаніхоў толькі двое спадабаліся Хоці. Гэта Ірвідуб з Прапошаска і Лад са Свяцілавіч. Абодва яны былі княжацкімі сынамі, прыгожыя, статныя. Волаты. Кожны з іх не раз хадзіў адзін на адзін на тура, мядзведзя, дзіка... Але Хоць ніяк не магла аддаць перавагу аднаму з іх.

Ірвідуб быў дужэйшы і багацейшы за Лада, але, жывучы ў лясах, ён агрубеў і меў суровае сэрца. Лад жа быў маладзейшы за Ірвідуба і больш вясёлы і таварыскі. Доўга чакалі жаніхі яе адказу і, не дачакаўшыся, заслалі сватоў сваіх. Але князь Радзька, параіўшыся з любімай дачкой, наладзіў спаборніцтва для саперніка ў. За таго, хто акажацца лепшым, павінна была выйсці замуж прыгажуня Хоць.

І прыехалі жаніхі спаборнічаць між сабой. Высокі, зграбны, з блакітнымі вачыма і смуглявым абліччам Лад, апрануты ў белую суконную світку, расшытую на каўняры сінімі шаўковымі ніткамі. На поясе ў яго віселі нож і скураная каліта, дзе ляжалі крэмень, крэсіва і трут. За спінай віселі лук і калчан са стрэламі, а за поясам сякера. Ірвідуб быў ніжэйшага росту, апрануты таксама ў белую суконную світку. Але аздоба была больш прыгожай і багатай: сярэбраныя гузікі, скураны пояс, упрыгожаны сярэбранымі бляхамі з арнаментам.

Хоць павяла сваіх жаніхоў на бераг шырокага Сажа. Выбрала яна два камяні. Меншы падала Ладу, большы — Ірвідубу.

— Ну, пакажыце мне сваю сілу.

Размахнуўся асілак Ірвідуб і шпурнуў свой камень цераз шырокі Сож далёка-далёка. Разбегся і кінуў камень таксама і Лад. Але камень упаў за Сажом каля самай вады.

— Добра, — кажа Хоць, — цяпер пакажыце мне сваю храбрасць. Едзьце на паляванне: ты, Ірвідуб — у Шчакатоўскія лясы, а ты, Лад — у Любенскія, і прывязіце мне адтуль дзічыны.

Паехаў Лад у дрымучыя Любенскія лясы і на другі дзень прывозіць тура, забітага меткай стралой.

Ірвідуб жа паехаў у непраходныя Шчакатоўскія лясы. На другі дзень вяртаецца назад, і вядзе за сабой вялізнага мядзведзя.

— Добра, — кажа Хоць. — Бачу, што ты, Ірвідуб, і дужэйшы і больш харобры, чым Лад, але хачу паглядзець, хто з вас самы меткі стралок.

Стаяў над Сажом магутны стары дуб, ля якога радзімічы маліліся грознаму Перуну. Прывяла Хоць Ірвідуба і Лада да гэтага дуба і паклала яблык на сук, загадаўшы патрапіць у яго, пры тым каб яно не ўпала далоў.

Нацягнуў цеціву Ірвідуб, загудзела калёная страла і пранізала яблык наскрозь, упіўшыся ў дрэва. Уздрыгануўся стары дуб, застагнаў. У Лада ж нібы памуціўся розум ад убачанага. Узяў ён тады свой лук і стрэліў у Ірвідуба. Упаў той, як падкошаны, а Лад уцёк ад страху ў лес. На радзіміцкай зямлі ледзьве не пачалася міжусобіца. Род забойцы Лада выплаціў роду Ірвідуба вялікую грашовую віру.

Для пахавання Ірвідуба на ягонай радзіме высяклі з дуба вялізную калоду і паклалі яе канцамі з усходу на захад. Вакол калоды адмерылі вялікі круг і абвялі яго глыбокай канавай. У крузе наклалі шмат сухога ламачча і спалілі яго, каб зямля для нябожчыка была сухая і лёгкая. На папялішчы ж склалі сасновыя плахі для двух вялізных кастроў. На першы касцёр паклалі Ірвідуба галавою на захад, а на другі — яго любімага каня.

Ірвідуб быў апрануты ў лепшае адзенне. На шыі сярэбраная грыўня, на руках сярэбраныя кольцы. Збоку ля пояса паклалі лук, калчан са стрэламі, сякеру, нож, крэмень і крэсіва, а ля ног паставілі гаршчок з ахвяравальным тлушчам.

І загарэліся пахавальныя кастры. І загаласіла радня Ірвідуба. Калі ж кастры дагарэлі, самая старэйшая з роду ўзяла новую сярэбраную арабскую манету і кінула яе праз галаву ў попел, выгукнуўшы: «Зямля, зямля! Прымі ад нас шэлег і стань нябожчыку пухам...»

І ўсе закрычалі хорам:

«Пухам зямля Ірвідубу! Пухам зямля!»

І ўсе прысутныя пачалі засыпаць прах. Праз два дні на месцы вогнішча ўзнік высокі насып. На трэці дзень пачалі спраўляць трызну. Старэйшыя частаваліся медавухай, успаміналі пра подзвігі Ірвідуба, а маладыя ладзілі гульні, кідалі камяні, стралялі з лука, бегалі наперагонкі. Справіўшы трызну, зноў пачалі насіць яны зямлю. І ў хуткім часе узняўся над Сажом высокі курган. А паданне пра асілка Ірвідуба і прыгажуню Хоць з сівых стагоддзяў плыве, як стары човен, па хвалях часу.

Паводле кн.: Р о м а н о в Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 4. Витебск, 1894.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

У СКЛАДЗЕ ЧАРНІГАЎСКАГА КНЯСТВА

Чарнігаўскае княства, адно з найбольш буйных старажытных рускіх княстваў XI—XIII ст. з цэнтрам у Чарнігаве. Называлася таксама Северскай або Чарнігава-Северскай зямлёй (назва ад племя севяран).

Уключала тэрыторыю левабярэжжа Дняпра да ўпадзення ў яго Дзясны, а таксама басейна Дзясны. У другой палове XI ст. у Чарнігаўскае княства ўвайшлі землі па ніжнім цячэнні Сажа, на левым беразе Дняпра на паўднёвым усходзе ад Рагачова і невялікая тэрыторыя на правым беразе Дняпра. Галоўнымі гарадамі тут былі Гомель, Чачэрск, Рэчыца. Першы князь Чарнігаўскага княства — Мсціслаў Уладзіміравіч (з 1024), пасля яго смерці ў

1036 г. княства трапіла пад уладу Кіева. У канцы XI — першай палове XII ст. з Чарнігаўскага княства вылучыліся Мурамска-Разанскае і Северскае княствы. З пачатку XIII ст. раздрабілася на некалькі ўдзельных княстваў. У першай палове XIII ст. спустошана мангола-татарамі. У сярэдзіне XIV ст. асноўная частка Чарнігаўскага княства ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. У 12 т. Мн., 1974. Т. 11. С. 194.

* * *

Да сярэдзіны XII ст. зямля радзімічаў — Пасожжа — была канчаткова падзелена паміж двума магутнымі суседзямі: поўнач знаходзілася пад уладай смаленскіх князёў, а поўдзень уваходзіў у чарнігаўскія валоданні. Князі саперніча паміж сабой, выступалі то саюзнікамі, то ворагамі. Узаемаадносіны Смаленска і Чарнігава часам даходзілі да лабавога супрацьстаяння, якое канчалася кровапраліццем, захопамі гарадоў і паселішчаў суседа, паланеннем мірнага насельніцтва.

Прычына супрацьстаяння чарнігаўскіх і смаленскіх князёў у 40-я гады XII ст. была больш чым традыцыйнай: канфлікт за першынство і ўплыў у велікакняжацкіх справах.

Скарыстаўшы складаную сітуацыю ў Чарнігаве, смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч здзейсніў у 1142 г. вайсковы паход і, па словах летапісца, «взя около Гомия волость их всю». Гэты запіс некаторыя вучоныя зразумелі як захоп Гомія смалянамі. Аднак летапіс не дае падставы для такога адназначнага сцвярджэння. Трэба меркаваць, што Расціслаў здаволіўся разарэннем багатай Гомійскай акругі. Падзеі 1142 г. не прывялі да рэвізіі тагачасных палітыка-адміністрацыйных рубяжоў, і Гомій застаўся пад уладай Чарнігава.

У сярэдзіне XII ст. горадам правіў чарнігаўскі князь Ізяслаў Давыдавіч. Гомій з'яўляўся яго спадчыннай маёмасцю. Таму, калі Ізяслаў перайшоў на велікакняжацкае праўленне ў Кіеў, Гомій ён утрымаў за сабой, чым выклікаў раздражненне новага чарнігаўскага князя, які марыў атрымаць багаты горад. У выніку княжацкай усобіцы 1158 г. за валоданне кіеўскім «сталом» Ізяслава выгналі са сталіцы. Месцам для сховішча ён абраў Гомій, куды і накіраваўся праз Вышград. Да гаміян прыбыў разам са сваяком князем Святаславам Уладзіміравічам. Тэрмінова адправіў ганцоў за жонкай у Кіеў. Той пашчасціла ўцячы з дапамогай зяця Глеба Юр'евіча — сына Юрыя Далгарукава. Праз некалькі дзён яна прыбыла ў Гомій.

Ізяслаў схаваўся ў Гоміі невыпадкова: горад сярод лясоў меў надзейныя на выпадак аблогі фартэцыі і валодаў дастатковымі матэрыяльнымі і людскімі рэсурсамі, якія дазвалялі выгнаніку працягваць барацьбу за аднаўленне страчанай улады. Менавіта да такой думкі прыводзіць аналіз далейшых падзей, прама ці ўскосна звязаных з Гоміем. Ізяслаў Давыдавіч збірае ў Гоміі верных яму дружыннікаў, здзяйсняе паход у вяціцкія валоданні свайго ворага князя Святаслава Усеваладавіча, дзе захоплівае горад Облаў. У 1160 г. Ізяславу ўдаецца аднавіць і ўладу над стольным Кіевам.

Пасля смерці Ізяслава ў 1161 г. Гомій перайшоў да князя Святаслава Ольгавіча, які прыняў уладу ў Чарнігаве ў 1158 г. Смерць Святаслава (1164) прывяла да таго, што па праву спадчыннасці чарнігаўскі стол заняў яго пляменнік па старэйшым браце Святаслаў Усеваладавіч. Аднак сын нябожчыка Алег Святаславіч таксама прэтэндаваў на Чарнігаў і іншыя гарады чарнігаўскія. Пачуўшы пра канчыну Святаслава Ольгавіча, Святаслаў Усеваладавіч хутка адправіў сваіх пасаднікаў ва ўсе гарады, а ў Гомій — свайго сына. Факт накіравання ў Гомій прадстаўніка княжацкага роду вядомы спецыяліст па гісторыі Чарнігаўскай зямлі А.К.Зай-

цаў тлумачыць як магчымасць з'яўлення ў горадзе аўтаномнага, удзельнага княжацкага праўлення.

Летапісны запіс пра падзеі 1164 г. падкрэслівае істотныя адрозненні Гомія ад іншых чарнігаўскіх гарадоў XII ст. Археалагічныя матэрыялы праясняюць сэнс шматзначных радкоў летапісу: Гомій сапраўды быў у шэрагу буйнейшых і багацейшых цэнтраў княства...

З канца XII ст. назва Гомій амаль на дзвесце гадоў знікае са старонак летапісаў: горад апынуўся ў баку ад асноўных падзей тагачаснай гісторыі, якая «пісалася» ў Кіеве і сталіцах буйнейшых княстваў — Чарнігаве, Полацку, Смаленску, а таксама ў Ноўгарадзе. Тым часам горад працягваў расці і багацець. Да пачатку XIII ст. яго плошча дасягнула 45—50 га, што па мерках усходнеславянскага сярэдневякоўя раўняецца тэрыторыі вельмі значнага гарадскога цэнтра са шматтысячным насельніцтвам (для параўнання: у сёлах звычайна пражывала не больш за 50—100 чалавек).

Чарнігаўскія князі, устрывожаныя ўскладненнем унутрыпалітычнай сітуацыі ў паўднёварускіх землях і асабліва з'яўленнем у стэпах новага ворага — мангол, трымалі ў Гоміі моцны гарнізон прафесійных воінаў-дружыннікаў. Прыватную зброю мелі і шматлікія гараджане, якія былі гатовыя выйсці на гарадскія сцены ў момант варожага нападу. Рэчы ўзбраення, баявой экіпіроўкі вершніка і каня: наканечнікі стрэл, дзідаў, часткі клінковай зброі (мячоў, шабляў), шпоры, цуглі — знойдзены археолагамі як у «арыстакратычным» раёне горада — дзядзінцы, так і ў звычайных дамах на пасадзе і навакольным градзе...

У сярэдзіне XIII ст. паўнакроўнае жыццё Гомія — багатага сярэдневяковага горада — рэзка абарвалася.

Заснаванне старажытнага гарадка. Летапісная мініяцюра.

Пільнае вывучэнне археалагічных знаходак, адзначаныя пры раскопках сляды моцнага пажару ў дзядзінцы і навакольным градзе, які знішчыў драўляную забудову і фартэцыі, пакінутыя ў дамах і майстэрнях каштоўныя рэчы, за якімі так і не прыйшлі іх гаспадары, сведчаць: у гісторыі Гомія адбыліся нейкія трагічныя падзеі. Знойдзеныя ў пласце разбурэння крапаснога вала наканечнікі мангольскіх стрэл не пакідаюць сумненняў, што горад падвергся нападу іншаземных заваёўнікаў. Гаміяне абаранялiся мужна, аднак крэпасць была ўзята штурмам, горад разрабаваны, а большая частка яго жыхароў забіта ці ўзята ў палон.

Дакладную дату захопу летапіснага Гомія вучоныя пакуль не ведаюць. Трэба меркаваць, што гэта здарылася ў 1239 г., калі орды азіяцкіх прышэльцаў разрабавалі і спалілі стольны Чарнігаў. Багаты горад-крэпасць, які стаяў на шляху захопнікаў на поўнач, падзяліў долю шматлікіх паўднёварускіх гарадоў і замкаў. Намёк на трагічныя падзеі ў гісторыі Гомія ўгадваецца ў горкіх словах летапісца пра тое, што лёс Чарнігава напаткаў многія гарады чарнігаўскія.

А.А.Макушнікаў.

Гомійская воласць — уладанне князя Ігара Святаславіча

Герой паэмы «Слова аб палку Ігаравым» Ігар Святаславіч, князь ноўгарад-северскі (з 1178) і чарнігаўскі (1198—1202). 23 красавіка 1185 г. разам з малодшым братам князем трубчэўскім Усеваладам Святаславічам, празваным Буй Турам, сынам Уладзімірам, які княжыў у Пуціўлі, пляменнікам Святаславам Алегавічам, князем рыльскім, і чарнігаўскім ваяводам Ольсцінам Алексічам выступіў у паход супраць полаўцаў. Сумесны паход рускіх войскаў (23 красавіка — 12 мая 1185 г.) закончыўся паражэннем. Князь быў паранены і разам з братам Усеваладам, сынам Уладзімірам і пляменнікам Святаславам трапіў у палоў да хана Канчака, адкуль уцёк праз некаторы час. Гэты паход стаў асновай сюжэта «Слова аб палку Ігаравым», а таксама апісаны ў Іпацьеўскім і Лаўрэнцьеўскім летапісах.

Гомій і Гомійская воласць, як паведамляе Л.Вінаградаў у кнізе «Гомель. Его прошлое и настоящее» (М., 1900), належалі спачатку старэйшаму брату Ігара Алегу Святаславічу, а пасля смерці яго ў 1178 г. князю Ігару Святаславічу, які не раз наязджаў у Гомій і ваколіцы. Гомель належаў яму і калі ён у 1198 г. стаў чарнігаўскім князем.

Беларускі археолаг А.А.Макушнікаў, які ў 1986—1989 гг. вёў раскопкі гомельскага гарадзішча, пасада і вакольнага горада, так апісвае Гомель таго часу: «Гомель сапраўды быў у шэрагу буйнейшых і багацейшых цэнтраў княства. Над горадам узвышаліся грозныя вежы і баявыя сцены дзядзінца, ярусы княжацкага палаца, купалы сабора. Каля падножжа крэпасці, каля самага Сажа, знаходзілася гарадская прыстань, куды з сяленняў воласці, Смаленска, Любечы, Чарнігава, Кіева і нават далёкіх краін прыбывалі чаўны з таварам. На гандлёвай плошчы можна было сустрэць і заморскіх купцоў. Са сталіцы Русі дастаўляліся шкляны посуд, бранзалеты і пярсцёнкі з каляровага шкла, рэчы хрысціянскага культу. З далёкіх візантыйскіх гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я везлі ў Гомій вялікія чырвонагліняныя амфары з віном і аліўкавым алеем. Мясцовыя гандляры прапаноўвалі гасцям мёд, воск, харчовыя прадукты, жывёлу, вырабы гомійскіх майстроў — гліняны і драўляны посуд, металічныя ўпрыгожанні, прылады для ювелірнай і кавальскай справы, гаспадарчы інвентар, тканіны, адзенне».

М.З.Башлакоў.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Малая Русь, у склад якой увахо-
дзіла Гомійская воласць, была далучана да Вялікага княства Літоўскага недзе ў пачатку 1360-х гадоў. Гэтаму спрыяла вядомая перамога вялікага князя Альгерда над татарскімі тыменамі ў бітве пры Жоўтых Водах.

З былога Улуса Джучы зноў выдзеліліся Кіеўскае, Чарнігаўскае, Пераяслаўскае княствы. Але час самастойнага іх існавання ўжо даўно мінуў, і таму новыя землі былі аб'яднаны пад кіраўніцтвам прызначаных з Вільні намеснікаў, сталі вотчынамі членаў велікакняжацкай сям'і. Адміністрацыйным цэнтрам і княжацкай рэзідэнцыяй стаў горад Старадуб.

Першым гаспадаром Старадубскай зямлі стаў унук вялікага князя Гедзіміна навагрудскі, а потым падольскі князь Фёдар Карыятавіч. Праз некаторы час, дакладней у 1392 г., уладу ў

Вільні захапіў пляменнік вялікага князя Альгерда князь Вітаўт. Каб умацаваць свае пазіцыі і пазбегнуць вайны з сынам Альгерда Скіргайлам, ён вырашыў перадаць пад яго ўладу усходнія землі княства разам з тытулам «вялікі князь рускі».

У 1396 г. князь Скіргайла памёр і Старадубскія землі зноў вярнуліся пад уладу Гедзімінавічаў. Новым гаспадаром стаў унук вялікага князя Гедзіміна князь Аляксандр Патрыкеевіч. У час паходу на Маскву (1406) вялікага князя літоўскага Вітаўта ён не прыняў удзел у вайне і тым самым парушыў васальную прысягу. Яго абвінавацілі ў змове з ворагамі княства, і ён быў пазбаўлены ўлады над усходнімі землямі.

Сярод «Спісу рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх...», выдадзеным у 1390 г., зноў упамінаецца назва Гомеля. У тыя далёкія часы гэта быў невялічкі гарадок, насельніцтва якога займалася рамяством і земляробствам. Вакол горада, сярод лясоў і балот, на берагах шматлікіх азёр і рэчак існавалі маленькія вёсачкі. У іх жылі патрыярхальным жыццём жыхары, якія марылі аб шчасці і свабодзе. Але іх надзеям не дадзена было здзейсніцца.

У 1407 г. Гомійская воласць разам з іншымі землямі стала вотчынай Свідрыгайлы Альгердавіча. Блізкія да яго баяры атрымалі ў гомельскіх наваколлях у сваё карыстанне некаторыя вёскі. Акрамя таго, князь Свідрыгайла праводзіў авантурную палітыку і вёў войны за кошт насельніцтва ўсходніх раёнаў з вялікім князем Жыгімонтам Кейстутавічам. Войны вяліся з пераменным поспехам і закончыліся са смерцю князя Свідрыгайлы ў 1452 г.

У 2-й палове XV ст. пагоршыліся адносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскім княствам. З'явіліся перабежчыкі з абодвух бакоў, якія знаходзілі прытулак і кармленне ў суседняй дзяржаве. Так, Гомійская воласць перадаецца ў кармленне ў 1446 г. бароўскаму князю Васілю Яраславічу; у 1452 г. мажайскаму князю Івану Андрэевічу. Пасля смерці Івана Мажайскага яго сын Сямён ездзіў у Вільню прасіць у вотчыннае карыстанне гарады з валасцямі Гомель і Старадуб. Вялікі князь Аляксандр згадзіўся і выдаў указ наступнага зместу: «И мы ему тые города Стародуб и Гомель подтверждаем нашим листом, теж вечно, ему и его детям, подле листу нашего...» (Архив. Мин. Юст. 1897. Т. 6. С. 87.)

У канцы XV — пачатку XVI ст. пачалася барацьба за ўсходнеславянскія землі, якія ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Маскоўскі князь Іван III выкарыстаў чуткі аб ганенні на праваслаўных у Вялікім княстве Літоўскім для развязвання вайны. На яго бок перайшлі чарнігава-северскія князі разам са сваімі валасцямі. Сярод іх быў і Сямён Мажайскі. Вялікае княства Літоўскае апынулася ў цяжкім становішчы і было вымушана прызнаць страту ўсходнеславянскіх зямель разам з гарадамі Бранскам, Гомелем, Старадубам і інш. Падпісанне мірнага пагаднення не прынесла ў Пасожжа мір. Пачаліся двухбаковыя набегі. У ліку абрабаваных вёсак называюцца «...Уваровичи, Телешовичи, Тереничи, Кошелев Лес, Морозовичи, Лапиничи, Скорбовичи, Залесье, Бабичи, Светиловичи, Голодко, Лапичи, Полешане» (Акты Западной России. Т. 2. С. 54. Договорная грамота Московского великого князя Василия III и Польского короля Сигизмунда; 1508 г.)

Вялікае княства Літоўскае не згадзілася са стратай Гомеля і прыкладвала вялікія намаганні для яго вызвалення. Адбываліся ваенныя набегі, аб якіх сведчаць справаздачы тых часоў: «... литовские люди приказчики из Пропойска и из Речицы, не единово приходя, в гомельской волости людей наших иных до смерти побили, а иных головами свели к себе с

женами и с детьми, а животы их много пограбили...» (Сб. Им. Русск. Ист. Общ. Т. 35. С. 758.)

Лёс Гомійскай воласці канчаткова вызначыўся ў 1535 г. у час вайны паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім. Літоўскае войска пад кіраўніцтвам гетмана Юрыя Мікалаевіча Радзівіла нечакана з'явілася каля сцен гомельскага замка і прымусіла яго абаронцаў капітуліраваць. Рускі намеснік воласці Дзмітрый Шчэпін-Абаленскі здаў замак, а потым «некоторые бояре и люди учинили присягу королю Сигизмунду» (Акты Западной России. Т. 1. № 171.)

У 1537 г. быў падпісаны чарговы дагавор аб міры і межах абедзвюх дзяржаў. Воласць была падзелена на дзве часткі. За Вялікім княствам Літоўскім застаўся Гомель і правабярэжжа Сажа, а насупраць горада, па левабярэжжы ракі, Літва атрымала паласу берага працягласцю 30 вёрст.

Падпісаны мір бакі разглядалі як чарговую перадышку. Таму літоўскі ўрад вырашыў умацаваць дзяржаўную мяжу шляхам будаўніцтва ў памежных гарадах моцных замкаў з рэгулярнымі атрадамі войска.

Акрамя таго, прыгранічныя воласці сталі дзяржаўнай уласнасцю — гаспадарчымі дварамі, або староствамі. Так, узніклі Гомельскае, Чачэрскае, Крычаўскае староствы*.

Асноўным насельніцтвам гаспадарчых двароў было цяглае сялянства і служылыя людзі — баярства. Старосты былі кіраўнікамі і іх суду падлягалі як сяляне, так і баяры. Сяляне неслі павіннасць на карысць дзяржаўца ў выглядзе паншчыны, прадастаўлення падвод, касьбы сена і інш. З паншчынай перамяжоўваліся аброкі, якія плаціліся натурай — збожжам, мясам, мёдам, футрам. Часам натуральны аброк пераводзіўся ў грошы. Чацвёртую частку прыбытку — «кварту» — дзяржавец пераводзіў у вялікакняжацкую скарбніцу.

Першым дзяржаўцам у Гомелі быў прызначаны князь Аляксандр Андрэевіч Кашырскі «часова да волі гаспадарскай». Аб іншых старостах Гомійскай воласці Л.Вінаградаў пісаў наступнае: «Князь Кашырскі нядоўга лічыўся дзяржаўцам; праз восем месяцаў яго змяніў князь Васіль Юр'евіч Талачынскі, а таго ў сваю чаргу змяніў Ян Дарашкевіч. Па смерці Дарашкевіча дзяржаўцам у 1543 г. быў Ян Хршчановіч.

6 верасня 1548 г. Гомель з воласцю быў пажалаваны ва ўзнагароду важнаму саноўніку, каралеўскаму пісару Анікею Гарнастаю... З іншых старост вядомы пан Каленіцкі, літоўскі вяльможа Тышкевіч і Міхайла Мышка-Вархоўскі». (Виноградов Л. Гомель. Его прошлое и настоящее. М., 1900. С. 14—15.)

Час з 1537 г. па 1632 г. быў самым мірным у гісторыі сярэдневяковай Гомельшчыны. У 1558—1583 гг. далёка на поўначы адбываліся бітвы Лівонскай вайны; недзе ў Любліне вырашаліся ўмовы ўтварэння Рэчы Паспалітай, і толькі падзеі 1596 г. выклікалі хваляванні ў старостве. У гэтым годзе ў Бярэсці была падпісана царкоўная унія. На ўсходзе краіны быў даволі значны ўплыў праваслаўнай царквы на жыхароў княства і таму насельніцтва аднеслася да яе з асцярогай. Становішча значна пагоршылася пасля гвалтоўнага пераводу жыхароў г. Магілёва ва уніяцтва Іасафатам

* Староства — дзяржаўны маёнтак у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай, які даваў вялікі князь або кароль на часовае карыстанне феадалам у якасці ўзнагароды за службу. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай староствы ўвайшлі ў склад дзяржаўных маёнткаў. Пазней некаторыя з іх былі падараваны рускім дваранам.

Кунцэвічам. Яго палітыку ў адносінах да праваслаўнай царквы падтрымалі і ўлады Гомеля. У горадзе пачалося прымусовае насаджэнне новай рэлігіі. Але старостам Багдану, Андрэю, Паўлу Сапегам, Аляксандру Служку так і не ўдалося вырашыць станоўча гэту праблему. Амаль адзінай іх заслугай перад уніятамі была перадача ў іх карыстанне замкавай Мікалаеўскай царквы (1612).

Больш значнымі былі поспехі ў развіцці гаспадаркі староства. Гэтаму спрыяла тое, што край не ведаў спусташальных войнаў. Староства стала даходнай крыніцай дзяржаўнай казны, аб чым сведчаць матэрыялы «Описи королевской волости, принадлежащей к Гомельскому старосту», складзеныя ў 1640 г. пры Аляксандру Служку.

У Гомійскую воласць уваходзіла 49 населеных пунктаў. 32 вёскі мелі статус гаспадарскіх і ўпраўляліся дзяржаўцам. Сярод іх называюцца Рамановічы, Прыбыткавічы, Маркавічы, Цярэшкавічы, Дзятлавічы, Бабовічы, Воўкавічы, Целяшы, Цярэнічы. Прыватнымі былі Валатава і Сеўрукі, а Плёсы належалі царкве.

У пачатку XVII ст. на гомельскія землі пачаліся набегі казакаў. Першая спроба была зроблена ў 1603 г. казакамі пад кіраўніцтвам атаманаў Касога і Куцковіча. Паход прайшоў для казакаў даволі ўдала, і яны вярнуліся з палонам і багатым скарбам. Але па-сапраўднаму Гомійская воласць адчула лютасць казацкіх загонаў у час вызвалення барацьбы ўкраінскага народа супраць Рэчы Паспалітай (1648—1654). Гетман Багдан Хмяльніцкі накіраваў у межы Літоўскай дзяржавы казацкія атрады з мэтай пашырэння ваенных дзеянняў на суседнія землі.

Вясной 1649 г. каля Гомеля нечакана з'явіўся атрад казакаў на чале з палкоўнікам Нябабам. Сярод жыхароў горада знайшліся здраднікі. Яны дапамаглі захапіць Гомель. Казакі ўчынілі ў Вялікдзень страшэнную разню. І толькі падыходзячыя да воласці літоўскія войскі вымусілі Нябабу пакінуць горад.

У чэрвені 1654 г. атрады казакаў пад камандаваннем швагра Багдана Хмяльніцкага, наказнога атамана Івана Залатарэнкі асадзілі зноў гомельскі замак. Ваюючы на баку Маскоўскай дзяржавы, казакі пустошылі навакольныя землі. «Стоячи под тем Гомелем, — пісаў Залатарэнка цару 15 ліпеня, — посылаем есмя загоны, которые на той стороне Днепра замки и места поимали, и под меч непослушные; а городы, которые нам шкоды прежде чинили, попалить велели...» (Акты Южной и Западной России 1889 г. Т. 14. С. 136—138.)

Горад Гомель абараняла паспалітае рушэнне і замкавы гарнізон пад кіраўніцтвам старосты Рудскага, харунжага Жыжэмскага, палкоўніка Бабраўніцкага і камандзіра наёмнага атрада Міхаіла Сверскага.

Аблога доўжылася восем тыдняў. Казакі абстрэльвалі замак з гармат, адрэзалі падвоз да замка правіянту і ўзарвалі патайны ход да ракі Сож. Гарнізон замка быў вымушаны здацца. Залатарэнка прапанаваў яго абаронцам прынесці прысягу маскоўскаму цару Аляксею Міхайлавічу. Кіраўнікі абароны горада згадзіліся з прапановай, але потым збеглі з палону і накіраваліся ў Стары Быхаў.

За заслугі перад Маскоўскай дзяржавай цар перадаў Гомель у карыстанне брату Івана Залатарэнкі — Васілю. «Гомель с волостью и с уездом и со всеми угодьями ему, его жене и наследникам». (Акты Южной и Западной России. Т. 5. № 6.)

Пажалаванне адбылося ў сакавіку 1661 г., але не магло быць выканана, бо горад вызваліў палкоўнік Дзяніс Мурашка, які знаходзіўся на службе ў Рэчы Паспалітай. Ён на працягу дзесяці гадоў кіраваў староствам, робячы частыя набегі на землі Маларасіі. Вынікам такой палітыкі стала новая

аблога гомельскага замка ў 1666 г. казакамі суседніх валасцей. Але яна закончылася безвынікова, бо казакі атрымалі загад з Масквы з патрабаваннем адступіцца ад горада і не парушаць перамір'я.

У 1667 г. на землі Пасожжа прыйшоў мір. Але ў выніку працяглых войнаў край быў у поўным заняпадзе.

У канцы XVII ст. адбываецца хуткі рост вёсак у старостве. Адсутнасць у ім вялікіх масіваў ворыўнай зямлі прыводзіла да таго, што яны ўзнікалі на месцы раней існуючых і былі невялікімі. На ўскрайках лясоў і балот, асабліва на берагах маленькіх рэк, будуюцца хаты перасяленцаў. Да іх далучаюцца новыя гаспадары і ўзнікаюць вёскі з правамі слабод. Але ўсе яны доўгі час заставаліся маладворнымі.

Новыя вёскі называліся слабодамі. У інвентары Гомельскага старостваў 1681 г. гаворыцца аб 20 сёлах старостваў: Азарычы, Беліца, Бярозцы, Бабовічы, Воўкавічы, Дзям'янавічы, Добруш, Карма, Касцюкоўка, Крупецкая, Лагуны, Маркавічы, Пакалюбічы, Прыбыткавічы, Стараселле, Уцце, Цярэшкавічы і Юркавічы.

Адраджэнне краю затрымала на нейкі час Паўночная вайна 1700—1721 гг. На тэрыторыі старостване адбывалася ваенных дзеянняў, акрамя пераходу рускіх войскаў на чале з А.Меншыкавым ад в. Лясной да г. Палтава. Воінскія рэквізіцыі нанеслі значны ўрон гаспадарцы, але яна працягвала аднаўляцца. Гэтаму спрыяла палітыка гомельскіх старост Васіля, Фамы і Мікалая Красінскіх, Міхаіла Чартарыйскага. Яны накіравалі сваю дзейнасць на стварэнне ўмоў для перасялення новых жыхароў у старостваства.

Аб росце вёсак расказвае інвентар Гомельскага старостваза 1738 г. У ім названы ужо 37 сельскіх паселішчаў (з іх 18 слабод), а ў люстрацыі за 1765 г. азначана такіх вёсак ужо 58. У іх пражывала 2230 сялянскіх сямей.

Рост колькасці сельскіх паселішчаў у Гомельскім старостве паскорыўся асабліва пасля масавага перасялення стараверaў з Расійскай імперыі.

Пачынаючы з канца XVII ст., адна за адной узнікаюць на берагах Сажа, Іпуці, у патайных месцах стараверскія слабоды. Іх жыхары атрымлівалі ад гаспадароў староствазначныя льготы: іх не бралі ў рэкруты, не патрабавалі ў першыя гады выплаты падаткаў і нават не цікавіліся, адкуль яны перасяліліся. Першапачатковая арэнда абмяжоўвалася арэхамі, ягадамі, грыбамі і мёдам. Калі перасяленцы пабудавалі хаты, распрацавалі новыя землі, кошт зямлі павысіўся, і тады з'явіліся кантракты і гвалтоўнае прымацаванне сялян да зямлі.

Побач з вёскамі (слабодамі) узнікаюць скіты, якія былі рэлігійнымі ўстановамі і выконвалі ролю схованак для бежанцаў з Расійскай дзяржавы.

Стараверскія слабоды і скіты ўзнікаюць з дазволу мясцовых памешчыкаў. Аб гэтым сведчаць агентурныя сведкі рускай дзяржавы. «В 1760 году зарубежные раскольники монахи Феодосий и Филарет... показали, что в Польской стороне близ границы Российской, под владением старосты Гомельского кн. Черторыжского имеются поселения великоруссов до 30 слобод, в которых по 50 и 100 и более дворов в каждой слободе есть. Да под владением подкормчего Киевского кн. Казимира Халецкого имеется же слобод за 20, в том числе и Ветка». (Лилеев М.И. Из истории раскола по Ветке и Стародубье 17—18 вв. Вып. 1. Киев, 1895 г. С. 130.)

У сярэдзіне XVIII ст. у старостве заснавана некалькі стараверскіх манастыроў. Перасяленцы садзейнічалі развіццю гаспадаркі. Яны прынеслі ў край новыя тыпы сельскагаспадарчай дзейнасці. З'явілася новая форма землекарыстання — арэнда зямлі. Беднасць зямель кампенсіравалася разбіўкай агародаў і садоў. Развіваецца ган-

даль і рамёствы. З'яўленне новых жыхароў, па сваёй веры праваслаўных хрысціян, некалькі зменшыла наступ каталіцызму і спрыяла ўзнікненню раёна ўсебаковай верацярпімасці.

Другую палову XVIII ст. можна наогул лічыць найбольш спрыяльнай для развіцця гаспадаркі староства. Закончыліся працяглыя войны з Рускай дзяржавай, разважлівая і прадбачлівая палітыка ўрада Рэчы Паспалітай у адносінах да насельніцтва Усходняй Беларусі дала свае вынікі. Гомель з новым дубовым замкам, пабудаваным канцлерам М.Чартарыйскім, па-ранейшаму выконваў ролю цэнтра староства і буйнога апорнага пункта на ўскрайку дзяржавы.

На падставе даследаванняў Е.Р.Раманава вядома, што ў 1772 г. у мястэчку жылі 1692 жыхары. Сярод іх значнае месца займалі праваслаўныя мяшчане — 910 чалавек, іудзеяў было 593 чалавекі, католікаў 67 і 62 жыхары ўваходзілі ў склад сем'яў святароў. Адбываецца ўтварэнне першых мануфактур. Рост вытворчасці спрыяў развіццю гандлю па рацэ Сож з паўднёвымі раёнамі, а праз м. Дабранку гандлёвыя шляхі вялі ў Расійскую імперыю. Адсюль робяцца зразумелыя вытокі багацця староства: «...одной так называемой кварты в казну взымалось (до 1772) 20 752 злотых или в 5 раз больше, чем с соседней Речицы и в 4 раза, чем с Рогачева, и 3832 злотых гиберцы (злот равнялся 60 коп. того времени). Чарторыжский построил новый крепкий дубовый замок с бойницами, углубил рвы и на валах построил деревянные стены или палисады с подъемными мостами...» (Виноградов А. Гомель. Его прошлое и настоящее. М. 1900. С. 23.)

Другой крыніцай выкарыстання свабоднай сілы беззямельных сялян-бабылёў сталі землі сялян-суседзяў. Развіццё таварнай гаспадаркі вяло да павольнага рассялення насельніцтва. У вёсцы з'яўляецца даволі значная колькасць заможных сялян, якія пачынаюць выкарыстоўваць працу батракоў. Рост насельніцтва ў старостве выклікаў рост рамесніцкіх гаспадарак. Знойдзеныя залежы балотнай руды пачалі асвойваць шляхам перадачы іх у карыстанне гаспадарам на правах арэнды або на водкуп. Кіраўнікі дзяржавы садзейнічалі ўзнікненню слабод на месцах перспектыўных залежаў руды. Жалеза выплаўлялася нізкай якасці і ішло на мясцовыя патрэбы. З часам на месцах выплаўкі жалеза ўзніклі вёскі: Рудня-Прыбыткаўская, Рудня-Церуха, Рудня-Дзікалаўка, Рудня-Марымонава, Рудня-Сямёнаўка, Пясочная Буда, Рудня-Жыгальская і іншыя.

Шляхта. XVIII ст. Малюнак Я.Матэйкі.

Вось што піша пра некаторыя з іх у сваёй кнізе Л.М.Максімовіч: «Песочная Буда. Она называется Будою потому, что в древние времена бывали здесь полотняные заводы, которые однако оставлены.

От м. Гомель в 19 верстах востока течет ручей Уть, над ним лежит о 10 дворах деревня, называемая Прибыт-

ковской Рудней. Ручей сей перепружен здесь небольшой плотиной длины 150 саженей, а высотою аршина в 4. На плотине выстроены 4 домны, в коих 12 мехов и 4 молота. Выделывают тут железо ломкое и в самой деревне кузнецы переделывают в крестьянские надобности. Вверх близ плотины есть другой завод маленький, а вниз — множество разных плотин и мучных мельниц». (Максимович Л.М. Новый и полный географический словарь... Т. 2. СПб. 1788. С. 102.)

Значныя змены ў гаспадарцы сведчаць пра тое, што край у 2-й палове XVIII ст. уступіў у стадыю першапачатковага накаплення капіталу і фарміравання капіталістычных адносін.

М.М.Халюшкоў.

Па старонках летапісаў

З ЛЕТАПІСУ РАЧЫНСКАГА

(1398). Коли Витовт пошол у поле з литовъским воиском и побил татар и князеи татарских на имя Хачея а Колобута, а Дмитрея. А тые тры браты татаръские, отчычы и дедичы Подольское земли, и заведали от них отаманы а прыеждчаючы дани в них бирали у-в отаманов с Подольское земли. А князь Корят, брат князя Олькгирдов, держал Новгородок Литовский, а в того Корята чотыры сыны были: князь Юри а князь Александро, а князь Костентин, а князь Федор. И тые княжата Коръятовичы князя Витовтовою помочю и волею пошли у Подольскую землю. А тогды у Подолской земли не было еще ни одного города мурованого а ни деревяного. Тогды тые княжата Корятовичы, пришедшы у Подольскую землю, вошли у прыязнь з отаманы и почали боронити их от татар и дани татаром не почали давати. Непервэи нашли собе тверъжыцу на рецэ на Смотричы, и тут собе город Смотрыч уделали, а в другом местцы на Смотрычы ж город Бокут поставили. А потом, ловечы у ловех, и прыгодилося им стадо оленеи наехати на том месте, где тепер Каменецкое место лежыть. И тые княжата розселилися на том местцу и город змуровали Каменец, а с того вси городы Подольские помуровали и оселилися тые Корятовичы. А потом один брат их отехал до вгорского кроля, князь Костентин, и там умер, а князя Юря волохове убили, а князя Александра татарове убили. И як тых трех братов не стало, ино их четвертыи брат у Литве держал Новгородок, князь Федор, и к тому еще держал Гомеи. И пошодшы з литовским воиском засядеть Подольскую землю к Литве.

З ВАЛЫНСКАГА КАРОТКАГА ЛЕТАПІСУ

В лето 7008 (1500). Месяца маиа 10 день, индикта 3, поставиша митрополита киевьского и всея Руси Иосифа, епископа смоленского. Приеха посол с Цариграда от патриярха Иоакима крестоносець Аврамие и епископ литовьскии, Лука полоцкыи, Кирил луцкии, Васьян туровскыи. Того же лета побра великии князь Иван Василевич московскии городы литовскии не сам, но люди свои посылаше, многыи силы, без вести, и взя грады Мценеск, Любутеск, Брянеск, Трубческ, Новгородок Северьскыи, Радогощь, Почопов, Гомеи, Стародуб, Чернигов. С тыми трема грады предасть князь Семен Ивановичь, изменив целование: Рылеск, Дорогобуж, Мьглин.

З ЕЎРАІНАЎСКАГА ЛЕТАПІСУ

Лета божия нарожения 1535-го. Король Жикгимонт Старыи и милодыи послали гетмана литовскаго пана Юрья Родивила с воиском литовским на московского, а с ним было поляков много ездных и пеших, наемных литовских на пенезях, а над ними был гетман пан Тарновскии и полскии. К тому земля Полская дала на помоч за свои пенези 2000 людеи, а над ними был гетман пан познанскии. И тех всех ляхов пописали в Берести и пошли к Речицы, там ся сьехали с литовским воиском, обнечовалися у Речицы и от Речицы пошли к Гомью, и Гомеи город взяли, и от Гомея пошли к Стародубу, и под Стародубом стояли четыре недели и не могли ево достат. И ездил боячи, ибо людеи в городе прибылых с Москвы и з городов Северских велми много, и стрелба великая. Оли ж ляхове, которые с тем разумели Ербурд с торыщи своими почалися копать под стену городовую, и когда подко-

пали и подложили зелия под стену з бочками, и зажгли кнотом, и выкинуло четыре городни в неделю на сятаго Иванна. В тот час все ляхове кинулис с вороны к тои дире, и москва почала боронитися, и была битва великая над тою дирою. Ту побили москвич и город зажгли, и всех воевод и детеи боярских живых поимали, и воеводу стародубскаго князь Федора Оболенского Овчину взяли, и иных добрых людеи. Детеи боярских гетман полскии Торновскии велел стинати из станов выводя, и стинали их тот де с целыи, и много трупов мертвых стиненых лежаше до тысечи. А иж на переписи было у князя Федора Овчины, что в том городе Стародубе было всех людеи и з женами и з детми 24 000, и все там погибли, много простых людеи и жен и детеи в полон к Литве отведено...

Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т. 35. С. 125, 160, 236.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Гомельскае староства

Дзяржаўнае ўладанне ў складзе Вялікага княства Літоўскага ў XIV—XVIII ст. Цэнтр — мястэчка Гомель. Уваходзіла ў склад гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцей. З 1565 г. у Рэчыцкім павеце Менскага ваяводства. У XVIII ст. уключала Засожскую, Лакуцкую і Прадсожскую воласці. Знаходзілася ў трыманні старостаў (дзяржаўцаў). У «Рэестры рэвізіі гаспадарскай Гомельскай воласці 1560» зафіксавана 50 населеных пунктаў, Гомель і 32 вёскі знаходзіліся пад непасрэдным кіраваннем дзяржаўцы. Вёскі Валатава і Валазковічы былі вотчынамі, а Вага, Кузьмічы, Рылавічы, Сеўрукі і Слабада — «да волі гаспадарскай» у мясцовых баяр. Засоўе, Кальскевічы, Чабатовічы, Чорныя і Хальча былі выслужаны панамі Халецкімі, Дубровічы былі ленам паручніка гомельскай роты Я.Фашча, Прысна і Шэрсцін — ленам гомельскага ротмістра К.Ленскага, Плёсы належалі гомельскай Троіцкай царкве, Сляпня была падаравана віленскаму касцёлу святога Станіслава і ўвайшла ў склад яго маёнтка Стрэшын. Эканамічнае развіццё Гомельскага староства ўскладнялася яго прыгранічным становішчам. У выніку ўзброеных канфліктаў многія населеныя пункты цярпелі разарэнне. У сярэдзіне XVII ст. тэрыторыя староства апынулася ў эпіцэнтры шматгадовых войнаў. У інвентары Гомельскага староства 1681 г. згадана 20 вёсак. У інвентары Гомельскага староства 1738 г. названа 37 сельскіх паселішчаў (з іх 18 слабод), у люстрацыі 1765 г. іх 58. Пасля анексіі Рэчы Паспалітай тэрыторыя Гомельскага староства ўвайшла ў склад Гомельскага павета.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1996. Т. 3. С. 67.

Дакументы сведчаць

З ВОПІСУ ДЗЯРЖАЎНЫХ ВЁСАК ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА ПАВОДЛЕ ІНВЕНТАРА 1640 ГОДА

...В 35 селах (гомейского староства) жили подданые короля или «отчичы». Это были подневольные люди, платившие тягло, 10 селений принадлежале шляхте, 1 — Виленскому капитулу и 1 село было церковным.

Опись не сообщает подробно о селах шляхтецких и принадлежавших духовенству. Но о 35 селений донесения ревизоров подробны касательно границ или качества земли, сенокосов, ловов звериных и рыбных, количество скота и числа лошадей.

На грунте «среднем», но большей части и «добром», меньшею частью только в селениях жило от 10 до 16 работников в каждом, в остальных — число рабочих сил было от 2 до 9. Только в 4-х селениях приходилось по 2 вола на каждого пахаря и по 2 коня на 3 работников. В 9 селах на 3-х работников приходилось по 2 вала и по 2 коня. В остальных 20 селениях на каждого работника приходилась под ярмом по большей части пара из вола и коня. В 2-х селах 1 конь и 1 вол на 2-х работников.

Сеножатьми были относительно богаты только 2 селения, где на штуку рабочего скота приходилось по 10 возов сена. Не свыше 5 возов сена — на штуку скота было в 15 селениях. В остальных селениях число возов колебалось между 2—4.

Только в 8 селениях приходилось на человека по 3 пуда меда. В 11 селах было от 1 до 2 пудов, а в 9 селах пчеловодства вообще не было.

Бобровые гоны были при 25 селах, а рыбные ловы при 17.

У 11 селений в чиншевом пользовании были 36 пустошей и 7 островов да кроме того 29 пустошей принадлежали на чиншевом праве 16 боярам или служкам короля жившими между отчичами.

В Гомейской волости было 3 церкви, не считая замковых в самом городе.

В волости считалось 10 надданий или фундушевых сел, с коих доход шел на церковь. Независимо от этого в 3-х селениях вносилась дань на церковь отдельными тяговыми людьми, например из села Лагуновичи от 2 отчичей шло 5 пудов меда и 60 грошей Гомельской замковай церкви; из села Терешковичи от одного крестьянина шли 4 пуда меда и 100 грошей на церковь св. Николая в Орше.

Постройка шинков и корчем не была дозволена в округе волости. Водку гнали и продавали только в Гомеле, раздробительная продажа допускалась только при гостинницах.

В волости считалось 88 служб и 228 работников. Каждую службу, считая за волоку в 19 1/2 десятины, мы получили для целой волости 1716 десятины пахотных земель, что составляет по 7 1/2 десятин на человека.

Доход податного человека или «отчича» можно определить следующим образом. Полагаем годовую запашку 65 десятин (из 7 1/2 трёхпольного хозяйства), получаем с 2 1/2 десятин ржи — 6 бочек ржи по 24 гроша, что считая грош равным в то время 6 1/4 копейки 9 рублей. 6 бочек овса по 16 грошей — 6 рублей; сена средним числом 7 возов по 8 грошей — 3 руб. 50 коп.; меду 2 пуда по 60 грошей — 7 руб. 50 коп. Итого доход составил 26 рублей. За вычетом повинностей 7 рублей 50 копеек остается 18 рублей 50 копеек.

Мог ли «отчич» на эти деньги существовать безбедно? Цены на предметы необходимости в сельском хозяйстве были следующие: тулуп бараний 3 руб. 50 коп., сермяга 1 руб. 25 коп., локоть сукна крестьянского 20 коп., топор 37 коп., серп 12 коп., хомут кожан. 37 коп., телега 37 коп., лошадь 7 руб. 50 коп., корова 6 руб., свинья 1 руб. 25 коп., овца 80 коп., куры 18 коп.

Фурсов М.В. Исторический очерк Могилевской губернии. Могилев, 1882. С. 11–19.

ГАСПАДАРКІ ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА 1640 ГОДА

д. Романовичи	Иван Ходолович	1 дым*	
	Илья Маркович	1 дым	
	Овтух Ходорович	1 дым	
	Курила Яковлев	1 дым	
	Кондрат Омельянович	1 дым	
	Илья Бобрович	1 дым	
	Стефан Ходорович	1 дым	
	Халимон Маркович	1 дым	
	Иван Ходорович	1 дым	всего 9 д.
д. Головинцы	Матвей Ходотович	1 дым	
	Устин Зарич	1 дым	
	Тронько Зарич	1 дым	
	Иван Губич	1 дым	всего 4 д.
д. Прибытковичи	Илья Сидорович	1 дым	
	Давид Матвеевич	1 дым	
	Тишко Ходорович	1 дым	
	Иван Кисель	1 дым	
	Стефан Сидорович	1 дым	
	Семен Левонович	1 дым	
	Федьковская Аксинья	1 дым	
	Сугрон Яковлевич	1 дым	
	Сенько Федкович	1 дым	всего 9 д.
д. Марковичи	Яков Плошкович	1 дым	
	Антон Федорович	1 дым	

*Дым — сялянская гаспадарка ў Старажытнай Русі і Вялікім княстве Літоўскім.

	Свирид и Жидко Фурсовичи	1 дым	
	Иван Андросович	1 дым	
	Тишко Полуянович	1 дым	
	Андрей Василькович	1 дым	всего 6 д.
д. Терешковичи	Ермак Стефанович	1 дым	
	Косило Яковлевич	1 дым	
	Тит Оксютыч	1 дым	
	Кузьма Кучукович	1 дым	всего 4 д.
д. Дятловичи	Олешко Ходорович	1 дым	всего 1 д.
д. Носовичи	Терех Яковлевич	1 дым	
	Семен Терехович	1 дым	всего 2 д.
д. Бобовичи	Иван Кононович	1 дым	
	Василий Лобкович	1 дым	
	Иван Кобцович	1 дым	
	Федько Красич	1 дым	
	Гаврило Болото	1 дым	всего 6 д.
д. Волковичи	Кузьма Павлович	1 дым	
	Иван Терентьевич	1 дым	
	Опанас Васильевич	1 дым	
	Курило Федькович	1 дым	
	Хотян Мехедович	1 дым	
	Павел Миткович	1 дым	
	Лев Черпакович	1 дым	
	Трохим Прокотвич	1 дым	
	Данила Матвеевич	1 дым	
	Симон Андросович	1 дым	
	Лаврен Ильин	1 дым	
	Кузьма Грицкович	1 дым	всего 12 д.
д. Телеши	Панко Нестерович	1 дым	
	Шупко Ходотович	1 дым	
	Тарас Михайлович	1 дым	
	Карп Соломонович	1 дым	
	Зенко Иванович	1 дым	
	Иван Лукьянович	1 дым	
	Савва Степанович	1 дым	
	Ничипор Иеротович	1 дым	всего 8 д.
д. Тереничи	Грин Малевич	1 дым	
	Тит Корабыч	1 дым	
	Стефан Кисель	1 дым	всего 3 д.

Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 5. СПб. 1853.

З ІНВЕНТАРА ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА 1640 ГОДА

...Село Прибытковичи. Илья Сидорович, Давид Матвеевич, Тишко Ходорович, Иван Кисель, волов осим, кони чотыры, служба; Степан Сидорович, Семен Левонович, Федьковская Оксинья, Супрон Яковлевич и Сенько Федкович, волов пять, кони чотыры, дымов пять, служба; а под каждою службою сеножатей возов патнадцать. В том селе девять службы две грунку среднего, сеножатей возов тринадцать. Повинности того села: в каждый год о Светлом Михаиле, свята римского, мают давати до скарбу господарского с каждое службы по пятнадцать грошей, жита бочку ровную, без верха и нетрясенную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чините з служб двох копа сена, грошей сорока; жита бочки две, овса бочек две, с сеножатей от возов тридцати, от каждого воза сена по четыре пенези, то чинш грошей двенадцаци; дани грошовые здавна платиць коп три, грошей двадцать; за ловы звериные, яко великого, так и малого зверя, и теж куничные, белочные и иные всякие и пташные копа обна, за ловы рыболовничего не платить — их не мают; за бобровые гоны грошей сорок; за ездовщину с каждой службы по шесть грошей, то чинить грошей двенад-

цать. Сумма всех платов и доходов господарских от того села коп семь, грошей четыре, жита бочек две, овса бочек две. Доходы на державца с каждой службы жита пол бочки, овса пол бочки тоеж меры, которую на господаря его милости могли быть задавно, а с каждой службы по два воза сена, або за каждый воз по три грошы, по два возы дров. А окромя того, што на той уставе описано некоторых иных платов и подачок жаданых до господаря его милости, ни на державца своего, ани на врадников земских и надворных давати повинен. Граница того села. От границы Лагуновские лесом Тесным в речку Песочну, Песочною вниз в речку Репенец, Репенцом вниз в речку Посожец. Посожцем вниз через речку Утью в речку Черилощонку, с тое речки в лес Лопатища, с того леса в речку Торчинь, по той речке вниз в речку Пенцику, Пенцикою уверх у болото Кудринское, с того болота через речку Утню у лог Широкий. Того грунту от речки Посожец, до Тесняго удолж миля одна, впоперок от речки Песочны до речки Пониква на три версты. Ловов звериных, окромя переходом, рыбных никоторых нет, гоны бобровые того села в реце Утье от Куплениныдо Мошка обема берегами на три версты.

Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Вильна, 1886. Т. 13. С. 353.

НАЗВЫ РЭЧАК, АЗЁР, БАЛОТ І ЛЯСОЎ, ЯКІЯ ЎПАМІНАЮЦЦА Ў ІНВЕНТАРЫ ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА 1640 ГОДА

Азёры: Арэхавае (в. Цярэшкавічы), Бабыліна (в. Воўкавічы), Баравое, Былін (в. Дзятлавічы), Беразнянка, Вузкае (в. Бабовічы), Гадзючае (каля Навабеліцы), Глушэц (в. Дзятлавічы), Глушынь, Дзедна (в. Воўкавічы), Долшаў, Жазейскае (в. Дзятлавічы), Забоча, Кач (в. Церуха), Казейкава (в. Маркавічы), Казейкава Лужа (в. Цярэшкавічы), Карошч (в. Воўкавічы), Крывое (в. Галавінцы), Одліцкае, Раждзянец (в. Маркавічы), Ростава (в. Воўкавічы), Сецін (в. Лапацін), Хатомля, Халянскае, Хорышча (в. Сеўрукі), Шапар (в. Сеўрукі).

Рэкі: Ачосна, Белічанка (прыток р. Уза), Беразніца, Быстрыца, Валатоўка, Варотная (прыток р. Вуць), Вуць, Гарадзішка, Гарадыўля (в. Раманавічы), Гарношча, Гарыста, Грабаўка (прыток р. Церуха), Дзеўка (в. Воўкавічы), Дзяменка (в. Целяшы), Добрая (в. Маркавічы), Добрыч (прыток р. Сож), Дарожанка (прыток р. Вуць), Дарыстаўля (в. Галавінцы), Ельня (прыток р. Сож), Жарсцвянец, Жукоцін (в. Зябраўка), Зябраўка, Івалка (в. Целяшы), Ізгібля, Іржавец (в. Воўкавічы), Косель, Кроква (Навабеліца), Купліна, Межліка, Нямыльня (в. Краўцоўка), Нярэйша (прыток р. Вуць), Павізна (в. Галавінцы), Падзераг (в. Сеўрукі), Палозец (в. Цярэшкавічы), Паніква, Паперня (в. Маркавічы), Пасожац (в. Прыбыткавічы), Прудоўка, Пянцыка (в. Прыбыткавічы), Пясочна, Радзвінная, Рандоўка (прыток р. Уза), Раянец (в. Прыбыткавічы), Ржаўчык (прыток р. Вуць), Сасонца (в. Бабовічы), Случ (прыток р. Вуць), Стоўпянка (в. Целяшы), Струпіца (в. Воўкавічы), Студзенка (прыток р. Сож), Сялянча (в. Маркавічы), Тарчынь (в. Прыбыткавічы), Ужа (в. Бабовічы), Уліня, Церуха, Цярэха (в.Цярэшкавічы), Чарацянка, Чарылошчанка (в. Прыбыткавічы), Хаўхліца (в. Плёсы), Хохла (в. Бабовічы).

Балоты: Жытоўля (в. Целяшы), Кабылье, Кудрынскае, Машчонае.

Лясы: Ахабніцкі (в. Маркавічы), Ахотнішча (в. Дзятлавічы), Бортцы (в. Маркавічы), Копічава Дуброва (в. Плёсы), Красны Бор (в. Воўкавічы), Саколле (в. Зябраўка).

Заўвагі: 1. Большасць гэтых назваў прыродных аб'ектаў, якія ўпамінаюцца ў інвентары Гомельскага староства 1640 г., цяпер ужо не існуюць.
2. Вёска Воўкавічы (Волкавічы) — цяпер в. Урыцкае.

Падрыхтаваў М.М.Халюшкоў.

З ЗАПІСКІ ДЗЯКА КУНАКОВА ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ ВАЙНЕ БАГДАНА ХМЯЛЬНІЦКАГА З ПОЛЬСКІМІ ВОЙСКАМІ І ДАЛУЧЭННІ ДА ІХ ПАЎСТАЎШЫХ АТРАДАЎ З БЕЛАРУСКІХ ГАРАДОЎ

26 мая 1648 г.

...А к Богдану де Хмелницкому собралися в полки многие люди своевольные и пашенные мужики, побив панов своих в их маетностях, а у панских жон у беременных брюха роспарывали и многое ругательство делали.

А воевали де Богдан Хмельницкий и полковники его и татаровя городы: Чернигов, Стародуб, Белую Церковь, Винницу, Броды, Речицу, Мозырь, Гомель, Бар, Брест-Литовскую, Парцово и иные городы многие подолские и волынские и уезды, которые против их стояли, а ляхов и жидов побивали без милости...

Да полковник де Кривонос приходил к Быхову, а в Быхове сидел в осаде подканцлера литовского Казимера Сапеги капитан Вейс, и от многих приступов от черкас Быхов отсидел, и черкасы де, по многим приступом, от Быхова отошли и стали обозом у карчмы, от Быхова в полумиле; а для выручки де пришол было к Быхову Ян Пац, хоружей литовской, и на черкас у карчмы напал безвестно и черкас будто побил многих...

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 23—24.

З ПІСЬМА ПОЛЬСКАГА ВАЙСКОЎЦА АБ УСТУПЛЕННІ КАЗАКАЎ ПАЛКОЎНІКА НЯБАБЫ Ў ГОМЕЛЬ

28 красавіка 1649 г.

По краткости времени ничего не пишу вам о наших нуждах и голоде; расскажу только, что случилось. Полк е. м. пана гетмана стоит в Речице (куда я отправлен был от своего товарищества посоветоваться о нашем горе, о том, что мы служим, а платы не получаем). В Речицу приведен Фесько, сотник брасинский, который на допросе показал, что в великую субботу полковник Небаба вступил в Гомель с 2500 казаков, что у него наиболее опытной пехоты; у полковника Макеры до 6000 чел., в Лазове и Брагине. В Говнице Напальщиц имеет до 6000 чел. и с ним шляхтич Горностай сотник. Вышеупомянутый сотник с 80 чел. пришел было к Гельману, где был поставлен для защиты ловчий стародубский Соколовский с отрядом из 150 чел. Неприятель хотел напасть ночью, но прежде сам сотник пошел против отряда, отправленного из Речицы для разъездов. Сотника взяли, однако ж с трудом, а другие не дали взять себя и сгорели вместе с избою. Вышеупомянутый сотник оставил было своих людей на острове, но принужден был объявить о них, и туда послано 200 чел. немецкой пехоты, которая перестреляла казаков. Тот же сотник говорил, что хотя Хмельницкий и хотел бы помириться, но не может, ибо чернь так разъярена, что решилась или уничтожить шляхту, или погибнуть; тем временем из полка Речицкого погибло до 100 чел. Мы уже удостоверились, что мужики, уходя, разными способами ловят наших, от чего множество поселян гибнет в лесах и пр.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 38.

З АДПІСКІ РЫЛЬСКАГА ВАЯВОДЫ СОНЦАВА Ў РАЗРАДНЫ ПРЫКАЗ АБ ЖОРСТКАЙ РАСПРАВЕ ВОЙСКА ГЕТМАНА ЯНА РАДЗІВІЛА З КАЗАКАМІ І ЖЫХАРАМІ ЛОЕВА І ЧАЧЭРСКА І НЕДАПУШЧЭННІ ЯГО КАЗАКАМІ Ў г. ГОМЕЛЬ

27 чэрвеня 1649 г.

...Июня же в 24 день приехал в Рылеск из-за рубежа из литовские стороны рылянин, торговый человек, беломесного казака сын Алешка Лагутин, а вестей сказал: был де он для торговли в литовской стороне в городе в Борзне. И видел де он 4 чел. казаков, правые руки по запястья отсечены, а сказывали де те сеченые казаки, что пришол от литовского повету пан Родивил, а с ним де войско его с 30 000 и взял де гор. Чичерск. А их де, казаков, выбрав полтораста человек, отсекли правые руки по запястья, а 50 де человек на колья посажали, а достольных де казаков и их жон и детей порубили всех, да они ж де взяли гор. Лоев. А в Лоеве де сидели казаки, и тех де казаков и их жон и детей порубили всех.

Да они ж де, ляхи, хатели перевазитца р. Днепр, а приходить де было им под гор. Гомель, и казаки де их, ляхов, что пришли от литовского повету на сю сторону Днепра, не перепустят. Да к нему ж де, к Родивилу, сказывают, будет вскоре на помочь пан Сапега со многими людьми. А про короля де польского сказывают, что стоит ныне за Вислою рекою, а сказывают де, что с ним будет многое ж собранья, а бою де у ляхов с черкасы в поле не бывало.

А казаков де в собранье добре много, а которая де сторона будет сильная, ляхи ль черкасом или черкасы ляхом, и я де тово не ведаю...

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 39.

ФРАНЦУЗСКІ ПІСЬМЕННІК ШЭВАЛЬЕ АБ ВЫСТУПЛЕННІ ЖЫХАРОЎ г. ГОМЕЛЯ СУМЕСНА З КАЗАЦКІМІ АТРАДАМІ СУПРАЦЬ ПОЛЬСКІХ ВОЙСКАЎ

1-я палова 1649 г.

...Бунты козаков и русских мужиков с начала сей войны распространились в Литве по тому более, что народ того княжества довольно сходствен был нравами и верою малороссиянам.

Козаки, вступив в оное княжение из 2 сторон, сделали несколько нападений в Полесье, которая сторона наполнена лесами и болотами и принадлежит частию к воеводству Киевскому и Волынскому, и чрез измену полякам тамошних обывателей, кои в козацком походе согласны были, завладели было уже городами Стародубом и Гомлем; однако ж польскаго войска полковники Пац и Волович, а при том кн. Ян Радзивил, генерал жмудский и хетман литовский, с шляхетством оршанским и гарнизоном быховским, т. к. и с другими несколькими полками, пресекли дальнейшее их нападение.

...Зима так, как и перемирие, поудержала брань в Литве и в Польше чрез несколько месяцев, а как скоро Хмельницкий в наступившей весне решился вступить внутрь самого королевства, то и в Литве опять войска собираться начались, ибо он отправил туда с 10 000 чел. Илью Голоту, к которому тотчас бунтующиеся в Литве мужики присоединились.

Сей козацкий генерал Голота вздумал атаковать, во-первых, партию литовской армии, стоящую на контонир—квартирах в Загали, при р. Припети, но радзивилово войско, собравшись, в скорости прогнало его оттуда ж, загнав в болотное место, одержало над ним совершенную победу.

А вышереченный вождь Голота остался убит на месте, на которого место Степан Подобайло прислан от Хмельницкаго тем наставлением, чтоб он стал в ретранжаментах между рр. Днепром и Сожею, что он за прибытием своим к войску в Литву и учинил, а во-первых, зажег гор. Лоев, опасаясь, чтобы то место не могло быть убежищем литовскому войску от той стороны, от которой стоял Гозиевский с некоторыми полками против его.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 42—43.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Князь Аляксандр Меншыкаў у Гомелі

Аляксандр Данілавіч Меншыкаў (1673—1729), вядомы рускі дзяржаўны і ваенны дзеяч, фаварыт і паплечнік Пятра I, пасля перамогі рускіх войскаў над 16-тысячным шведскім корпусам генерала А.Левенгаўпта каля вёскі Лясная (9.10.1708) на Магілёўшчыне, рушыў са сваёй конніцай на Гомель. Тут ён спыніўся і прабыў каля дваццаці дзён, сочачы адсюль за рухам непрыяцеля.

Шведскі кароль Карл XII, спадзеючыся на падтрымку гетмана Мазепы і выступленне Турцыі і крымскага хана супраць Расіі, не пайшоў на Смаленск, а павярнуў на Украіну. Рэшткі корпуса Левенгаўпта (6 тысяч салдат) пераправіліся цераз Сож і пайшлі пад Старадуб на злучэнне з каралём. Меншыкаў жа ўвесь гэты час стаяў у Гомелі і, як сведчыць гісторык М.І.Кастамараў, толькі 1.11.1708 прыбыў у сяло Горск, што на Украіне, непадалёку ад мяжы з Гомельскім староствам (цяпер Шчорсаўскі раён Чарнігаўскай вобласці). Князь Меншыкаў яшчэ не ведаў пра тайную змову гетмана са шведскім каралём і чакаў таго ў Горску на ваенны савет. Але гетман, як вядома, не прыехаў і праз некалькі дзён адкрыта перайшоў на бок шведаў. Тады Меншыкаў захапіў г. Батурын (цяпер Бахмачаўскі раён Чарнігаўскай вобласці) і спаліў яго. Жыхары ж «от мала до велика подвергались поголовному истреблению». (Костомаров Н.И. Мазепа. М., 1992. С. 252.)

М.З.Башлакоў.

Станіслаў Іванавіч Богуш-Сестранцэвіч

Беларускі палітычны і царкоўны дзеяч, вучоны-славіст, пісьменнік. Нарадзіўся 3.9.1731 г. у в. Занкі Ваўкавыскага павета (цяпер Свіслацкі раён). Дзядзька В.І.Дуніна-Марцінкевіча. Вучыўся ва універсітэтах Кёнігсберга, Франкфурта, Амстэрдама, Лондана. Служыў афіцэрам у прускім войску і літоўскай гвардыі. У 1761 г. выйшаў у адстаўку. Быў выхавацелем дзяцей князя Радзівіла. У 1768 г. прызначаны ксяндзом. Апошні гомельскі староста князь Міхаіл Чартарыйскі пабудаваў у Гомелі новы драўляны касцёл. Гомельскі прыход лічыўся даволі багатым. Вось сюды і прыбыў на службу адзін з самых вядомых прапаведнікаў таго часу С.І.Богуш-Сестранцэвіч.

Пасля далучэння ўсходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі быў прызначаны біскупам беларускім. З 1798 г. — мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх касцёлаў Расійскай імперыі. Спрыяў адкрыццю школ і развіццю кнігадрукавання. Заснаваў у Магілёве друкарню. Аўтар твораў «Аб Заходняй Русі», «Гісторыя Таўрыды» (у 2 тамах), «Гісторыя сарматаў і славян» (у 4 тамах), «Граматыка літоўская» (не выдадзена). Член Расійскай акадэміі навук, Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Памёр 13.12.1826 года.

М.З.Башлакоў.

Стараверскія слабоды, скіты і манастыры

У канцы XVII — пачатку XVIII ст. у сувязі з расколам рускай праваслаўнай царквы і ганеннямі на праціўнікаў царкоўнай рэформы з Расійскай дзяржавы ў глухія месцы ўскраіны Расіі і за яе межы сталі ўцякаць прыхільнікі старой веры (стараверы, або раскольнікі). Сярод іх былі сяляне, стральцы, купцы, прадстаўнікі баярства. Тады ж у Гомельскім старостве, якое ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, і пачалі ўзнікаць першыя стараверскія слабоды.

А.І.Жураўлёў у сваёй кнізе, апавядаючы пра раскольнікаў, называе наступныя стараверскія слабоды: Косіцкая, Дубовы Лог, Папсуеўка, Мар'іна, Мільча, Краснае, Грабаўка, Крупец, Буда, Гарадня, Ніўкі, Тарасаўка, Спасаўка. (Журавлев А.И. Полное историческое известие о Древних Стригольниках и новых раскольниках... М., 1795. С. 175.)

Стараверы разыходзіліся па ўсім старостве, займалі неўрадлівую зямлю, што пуставала, апрацоўвалі яе, абжываліся, плацячы арэнду. Уладальнікам зямлі было гэта вельмі выгадна. Стараверам таксама. Бо тут яны жылі ціха і спакойна, за веру іх ніхто не праследаваў.

Прыкладна ў гэты час на Гомельшчыне ўзнікаюць і першыя стараверскія скіты. Паміж скітамі і слабодамі былі даволі значныя адрозненні. Калі слабоды былі ў асноўным земляробчымі паселішчамі, то скіты выконвалі ролю гаспадарчых і рэлігійных устаноў.

Найбольш вядомыя скіты: Тырлаўскі (каля в. Агародня), Епіфанскі (пустыня Епіфань на р. Церуха), Спаскі (недалёка ад Гомеля), Макар'еў, Філатаў, Пахомаў (ва ўрочышчы Чонскі абрыў), Лаўрэнцьеў.

У сярэдзіне XVIII ст. у ваколіцах Гомеля і Веткі ўзніклі і першыя манастыры. Лаўрэнцьеў манастыр заснаваў калужскі выхадзец Лаўрэнцій. Ва ўрочышчы Баравіцы на месцы былога Тырлаўскага скіта манах Анфім заснаваў манастыр. На рацэ Іпуць прапаведнік Макарый заклаў Макар'еўскі манастыр.

Пасля першай і другой «выганкі» стараверaў рускімі войскамі колькасць насельніцтва старостваа значна паменшылася.

Разварот Евангелля (выдадзена ў 1667 г. у Маскве) з Макар'еўскага манастыра.

Скіты былі разбураны і спалены, але манастыры захаваліся.

Пасля далучэння зямель Гомельскага старостваа да Расійскай імперыі ва ўрочышчы Чонскі абрыў узнік яшчэ адзін манастыр, што быў заснаваны ігуменам Феафілактам. Як сведчыць Платон Гаручка, у 1800 г. у манастыры пражывалі іераманахі Іаасаф, Аўраамій, Філіп, іерадыякан Багалеп, 17 манахаў і 3 паслушнікі. Ён жа паведамляе, што ў гомельскіх ваколіцах у 1802 г. існавалі наступныя стараверскія скіты і манастыры:

Лаўрэнцьеў (у 12 вярстах ад Гомеля, ва ўладанні М.П.Румянцава. Манахаў і бяльцоў больш за 100 чалавек);

Іаасафаўскі (у 20 вярстах ад Гомеля, ва ўладанні М.П.Румянцава. Манахаў і бяльцоў больш за 100 чалавек);

Пыханскі (ва ўладанні М.П.Румянцава, у 35 вярстах. Мужчын і жанчын 20 душ);

Тырлаўскі манастыр (ва ўладанні М.П.Румянцава, ад Гомеля ў 7 вярстах. Да 40 чалавек);

жаночы манастыр пры Спасавай слабадзе (побач з Гомелем. Больш за 50 чалавек);

Веткаўскі манастыр (мужчын і жанчын да 100 чалавек);

скіт каля в. Агародня (ад Гомеля ў 35 вярстах, уладанні М.П.Румянцава. Браціі больш за 50 чалавек);

скіт Чыстыя Лужы (у 7 вярстах, уладанні М.П.Румянцава, браціі да 10 чалавек);

пасяленне ў Беліцы. Браціі каля 200 чалавек. (Горючко П.С. Материалы для истории раскола старообрядчества в Могилевской губернии конца XVIII — нач. XIX века. Могилев, 1902.)

М.М.Халюшкоў.

Емяльян Пугачоў на Гомельшчыне

Славуты кіраўнік сялянскай вайны 1773—1775 гг. Емяльян Іванавіч Пугачоў быў на Гомельшчыне двойчы.

Першы раз ён трапіў на Гомельшчыну ў 1764 г., калі па загаду Кацярыны II у Гомельскае староства, якое ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, была накіравана карная экспедыцыя расійскіх войск пад камандаваннем генерал-маёра Я.В.Маслава для так званай другой «выганкі» рускіх стараверaў, што ўцяклі сюды ад праследавання царскіх улад. (Першая «выганка» адбылася ў 1735 г. пры Ганне Іванаўне.)

Яшчэ ў канцы XVII — пачатку XVIII ст. у Гомельскае староства з розных куткоў Расійскай імперыі сцякаліся беглыя раскольнікі, якія сяліліся тут з дазволу польскіх улад і, у прыватнасці, гомельскіх старост Васіля, Фамы і Мікалая Красінскіх. Па палітычных меркаваннях улады ахвотна падтрымлівалі беглых стараверaў і дазвалялі ім сяліцца на свабодных землях.

Стараверы ж у сваю чаргу ахвотна плацілі арэндную плату за зямлю, стваралі свае абшчыны і жылі сваімі інтарэсамі. Так вакол Гомеля і Веткі ўзніклі першыя стараверскія слабоды, скіты, а пазней і манастыры. Стараверы былі добрымі гаспадарамі. Яны будавалі млыны, разводзілі жывёлу, займаліся агародніцтвам, садаводствам, пчалярствам, а таксама рознымі рамёствамі і гандлем. У пачатку XVIII ст. у Гомельскім старостве пражывала больш за 40 тысяч раскольнікаў. Існаванне стараверскіх пасяленняў каля меж Расійскай дзяржавы выклікала незадаволенасць царскіх улад і рускіх памешчыкаў, чые прыгонныя масава ўцякалі сюды. Каб спыніць уцёкі раскольнікаў у Рэч Паспалітую, царскі ўрад вырашыў прыняць меры.

Для «выганкі» асеўшых у слабодах, скітах і манастырах Гомельскага староства беглых людзей камандзіравалі з карнай экспедыцыяй Маслава і атрад данскіх казакаў, сярод якіх быў і Емяльян Пугачоў. Хоць яму, як піша ў сваім рамане пра Пугачова рускі пісьменнік В.Я.Шышкоў, «на гэтую цёмную справу вельмі не хацелася ехаць, але адкупіцца ад паходу беднаму казаку не было чым». Расправа была жорсткая. Стараверскія скіты і слабоды былі разрабаваны і спалены, а каля 20 тысяч раскольнікаў, якія не паспелі ўцячы і схавацца ў іншых месцах Магілёўскай губерні, пад канвоем былі накіраваны ў асноўным на пасяленне ў Сібір.

У другі раз на Гомельшчыну Емяльян Пугачоў трапіў сам. Ухіляючыся ад службы ў казацкім войску, у лютым 1772 г. ён уцёк з-пад арышту ў Польшчу, у добра

Е.Пугачоў атрымлівае пашпарт на Дабранскай мытні. Карціна мясцовага мастака, Дабранскі краязнаўчы музей.

знаёмыя яму мясціны, дзе, нягледзячы на рэпрэсіўныя меры царскіх улад, па-ранейшаму жылі сваім укладам у адбудаваных слабодах і скітах стараверы. Тут ён прабыў амаль 15 тыдняў, пра што сведчыць А.С.Пушкін, які працаваў над матэрыяламі да «Гісторыі Пугачова».

Пражыўшы некалькі месяцаў, Пугачоў з'явіўся на Дабранскі фарпост, дзе, выдаўшы сябе за раскольніка і выхадца з Польшчы і адбыўшы прызначаны каранцін (паколькі лютавала чума), 12 (па н.с. 25) жніўня 1772 г. атрымаў пашпарт для свабоднага пропуску да пастаяннага месца жыхарства на рацэ Іргіз Сімбірскай правінцыі Казанскай губерні, выбранага ім самім.

Менавіта адсюль і пачаўся шлях ад невядомага «раскольніка» Емяльяна, сына Іванава, да славутага кіраўніка пугачоўскага паўстання ў Расійскай імперыі.

М.З.Башлакоў.

З «ГІСТОРЫІ ПУГАЧОВА» А.С.ПУШКІНА

Емельян Пугачев, Зимовейской станицы служилый казак, сын Ивана Михайловича, умершего в давних годах. Он был сорока лет от роду, росту среднего, смугл и худощав; волосы имел темно-русые, бороду черную, небольшую и клином. Верхний зуб был вышибен еще в ребячестве, в кулачном бою. На левом виску имел он белое пятно, а на обеих грудях знаки, оставшиеся после болезни, называемой черною немочью. Он не знал грамоты и крестился по-раскольничьи. Лет тому десять женился он на казачке Софье Недюжиной, от которой имел пятеро детей. В 1770 году был он на службе во второй армии, находился при взятии Бендер и через год отпущен на Дон по причине болезни. Он ездил для излечения в Черкасск. По его возвращении на родину зимовейский атаман спрашивал его на станичном сбору, откуда взял он карюю лошадь, на которой приехал домой? Пугачев отвечал, что купил ее в Таганроге; но казаки, зная его беспутную жизнь, не поверили и послали его взять тому письменное свидетельство. Пугачев уехал. Между тем узнали, что он подговаривал некоторых казаков, поселенных под Таганрогом, бежать за Кубань. Положено было отдать Пугачева в руки правительству. Возвратясь в декабре месяце, он скрывался на своем хуторе, где и был пойман; но успел убежать; скитался месяца три неведомо где; наконец, в великом посту, однажды вечером пришел тайно к своему дому и постучался в окошко. Жена впустила его и дала знать о нем казакам. Пугачев был снова пойман и отправлен под караулом к сыщику, старшине Макарову, в Нижнюю Чирскую станицу, а оттуда в Черкасск. С дороги он бежал опять и с тех пор уже на Дону не являлся. Из показаний самого Пугачева, в конце 1772

года приведенного в Канцелярию дворцовых дел, известно уже было, что после своего побега скрывался он за польской границей, в раскольничьей слободе Ветке; потом взял паспорт с Добрянского форпоста, сказавшись выходцем из Польши, и пробрался на Яик, питаясь милостыней.

* * *

Вследствие сего вышедший из-за польской границы с данным с Добрянского форпосту пашпортом для определения на жительство по реке Иргизу раскольник Емельян Иванов был найден и приведен ко управительским делам выборным Митрофаном Федоровым и Филаретова раскольничьего скита иноком Филаретом и крестьянином Мечетной слободы Степаном Васильевым с товарищи, — оказался подозрителен, бит кнутом; а в допросе показал: что он зимовейский служилый казак Емельян Пугачев, от роду 40 лет; с той станицы бежал великим постом сего 72 года в слободу Ветку за границу, жил там недель 15, явился на Добрянском форпосте, где сказался вышедшим из Польши; и в августе месяце, высидев тут 6 недель в карантине, пришел в Яицк и стоял с неделю у казака Дениса Степанова Пьянова.

П у ш к и н А.С. Собрание сочинений. М., 1981. Т. 7. С. 42, 98.

З РАМАНА В.Я. ШЫШКОВА «ЕМЯЛЬЯН ПУГАЧОЎ»

Правительство решило, наконец, бороться с «утеклецами» крутыми мерами. В 1764 году была сформирована особая карательная экспедиция под начальством генерала Маслова для «выгонки» осевших на Ветке беглых раскольников и прочих бежавших из России людей обиженных.

В эту экспедицию командировали и отряд донских казаков во главе с есаулом Яковлевым. Сюда попал и Емельян Пугачев; на это темное дело ему очень не хотелось ехать, но откупиться от похода бедному казаку было нечем.

Расправа с беглыми на Ветке была на этот раз очень жестокая: раскольничьи скиты и селения, по приказу генерала Маслова, были расхищены, преданы огню, многие беглецы переловлены, угнаны на поселение в Сибирь.

Емельян Пугачев пытливо присматривался к беглецам — этим вольнолюбивым людям, раздумывал о причинах их бегства из России, узнавал тайные тропы за рубеж, на Ветку: авось, когда-нибудь эти запретные пути ему пригодятся.

А пока что он снова возвратился к своему семейству и, живя в бедности, стал заниматься хлебопашеством.

* * *

Бродяжническая жизнь Емельяна Пугачева продолжалась.

В те времена вся Русь кишела беглецами, бродягами. Бежали работные люди от непосильного труда, бежали солдаты от военной службы, длившейся тридцать пять лет, бежали закоренелые каторжники или невинно осужденные, которым грозил кнут, колесование, смерть; бежали купеческие дети, прокутив отцовские или чужие деньги, даже бежали купцы, избавляясь от долговой ямы, тюрьмы, позора; бежал разный люд и сброд, а главное — массами скрывались от своих тиранов-бар крепостные крестьяне.

* * *

Таким бродягой стал и бедный семейный казак Емельян Пугачев. Он лелеял малую мысль — найти притык себе и семейству где-нибудь на вольной земле среди таких же, как он, вольнолюбивых людей, растоптанных жизнью на родине.

* * *

Бродяжья фантазия, лукавая сметка и зовы жизни стали бросать Пугачева туда и сюда. Прошло порядочно времени.

И вот мы снова встречаем его в стародубском раскольничьем скиту у старца Василия. Пугачев признался старцу, что он беглый казак.

— И скажи ты мне, бога для, старец праведный, где бы мне голову приклонить да пожить по тихости. У меня на Дону жена с малыми ребятами.

Угощая странника редькой с квасом, старец сказал:

— А прямой тебе путь, милый мой, в Польшу. Здесь проходит всяких беглых множество, а там они бегут на Ветку, в раскольничьи разоренные скиты. Прожив там малое время, они придут на Добрянский форпост и скажут: «Мы раскольники, выходцы из Польши». А как обнародован указ, данный еще блаженныя памяти

государем Петром Третьим, и по сему указу велено польских выходцев селить кто куда похощет, то и дадут тебе билет на жительство в любое место, кое тебе глянется. Вот застава с нашей местности перейдет подале, я тебя, чадо, выведу.

Вскоре, следуя советам последнего, Пугачев попал на Ветку, затем на Добрянский форпост. Там встретил много беглых, которые по чумному времени выдержали карантин. Беглые научали Пугачева:

— Ты показывай на форпосте, что, мол, в Польше родился и желаешь подаваться на Русь. А ежели скажешь, что родина твоя — Дон, привязку сделают.

Пугачев чрез два дня так и поступил. На вопрос майора Мельникова: «Какой ты человек и как тебя звать-величать?» — он, не тая своего имени, ответил: «Я польский уроженец, зовусь Емельян, Иванов сын, Пугачев».

Он был записан в книгу. Лекарь-старик раздеваться не велел, только заставил три раза перейти через огонь, посмотрел ему в глаза, сказал:

— Опасной болезни нет в тебе, по здоровью не сумнителен.

Просидев шесть недель в карантине, они вдвоем с солдатом Логачевым получили от майора Мельникова паспорт для свободного прохода к месту избранного ими жительства на реке Иргиз, в дворцовую Малыковскую волость.

За время пребывания в карантине Пугачев часто хаживал к добрянским купцам-раскольникам Кожевникову и Крылову. Он даже помогал Кожевникову строить баню и толково исполнял торговые поручения. Видя в Пугачеве смекалистого, с сильной волей человека, Кожевников предлагал ему заняться в Добрянском форпосте торговлей, давал на это денег.

— Благодарствую, — ответил Пугачев, — займовался я и торговым рукомеслом, на Каму с дружком донским казаком ездил, в Котловку село, холсты да деготь скупали с ним, суденышко свое огоревали. Да ни хрена не вышло. Купчишки в Царицыне, дай им бог здоровья, пообманули нас, ну мы с огорченьица кое пропили, кое так прахом пошло. Нет, отец, тяга к торговле не живет во мне...

— Воля твоя, — обидчиво сказал старик Кожевников. — Потчевать можно, неволить грех... Тебе бы, Емельян, атаманом быть. Удали в тебе много, токмо какой-то нескладной ты, непоседливый... Слоняешься, как Каин.

— Я атаманствовать непрочь... Ведь я на турецкой войне — хорунжий. К какому ж войску ты меня в атаманы метишь?

— Про яицких казаков слыхал? Перетырка там идет.

— Слыхал, слыхал... Яицкие казаки нам шабры, соседи.

Тем разговор и кончился.

Получив паспорт, Пугачев пошел к Кожевникову попросить в путь-дорогу милостыню. Тот подал ему рубль да большой хлеб и сказал:

— Кланяйся отцу Филарету, старцу скитскому. Меня, Кожевникова, на Иргизе всякая собака знает. Да, слышь, посовещайся-ка с Филаретом-то про Яик. Он башка-а-а.

Ш и ш к о в В.Я. Емельян Пугачев. Мн., 1984. Кн. 1. С. 235—236, 484—486.

ПАШПАРТ ЕМЯЛЬЯНА ПУГАЧОВА

По указу ея Величества государыни императрицы Екатерины Алексеевны, самодержицы Всероссийской, и прочая, и прочая, и прочая объявитель сего, вышедший из Польши и явившийся собою на Добрянском форпосте веры раскольнической Емельян Иванов сын Пугачев, по желанию ево для житья определен в Казанскую губернию в Симбирскую провинцию к реке Иргизу, которому по тракту чинить свободный пропуск: оскорблений, налогов и притеснений не чинить и давать квартиры по указам.

А по прибытии ему явиться с сим паспортом в Казанской губернии в Симбирской провинциальной канцелярии, тако ж следуя и в протчих провинциальных и городовых канцеляриях являться. Праздно же оному нигде не жить и никому не держать, кроме законной нужды.

Оной же Пугачев при Добрянском форпосте указанный карантин выдержал, в котором находился здоров, и от опасной болезни — по свидетельству лекарскому — явился несумнительным.

А приметами оными: волосы на голове темно-русые, усы и борода — черные с сединой,

от золотухи на левом виске шрам... рост двух аршин с половиной, от роду — 40 лет. При оном, окромя обыкновенного одеяния и обуви, никаких вещей не имеется.

В верность чего дан сей от главного Добрянского форпостного правления за подписанием руки и с приложением печати оной.

В благополучном по чуме месте 1772 года августа 12 дня.

Майор Мельников.

Пограничный лекарь Андрей Томашевский.

При исправлении письменных дел каптенармус Никифор Базанов.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

Войны. Набегі. Спусташэнні

(хроніка падзей у датах і асобах)

1492—1494 — Першая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

1500—1503 — Другая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

1500 — Заняцце войскамі Івана Грознага г. Гомеля.

1503, 4 сакавіка — У выніку перамір'я паміж Вялікім княствам Літоўскім і Вялікім княствам Маскоўскім да Масквы адышло 29 гарадоў і 70 валасцей, у тым ліку і г. Гомель.

1507—1508 — Трэцяя вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

1512—1522 — Чацвёртая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

1529, 1532 — Паходы літоўскіх войскаў на Гомельскую воласць.

1535, лета — Войскі гетмана Вялікага княства Літоўскага Юрыя Радзівіла вызвалілі г. Гомель.

1534—1537 — Пятая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім.

1576 — Захоп рускімі войскамі г. Гомеля. Вяртанне яго ў склад Вялікага княства Літоўскага.

1609—1619 — Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй (Смаленская вайна).

1632—1634 — Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.

1633 — Аблога і штурм г. Гомеля ўкраінскімі казакамі.

1648, лета — аблога г. Гомеля ўкраінскімі казакамі.

1649 — Захоп г. Гомеля казакамі палкоўніка М.Нябабы. Частка насельніцтва была выразана.

1649, чэрвень — Войска на чале з гетманам Янушам Радзівілам вызваліла г. Гомель.

1651, двойчы — Аблога казацкім войскам г. Гомеля.

1654—1667 — Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай.

1654, май—чэрвень — Аблога і захоп казацкім войскам г. Гомеля на чале з наказным гетманам І.Н.Залатарэнкам.

1661, красавік — Антырускае паўстанне ў г. Гомелі. Захоп г. Гомеля Д.Мурашкам.

1684 — Паход казакаў на Гомельскую воласць. Далучэнне сялян гомельскіх сёл да казакаў.

1686, 16 мая — Падпісанне мірнага дагавора («Вечнага міра») паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Гомель з ваколіцамі ў складзе Рэчы Паспалітай.

1700—1721 — Паўночная вайна. Вайна Швецыі з Расіяй і Рэччу Паспалітай. Пад час вайны Беларусь панесла вялікія страты: загінула шмат людзей, многія населеныя пункты былі спалены, разбураны ці разрабаваны.

1735 — Першае выгнанне старавераў расійскімі войскамі з Гомельскага старостава. Больш за 13 тысяч так званых раскольнікаў былі выгнаны ў Сібір.

1764 — Другое выгнанне старавераў з Гомельскага староства. Расійскія войскі выгналі ў Сібір 20 тысяч раскольнікаў.

* * *

ЗАЛАТАРЭНКА Васіль Нічыпаравіч (?—1663), нежынскі палкоўнік (з 1658). Удзельнік руска-польскай вайны 1654—1667 на Беларусі. Летам 1654 атрад В.Н.Залатарэнкі ў складзе казацкага войска пад камандаваннем яго брата І.Н.Залатарэнкі ўдзельнічаў у захопе г. Гомеля і іншых гарадоў Беларусі. Загінуў у барацьбе за гетманскую ўладу.

ЗАЛАТАРЭНКА Іван Нічыпаравіч (?—1655), нежынскі палкоўнік. Наказны гетман украінскага казацкага войска на Беларусі (з 1654) у руска-

польскую вайну. Па загаду Багдана Хмяльніцкага з мая 1654 узначальваў Нежынскі, Чарнігаўскі і Старадубскі палкі (каля 20 тысяч казакаў). Падпарадкоўваўся рускаму камандаванню і наступаў на Беларусь. Заняў Гомель, Рэчыцу, Горваль, Стрэшын, Жлобін, Рагачоў, Чачэрск, Прапойск і іншыя гарады. Загінуў пры штурме крэпасці Стары Быхаў.

МУРАШКА Дзяніс (? – пасля 1671). Узначальваў атрад беларускіх сялян у руска-польскую вайну 1654 – 1667. Арганізаваны ім атрад дзейнічаў разам з казакамі І.Нячая ў ваколіцах Мінска, Ігумена, паліў шляхецкія маёнткі. У 1658 перайшоў на бок Рэчы Паспалітай і змагаўся супраць рускіх войскаў. У 1661 захапіў Гомель і больш дзесяці гадоў кіраваў горадам і ваколіцамі, робячы адсюль набегі на памежныя рускія ўладанні (Старадуб, Сеўск, Ноўгарад-Северскі і інш.).

НЯБАБА Марцін (? – 1651), чарнігаўскі палкоўнік (з 1649), кіраўнік казацкіх атрадаў на Беларусі. У маі 1648 узначаліў сялянскае паўстанне на Чарнігаўшчыне. Кіраваў палком у бітвах пад Піляўцамі, Замосцем, Зборавам. Вясной 1649 (у Велікодную суботу) з 2500 казакамі і гомельскімі сялянамі, што далучыліся да яго, захапіў Гомель. Частка насельніцтва (палякі і яўрэі) была выразана. Аднак у хуткім часе вымушаны быў Гомель пакінуць пад націскам войскаў гетмана літоўскага Януша Радзівіла. Летам 1651 узначаліў 15 тысяч казакаў чарнігаўскага і нежынскага палкоў, што былі пасланы Багданам Хмяльніцкім да Лоеўскіх перапраў, каб не дапусціць войска Януша Радзівіла на Украіну. Казакі пацярпелі паражэнне пад Лоевам. М.Нябаба загінуў у баі.

НЯЧАЙ Іван (? – каля 1672) – казацкі палкоўнік, брат славутага ўкраінскага палкоўніка, паплечніка Багдана Хмяльніцкага Данілы Нячая. Быў зяцем гетмана Б.Хмяльніцкага. Удзельнічаў у руска-польскай вайне 1654 – 1667. Пасля смерці І.Залатарэнкі ўзначаліў казацкае войска на Беларусі (з 1655). Рэзідэнцыю меў пераважна ў Чавусах. Меў тытул «палкоўніка Гомельскага». У 1658 перайшоў на бок Рэчы Паспалітай. У 1669 быў разгромлены ў баях пад Магілёвам і Мсціславам, арыштаваны і высланы ў Табольск. Пасля вайны быў вызвалены і служыў у казацкім войску (з 1667).

ПАЦ Міхал Казімір (1624 – 1682) – вялікі гетман літоўскі (з 1667), ваявода віленскі. Вызначыўся пад час кампаніі Януша Радзівіла супраць казакаў. У чэрвені 1649 прымаў удзел у вызваленні Гомеля.

РАДЗІВІЛ Юрый (1480 – 1541) – сын Мікалая Старога. Падчашы літоўскі (1510 – 1516), ваявода кіеўскі (1511 – 1515), гетман надворны (з 1521), вялікі гетман літоўскі (з 1531). Ваяваў з крымскімі татарамі і Маскоўскай дзяржавай. Перамог у 30 бітвах. Войскі гетмана Ю.Радзівіла вызвалілі Гомель летам 1535 ад рускіх войскаў.

РАДЗІВІЛ Януш (1612 – 1655) – сын Крыштафа Радзівіла. Вялікі гетман літоўскі (з 1654). Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, а таксама за мяжой. Прымаў удзел у вайне Рэчы Паспалітай з Расіяй (Смаленскай вайне) і ў вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1632 – 1634. Вызначыўся ваенным талентам. У чэрвені 1649 вызваліў Гомель ад казакаў М.Нябабы. У ліпені 1649 разграміў пад Лоевам 15-тысячнае войска палкоўніка М.Крычэўскага, у 1651 – войска палкоўніка М.Нябабы і заняў Кіеў.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Ва ўмовах палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай, пад кіраўніцтвам магілёўскага архіепіскапа Георгія Каніскага пачынаецца рух праваслаўнай беларускай шляхты з патрабаваннем права займаць ніжэйшыя пасады, права выбара ў Сойм. Але Сойм з гэтымі пажаданнямі праваслаўных, падтрыманых рускім паслом, не пагадзіўся. Тады для іх падтрымкі ў Польшчу ўводзяцца расійскія войскі. Горад Радом, дзе засядаў Сойм, быў абкружаны войскамі, былі праведзены арышты сярод праціўнікаў Расіі. Пасля гэтага Сойм быў вымушаны зацвердзіць акт свабоднага веравызнання грэчаскай веры і прызнання палітычных і грамадскіх правоў за яе прадстаўнікамі.

У адказ на спробы ўмяшання Расіі ў справы дзяржавы патрыятычна настроеныя колы Польшчы ўтварылі ў мястэчку Бар Падольскай губерні ў 1768 г. канфедэрацыю на чале з Адамам Красінскім. Яны патрабавалі адмены пастаноў 1766 г. Але нечакана для сябе яны сутыкнуліся з паўстаннем украінскіх сялян і казакаў, якія залілі крывёй усю Украіну. Злосць была ўзаемнай. Нянавісць канфедэратаў скіравалася на караля, і яны аб'явілі яго скінутым. Для падтрымкі парадку ў Польшчу былі ўведзены рускія войскі.

Граф П.А.Румянцаў.

У 1772 г. Кацярына II выдала маніфест, які зацвердзіў далучэнне ўсходніх зямель да Расіі. Беручы край пад сваю «царскую руку», яна пісала: «Между 1 и 7 числом наступающего сентября месяца взять в действительное наше владение все под российский скипетр назначенные места и земли и расположить в них на период определенный для того войска таким образом, чтоб в них порядок и тишина внутреннее совершенным извне обеспечением невредимо сохранены, так и должное к новой власти повиновение вкоренено и обнодеженно быть могли». (Указ Кацярыны II ад 16 жніўня 1772 г.)

Адначасова са з'яўленнем рускай адміністрацыі пагоршыўся стан сялянства. Моцная ўлада пачала павялічваць сялянскія павіннасці і душыць усялякае незадавальненне з іх боку. Абвясціўшы беларусаў часткай рускага народа і на падставе барацьбы з «польским влиянием» царскі ўрад праводзіў палітыку выключэння з ужывання беларускай мовы. Таму «...стаўшы мовай сялянства, якое ўжо не мела сваёй інтэлігенцыі, мова беларуская пачала памалу марнець і траціць сваю даўнюю гладкасць і багацце», — пісаў аб гэтым вядомы гісторык В.Ю.Ластоўскі. (Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1920. С. 100.)

У краі адбылося штучнае размежаванне на беларускую мову і культуру ў вёсках і з'яўленне цэнтраў рускай культуры ў гарадах і мястэчках, дзе знаходзілася рускае чыноўніцтва і кіраўніцтва паветам.

Важным мерапрыемствам новай улады стала фарміраванне тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры Магілёўскай губерні. Па царскім указе ад 1772 г. пачалася падрыхтоўчая работа па падзелу губерні на 12 паветаў. Але ажыццявіць гэты праект у губерні было даволі складана. Справа ў тым, што мястэчка Гомель, якое лічылася да 1777 г. павятовым цэнтрам Рагачоўскай правінцыі, было падаравана ва ўласнае карыстанне фельдмаршалу П.А.Румянцаву. Акрамя таго, у губерні не хапала яшчэ двух гарадоў, якія маглі б выконваць ролю павятовых. Выхад знайшлі ў тым, што было вырашана будаваць тры новыя гарады: Клімавічы, Бабінавічы і Беліцу. Будаўніцтва г. Беліца значна паўплывала на жыццё краю, разбудзіла яго патрыярхальную цішыню і спрыяла развіццю гаспадаркі. У 1781 г. павятовыя гарады Магілёўскага намесніцтва атрымалі гербы. Сярод іх была і Беліца. Ва ўказе пісалася: «Высочайше утвержден 16 августа 1781 года городу Белицку Могилевского наместничества. В верхней части щита, часть герба Могилевского: в золотом поле, половина Российского герба. В нижнем — лежащая спокойно рысь, в голубом поле: ибо таковых зверей в окрестностях сего города весьма много».

Частку насельніцтва горада склалі перасяленцы-стараверы. Магчымасць перайсці ў мяшчанства стварала для іх умовы займацца агародніцтвам, адыходным промыслам, гандлем, рамяством. Даволі нязначную частку жыхароў склалі рускія чыноўнікі, святары, вайскоўцы і члены іх сямей. У канцы XVIII ст. у горадзе пражывала 817 праваслаўных і 762 яўрэі. Да яго былі прыпісаны і 34 двараніны, 7 чыноўнікаў, 37 ваеннаслужачых, 9 купцоў. Такім чынам, у пачатку XIX ст. Беліца атрымала ўсе рысы павятовага горада

і ператварылася ў значны рамесна-гандлёвы цэнтр.

Цяжкае становішча ў гаспадарцы не дазволіла завяршыць будаўніцтва горада Беліца. Калі на будаўніцтва мястэчка Гомель яго ўладальнікі трацілі грошы, атрыманыя ад прыгонных сялян, то дзяржаўная маёмасць павятовага цэнтра заставалася ў вельмі цяжкім стане. Генерал-губернатар Хаванскі ў 1833 г. просіць аб пераносе цэнтра павета ў мястэчка Гомель і, абгрунтоўваючы гэту просьбу, піша: «...в городе Белица казенная принадлежность составляет 1 каменный провиантский магазин, из земских повинностей деревянная почтовая станция и гостиница, из коих последняя приходит уже в ветхость, присутственные места и острог помещаются в обывательских домах... самый городок не имеет у себя ни торгов, ни ярмарок, жители оного одни занимаются хлебопашеством, другие снискивают себе пропитание и заработок в отдаленных местах». (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 7384. Воп. 1. Спр. 537. Л. 294, 296.)

Але просьба засталася без увагі. І толькі тады, калі гаспадаром мястэчка Гомель стаў І.Ф.Паскевіч, было прынята станоўчае рашэнне. У 1851 г. магілёўскаму землямеру Амістонаву даецца загад аб складанні адзінага плана Беліцы і Гомеля. У 1852 г. выходзіць указ аб прызначэнні Гомеля павятовым горадам, а Беліцы — яго прадмесцем. Гомелю быў перададзены і герб, які раней належаў Беліцы. Адначасова адбылося і перайменаванне павета ў Гомельскі.

Далучэнне беларускіх зямель да Расіі патрабавала ад яе правядзення выверанай унутранай палітыкі. Нягледзячы на адзіны лёс, розныя раёны Рэчы Паспалітай захоўвалі свае асаблівасці. Раёны заходняй і цэнтральнай часткі Беларусі былі гістарычна звязаны з Наваградкам, Полацкам і Вільняй. Іх шляхта і буйныя магнаты імкнуліся да Польшчы. Зусім іншае становішча было на ўсходзе дзяржавы. Віцебская і Магілёўская губерні ў часы шматлікіх войнаў XVI—XVII ст. страцілі вялікую колькасць карэннага насельніцтва і былі заселены выхадцамі з Рускай дзяржавы. Не былі для іх нечаканасцю і прыгонніцкія парадкі. Перадача зямель усходняй Беларусі рускім памешчыкам яшчэ больш умацавала ў краі прарускія настроі. Да таго ж шляхецкія вольнасці былі перашкодай да аб'яднання ў барацьбе за свабоду. Ды і самой такой ідэі сярод народаў розных рэлігійных канфесій, розных па паходжанні, розных па інтарэсах не магло існаваць. Калі дадаць да гэтага амаль поўную адсутнасць беларускай, нават апалячанай інтэлігенцыі на ўсходзе з яе ідэямі барацьбы за незалежнасць, культуру і, наогул, за Радзіму, то становіцца зразумелым, чаму паўстанні 1794, 1830, 1863 гадоў не атрымалі ва ўсходніх раёнах падтрымкі.

Палітыка рускага царызму ва ўсходніх беларускіх губернях набыла ў пачатку XIX ст. русіфікацыйны характар. Поўнымі гаспадарамі зямель сталі рускія памешчыкі; першымі раёнамі, дзе было адменена дзеянне Літоўскага Статута ў 1831 г., былі тыя ж губерні. Адсюль пачалася барацьба з уніятамі праз закрыццё іх цэркваў.

Новыя гаспадары нанеслі за гады панавання гаспадарцы краю вялізныя страты «...бо з'явіўся велікарускі памешчык, выпадковы чалавек у краі, які выпадкова атрымаў маёнтак як узнагароду за службу або купіў яго па нізкай цане. Такі памешчык наязджаў у маёнтак, наспех яго эксплуатаваў, высякаў спрадвечныя лясы, закладваў і перазакладваў і пры зручным выпадку прадаваў ці проста кідаў маёнтак крэдыторам. Гэта — памешчык-чыноўнік, які не расставаўся са службай у сталіцы, а зрэдку і ў мясцовым цэнтры, не меў ні сродкаў, ні жадання падтрымліваць сельскагаспадарчую

культуру. Такім, амаль без выключэння, быў велікарускі памешчык на Беларусі, што павінен быў скласці процівагу польскай культуры». (Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 283.)

Вырашыўшы задачу далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі, урад пачаў праводзіць у краі неабходныя рэформы. Каланізацыя новых зямель была немагчыма без пракладкі зручных шляхоў зносін. Таму па ініцыятыве графа З.Р.Чарнышова пачынаецца пракладка і ўдасканаленне дарог.

Адначасова з будаўніцтвам шляхоў урад вывучае магчымасць перавозак гаспадарчых грузаў па рэках. Дняпроўскія парогі перашкаджалі суднаходству па рацэ Днепр, але на сярэднім цячэнні Дняпро і Сож мелі ўсе ўмовы для гаспадарчага іх выкарыстання. Была зроблена спроба пачаць суднаходства па рацэ Іпуць. Пры Кацярыне II на раку была «...снаряжена особая комиссия для очистки её от повалившегося леса. В 30—40 гг. были попытки сплава леса и постройки барок. Но судоходству мешала Добрушская плотина и рыбные затоны». (Географический статистич. словарь. Ред. Семенов П.П. М., 1865. С. 345.) Таму галоўнай рачной артэрыяй краю заставаўся Сож.

У пачатку XIX ст. апісанне жыцця Беліцкага павета зрабіў Еўдакім Зяблоўскі. Яно цікава ў тым плане, што дапамагае зрабіць параўнанне змен, якія адбыліся ў краі на працягу першых дзесяцігоддзяў новай улады. «Белица, или Новая Белица на левой стороне Днепра (Сожа) при устьи Ипути с пристанью; расстояние от Москвы 719 1/2, от Санкт-Петербурга 1043 1/2, а от губернского города 197 1/2 вёрст. Городом учинена при открытии наместничества из села (Ст. Белица.— Авт.). Между жителями есть евреи. Повет сей простирается на полдень до Черниговской губернии; с Восточной стороны также примыкает к сей губернии, а запад к Минской. По середине его протекает река Сож, принимающий здесь Беседь, Ипуть, Утоть и Терюху с левой, Узу с правой, а западные пределы орошает Днепр. К нему причислены следующие местечки: Старая Белица, приписной город; Гомель — местечко на правом берегу Сожа с земельным укреплением. Имеет 3 греческие и 1 украинскую церковь и духовное училище. В нем бывает 2 годовые ярмарки, и жители здесь нарочито зажиточны. Монастыри-пустоши: Лаврентьев, Иосафова, Терлова. Заводы: 1 железный и 2 стекольных и 1 парусная фабрика». (Зябловский Е. Землеописание Российской империи для всех сословий. СПб., 1810. Ч. 6. С. 111.)

Але далучэнне беларускіх зямель да Расіі прывяло да карэннай ломкі жыцця насельніцтва. Кіраўніцтва дзяржавы пачало ўводзіць у краі прыгонніцкія парадкі. На зямлі Беліцкага павета з'явіліся ўладанні рускіх памешчыкаў. Адным з буйнейшых землеўладальнікаў павета стаў П.А.Румянцаў.

Усталяванне новых умоў жыцця, прыгонніцкіх парадкаў мела ў краі свае асаблівасці. Ішло збядненне сялян, аб чым сведчаць дакументы: «Крестьяне большей частью в течение восьми месяцев года находятся на продовольствии помещиков, которые отпускают на каждую душу мужского и женского пола зрелого общества по 2 чарца, а малолетним по 1 чарцу муки в неделю. Обыкновенно пища зажиточных людей: кислый хлеб из муки, часто смешанной с ячменем, овсом и гречихой, борщ со свининой, бараниной или салом, картофель, солонина, молоко, горох и пр. Пища же бедных состоит из пресного хлеба, спеченного наскоро из муки, из картофеля и болтушки из того или другого без всякой заправы, нередко даже и без соли». (Военно-статистический обзор Российской империи. СПб., 1848. Т. 8. С. 39.)

Прыгонніцкая сістэма гаспадаркі, якая трымалася на прымітыўных пры-

ладах працы, прыгонная залежнасць чалавека прынеслі ў край голад і галечу. На працягу ўсяго XIX ст. галоўным пытаннем заставалася пытанне аб зямлі, як адзіным сродку дабрабыту гаспадароў. Амаль ва ўсіх афіцыйных справаздачах уздымалася пытанне аб яе выкарыстанні.

Насельніцтва слабод Беліцкага павета да далучэння да Расіі карысталася свабодамі і амаль не ведала прыгоннага права. Таму царыца і больш прадбачлівыя ўрадавыя чыноўнікі не маглі рэзка іх абмежаваць. У краі захавалася частка ранейшых правоў і асабістых свабод. Былі пацверджаны правы беларускіх землеўладальнікаў. Захавалі частку сваіх правоў мяшчане і шляхта. Шляхта, якая раней была незалежнай, а потым была перададзена рускім памешчыкам, захавала права выбара месца жыхарства. Яна з дазволу гаспадара магла перасяляцца ў іншыя вёскі ці фальваркі. Аналіз дакументаў канца XVIII — пачатку XIX ст. паказвае вялікую міграцыю жыхароў вёсак. Гэта неяк стрымлівала незадаволенасць шляхты.

Культуру гаспадарання ў Беліцкім павеце вырашыў арганізаваць граф Мікалай Пятровіч Румянцаў, якому належалі ў павеце амаль усе вёскі. Будучы канцлер Расіі пачаў укараняць у сваіх маёнтках новую сістэму вотчыннай гаспадаркі. Усе свае вёскі ён падпарадкаваў фальваркам. Гэта дапамагло ў кіраванні і спецыялізацыі гаспадаркі. У фальварку ўсе сяляне былі падзелены на прыгонных і цяглых. Прыгонныя сяляне выкарыстоўваліся на работах па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны і ў рамеснай вытворчасці на прадпрыемствах фальваркаў.

Так, у вёсцы Студзёная Вада аднавіў сваю дзейнасць шкляны завод. У 1809 г. завод меў 32 горны для плаўкі шкла. На заводзе працавалі 72 чалавекі, у тым ліку 14 наёмных і 58 прыгонных сялян. На заводзе выраблена рознага посуду 150 тысяч штук.

Для задавальнення патрэб у цэгле граф арганізаваў дзейнасць цагельных заводаў у в. Якубоўка, Каранёўскай і Вылеўскай эканоміях і ў мястэчку Гомель. У вёсцы Дзікалаўка наладжана выплаўка чугуна з балотнай руды. «...Для приращивания экономических доходов построена в м. Гомель полотняная фабрика. Ткачество производится на 31 станке. В 1828 году выделано: пестряды 10 кусков, полотна на манер голландского 110 кусков, мухояру 15 кусков. Число людей: мастер — 1, мастеровых из крестьян 42 человека». (Часопіс «Мануфактура и торговля». 1828. С. 138.)

Мікалай Пятровіч Румянцаў робіць спробу павысіць даходнасць зямлі. Ён клапоціцца аб прысылцы з-за мяжы высакасортнага насення, авечак іспанскай пароды, разбівае ў эканоміях сады. Для стварэння ўзорнай гаспадаркі запрашае нямецкіх каланістаў і выдзяляе ім зямлю для «экономических полей» каля вёскі Валатава.

Праведзеныя рэформы далі станоўчыя вынікі. Значна павялічыліся даходы фальваркаў. Граф выкарыстоўваў атрыманыя сродкі на будаўніцтва ў сваім мястэчку, на адукацыю, медыцыну, мецэнацтва.

Пасля яго смерці ў 1826 г. маёнтак пачынае прыходзіць у заняпад. Брат Румянцава, Сяргей Пятровіч, які стаў гаспадаром маёнтка, залажыў яго ў дзяржаўны банк. Сядзібны банк быў прададзены фельдмаршалу І.Ф.Паскевічу. Праз некалькі гадоў апошні стаў гаспадаром і фальваркаў, перададзеных яму за заслугі перад Расіяй царом Мікалаем І.

Спробы ўрада і асобных прадстаўнікоў пануючых колаў, накіраваныя на развіццё гаспадаркі, далі месцамі станоўчыя вынікі. Але, тым не менш, прамысловасць прыходзіла ў заняпад.

Аб гэтым нам расказваюць дакументы і справаздачы:

«Промышленность в руках евреев.

Дрова, смола и деготь — почти единственный промысел, и то очень часто только как особенное одолжение экономике, и тогда с условием сбыта только в самой экономии, конечно, поставляемым с целью удержания крестьян от разорительного посещения местечек, но иногда по ограниченности платы обращающем эту промышленность просто в работу. Вину такого безжизненного, убийственного состояния крестьян, помещики, которым они составляют $^{2}/_{3}$ всего населения губернии, прежде всего должно приписать самим владельцам, не исполняющим своего призвания». (З рапарта старэйшага саветніка Бюргера Міністру унутраных спраў аб стане гаспадаркі Магілёўскай губерні ад 14 жніўня 1852 г.)

Тэму заняпада гаспадаркі працягвае справаздача, змешчаная ў «Ваенна-статыстычным аглядзе Расійскай імперыі»: «Здесь мельницы, по большей части дурного устройства, лесопилен мало, отчего доски распиливаются ручными пилами или колются топорами, отчего теряется время и истребляется много леса. Судоходство по рекам совершенно ничтожно, хотя оно могло бы принести чрезвычайную пользу, особенно при частых неурожаях, когда без подвоза хлеба по рекам Днепр и Сож голод был бы еще ощутительнее и пагубнее». (Военно-статистический обзор Российской империи. СПб., 1848. Т. 8. С. 11.)

Да гэтага трэба дадаць, што толькі ў 1823 г. на рацэ Дняпро з'явіўся першы параход. У 1835 г. па рэках плавалі 2 параходы і ўзнікла першая рачная кампанія. У 1861 г. па Сажы прайшло 276 суднаў і 236 плытоў лесу. Было пабудавана дзевяць прыстаней.

У 1850 г. праз павет была пракладзена шаша Пецярбург — Кіеў. Будаўніцтва было вельмі дарагое, па 12 227 рублёў у разліку на адну вярсту. Шаша прайшла ў баку ад шляху, пракладзенага раней, і патрабавала дадатковых затрат. На будаўніцтве выкарыстоўвалася праца залежных сялян. Яны засыпалі балоты, будавалі насыпы і масты. Пасля будаўніцтва шашы працягваў сваё існаванне і ранейшы Кацярынінскі шлях. Але ён змяніў сваё прызначэнне. Яго сталі выкарыстоўваць для прагону жывёлы з паўднёвых губерняў Расіі.

М.М.Халюшкоў.

Ланкастэрскія школы на Гомельшчыне

ЛАНКАСТЭРСКІЯ школы — пачатковыя школы ўзаемнага навучання ўзніклі ў канцы XVIII — 1-й палавіне XIX ст. Яны працавалі па сістэме англійскага педагога Дж.Ланкастэра (1771 — 1838), якая прадугледжвала навучанне дзяцей і дарослых больш падрыхтаванымі вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка. Замест падручнікаў выкарыстоўвалі разнастайны дыдактычны матэрыял. Вучні хутка засвойвалі навыкі чытання, пісьма і лічэння, але не атрымлівалі грунтоўнай сістэмы ведаў.

Першая ланкастэрская школа ў Беларусі і Расійскай імперыі пачала працаваць у Гомелі ў маёнтку графа М.П.Румянцава. Навучанне вёў англійскі педагог Джэймс Артур Герд, які прыехаў у Гомель летам 1817 г. Усе вучні былі падзелены на пяць аддзяленняў па прафесіях (кавалі, калёснікі, краўцы, сталяры, шаўцы) і займаліся ў доме графа М.П.Румянцава. Адначасова вялося будаўніцтва школы, якая была адкрыта 8 лістапада 1819 г. Школа была пабудавана па праекце Джона Кларка і мела галоўны корпус і дапаможныя будынкі. Школа праіснавала нядоўга. Пасля смерці графа яна была зачынена. Акрамя школы ў г. Гомелі былі адкрыты ланкастэрскія школы ў наступных населеных пунктах Беліцкага павета: Васільеўка, Вуць, Добруш, Карма, Кузьмінічы, Маркавічы, Пакалюбічы, Перарост.

М.З.Башлакоў.

Гісторыя з геаграфіяй: Беліца Старая і Новая

... Калі пры першым падзеле Рэчы Паспалітай усходняя частка Беларусі апынулася пад уладай расійскіх цароў, Гомель 22 ліпеня 1773 г. прызначылі цэнтрам аднайменнага павета Рагачоўскага намесніцтва. Неўзабаве пасля таго, як Гомель з вакольцамі ў 1775 г. быў падараваны Кацярынай II генерал-фельдмаршалу П.А.Румянцаву, было вырашана перанесці месцазнаходжанне павятовых улад. Выбар прыйшоўся на сяло Беліца, амаль што ў дваццаці вярстах на паўночны захад ад Гомеля. Адпаведна і павет з 22 сакавіка 1777 г. пачаў звацца Беліцкім.

Нягледзячы на тое, што беларускае сяло нечакана атрымала статус горада, ніякіх рыс сапраўднага гарадскога аблічча ў ім, вядома ж, не было. Царскі ўказ — адна справа, іншая справа — рэаліі беларускага сялянскага жыцця, якія відавочна супрацьстаялі волі расійскай імператрыцы і мала адпавядалі патрабаванням стварэння прыдатных умоў для размяшчэння павятовай адміністрацыі. Таму, каб прыдаць Беліцы гарадское аблічча, у 1778 г. з'явіўся генеральны план яе забудовы, распрацаваны ў духу архітэктурных ідэй класіцызму. Паводле плана горад павінен быў уяўляць велізарны прамавугольнік 600 на 1000 метраў з 52 аднолькавых жылых кварталаў, абнесеных земляным валам. На плошчы ў цэнтры планавалася будаўніцтва павятовага праўлення, гасцінага двара, праваслаўнага і каталіцкага храмаў. Дзве меншыя плошчы 100 на 200 метраў прызначаліся для будаўніцтва гандлёвых радоў з хлебным і мясным магазінамі і гаўптвахты з саляным магазінам. План вызначаўся строгай сіметрыяй: усе вуліцы павінны былі быць аднолькавай шырыні — 20 метраў. Наступны план, складзены ў 1783—1785 гг., амаль цалкам паўтараў план 1778 года, але з той розніцай, што дадаткова побач з горадам планавалася будаўніцтва цэйхгауза — вясковага склада.

Але зноў царскім планам не пашанцавала. Маштабнае будаўніцтва новага горада так і не пачалося. Можна меркаваць, што на яго ўлады не знайшлі сродкаў, што не вельмі здзіўляе, улічваючы катастрафічны недахоп грошай у дзяржаўнай казне на працягу ўсёй эпохі Кацярыны II, што было выклікана шматлікімі войнамі і раскошай імператарскага двара. З другога боку, даволі хутка выявілася не вельмі зручнае геаграфічнае месцазнаходжанне Беліцы: у далечыні ад асноўных шляхоў зносін і, у першую чаргу — воднага, па рацэ Сож, цэнтральнай транспартнай артэрыі павета.

16 жніўня 1781 г. Беліца як павятовы горад атрымала герб: шчыт з выявай рысі на блакітным ніжнім полі і двухгаловым царскім арлом — на верхнім. І гэта мала што змяніла ў лёсе Беліцы. Яна па-ранейшаму заставалася тыповым беларускім сялом.

Паводле Генеральнага межавання Магілёўскага намесніцтва, якое праводзілася ў 1783—1785 гг., горад Беліца меў толькі 847 дзесяцін забудаванай зямлі. У межах гарадскога выгану мелася 756 дзесяцін лесу, які з 1785 г. атрымаў па трохгадоваму кантракту павятовы прадвадзіцель Ф.О.Фашч.

Таму царскія ўлады сышліся на кампрамісным варыянце — зноў перанесці павятовы цэнтр амаль што на папярэдняе

Сядзібны дом у Старой Беліцы. Канец XVIII — 1-я палова XIX ст.

месца, толькі ўжо не ў Гомель, а на супраць-леглы бераг ракі Сож. Царскімі ўказамі ад 28 сакавіка і 7 кастрычніка 1785 г. Кацярына II пастанавіла купіць за 28 тысяч рублёў срэбрам мясцовасць пад назвай Шчокат з вёскай Сеўрукі (140 рэвізскіх душ і 4594 дзесяцін зямлі) у памешчыкаў Кільчэўскіх і Усціновіча. Новы горад належала называць «по-прежнему Белицы».

Нечакана выявілася, што на купленай зямлі ва ўрочышчы Чонка стаіць стараверскі манастыр. 20 манахаў з 1775 г. арандавалі ў памешчыкаў 100 дзесяцін і плацілі першыя 10 гадоў па 20, наступныя гады — па 40 рублёў у год. Каб захаваць зямлю, яны прасілі Сенат перадаць ім яе ў вечную арэнду. Землеўладкаванне горада выканалі адміністрацыйным шляхам. 10 сакавіка 1791 г. Сенат даручыў магілёўскаму намесніку П.Пасеку перасяліць 302 сялян сяла Прыбыткі і вёскі Дуянаўка на пасад Новай Беліцы і пакінуць 3440 дзесяцін на аброкавым становішчы па просьбе сялян.

Вось так і адбылася складаная гісторыя з паветам, які змяняў то назву, то месца павятовага горада.

Усё вышэйзгаданае — даныя з новай манаграфіі «Генеральнае межаванне на Беларусі» вядомага беларускага гісторыка Яўгена Анішчанкі (Мінск, 1996. С. 44—45). Дзякуючы ёй і з'явілася магчымасць па-новаму прачытаць адну са старонак нашай беларускай гісторыі, старонку, якая па збегу абставін увяла ў зман шматлікіх даследчыкаў.

Пачалася гэтая гістарычная блытаніна яшчэ ў мінулым стагоддзі. У шырока вядомым выданні «Живописная Россия» (1882 г., рэпрынтнае перавыданне: Мінск, 1993 г.) знакаміты даследчык беларуска-літоўскай даўніны Адам Кіркор пазначыў: «Тут же при Гомеле находилось селение Белица, которое в 1777 г. обращено в уездный город; а 1852 г. он оставлен заштатным, а уездным городом назначен Гомель» (С. 427). Далей — болей. Грунтоўны нарыс Л.Вінаградава «Гомель. Его прошлое и настоящее. 1142—1900 гг.» (1900 г., рэпрынтнае перавыданне: Гомель, 1992 г.) адносіць заснаванне Беліцы да 1777 г., а яе назву выводзіць быццам бы ад працякаўшага паблізу ручая Беліца (С. 26—27).

Не пазбеглі памылак і такія вядомыя гісторыкі архітэктуры, як У.Чантурыя і І.Слюнькова. У іх фундаментальных манаграфіях паміж той Беліцай, што была цэнтрам аднайменнага павета з 1777 г., і той, будаўніцтва якой па двух указах Кацярыны II пачалося ў 1785 г., ніякай розніцы не робіцца. Таму і атрымліваецца, напрыклад, атаясамленне планаў забудовы як Беліцы — першапачатковага цэнтра аднайменнага павета, якія так і не былі здзейснены (планы 1778 і 1783—1785 гг.), так і планаў рэальна існаваўшай забудовы Беліцы на левым баку Сажа пач. XIX ст. і 1824 г. (Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII — середины XVIII в. Мн., 1992. С. 83, 101—104). Між тым, усё гэта — праект для двух розных населеных пунктаў. У тым, дзе ж знаходзілася Беліца, якая дала назву павету, лёгка пераканацца, зірнуўшы на «Атлас Магілёўскага намесніцтва 1777 г.», змешчаны на старонке 66 той жа кнігі. На ім пазначаны Гомель, ёсць і Беліца, толькі не побач, а на даволі значнай адлегласці на захад, як зусім асобны населены пункт.

Памылковы пункт гледжання, калі матэрыялы, што датычаць адной Беліцы, прыпісваюцца іншай — сучаснаму гарадскому раёну Гомеля, зафіксаваны і ў салідных энцыклапедычных выданнях, напрыклад, у даведніку «Гомель» (выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя». Мінск, 1991 г.). Хаця ў адпаведным артыкуле і згадваецца сучаснае сяло Старая Беліца, дзе знаходзілася з 1777 г. адміністрацыя Беліцкага павета, усё роўна, план яе забудовы і герб прыпісваюцца Беліцы на ўзбярэжжы Сажа.

Якія ж высновы можна зрабіць з гэтага гістарычнага дэтэктыва? Сучасная Навабеліца, безумоўна, можа ганарыцца, што яна калісьці была павятовым горадам, якому ў адміністрацыйным сэнсе падпарадкоўваўся і Гомель. Але пры гэтым не трэба забываць і тую вёску, якая дала назву павету, імя — Навабеліцы, герб — Гомелю.

А.Кіштымаў.
Палессе. 1997. № 2. С. 144—146.

Гомельскі павет

Існаваў у 1773—77 у Рагачоўскай правінцыі, у 1852—1919 у Магілёўскай, у 1919—26 у Гомельскай губерні. Утвораны пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай. 22.7.1773 імператрыца Кацярына II зацвердзіла даклад Сената, паводле якога мястэчка Гомель прызначалася павятовым цэнтрам. 22.3.1777 у сувязі з пераносам цэнтра павета ў мястэчка Беліца (з 1786 у Новай Беліцы) пераўтвораны ў Беліцкі павет. Адноўлены пасля пераносу цэнтра павета з Новай Беліцы зноў у Гомель. Плошча павета 4719,4 кв. вёрст, насельніцтва 224,7 тысяч чалавек (1897). У 1917 у склад павета ўваходзіла 18 валасцей: Веткаўская, Вылеўская, Гомельская, Дзятлавіцкая, Кармянская, Маркавіцкая, Насовіцкая, Пакалюбіцкая, Палеская, Папоўская, Покацкая, Рудзянецкая, Рэчкаўская, Стараюркавіцкая, Стаўбунская, Целяшоўская, Чабатовіцкая, Чырванабудская; гарады Ветка, Новая Беліца; мястэчкі: Антонаўка, Добруш, Карма, Насовічы, Уваравічы, Хальч, Шарсцін. З 26.4.1919 Гомельскі павет у складзе Гомельскай губерні. У 1919 у Гомельскі павет перададзена з Рагачоўскага павета Дудзіцкая воласць, у складзе павета створана Мухаедаўская воласць, у 1922 — Добрушская воласць. У 1923 Папоўская воласць перайменавана ў Ленінскую воласць. 9.5.1923 да Гомельскага павета далучаны Чачэрская воласць і частка Нядойскай воласці Рагачоўскага павета, а частка Чабатовіцкай воласці перададзена ў склад Рагачоўскага павета. Воласці, якія засталіся ў складзе павета, у 1923 узбуйнены, іх налічвалася 9: Веткаўская, Гомельская, Добрушская, Дзятлавіцкая, Насовіцкая, Свяцілавіцкая, Уваравіцкая, Чачэрская і Чырванабудская. Павет скасаваны 8.12.1926, яго тэрыторыя перададзена ў склад Беларускай ССР, дзе была ўключана ў склад Гомельскай акругі.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1996. Т. 3. С. 75.

Славуты Кацярынінскі шлях

У 1773 г. пасля далучэння Кацярынай II усходніх беларускіх зямель да Расійскай імперыі па ініцыятыве першага беларускага намесніка генерал-фельдмаршала Захара Рыгоравіча Чарнышова прыступілі да пракладкі шляхоў і пабудовы паштовых станцый. Старыя дарогі не адпавядалі новым умовам: былі вельмі вузкія, звілістыя і не зусім прыгодныя для праезду. Землямеры абазначылі накірункі і шырыню новых шляхоў, якія ў сваю чаргу падзяляліся на паштовыя, губернскія і павятовыя.

Шырыня паштовых шляхоў складала 8 сажняў[1]. Узбоч дарогі былі пракапаны для сцёку вады канавы шырынёй 2 аршыны[2] і глыбінёй 1 аршын. Праз кожныя 700 сажняў былі пастаўлены верставыя слупы, а праз кожныя 7 вёрст цагляныя піраміды, якія абазначалі мілі. На новых дарогах былі пабудаваны паштовыя станцыі, праз рэкі зроблены масты, а праз балоты пракладзены плаціны і гаці. Абапал шляхоў былі пасаджаны бярозы (да 2 тысяч дрэў на кожную вярсту).

Асноўны паштовы шлях спачатку пралёг праз Пскоў — Клясціцы — Полацк — Сянно — Абольцы — Коханава — Шклоў — Магілёў — Рагачоў — Чачэрск — Гомель — Пясочная Буда — Дабранка — Чарнігаў.

У 1782 г. пачалі пракладваць новую дарогу Пецярбург — Кіеў праз Вялікія Лукі — Усвяты — Сураж — Віцебск. У Магілёўскай губерні на гэтым шляху былі пабудаваны дваццаць паштовых станцый, асноўныя з якіх былі Бабінавічы — Орша — Шклоў — Магілёў — Прапойск — Чачэрск — Касцюкоўка — Беліца — Пясочная Буда — Дабранка (першая станцыя Чарнігаўскай губерні).

Праз Беліцкі павет акрамя Пецярбургска-Кіеўскага шляху былі пракладзены яшчэ тры шляхі: Беліца — Лоеў (і далей праз Чарнобыль на Кіеў), Беліца — Навазыбкаў і Навазыбкаў — Дабранка.

У 1850 г. праз Гомельскі павет была пракладзена адна з галоўных магістралей Расійскай імперыі — шаша Пецярбург — Кіеў. Кацярынінскі шлях застаўся збоку, і яго значэнне зменшылася.

Кацярынінскі шлях увайшоў у гісторыю. Колькі слынных людзей праехала гэтым шляхам! І старыя бярозы, што былі пасаджаны тады ўзбоч дарогі, і цяпер яшчэ дзе-нідзе шапочуць, шумяць, нібы апавядаюць нам пра тыя далёкія часы...

М.З.Башлакоў.

[1]Сажань — мера даўжыні (2,134 м).
[2]Аршын — мера даўжыні (0,71 м).

Іх шлях пралёг праз Гомельскі павет

ГЕОРГІЙ КАНІСКІ

Вядомы рэлігійны дзеяч, філосаф, украінскі і беларускі пісьменнік Г.Каніскі (1717—1795) нарадзіўся ў Нежыне Чарнігаўскай губерні. Пасля заканчэння Кіеўскай духоўнай акадэміі (1744) працаваў у акадэміі выкладчыкам. Вучань Ф.Пракаповіча і настаўнік Г.Скаварады. З 1745 г. прафесар філасофіі і паэтыкі. З 1751 г. рэктар акадэміі. У 1755 г. пераехаў у Магілёў, дзе ў 1757 г. заснаваў Магілёўскую духоўную семінарыю. З 1783 г. беларускі архіепіскап.

Аўтар курсаў паэтыкі «Правілы паэтычнага мастацтва», гістарычных запісак пра Магілёўскую епархію, інтэрмедый, вершаў, казанняў, прамоў. Яго творчасць высока ацэньваў А.С.Пушкін (1835). У 1755 г. праязджаў праз Гомельскі павет, калі накіроўваўся ў Магілёў, а таксама прыязджаў у Гомель.

ПАВЕЛ I

Павел I (1754—1801), расійскі імператар (1796—1801), сын Пятра III і Кацярыны II. Праязджаў праз Гомель у 1781 г., калі быў яшчэ цэсарэвічам. 19 лістапада 1781 г. разам са сваёй жонкай Марыяй Фёдараўнай ён начаваў у палацы фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага.

ДЖОН КЛАРК

Англійскі архітэктар і будаўнік Дж.Кларк жыў і працаваў у Гомелі ў 1800—1826 гг. Паводле яго праектаў пабудаваны Петрапаўлаўскі сабор (1809—1824), бакавыя флігелі Гомельскага палаца (пазней былі перабудаваны), гандлёвыя рады з вежай (1818, не захаваліся), касцёл (1818—1822, не захаваўся), цэрквы ў вёсках Валатава (1801—1805), Маркавічы (1822) і іншыя помнікі архітэктуры.

ІВАН ІВАНАВІЧ ГРЫГАРОВІЧ

Беларускі святар, гісторык, археограф, мовазнаўца І.І.Грыгаровіч (1792—1852) нарадзіўся ў Прапойску (цяпер Слаўгарад) Магілёўскай губерні. Яго бацька быў праваслаўным святаром у Рагачове, Прапойску і Гомелі.

Пасля заканчэння Магілёўскай духоўнай семінарыі (1811) працаваў выкладчыкам у духоўным вучылішчы ў Магілёве. У 1815 г. паступіў у Пецярбургскую духоўную акадэмію, пасля заканчэння якой (1819) вярнуўся ў Гомель, дзе быў протаірэем у саборы.

У 1829 г. пераведзены ў Віцебск. З 1831 г. жыў і працаваў у Пецярбургу.

Менавіта ў Гомелі падрыхтаваны «Беларуская іерархія» (1824) і зборнік «Беларускі архіў» (1824). Падрыхтаваў і выдаў творы Г.Каніскага (1835). Працаваў над «Слоўнікам беларускіх гаворак», які не паспеў закончыць.

ЗАРЫЯН ЯКАЎЛЕВІЧ ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ

Беларускі, польскі і ўкраінскі археолаг, фальклярыст і этнограф Даленга-Хадакоўскі (сапраўднае імя Адам Чарноцкі, 1784—1825) нарадзіўся ў в. Гайна Мінскага ваяводства (цяпер Лагойскі раён). Пасля заканчэння Слуцкага вучылішча (1801) працаваў хатнім настаўнікам у Мінску, затым адвакатам. Быў гарачым прыхільнікам Напалеона, за што быў арыштаваны і заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць (1809). Служыў радавым салдатам у рускім войску ў Омску і Бабруйску, адкуль уцёк і хаваўся пад псеўданімам Даленга-Хадакоўскі.

Падарожнічаў па Польшчы, Галіцыі, Палессі. У 1818—1820 гг. даследаваў гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, Тураве, каля Брэста, Гомеля і Магілёва.

Аўтар шматлікіх прац, у тым ліку: «Пра славяншчыну да хрысціянства» (1818), «Даследаванні адносна рускай гісторыі» (1819).

ІВАН ІВАНАВІЧ ПУШЧЫН

Дзекабрыст, сябар А.С.Пушкіна І.І.Пушчын (1798—1859) пасля заканчэння Царскасельскага ліцэя (1817) паступіў у гвардзейскую конную артылерыю ў Пецярбургу. Стаў членам «Саюза працвітання» і «Паўночнага таварыства». У 1823 г. пакінуў ваенную службу і перайшоў на працу ў Маскоўскі надворны суд. Удзельнік снежаньскага паўстання 1825 г. Асуджаны да пажыццёвай катаргі. Адбываў пакаранне ў Шлісельбургскай крэпасці (з 1826 г.), у Нерчынскіх рудніках (1828—1838). З 1839 г. на пасяленні ў Турынску і

Ялутараўску Табольскай губерні. У 1856 г. быў амнісціраваны і вярнуўся на радзіму. Аўтар «Запісак пра Пушкіна».

Праязджаў у студзені і маі 1820 г.

АЛЯКСАНДР СЯРГЕЕВІЧ ПУШКІН

У маі 1820 г. А.С.Пушкіна (1799—1837) высылалі з Пецярбурга за вольналюбівыя вершы. 19 мая паэт выехаў у ссылку на поўдзень у суправаджэнні свайго дзядзькі Мікіты Казлова. Да Царскага Сяла паэта праводзілі яго сябры Дэльвіг і Якаўлеў. Маршрут Пушкіна пралягаў праз Вялікія Лукі — Віцебск — Магілёў — Гомель — Чарнігаў — Кіеў. Як зазначае Л.Вінаградаў, А.С.Пушкін праехаў Гомель і Беліцу недзе каля 23 мая 1820 г. (Виноградов Л. Гомель. Его прошлое и настоящее. М., 1900. С. 46.) З левага боку шляху над Сожам узвышаўся адзін з самых прыгожых палацаў у Расійскай імперыі — палац графа М.П.Румянцава. Цераз Сож быў перакінуты новы прыгожы мост на сваях. У Гомелі быў раскватэраваны Ахтырскі гусарскі полк. Але часу не было, каб спыняцца. Маршрут паэта быў строга распісаны.

Мільгалі верставыя слупы і паштовыя станцыі, так падобныя між сабой адна на адну, на якіх мянялі коней. У Беліцкім павеце гэта былі Новая Беліца і Пясочная Буда. Наступная станцыя Дабранка належала ўжо да Чарнігаўскай губерні. Касцюкоўка, Клімаўка, Пясочная Буда, Маркавічы, Паддабранка — праз гэтыя гомельскія вёскі праязджаў вялікі рускі паэт, едучы ў ссылку на поўдзень. На жаль, паэт нідзе ніводным словам не выказаўся пра свой шлях праз Беларусь ні ў 1820 г., ні ў 1824, калі ён вяртаўся назад у роднае ціхае Міхайлаўскае.

Выехаў ён з Адэсы 13 жніўня 1824 г. 18 жніўня праехаў Беліцу і Гомель, а 19, якраз на Спаса, паэт уехаў у Магілёў. Аб сустрэчах з Пушкіным у жніўні 1824 г. у Чарнігаве і Магілёве ёсць успаміны А.І.Падалінскага і А.П.Распопава. Так, Падалінскі аб сваёй сустрэчы з паэтам у Чарнігаве піша: «Утром, войдя в залу, я увидел в соседней буфетной комнате шагавшего вдоль стойки молодого человека, которого, по месту прогулки и по костюму, принял за полового. Наряд был непредставительный: желтые нанковые, небрежно надетые шаровары и русская цветная измятая рубаха, подвязанная вытертым черным шейным платком; курчавые довольно длинные и густые волосы развевались в беспорядке». (Жизнь Пушкина: Переписка. Воспоминания. Дневник. М., 1988. Т. 1. С. 564.)

22 жніўня паэт прыехаў у Міхайлаўскае.

МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЕВІЧ ГОГАЛЬ

Вялікі рускі пісьменнік Мікалай Васільевіч Гогаль (1809—1852) праязджаў праз Гомельшчыну толькі адзін раз — у снежні 1828 г., калі ён ехаў у Пецярбург пасля заканчэння Нежынскай гімназіі вышэйшых навук. Выехаў ён з роднай Васільеўкі на Міколу зімовага — 19 снежня разам з сябрам А.Данілеўскім. Зіма была снежная, марозная. Заехаў у Нежын. Затым на шляху быў Чарнігаў, а там далей невядомая, таемная, заснежаная Беларусь. Каляды засталі яго ў дарозе. Мільгалі станцыі, вёскі, мястэчкі, гарады. І толькі кружыла завея, намятаючы абапал шляху сумёты. Наперадзе яго чакаў Пецярбург, чакала слава. Гэта быў толькі пачатак, першы крок да самастойнага жыцця, да сусветнай вядомасці. І як прыемна, што менавіта Беларускі тракт вёў Гогаля да яго славы.

МІКАЛАЙ I

Расійскі імператар Мікалай I (1796—1855). Сын Паўла I. Уступіў на трон у 1825 г. пасля смерці брата Аляксандра I. У дзень уступлення задушыў паўстанне дзекабрыстаў. Устанавіў у Расіі ваенна-паліцэйскую дыктатуру.

Праязджаў праз Гомель некалькі разоў. Спыняўся ў князя І.Ф.Паскевіча. У 1840 г. быў некалькі дзён і рабіў агляд войскаў. У 1845 г. і 1851 г. быў праездам.

АЛЯКСАНДР II

Расійскі імператар Аляксандр II (1818—1881). Сын Мікалая I. Уступіў на трон у 1855 г. Пасля паражэння Расіі ў Крымскай вайне (1853—1856) вымушаны быў правесці рэформы: адмену прыгоннага права (1861), земскую, судовую, ваенную. Забіты нарадовольцам І.Грынявіцкім у Пецярбургу.

У Гомелі спыняўся двойчы: у 1840 г. разам з бацькам, імператарам Мікалаем I, і 22 кастрычніка 1857 г. разам з імператрыцай Марыяй Аляксандраўнай.

МІХАІЛ ВОСІПАВІЧ БЕЗ-КАРНІЛОВІЧ

Беларускі гісторык, краязнаўца і этнограф, вайсковы тапограф і статыстык, генерал-маёр М.В.Без-Карніловіч (1796—1862) нарадзіўся ў Магілёўскай губерні. Скончыў 1-ы кадэцкі корпус. У 1831—1847 гг. пад яго кіраўніцтвам праводзілася тапаграфічная экспедыцыя ў некаторых рэгіёнах Беларусі, у тым ліку і ў Магілёўскай губерні. Даследаваў гісторыю Беларусі. Аўтар кнігі «Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии...» (1855).

ТАРАС РЫГОРАВІЧ ШАЎЧЭНКА

Вялікі ўкраінскі паэт Тарас Рыгоравіч Шаўчэнка (1814—1861) праязджаў Беларускім трактам праз Гомельскі павет двойчы.

Першы раз — у красавіку 1843 г. Тады 29-гадовы паэт, аўтар славутага «Кабзара», ехаў з Пецярбурга, дзе вучыўся ў Акадэміі мастацтваў, на родную Украіну. Ехаў ён на перакладных разам з паэтам Я.П.Грабінкам шляхам праз Гомель і Новую Беліцу.

Першы, да каго завітаў у госці славуты паэт, быў чарнігаўскі памешчык Рыгор Сцяпанавіч Тарноўскі, маёнтак якога знаходзіўся ў Качанаўцы (непадалёку ад Прылук). У свой час тут падоўгу гасцявалі М.І.Глінка і М.В.Гогаль. Пасля Качанаўкі Т.Р.Шаўчэнка паехаў да Я.П.Грабінкі, у яго сяло Мар'янаўку на Палтаўшчыне (непадалёку ад Пірацина).

На радзіме паэт прабыў да лютага 1844 г., калі ён зноў вярнуўся ў Пецярбург, але ўжо праз Маскву. Праз Маскву Шаўчэнка ехаў на Украіну і ў сакавіку 1845 г. У Кіеве ён паступіў на службу ў Археаграфічную камісію. У 1846 г. ён зблізіўся з гісторыкам М.І.Кастамаравым, які працаваў тады настаўнікам у 1-й Кіеўскай гімназіі, і членамі нелегальнага Кірыла-Мяфодзьеўскага таварыства.

18 красавіка 1847 г. Т.Р.Шаўчэнка быў арыштаваны ля паромнай пераправы праз Дняпро ў Кіеве, калі вяртаўся з Седнева, дзе нейкі час жыў і творча працаваў у гасцінным доме Андрэя Іванавіча Лізагуба. Гэта была субота. А на наступны дзень у нядзелю, 19 красавіка, Шаўчэнку «пад строгай аховай, пры адным паліцэйскім афіцэры і адным радавым жандары», як паведамлялася ў афіцыйным данясенні, адправілі Беларускім шляхам у Пецярбург. Калі першы раз славуты паэт ехаў праз Беларусь і Гомельскі павет па сваёй волі, то цяпер яго везлі гэтым жа шляхам пад канвоем. Праз 11 дзён паэта даставілі ў Пецярбург. Наперадзе яго чакала 10-гадовая ссылка ў Арэнбург.

ЯЎГЕН ПАЎЛАВІЧ ГРАБІНКА

Украінскі і рускі пісьменнік Я.П.Грабінка (1812—1848) скончыў Нежынскую гімназію вышэйшых навук (1831). З 1834 г. жыў у Пецярбургу. Выдаў першы ўкраінскі альманах «Ластівка» (1841), быў блізкі да петрашэўцаў і Т.Шаўчэнкі. Аўтар вершаў, якія сталі народнымі песнямі, у тым ліку вядомага раманса «Вочы чорныя», а таксама празаічных твораў «Нежынскі палкоўнік Залатарэнка» (1842), «Чайкоўскі» (1843), «Запіскі студэнта», «Доктар», «Іван Іванавіч» і інш.

Дакладна вядома, што праязджаў праз павет у красавіку 1843 г., калі ехаў з Т.Шаўчэнкам на Украіну.

МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ КАСТАМАРАЎ

Рускі і ўкраінскі гісторык і пісьменнік Мікалай Іванавіч Кастамараў (1817—1885) нарадзіўся ў Астрагожскім павеце Варонежскай губерні. Пасля заканчэння Харкаўскага універсітэта (1837) працаваў настаўнікам у Роўне і Кіеве. З 1846 г. прафесар Кіеўскага універсітэта. За ўдзел у Кірыла-Мяфодзьеўскім таварыстве ў 1847 г. быў арыштаваны, дастаўлены ў Пецярбург і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Праз год быў сасланы ў г. Саратаў на 9 гадоў. З 1856 г. жыў у Пецярбургу. Прафесар Казанскага (1858) і Пецярбургскага (1859—1862) універсітэтаў. Аўтар шматлікіх гістарычных прац, у тым ліку «Богдан Хмельницкий» (1857), «Бунт Стеньки Разина» (1858), «Мазепа» (1882), «Руская история в жизнеописаниях ее главнейших деятелей» (1915).

Дакладна вядома, што праязджаў праз Гомельскі павет у 1847 г., калі быў арыштаваны ў Кіеве і дастаўлены ў Пецярбург.

СЯРГЕЙ ВАСІЛЬЕВІЧ МАКСІМАЎ

Рускі пісьменнік, фальклярыст і этнограф Сяргей Васільевіч Максімаў (1831—1901) нарадзіўся ў Калагрыўскім павеце Кастрамской губерні. У 1850 г. паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта, з якога перавёўся ў Пецярбург-

скую медыка-хірургічную акадэмію. У 1856 г. ён пакінуў акадэмію і заняўся творчасцю. Шмат падарожнічаў. Вынікамі яго вандровак па Расійскай імперыі з'явіліся кнігі: «Год на Севере» (1859), «Куль хлеба и его похождения», «Сибирь и каторга» (1871), «Лесная глушь» (1871), «Бродячая Русь Христа-рада» (1877).

У 1867—1868 гг. С.Максімаў у складзе этнаграфічнай экспедыцыі наведаў Беларусь. Пісьменнік аб'ездзіў Смаленскую, Магілёўскую, Віцебскую, Вілейскую, Гродзенскую і Мінскую губерні. Яго матэрыялы з гэтай паездкі друкаваліся часткова ў газеце «Голос», часопісе «Древняя и новая Россия», а таксама ў шматтомным выданні «Живописная Россия».

У час экспедыцыі Максімаў быў і ў Гомельскім павеце. З гумарам ён расказаў пра Маркавічы ці, дакладней, пра маркаўцаў у «Живописной России».

Выдаў таксама кнігі «Крылатые слова» (1890), «Нечистая сила» (1899), «Крестная сила» (1901).

НАПАЛЕОН ОРДА

Беларускі кампазітар, піяніст, педагог, мастак Напалеон Орда (1807—1883) нарадзіўся ў в. Варацэвічы Пінскага павета (цяпер Іванаўскі раён) у сям'і інжынера. У 1823 г. паступіў у Віленскі універсітэт, з якога быў выключаны ў 1827 г. за ўдзел у тайным студэнцкім таварыстве. Удзельнік паўстання 1830—1831 гг. Эмігрыраваў. Жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі.

У 1856 г. вярнуўся на радзіму, жыў у Варацэвічах, у Гродне, на Валыні. У 1873 г. выдаў у Варшаве «Граматыку музыкі». Шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Польшчы і Літве, рабіў замалёўкі помнікаў архітэктуры і мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей. Па Беларусі зроблена больш за 200 малюнкаў, у тым ліку палацаў у г. Гомель і в. Хальч Гомельскага павета (цяпер Веткаўскі раён).

ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Беларускі пісьменнік Францішак Багушэвіч (1840—1900) нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскай губерні (цяпер Літва). Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, аднак быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Удзельнік паўстання 1863—1864 гг., быў паранены. Хаваючыся ад рэпрэсій, пераехаў на Украіну. У 1805—1868 гг. вучыўся ў Нежынскім юрыдычным ліцэі, пасля заканчэння якога працаваў судовым следчым у Чарнігаве, Краляўцы (цяпер Сумская вобл.), Барзне (Чарнігаўская вобл.). У 1884 г. пераехаў у Вільню. З 1898 г. жыў у Кушлянах (Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.). Неаднаразова праязджаў праз Гомельскі павет.

МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ ГЕ

Рускі жывапісец М.М.Ге (1831—1894) нарадзіўся ў Варонежы. Пасля заканчэння Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1857) выехаў у Фларэнцыю, дзе стварыў сваю славутую «Тайную вячэру» (1863). Аўтар карцін «Пётр I дапытвае царэвіча Аляксея» (1871), «Пушкін у сяле Міхайлаўскім» (1875), «Што ёсць ісціна?» (1890), «Распяцце» (1892—1894), а таксама партрэтаў А.І.Герцэна (1867), М.І.Кастамарава (1870), Л.М.Талстога (1884).

Неаднаразова праязджаў праз Гомельскі павет.

МІХАІЛ ВОСІПАВІЧ МІКЕШЫН

Беларускі і народны мастак і скульптар Міхаіл Восіпавіч Мікешын (1835—1896) нарадзіўся ў в. Платонава Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Рослаўскі раён Смаленскай вобласці) у сялянскай сям'і. У 1852 скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. Вядомасць прынесла яму работа над помнікам «Тысячагоддзе Расіі» (Ноўгарад, 1862). Па яго праектах пастаўлены помнікі Кацярыне II (Пецярбург, 1873), Багдану Хмяльніцкаму (Кіеў, 1888) і іншыя. Ілюстраваў творы М.Гогаля, А.Пушкіна, Т.Шаўчэнкі. Стварыў шэраг замалёвак з жыцця беларусаў. Неаднаразова праязджаў праз Гомельскі павет.

АРХІП ІВАНАВІЧ КУІНДЖЫ

Рускі жывапісец-пейзажыст (1842—1910) нарадзіўся ў Марыупалі. Член Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. Правадзейны член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (з 1893), дзе ўзначальваў пейзажную майстэрню. Заснавальнік Таварыства мастакоў (1909). Аўтар вядомых карцін «Забытая вёска» (1874), «Украінская ноч» (1875), «Бяро-

завы гай» (1879), «Ноч на Дняпры» (1880) і іншых.

Неаднаразова праязджаў праз Гомельскі павет.

ФЁДАР АЛЯКСАНДРАВІЧ ВАСІЛЬЕЎ

Рускі жывапісец-пейзажыст Ф.А.Васільеў (1850—1873) пражыў кароткае жыццё. Вучыўся ў Пецярбургу ў Рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастакоў (1866—1867), у Акадэміі мастацтваў (1871). Вучань І.Шышкіна. Аўтар вядомых карцін «Перад навальніцай» (1868), «Пейзаж» (1869), «Адліга» (1871), «Мокры луч» (1872), «У крымскіх гарадах» (1873).

У 1871 г. захварэў на сухоты і выехаў на лячэнне ў Ялту праз Гомельскі павет.

МІХАІЛ АЛЯКСАНДРАВІЧ УРУБЕЛЬ

Вядомы рускі жывапісец і графік М.А.Урубель (1856—1910) нарадзіўся ў Омску ў сям'і ваеннага. Яго бацька Аляксандр Міхайлавіч быў родам з Гродзенскай губерні і паходзіў з шляхецкай сям'і. Пасля заканчэння Рышэльеўскай гімназіі ў Адэсе вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта (1874—1879), а затым у Акадэміі мастацтваў (1880—1884). У 1884 г. распісваў Кірылаўскую царкву ў Кіеве. Аўтар вядомых карцін «Дэман» (1890), «Іспанія» (1894), «Варажбітка» (1895), «Пан» (1899), «Царэўна-Лебедзь» (1900) і іншых.

Неаднаразова праязджаў праз Гомельскі павет (1869, 1874, 1884).

М.З.Башлакоў.

У парэформенны перыяд

У 1861 г. урад увёў у дзейнасць маніфест аб адмене прыгоннага права. Рэформа ў Паўночна-Заходнім краі ва ўмовах набліжэння сялянскага паўстання мела свае асаблівасці. Адрэзкі зямель у Магілёўскай губерні адсутнічалі, і за сялянамі захоўваліся землі, якімі яны валодалі да рэформы. Зямля ў губерні давалася ў падворнае карыстанне на падставе ўстаўных грамат.

Як аднесліся да ўказа жыхары Гомельскага павета? Спачатку яны не маглі разабрацца з тым, што адбываецца, але іх насцярожылі некаторыя яго палажэнні. Аб гэтым так пісаў у газету «Северная пчела» аканом маёнтка князя Паскевіча: «Касательно Уставных грамот по Гомельскому имению, я не могу сообщить много, так как до сих пор представлено крестьянам три грамоты, которые они и приняли добровольно, но замечательно, что из трех деревень в одной (Терюхе) часть крестьян никак не согласна подписать грамоты, хотя почти как и остальная часть подписавших грамоту изъявила на все полное удовлетворение, рассыпалась предо мною в благодарности».

Пасля некаторай роспачы сяляне зразумелі, што іх зноў ашукалі. Яны адмовіліся адбываць паншчыну і падпісваць устаўныя граматы.

Для «навядзення парадку» ў вёсках з'явіліся карнікі. «В деревне Михальки съезжал исправник и при бытности 60 человек нижних чинов, командированных г-ном контр-адмиралом Захарьиным, объяснил как Михальковским, так и с других деревень собранным крестьянам их обязанности, и когда виновные были наказаны, то все общество с раскаянием изъявило готовность отслужить повинность». (Доклад могилевского губернатора о волнениях в губернии. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1291. Воп. 52. Спр. 42. С. 17.)

Па заканчэнні двухгадовага перыяду, вызначанага на ўвод у дзейнасць «Положения», ...сяляне пачалі чакаць «другой воли». Яны выконвалі павіннасці, але не хацелі выбіраць упаўнаважаных для ўдакладнення грамат, упарта адмаўляліся ад пераходу на паншчыну, не прызнавалі павіннасці, вызначаныя ўстаўнымі граматамі.

За арганізацыю непаслушэнства пачаліся судзебныя праследаванні. Да суда прыцягнуты, напрыклад, староста вёскі Целяшы Гомельскага павета Якім Міхайлаў.

У лютым гэтага ж года ён абіраецца дацэнтам кафедры чыстай матэматыкі Кіеўскага універсітэта. Яму даручаюць чытанне лекцый па тэорыі лікаў, тэорыі верагоднасці, рознаснаму вылічэнню і трыганаметрыі. Педагагічнай дзейнасці Васіль Пятровіч Ермакоў аддаў чвэрць стагоддзя, працуючы ў сценах выхаваўшага яго універсітэта.

Педагог не загубіў у ім вучонага. У канцы 1876 г. ён завяршыў вялікую работу «Інтэграраванне дыферэнцыяльных ураўненняў механікі», якая была прадстаўлена ў якасці доктарскай дысертацыі. Яе паспяховая абарона адбылася 13 верасня 1877 г.

У 1884 г. ён першым з матэматыкаў «заходніх правінцый» вылучаецца членам-

Е.Р.Раманаў.

карэспандэнтам Пецярбургскай Акадэміі навук.

У сакавіку 1899 г. В.П.Ермакоў атрымлівае званне заслужанага прафесара. У жніўні 1889 г. ён запрашаецца на кафедру вышэйшай матэматыкі Кіеўскага політэхнічнага інстытута (з захаваннем пасады ва універсітэце).

За паўстагоддзя навукова-педагагічнай дзейнасці В.П.Ермакоў напісаў больш за 150 навуковых прац, артыкулаў, падручнікаў.

У 1884 г. пад рэдакцыяй В.П.Ермакова пачаў выходзіць «Часопіс элементарнай матэматыкі», які прызначаўся для вучняў старэйшых класаў, настаўнікаў і «наогул для ўсіх аматараў матэматыкі».

Высокая павага рускага настаўніцтва да дзейнасці В.П.Ермакова адлюстравалася ў прывітаннях, дасланых педагогу ад першага (1912) і другога (1914) Усерасійскіх з'ездаў выкладчыкаў матэматыкі.

В.П.Ермакоў быў жанаты з Лізаветай Сцяпанаўнай Лукомскай — выкладчыцай жаночай гімназіі. У іх было трое дзяцей: Вадзім, Вольга і Ніна.

Людзі, якія блізка ведалі В.П.Ермакова, адзначаюць абаяльнасць яго асобы, душэўную прыгажосць і дабрыню. Яго захапленнем была не толькі матэматыка, але і кранаючая любоў да прыроды. На сваёй дачы ён развёў цудоўны сад.

Памёр Васіль Пятровіч Ермакоў 16 сакавіка 1922 г.

У.Ларыёнаў.

СЛАВУТЫ ВУЧОНЫ

Еўдакім Раманавіч Раманаў нарадзіўся 11.9.1855 г. у мястэчку Навабеліца (цяпер у межах Гомеля). Беларускі этнограф, фальклярыст і археолаг. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), маскоўскага археалагічнага таварыства (1890), Віцебскага статыстычнага камітэта (1891). З бедных мяшчан. Скончыў Гомельскую прагімназію (1870), курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі (1872). Працаваў настаўнікам (1872—86), інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерній (1886—1906), член Часовай камісіі па ўладкаванню Віленскай публічнай бібліятэкі і музея (1906—1916). У 1897—1903 гг. рэдактар неафіцыйнага аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости». З 1910 г. загадчык секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення рускага геаграфічнага таварыства. З 1917 г. жыў у Стаўрапалі. Вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, адзенне, сямейны побыт, народныя абрады, вераванні, народны каляндар і медыцыну, дзіцячыя гульні. Апублікаваў больш за 200 прац па этнаграфіі, фальклоры, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10 тысяч фальклорных твораў. У 1886—1894 гг. вёў археалагічныя раскопкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях, адкрыў помнік эпіграфікі XII ст. Барысаў камень (каля в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна). Склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай губерняў. Сабраў звесткі пра 1000 гарадзішчаў Беларусі, выявіў шмат стаянак першабытнага чалавека, вёў антрапалагічныя даследаванні. У 1901 г. апублікаваў (са скарачэннямі) працу А.Меера «Апісанне Крычаўскага графства або былога староства 1786 года». Папулярызіраваў творы В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча. У 1900 г. выдаў зборнік «Тарас на Парнасе» і іншыя беларускія вершы. Памёр Е.Р.Раманаў 20.1.1922 г.

Асноўныя творы Е.Р.Раманава:

Материалы по исторической типографии Витебской губернии. Уезд Велижский. Могилев, 1898.

Могилевская старина. В 3-х т. Могилев, 1900—1903.

Учебник русской грамматики. 4-е изд. Могилев, 1904.

Материалы по этнографии Гродненской губернии. В 2-х т. Вильна, 1911—1912.

Первоисточники для истории Могилевского края. Одесса, 1916.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1986. Т. 4. С. 487.

«АДКРЫЦЬ СВЕТУ ДУШУ БЕЛАРУСА...»

«Я блізка стаю да народа...». Гэтыя словы Е.Раманава — не ўзор публіцыстычнай рыторыкі, яны напоўнены праўдай усяго жыцця гэтага чалавека. Нарадзіўся Еўдакім Раманаў на зыходзе жніўня 1855 г. у вялікай беднай мяшчанскай сям'і, якіх нямала было ў тагачасным мястэчку Нова-Беліца. З маленства давялося яму зведаць нястачу, горкі смак мякіннага хлеба, бясконцыя гаспадарчыя абавязкі. Вельмі рана выпала Еўдакіму ўзяць на свае дзіцячыя плечы і цяжар адказнасці старэйшага мужчыны ў доме: бацька з дарослымі братамі ледзь не штогод доўгімі месяцамі працавалі на адыходных промыслах.

Бязлітасна рана напаткалі Еўдакіма Раманава жорсткія выпрабаванні. Страціўшы бацьку і амаль следам за ім маці, ён у чатырнаццаць год застаўся сіратой і, каб вучыцца ў Гомельскай прагімназіі, за кавалак хлеба ды прытулак пайшоў хатнім рэпетытарам у мясцовую купецкую сям'ю. Аднак не знайшоў у гэтым доме Еўдакім ні спачування, ні простай чалавечай цеплыні. У памяці яго на доўгі час захаваліся толькі цяжкая гаспадарчая праца пасля заняткаў і халодны закуток, які ўвечары сустракаў знямоглага хлопца.

Такім самотным выдалася прадвесне Еўдакімавага веку... Але хто ведае, ці не гэтыя гады, вымагаўшыя ранняга сталення, прыгадваліся пазней ужо ладна пасівеламу Е.Раманаву, калі ён разважаў пра «бытавыя з'явы», «якія загартоўваюць для бязлітаснай барацьбы з суровай мачыхай жыццём»?.

1870 год стаў для юнака першай значнай вехай на самастойным жыццёвым шляху. Скончыўшы прагімназію з намерам далей працягваць адукацыю, Еўдакім Раманаў рыхтуецца і паспяхова здае ўсе ўступныя экзамены ў Магілёўскую гімназію. Аднак сярод навучэнцаў месца для яго не знайшлося. Атрымаў адно — афіцыйную адмову кіраўніцтва гімназіі з крыўднай спасылкай на «адсутнасць вакансій». Самім лёсам, відаць, наканавана было Еўдакіму Раманаву ісці да сваёй Брамы Вучонасці няпростымі дарогамі жыццёвых «універсітэтаў». Чарговае выпрабаванне юнак сустрэў з годнасцю сапраўднага стоіка. Не губляючы часу ён паступае на курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі і пасля паспяховага іх заканчэння ў 17-гадовым узросце пачынае сталую педагагічную дзейнасць.

Галоўныя старонкі настаўніцкай «адысеі» Е.Раманава, на жаль, і сёння застаюцца недаследаванымі. Па сціплых звестках дакладна відаць адно — пачатак новага жыцця прайшоў для яго ў шматлікіх клопатах і неўладкаванасці. Пошукі лепшай настаўніцкай долі кідалі нашага земляка ў розныя куткі Беларусі — ад роднай Гомельшчыны да Аршаншчыны і Ліды. Далей былі гады адказнай працы на паса-

Вёска Воўкавічы (цяпер Урыцкае). XIX ст.

дзе інспектара народных вучылішчаў у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях. Добрая трэцяя частка веку на ніве народнай адукацыі не адзначана ў службовых фармулярах Еўдакіма Раманава нейкім асаблівым узлётам кар'еры. Сама справа і сумленнае служэнне ёй у яго ўласным чалавечым вымярэнні жыцця заўсёды стаялі вышэй вузкаасабістых разлікаў. Таму прынцыповая скіраванасць Е.Раманава — практыка і публіцыстыка на вырашэнне набалелых праблем народнай школы і настаўніцтва — прынесла яму не толькі аўтарытэт, але і ладную нізку службовых канфліктаў. Напэўна, так яно вядзецца спрадвеку...

Менавіта ў гэтыя гады, напоўненыя штодзённым упартым змаганнем з тым, што ён называў «складам правінцыяльнага жыцця», Еўдакім Раманаў робіць свой галоўны выбар. Ён свядома выходзіць на шлях навукова-асветніцкай працы, прызначэнне якой бачыў у тым, «каб адкрыць свету душу беларуса...». А напачатку было слова. Слова і мова свайго народа, такія блізкія і знаёмыя яму, «карэннаму прыроджанаму беларусу» (Е.Раманаў), і такія прыцягальныя ў сваім бязмежным і нераскрытым багацці. Пазней неаднойчы прыгадваўся Раманаву 1876 год, калі ён, малады вясковы настаўнік, прагна вывучаючы летапісы, курсы граматыкі, лінгвістычную літаратуру, прыйшоў да яснага ўсведамлення: «багацейшую скарбніцу беларускай мовы, якая нагадвала мову Нестара і прадстаўляе ... невычарпальны запас рысаў старажытнарускай мовы, навуковая аўдыторыя па сутнасці не ведае». «Балюча стала беларускаму майму сэрцу такое незнаёмства вучоных з маёй роднай мовай, — успамінаў Е.Раманаў, — і, разумеючы беднасць літаратуры беларускай, узяўся я за збіранне».

Так пачынаўся шлях Еўдакіма Раманава да свайго «Беларускага зборніка» — той галоўнай працы, якой было аддадзена 35 гадоў жыцця да самых апошніх яго дзён. Першыя тры выпускі, апублікаваныя Е.Раманавым на свае ўласныя сродкі ў 1886—1887 гг., сталі буйнейшым выданнем беларускай вуснай народнай творчасці. Яны выклікалі жывую зацікаўленасць спецыялістаў і грамадскасці, а малады даследчык атрымаў прызнанне і падтрымку з боку вядучых навуковых таварыстваў Расіі. Усталяванне навуковых кантактаў мела сваім вынікам правядзенне пяці фальклорна-этнаграфічных экспедыцый Е.Раманава ў Магілёўскую і Віцебскую губерні (1886—1891 гг.). Яны прынеслі такое багацце матэрыялаў, што іх зручней было, як паведамляў даследчык, «вымераць не колькасцю аркушаў, а літаральна пудамі». На доўгія гады быў закладзены падмурак для далейшых навуковых распрацовак Е.Раманава, але цэнтральнае месца сярод іх паранейшаму займаў «Беларускі зборнік». Усе 9 яго выпускаў, якія паспеў апублікаваць вучоны да 1912 г., — па-свойму унікальная энцыклапедыя духоўнай культуры і побыту беларусаў. Яна раскрывала свет народнай казкі, песні, даносіла сівыя легенды і паданні, адорвала трапнымі і поўнымі жыццёвай філасофіі прыказкамі-прымаўкамі, захапляла абрадавымі дзеяннямі, знаёміла са штодзённымі ўмовамі жыцця і працы народа і гасцінна запрашала на яго святы. Водгукі на раманаўскі «Беларускі зборнік» ішлі з Масквы, Варшавы, Прагі, Берліна. Вядучыя спецыялісты ў розных галінах гуманітарных ведаў звярталіся да гэтай каштоўнай крыніцы. Сярод іх — акадэмікі А.М.Весялоўскі, А.А.Шахматаў, Я.Ф.Карскі. Наш славуты зямляк здабыў сабе права з гонарам заявіць сваім апанентам, прыніжаўшым культурную спадчыну народа: «Дзякуючы беларускім зборнікам шэрагу збіральнікаў (Шэйн, Нікіфароўскі, Дабравольскі, Ляцкі, Раманаў, Доўнар-Запольскі, Косіч і інш.) беларуская народная славеснасць увайшла ў сусветны народны зварот... і заняла там пачэснае месца дзякуючы вялікаму багаццю свайго зместа».

Г. Аляксейчанка.
Палессе. 1997. № 2. С. 149—151.

ДЗМІТРЫЙ ЕЎДАКІМАВІЧ ЛАПО
(кастрычнік 1861 — люты 1936)

Пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік народніцкага рэвалюцыйнага руху. Нарадзіўся ў г. Беліца на Гомельшчыне ў мяшчанскай сям'і. У час вучобы ў Гомельскай прагімназіі зблізіўся з рэвалюцыйна настроенай моладдзю, быў удзельнікам тайных гурткоў самаразвіцця, прапагандаваў антыўрадавыя ідэі сярод рабочых. З 1879 г. вучыўся ў Кіеўскай гімназіі. Сярод навучэнцаў вулучаўся актыўнасцю і ста-

ласцю, нейкі час быў старшынёй аб'яднанага камітэта рэвалюцыйных груп сярэдніх навучальных устаноў Кіева. Пасля заканчэння гімназіі паступіў на юрыдычны факультэт Кіеўскага універсітэта. Быў актыўным членам кіеўскай групы нарадавольцаў, уваходзіў у «тэхнічную» падгрупу, якая займалася справамі падпольнай друкарні. Прыязджаючы дамоў, вёў агітацыю сярод рабочых у Гомелі і ў вёсках. У 1885 г. арыштаваны ў Гомелі і сасланы ў Табольскую, потым у Енісейскую губ. У ссылцы пачаў пісаць свае апавяданні з беларускага жыцця, дзе выкарыстоўваў уражанні дзяцінства і юнацтва. Пасля заканчэння тэрміну ссылкі (1890) вярнуўся ў Гомель і ўключыўся ў работу па ўзнаўленні мясцовых нарадавольскіх арганізацый. З 1892 г. жыў у г. Чыстапаль Казанскай губ., служыў сакратаром гарадской управы, займаўся прыватнай адвакацкай практыкай, выдаў кнігу па гісторыі Чыстапаля. У 1896 г. перабраўся ў Краснаярск. Праз 2 гады, здаўшы экзамен у Казанскі універсітэт на званне юрыста, атрымаў месца міравога суддзі пры Краснаярскім акруговым судзе з адкамандзіраваннем у Мінусінск. З 1903 г. працаваў міравым суддзёй, пракурорам акруговага суда ў Краснаярску. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, быў гарадскім сакратаром і гласным думы ў Краснаярску. З 1898 г. супрацоўнічаў у многіх сібірскіх газетах, дзе пад рознымі псеўданімамі змяшчаў публіцыстычныя артыкулы і допісы. Як член, а потым старшыня вучылішчнай камісіі пры Краснаярскай гарадской управе шмат зрабіў для развіцця ў горадзе асветы, марыў пра ўвядзенне ў Краснаярску ўсеагульнай адукацыі. Займаўся педагагічнай дзейнасцю — выкладаў гісторыю і заканадаўства ў мясцовай гімназіі і гандлёвай школе. Па яго ініцыятыве адкрыты Марцьянаўскі дзіцячы прытулак. Быў членам камітэта Мінусінскага музея. Зімой 1901—1902 гг. актыўна дапамагаў галадаючаму насельніцтву Мінусінскай акругі. Як член партыі кадэтаў прымыкаў да так званых «абласнікоў», удзельнічаў у падзеях 1905 г. Вывучаў побыт і норавы карэннага сібірскага насельніцтва, адстойваў яго правы, прапанаваў стварыць у Томскім універсітэце кафедры стэпавага права і цюрка-мангольскіх гаворак, адкрыць шлях качавым народам да асветы. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўключыўся ў культурнае будаўніцтва ў Сібіры, у 1923 склаў асноватворныя дакументы, якія вызначылі нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва народнасцей енісейскай Поўначы. Працу юрыста сумяшчаў з выкладчыцкай работай у Краснаярскім тэхнікуме. Захапляўся краязнаўствам, выступаў з дакладамі ў Сярэдне-Сібірскім аддзеле Рускага геаграфічнага таварыства (быў яго старэйшым членам), з лекцыямі ў рабочых клубах Краснаярска.

Асноўнае месца ў творчай спадчыне Дз.Лапо займае зборнік «Беларускія апавяданні» (1895). Ва ўключаных у яго творах праўдзіва, з дэмакратычных пазіцый паказана цяжкае жыццё сялян Прысожжа, выкарыстаны гомельскія паданні, апісаны народныя заняткі, звычаі.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 476.

ЗІНАІДА ФЁДАРАЎНА РАДЧАНКА

Беларускі фалькларыст і этнограф З.Ф.Радчанка нарадзілася ў 1839 г. у в. Старыя Дзятлавічы Гомельскага павета. На працягу ўсяго жыцця збірала матэрыялы духоўнай культуры беларускага народа, запісвала народныя песні. Склала «Зборнік маларускіх і беларускіх песень Гомельскага павета, запісаных для голасу з акампанементам фартэпіяна» (1881), у які ўключыла 30 песень з напевамі. Склала і выдала ў 1888 г. у Пецярбургу зборнік «Гомельскія народныя песні...», куды ўвайшлі 676 песень, запісаных у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета. У прадмове да гэтага зборніка дала апісанне абрадаў і звычаяў сялян, матэрыяльнай культуры.

Першая з даследчыкаў XIX ст. адзначыла двухгалоссе ў спевах беларусаў. У 1887 г. была абрана правадзейным членам Рускага геаграфічнага таварыства. Памерла 18.3.1916 г.

З ПРАДМОВЫ З.Ф.РАДЧАНКА ДА ЗБОРНІКА «ГОМЕЛЬСКИЕ НАРОДНЫЕ ПЕСНИ» (СПб., 1888)

Што датычыць звычаяў, павер'яў, прыкмет і прымхаў гомельскіх беларусаў, то яны тыя ж, што і ў астатняй Беларусі і на Украіне.

Святая пятніца ходзіць па вёсках пад

выглядам старой бабы і строга наглядае за тым, каб ніхто не адважваўся прасці ў пятніцу, бо яна, бедная, вельмі пакутуе і ў тым доме здарыцца нешта нядобрае або наогул будзе няўдача. Вера ў існаванне ведзьмаў і ведзьмакоў, лесавікоў, вадзяных і чарцей непахісная. Ваўкалакі існуюць бясспрэчна: гэта людзі, перавернутыя ў ваўкоў за якое-небудзь злачынства. Калі такога воўка параніць, ён зноў пераварочваецца ў чалавека, пачынае гаварыць чалавечым голасам і, паміраючы, прызнаецца, што быў воўкам і што яму было цяжка наносіць страты свайму сялу.

Не трэба прыносіць аснову (ніткі для кроснаў) з чужой вёскі, бо ваўкі будуць нападаць на жывёлу. Вераць таксама, што чэрці жывуць у лозах, каля берагоў рэк і хапаюць там людзей.

Ведзьму можна лёгка пазнаць на Юр'я, трэба толькі накідаць мурашніку па вуліцы: ведзьма ніяк не зможа прайсці праз гэту вуліцу, будзе злавацца і зробіць вялікі круг у абход, таму што не можа і кроку ступіць паблізу мурашак. На Юр'я ведзьмы адбіраюць малако ў кароў. Каб убачыць ведзьму, трэба сесці на двары каля хлява пад бараною з запаленаю свечкаю. Ведзьма прыйдзе ў адной кашулі з распушчанымі валасамі. Карыстаючыся гэтымі забабонамі, часам маладыя жанчыны ідуць на чужы двор «па малако». Як іх застаюць, то ўжо не сумняваюцца, што гэта і ёсць сапраўдныя ведзьмы.

Калі надыходзіць час сеяць жыта, збіраюцца ўсе сейбіты і просяць пачаць сеяць самага лепшага, добрага чалавека. У выніку, калі здарыцца неўраджай, высвятляецца, што першым сеяў жыта нядобры чалавек. Няўдачу ў жніве, калі хлеб ад дажджу гніе ў копах, тлумачаць таксама тым, што першая жнейка была нядобрая баба.

Заломы ў жыце пазбаўляюць сілы. Бяда, калі хто сажне, не заўважыўшы іх, немінуча здарыцца няшчасце.

Купацца ранняй вясной нельга, бо схопіць хіндзя: яна, вядома, сядзіць на дне і ловіць тых, хто купаецца. Сродак ад ліхаманкі наступны: кідаюць каля дарогі кашулю, хто яе возьме і адзене на сябе, на таго і ліхаманка пяройдзе. Усяго ліхаманак семдзесят сем, і, каб пазбавіцца ад іх, бяруць семдзесят сем зярнят проса, ідуць да вады і, павярнуўшыся спіною, кідаюць гэтыя зярняты праз галаву назад са словамі:

Цёткі хіндзі,
Вас семдзесят сем,
Наце плату вам усім!

Каб не сурочылі, трэба надзяваць сарочку навыварат або задам наперад. Калі пахваляць, трэба сплюнуць тры разы і сказаць: «Соль табе ў вочы, малонне ў зубы». Цяпер гэтыя словы ўголас не гавораць, а шэпчуць самі сабе. Калі хто пераляканецца, то яму тады ж разрываюць сарочку, каб не захварэў з пераляку. Калі жывёла не вернецца з пашы нанач, дык моляцца святому Юр'ю, каб ён яе пасцярог; потым ідуць да знахара і просяць яго «закладаць» жывёлу ад звера. Знахар бярэ ў гаспадара замок з ключом, пашэпча над ім, замыкае замок ключом і кладзе яго на двары дзе-небудзь на відным месцы, каб гаспадыня адразу магла знайсці, — тады жывёла вяртаецца з пашы сама або з дапамогаю чорта, ідала, як тут гавораць. Мне гаварыла адна набожная бабуля: «Не люблю я таго — няхай лепей мая жывёла прападзе, як яна мне вернецца ад ідальскай сілы». Наогул калі жывёла вяртаецца сама (пасля таго як лічылася страчанай, пераначавала ў лесе), дык вераць, што яе прыгнала «нячыстая сіла». Калі яна мае стомлены выгляд, дык гавораць: «Як ён яе, бедную, замардаваў...»

Беларусы любяць песні і многа спяваюць. У свята і ў будні, на рабоце і на вячорках, вясною, летам, увосень і нават зімою пад адкрытым небам гучаць іх песні.

Вяснянкі — самыя любыя песні беларусаў. 2 лютага, на Стрэчанне, спяваюць першую вяснянку, якая пачынаецца гэтак:

Зіма з летам сустракалася,
Пра здаровейка пыталася і г. д.

Потым перастаюць спяваць, пакуль не пацяплее. З сакавіка пачынаюць спяваць амаль кожны вечар да позняй ночы. 25 сакавіка спяваюць вяснянку:

У нас сягодні Благавешчанне...

На Юр'я захоўваецца звычай юрыцца: дзяўчаты і нават дзеці ідуць за вёску ў поле або ў лясок і пад бярозкаю гатуюць яечню. У гэты дзень дзяўчаты выбіраюць сабе сяброўку на ўвесь год, пры гэтым абменьваюцца паясамі і хусткамі і гавораць пасля гэтага: «Мы з ёю паюрыліся».

Звычай гэты суправаджаецца спяваннем вяснянак.

Вяснянкі адрозніваюцца ад усіх іншых песень своеасаблівым прыпевам накшталт перагуквання (гукання) у сярэдзіне песні, што само па сабе вельмі прыгожа, калі песня прагучыць у лесе, праляціць над вясеннім разлівам і адгукнецца далёкім рэхам...

Усе маладыя дзяўчаты збіраюцца вечарам пасля заканчэння сваіх работ і становяцца групамі на беразе ракі, а калі няма рэчкі або возера, то за вёскай, на аколіцы, часам на ўзгорку. Размяркоўваюцца гэтыя групы далёка адна ад адной. Калі адна група закончыць свой куплет і толькі пачынае заціхаць апошняя нота, тады ўдалечыні другая група працягвае наступны куплет. Такое выкананне веснавых песень мае ў іх назву «вясну гукаці». Вяснянкі спяваюць да самага лета, г. зн. да 24 чэрвеня. Апошняя вяснянка вельмі дарагая для іх:

Песенька мая харошая,
Схаваю цябе на лецейка,
Паеду ў поле з сахою,
Вазьму песеньку з сабою;
Ой, сахою буду араці
І цябе, песенька, спяваці.

Пасля гэтай апошняй вяснянкі адзначаюць ужо Івана Купалу. 24 чэрвеня, калі зойдзе сонца, усе дзяўчаты збіраюцца за вёскай і плятуць вялізныя вянкі для ўсіх, а самы вялікі для той, якая выдае сябе за русалку. Русалкаю выбіраюць тую, якая мае самыя доўгія валасы. Яна здымае свой андарак і застаецца ў кашулі з расшпіленым каўняром. Калі яна даволі смелая, то скідае нават і кашулю. Доўгія распушчаныя валасы закрываюць плечы, вялізны вянок, як кола, прыкрывае ўсю галаву. Адначасова выбіраюць і дзяўчыну на ролю дачкі русалкі. А з саломы робяць чучала накшталт чалавека. Калі ўсе вянкі адзеты, бяруць чучала і вядуць «русалку» ў поле з песняю:

Правяду я русалачку да бору,
А сама вярнуся дадому...

Давёўшы да поля, ідуць мяжою, выбіраюць месца як найдалей ад вёскі, ад засеянага поля, раскладваюць касцёр і кідаюць у агонь чучала з песняю пра Івана Купалу:

Купала на Івана, Купала!
Дзе, Купала, начавала, Купала!

Калі чучала згарыць, тады дзяўчаты і хлопцы пераскокваюць праз гэты агонь, і доўга яшчэ працягваюцца іх песні і скокі.

Вясковыя ўлады забараняюць выконваць гэтыя старадаўнія язычніцкія абрады; неяк было зусім перасталі адзначаць Івана Купалу, а нядаўна зноў пачалі, але ўжо не напярэдадні, г. зн. 23 чэрвеня, а на самога Купалу, 24 чэрвеня.

Вясеннія карагодныя песні спяваюцца толькі на Велікодным тыдні, на Вялікадне, як тут гавораць, таму яны і велікодныя. Іх называюць яшчэ «танкі» («танок»). Разам з тым гэта і гульні («А мы проса сеялі», «Ці далёка мой старац», «А на гарэ мак», «На гарэ лён, белы кужаль» і г. д.). Ёсць яшчэ песні, якія спяваюць, вадзіўшы «сулу», г. зн. ходзячы па вуліцах на святым тыдні: «сулу» — з вуліцы на вуліцу...

Жыхарка вёскі Прыбыткі каля сваёй хаты.

Яшчэ перад жнівом спяваюць: «Пара, маці, жыта жаці». А калі ідуць зажынаць, г. зн. першы раз жаць (абавязкова ў суботу, якая лічыцца лёгкім днём), дык да поля звяртаюцца з наступнай песняй:

— На дабранец, да шырокае поле, жыта ядраное!
— На здароўе, жанцы маладыя, да сярпы сталяныя,
Вы прыходзьце заўтра рана, штоб я ў полі не стаяла
і г. д.

Жаць жыта адпраўляюцца ўсе — і падлеткі, і дзяўчаты, і маладзіцы, і старыя бабы. А калі ў сям'і толькі сыны, яшчэ не жанатыя, то і яны жнуць. Усе яны спяваюць свае жніўныя песні.

Пасля заканчэння жніва гуляюць абжынкі: з жыта робяць вянок і крыж. Вянок гэты надзявае на сябе адна з дзяўчат, а крыж нясе другая. Вянок робяць з жыта, а таксама з пахучай траўкі пад назвай «кудраўчык» і з вялікіх жоўтых гваздзікоў. Усё гэта прыносяць у дом гаспадара, якому жалі, за гэта ім плацяць грошы і частуюць гарэлкай. Вянок і крыж вешаюць пад абразамі. На гэтым святкаванні спяваюць розныя жніўныя песні, а потым усялякія іншыя. Захаваўся яшчэ адзін звычай: калі дажынаюць, то пакідаюць на ніве «кругловінку» нязжатага жыта, звязваюць яго поясам, убіраюць кветкамі і паліваюць вадою. Пры гэтым спяваецца наступная песня:

Сядзіць казёл на капе
Да дзівіцца барадзе...

Ёсць яшчэ звычай склікаць людзей на талаку, г. зн. запрашаюць жаць жыта або ўбіраць сена без усялякай платы, толькі за пачастунак; даюць многа гарэлкі, абед, падвячорак, вячэру. На гэту талаку ідуць з вялікай ахвотаю. Талаку склікаюць найчасцей у якое-небудзь невялікае свята, напрыклад на Пятра і да т. п., калі адзначаюць другі дзень пасля свята. Сабе рабіць, гавораць, грэх, а людзям можна, але не за плату, а толькі за пачастунак. Для гэтага наймаюць часта нават музыку. На рабоце не падганяюць людзей, а толькі частуюць іх.

«Звязду» носяць на Каляды, на Новы год і на Вадохрышча. Хлопчыкі ходзяць вялікім гуртам і спяваюць хорам песні аб нараджэнні Хрыста...

На Каляды водзяць яшчэ «казу». Ролю казы выконвае хлопец, адзеты ў вывернуты кажух, а другі хлопец, які вядзе «казу», адзеты старым дзедам з вялікаю льняною барадою. Пра «казу» спяваюць:

Го, го, го, каза,
Каза шэрая,
І дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць...

Шляхцюкі на Каляды водзяць «кральку». Зместам гэтай песні-гульні з'яўляецца расказ пра нялюбую жонку, якая ўсім дагаджае: і свёкру, і свякроўцы, і дзеверу, і залоўцы — толькі мужу нічым не можа дагадзіць. Песня даволі прыгожа гучыць. Усе становяцца ў круг, скачуць і спяваюць. У сярэдзіне круга скача «кралька» ў вобразе пачварнай карліцы, з двума гарбамі.

Напярэдадні Новага года пад вокнамі шчадруюць дзеці, часам і маладыя дзяўчаты. Вось узор шчадровак:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Дайце каўбасу,
Дамоў панясу...

Вясковыя ўлады забараняюць шчадраваць...

На першы дзень Новага года дзеці ходзяць «засяваць». Уваходзячы ў хату, сыплюць жыта, ячмень або проса са словамі:

Сею грэчку і пшаніцу,
А мне дайце паляніцу.

Гэтых дзяцей частуюць і даюць ім грошы.

Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. Мн., 1990. С. 342—347.

На пачатку XX стагоддзя

Палітычнае і эканамічнае банкрутства палітыкі самадзяржаўя ў Заходніх губернях прывяло да росту палітычнай барацьбы. Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух у Гомелі і павеце развіваўся ў надзвычай складаных умовах. Назіралася абыякавасць сельскага насельніцтва да рэвалюцыйнай прапаганды. Працягвалася распаўсюджванне пракламацый, якія выклікалі трывогу ў жандарскага ўпраўлення.

30 сакавіка 1904 г. сярод жыхароў вёскі Яроміна было праведзена дазнанне аб распаўсюджванні сярод сялян праклямацый пад назвай «Люби ближнего, как

самого себя». У сяле было знойдзена 10 экзэмпляраў пракламацый. За яе распаўсюджванне да следства былі прыцягнуты жыхары сяла: Уладзімір Бажкоў, Восіп Каробкін, Іван Ганчароў. Вінаватасць падследных даказаць не ўдалося, і справу спынілі «из-за отсутствия доказательств». (Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 52. Воп. 1. Л. 70.)

Уздым рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху, настойлівая дзейнасць рэвалюцыянераў прывялі да ўздыму сялянскіх выступленняў. Сяляне пад уплывам прапаганды эсэраў, сацыял-дэмакратаў пачынаюць выказваць свае патрабаванні. У першую чаргу яны патрабуюць зніжэння арэндных плацяжоў, павелічэння зямельных надзелаў, працягваюць барацьбу за сервітуты.

У сваёй справаздачы за 1904 г. магілёўскі губернатар пісаў: «Революционная пропаганда приняла размеры небывалые; прокламации касались всех сторон народной жизни, всех вопросов, издавна являющихся больным местом в земледельческом быту. Подпольная деятельность злонамеренных лиц достигла известных результатов: снова возникли разговоры о наделении землею, о притеснениях со стороны правительства, об отобрании земель от помещиков и т.п. Насильственные действия проявились впрочем только в виде самовольных лесных порубок, совершаемых скопом, но принятыми строгими мерами они на время прекратились. К концу года, отчасти благодаря разжигательному направлению, принятому некоторыми органами печати, отчасти под тяжелым впечатлением военных неудач, нервное настроение во всех классах населения достигло высокой степени и обычная жизнь выбилась, можно сказать, из колеи. Всякий считал своим долгом открыто обвинить правительство; из классов интеллигентных такое настроение переходило в народную массу и постепенно подготовляло ту почву, на которой произошли в губернии аграрные и политические беспорядки в текущем 1905 году». (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1284. Воп. 194. Спр. 82. Л. 2—3.)

У 1906 г. барацьба сялян набывае больш арганізаваны характар. У іх з'яўляюцца даволі трывалыя і абгрунтаваныя патрабаванні. Адчуваецца ўплыў партыі эсэраў.

Вышэйшага ўздыму рэвалюцыя ў вёсцы дасягнула ў 1906 г. Вось што паведамляў магілёўскі губернатар аб падзеях гэтага года:

«Отчетный год во всех отношениях был самый тяжелый. Беспорядки, происходящие во многих местах и начавшиеся еще в 1905 г., не миновали и Могилевской губ., вследствие чего один из уездов ея-Гомельский и самый гор. Гомель, как главный центр революционных движений и бывшей железнодорожной забастовки, в декабре 1905 г. был объявлен, на основании указа Вышего Величества 29 ноября того же года, на положении чрезвычайной охраны. К началу 1906 года аграрно-революционное движение широкою волною захватило другие уезды. Движение это было создано оторвавшимися от земли рабочими-крестьянами, исключительно молодежью, вернувшимися после забастовки с заводов южных губерний. Восприняв там социалистически-революционное учение, они явились ярыми проповедниками идеи известного крестьянского союза и, пользуясь темнотою народною, внушили крестьянам уверенность в необходимости и безнаказанности захватного права.

Крестьяне вооруженными толпами нападали на помещичьи усадьбы, громили, грабили и жгли их, массами вырубали частновладельческие леса и сбывали награбленное перекупщикам за бесценок. В некоторых уездах было оказываемо вооруженное сопротивление чинам полиции; местами крестьяне образовывали свои так называемые «думы», откуда вожаки и руководили всеми набегами, не признавая над собой какой бы то ни было власти. Всем этим мирные жители деревни, в особенности землевладельческий класс, были прямо терроризированы, — многие помещики побросали свои имения и переехали на жительство в города». (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1284. Воп. 194. Спр. 46, 1907 г. Л. 2—3.)

Супраць паўстаўшых сялян Гомельскага павета былі накіраваны воінскія каманды. Удзельнікаў паўстання падвергліфізічнаму пакаранню. найбольш адукаваныя і аўтарытэтныя кіраўнікі выступленняў былі арыштаваны і высланы. У краі пачалася паласа палітычных рэпрэсій.

Жандарскае ўпраўленне працягвала весці назіранне за «неблаговидными» жыхарамі павета. У мястэчках павета з'яўляюцца людзі, перададзеныя пад надзор паліцыі. Але зразумеўшы, што аднымі рэпрэсіямі падтрымліваць парадак у Паўночна-Заходнім краі немагчыма, урад Расіі

быў вымушаны пайсці на змены ў заканадаўстве. Галоўнай яе часткай з'явіўся ўвод у дзейнасць «Палажэння 12 чэрвеня 1890 года аб Земскіх установах». У 1911 г. праводзяцца выбары ў земскія ўправы. Іх вынікі былі станоўча ацэнены ўрадам.

«Первые земские выборы в губернии дали в этом отношении вполне благоприятные результаты: из числа 306 уездных гласных в составе их находится: 168 дворян и чиновников, 14 почетных граждан и купцов, 17 мещан и 107 крестьян...» (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1276. Воп. 17. Спр. 1216. Л. 4.)

Амаль упершыню ў гісторыі края было ўзнята пытанне аб фінансаванні адукацыі, медыцыны. І не толькі ўзнята, але і адпушчаны сродкі на іх развіццё. Сродкі былі даволі значныя, але заставалася не зусім зразумела, як іх магчыма сабраць у якасці падаткаў з сялян і памешчыкаў, гаспадарка якіх знаходзілася ў глыбокім крызісе.

У адным з артыкулаў «Вестника Минского губернского Земства» пісалася: «...Недоедание нашей деревни до такой степени обострилось, что нам необходимо безотлагательно прийти на помощь нашему крестьянину, а еще больше, чаще безотлагательней — на помощь детям, смертность которых, особенно грудных детей, огромна от недоедания». (Вестник Минского губернского Земства. № 2. Мн., 1914. С. 9.)

М.М.Халюшкоў.

З архіўных крыніц

З ДАНЯСЕННЯ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ

1905 г.

Революционное движение в районе Гомельского, Рогачевского и Быховского уездов начало проявляться с 1898 года и особенно усилилось в 1904—1905 гг. при общем подъеме революционного движения в России.

В 1903 г. было 50 дознаний, при 80-ти обвиняемых; в 1904 г. — 78 дознаний при 69-ти обвиняемых и в текущем году 97 дознаний при 54 обвиняемых.

Обращаясь к вопросу о том, какие именно революционные организации существуют теперь в районе, отмечаю их в порядке, начиная с более сильных партий.

а) Всеобщий еврейский рабочий союз в Литве, Польше, России (то же Бунд).
б) Гомельская группа партии социалистов-революционеров.
в) Северо-Западный областной организационный комитет, той же партии.
г) Полесский комитет Российской социал-демократической рабочей партии.
д) Гомельская организация этого комитета.
е) Группа социалистов-революционеров.
ж) Гомельские рабочие и сионисты...

Ротмистр гр. Подгоричани-Петрович.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 10200. Спр. 1800. Л. 240.

Будынак Грабаўскага земскага вучылішча. Пачатак XX ст.

Навучэнцы Грабаўскага земскага вучылішча. У цэнтры святар Уладзімір Каркуша і настаўніца Аляксандра Захараўна Яфімава. 1913 год.

З ДАНЯСЕННЯ Ў ЖАНДАРСКАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АБ НЕЗДАВОЛЕНАСЦІ СЯЛЯН З ВЁСКІ НОВЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

11 ліпеня 1905 г.

В имении Ново-Дятловичи крестьяне с Ново-Дятлович Дятловичской волости самовольно прирезали себе 19 десятин земли и поставили пограничные копцы. Земский начальник, прибыв на место, собрав сход, на котором крестьяне держали себя крайне дерзко и настаивали на том, что прирезанная ими земля принадлежит им, и что таковую они будут отстаивать силой, а если помещик им не уступит, то они его убьют. Для восстановления отношений между крестьянами и землевладельцами управляющий губернией Лодыженский 8, 9 и 10 июля, сопровождаемый силами уездной полиции и мной, посетил имение Новоселки, Закружье и Новые Дятловичи, где земскими начальниками были собраны сходы.

В имении Ново-Дятловичи отношения между крестьянами и владельцем Радченковым были более обостренными, чем в других местах, хотя эти крестьяне более других обеспечены землей, благодаря тому, что в прошлом году помещик продал им на льготных условиях 1200 десятин земли, кроме того, дал им 19 десятин земли как недостающих к наделу, хотя окружной суд отказал крестьянам в иске. Крестьяне этой земли не приняли и самовольно отрезали себе 19 десятин из усадебной земли и угрожали насилием помещику. Собранный сход держал себя крайне дерзко по отношению к управляющему губернией, не позволял ему говорить, заглушал его слова криком.

...Главные зачинщики в числе 6 человек были подвергнуты телесному наказанию и, кроме того, арестовано несколько человек. Благодаря репрессивным мерам порядок был восста-

новлен, управляющий губернией ушел и обещал крестьянам говорить с ними через несколько часов. Сход разошелся мирно, благодаря удалению зачинщиков.

Спустя три часа был собран вторично сход, на котором крестьяне держали себя мирно и благодаря разъяснению управляющего губернией крестьяне осознали свою вину и просили ходатайствовать перед помещиком о прирезке им 19 десятин земли. Кроме того, просили разрешения отправить к помещику выборных для исходатайствования прощения, что им и было разрешено. Помещик Радченков обещал крестьянам подарить им 19 десятин земли, но не из усадебной земли.

В настоящее время беспорядки среди крестьян Гомельского уезда совершего прекращены и можно надеяться, что таковые не повторятся, т.к. объезд управляющим губерний и принятые им меры произвели сильное впечатление на крестьян других волостей.

О вышеизложенном доношу
Ротмистр /подпись/

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 10200. Спр. 2550. Л. 142—143.

ПАТРАБАВАННІ СЯЛЯН ВЁСКІ МАРКАВІЧЫ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

1906 г.

Мы, крестьяне дер. Марковичи, собравшиеся на общий сход для обсуждения причин наших бедствий и страданий, пришли к заключению, что жить дальше так, как мы жили до сих пор, совершенно невозможно. Положение наше страшно бедственное и горестное. Мы находимся в полной кабале у помещиков, которые высасывают, как пауки, все наши соки, нашу кровь, пот. Чтобы лучше закабалить нас, крестьян, они окружили нас своими владениями, как кольцом, они отняли у нас все наши лучшие земли, которые мы удабривали потом и кровью; они захватили наши пастбища, которыми пользовались наши отцы и деды во время крепостного права. Признавая теперь, что работать при таких условиях невыносимо, мы, крестьяне названной деревни, решили забастовать и не идти на работу, пока помещики Голынский и Станкевич не удовлетворят наши требования:

1. Пастбищем мы должны пользоваться бесплатно.
2. Дрова помещики должны дать бесплатно из их лесных дач.
3. Работать поденно от 6 часов утра до 7 часов вечера.
4. Заработная плата за каждый день должна быть следующих размеров: крестьянину с лошадью 1 р. 50 к., без лошади 1 р. 20 коп., крестьянке — 80 коп.
5. Обращение вежливое.

Братья крестьяне! Вот эти требования мы предъявили к помещикам. Мы обращаемся ко всем крестьянам, работающим на этих помещиков, поддержать нас и не идти на работу, пока они не дадут наши требования. Эти требования нам необходимы как жизнь. Помните, братья, один за всех и все за одного. Будем дружно отстаивать наши требования.

Да здравствует крестьянская борьба за землю и волю!
С подлинным верно.
За правителя канцелярии Могилевского губернатора
(подпись)

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. ДП,ОО. 1906 г. Спр. 700. Ч. 17. Л. 261.

Народны бунтар Аляксандр Савіцкі

Час, як вада, збягае ад нас, зносячы і нашу памяць. Хто ведае сёння гомельскага славутага Робін Гуда, — праўдалюбца, артыста, рамантыка Аляксандра Савіцкага?

Савіцкі Аляксандр Іванавіч нарадзіўся ў 1882 г. у г. Навазыбкаў у сям'і служачага, беларуса па нацыянальнасці. Вучыўся ў Навазыбкаўскім рэальным вучылішчы, але не закончыў яго: быў выключаны за рэвалюцыйныя погляды.

Пасля выключэння з вучылішча арганізаваў рабочы клуб у Чарнігаве, потым у Магілёве, заклікаў натоўп ісці на штурм гарадской турмы, каб вызваліць зняволеных; раздаваў рэвалюцыйную літаратуру, зброю, ствараў кружкі, баявыя дружыны.

Пасля рэвалюцыі 1905 г. Савіцкі стаў на шлях партызанскай барацьбы супраць самадзяржаўя. Ён нападаў на панскія маёнткі, дзяржаўныя і прыватныя касы, раздаваў маёмасць і грошы бедным.

З канца 1906 г. да пачатку 1907 г. пра

дзейнасць А.Савіцкага сведчаць шматлікія дакументы з паліцэйскіх архіваў, артыкулы газетчыкаў таго перыяду, дзе яго называлі кіраўніком шайкі, дзейнасць якой мае палітычны характар, мэту пазбавіць насельніцтва ад уціску ўлад.

Пецярбургская газета «Новое время» паведамляе: «...Савіцкі, ледзь не штодзённа з'яўляючыся са сваёй шайкай у розных месцах, набыў рэпутацыю легендарнага героя. Сакрэт яго поспеху галоўным чынам тоіцца ў тым, што з простым людам ён абыходзіцца ласкава, памагае і раздае грошы бедным і несумненна карыстаецца вялікімі сімпатыямі сялянскага і наогул сельскага насельніцтва; вось чаму пасля рабаванняў шайка Савіцкага знікае заўжды бясследна...».

У легендах пра Савіцкага адкрываецца яго амаль дзіцячая прага гульні ў любімых герояў. То пераапранаецца ён у жаночае адзенне, то абедае са сваімі ахвярамі-панамі ў мундзіры спраўніка. Стаўка ў гэтых захапляючых гульнях — яго жыццё. Савіцкі ўчынкамі ствараў, узяўшы па рысачках з любімых прыгодніцкіх раманаў, натхніўшы прагай да справядлівасці, новы вобраз добрага разбойніка, якім любаваўся сам і які не мог не захапляць усіх, хто не супрацьстаяў яму ў рэчаіснасці.

Беларускага разбойніка пачатку XX стагоддзя зрабіў галоўным героем свайго рамана «Сашка Жыгулёў» знакаміты пісьменнік Леанід Андрэеў. Асоба А.Савіцкага не засталася па-за цікавасцю і Максіма Горкага, які ўспрыняў раман Андрэева рэзка негатыўна, асабліва не згаджаючыся з ідэалізацыяй героя. Але праз некалькі гадоў ён перагледзеў свае адносіны да галоўнай дзеючай асобы рамана і ў прадмове да амерыканскага выдання «Сашкі Жыгулёва» адзначыў: «Раман напісаны з пафасам... абсалютна дакладна ўзнаўляе фігуру аднаго з тых... летуценнікаў, якія вераюць, што зло жыцця можна перамагчы тою самаю сілаю зла...».

У даследаваннях пра А.Савіцкага беларускі пісьменнік У.Мехаў адзначае, што асобай летуценніка-бандыта даўно цікавіліся і вядомыя беларускія пісьменнікі: Рыгор Мурашка, Міхась Чарот, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Мікола Аляхновіч, Кузьма Чорны. У 1994 г. народны пісьменнік Беларусі Іван Чыгрынаў напісаў п'есу «Савіцкі». Шчырае захапленне А.Савіцкім гучыць у словах аб ім Уладзіміра Караткевіча: «Акруга за трыста вёрст, ад Оршы да Украіны, калацілася ад яго імя і бласлаўляла гэтае імя чатыры гады. Ні памешчык, ні стражнік, ніхто не смеў пакрыўдзіць беднага».

Атрад ці шайка разбойнікаў, якую вадзіў А.Савіцкі, была на здзіўленне невялікая. Матэрыялы архіва, знойдзеныя Мехавым, паказваюць, што ў пастаянным ядры значылася толькі сем чалавек.

Цяжка сказаць, як доўга ўдача была б лагоднай да Савіцкага, каб не малярыйная гарачка, калі паплечнікі вымушаны былі хаваць яго недалёка ад Гомеля, у вёсцы Краснае. У той час сялянскі хлопец, звязаны з Савіцкім, не вытрымаў на допытах, навёў на след. Супраць Савіцкага і двух яго памочнікаў у Краснае накіравалі аж сотню паліцэйскіх, якія чатыры гадзіны вялі перастрэлку. Трое бунтароў загінулі. Гэта здарылася вясной 1909 года.

У вёсцы Краснае ведаюць месца, дзе была магіла Аляксандра Савіцкага. Пра яго распавядаюць у мясцовым музеі...

В.М.Лямцава.

Першая сусветная вайна

Абвастрэнне супярэчнасцей паміж галоўнымі імперыялістычнымі краінамі за перадзел падзеленага ўжо свету і сфер уплыву прывяло да 1-й сусветнай вайны, якая пачалася 19.7(1.8.).1914 г. У ёй удзельнічалі 33 краіны, у т. л. Расія. 18.7.1914 г. беларускія губерні аб'яўлены на ваенным становішчы. Тэрыторыя Беларусі на пачатку вайны была ў непасрэднай блізкасці ад раёна баявых дзеянняў, потым стала прыфрантавой паласой. З жніўня 1915 г., пасля паражэння рускіх войск ва Усходняй Прусіі і адступлення з Польшчы, на тэрыторыі Беларусі разгарнуліся ваенныя дзеянні. Да кастрычніка 1915 г. нямецкія войскі акупіравалі значную тэрыторыю Беларусі, фронт стабілізіраваўся па лініі Дзвінск — Паставы — Баранавічы — Пінск. У цэнтральнай і ўсходняй частках Беларусі размяшчаліся 5 рускіх армій Заходняга фронту са штабам у Мінску і некаторыя падраздзяленні

Паўночнага фронту (каля 2 млн. салдат і афіцэраў), Стаўка вярхоўнага галоўнага камандавання рускай арміі (з пачатку вайны ў Баранавічах, з 8.8.1915 г. у Магілёве). (Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Мн., 1975. Т. 12. С. 128.)

Вайна прынесла незлічоныя бедствы ўсім уцягнутым у яе краінам. Але беларусы трапілі ў лік тых народаў, землі якіх сталі арэнай бітваў мільённых армій. Гінула мірнае насельніцтва, руйнаваліся вёскі і гарады, знішчаўся матэрыяльны і духоўны набытак. Адступленне рускіх войскаў у 1915 г. суправаджалася масавым, часта прымусовым бежанствам соцень тысяч людзей на ўсход, а таксама гібеллю несабранага ўраджаю і маёмасці, якую нельга было забраць з сабою. Ніхто і нідзе не чакаў бежанцаў — жанчын, дзяцей і старых. Рухаліся яны на ўсход на конных фурманках з невялікай паклажай харчоў, адзення, фуражу. Чыгуначны транспарт, амаль цалкам пераключаны на ваенныя перавозкі, не мог забяспечыць іх вываз.

На трактах, што вялі на ўсход, у ваколіцах чыгуначных станцый і гарадоў збіраліся велізарныя абозы і табары бежанцаў. Паводле афіцыйных звестак, у пачатку кастрычніка 1915 г. у тыле 4-й арміі на тракце Койданава — Стоўбцы — Мір — Гарадзея — Сноў у непасрэднай блізкасці да фронту знаходзілася да 35 тысяч, а ў раёне Рэчыцы — 64 тысячы бежанцаў. Да пачатку 1916 г. у Мінскай губ. аселі больш за 157 тысяч, у Віцебскай — 90 тысяч бежанцаў. Праз Магілёўскую губерню к таму часу прайшло каля 1 млн. бежанцаў.

Масы бежанцаў жылі пад адкрытым небам — на ўзлесках і палях, іншы раз спыняліся ў вёсках, фальварках і маёнтках. Не маючы ні прадуктаў, ні фуражу, ні сродкаў для іх набыцця, людзі, каб выжыць, літаральна спусташалі ўсё наўкола. Жудасныя ўмовы: голад, холад, асенняя непагадзь, антысанітарыя — спрыялі ўспышкам розных, у тым ліку заразных, захворванняў.

... Вайна прывяла да заняпаду сельскую гаспадарку Беларусі. У вёсцы ўсё вастрэй адчуваўся недахоп рабочых рук, найперш мужчынскіх. За гады вайны толькі ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях былі мабілізаваны ў армію 634,4 тысячы чалавек — больш паловы працаздольных мужчын. У выніку каля $^1/_3$ гаспадарак засталіся пад апекай жанчын. У дадатак сотні тысяч людзей адрываліся ад сваёй гаспадаркі на акопна-будаўнічыя работы, ахову чыгуначных ліній і г. д. З-за адсутнасці ці недахопу рабочых рук у крытычнае становішча трапілі многія памешчыцкія гаспадаркі. У выніку пасяўныя плошчы на прыватнаўласніцкіх землях 1914—1917 гг. скараціліся на 72,3 працэнта. За той жа перыяд на 11,4 працэнта паменшала агульная колькасць хатняй жывёлы. Рэзка ўзрасла ўдзельная вага бескароўных гаспадарак (у Магілёўскай губ. у параўнанні з 1913 г. — у 8 разоў).

Амаль на $^1/_3$ зменшыліся зборы жыта і пшаніцы. У 1915 г. у многіх паветах Беларусі па ваенных абставінах засталася нявыкапаная бульба, а пасевы азімых былі знішчаны перамяшчэннямі войскаў, хваляй бежанцаў, прагонам ваенных гуртоў.

Цэны на прадукты і прамысловыя тавары ў пачатку 1917 г. выраслі ў 3—5—7 і болей разоў. Гэта спрыяла нябачанаму росту спекуляцыі. Указы і пастановы ўрада і мясцовых улад, накіраваныя на абмежаванне спекуляцыі, не дзейнічалі. Казнакрадства, хабарніцтва, спекуляцыя шырока распаўсюдзіліся ў інтэнданцкіх службах арміі.

З пачаткам вайны былі адменены ўсе абмежаванні, што датычылі працягласці рабочага дня і выкарыстання працы жанчын і дзяцей. У прамысловасці, ды і ў сельскай гаспадарцы, менавіта дзеці і жанчыны замянілі мужчын, мабілізаваных у армію. У пачатку 1917 г. жанчыны, падлеткі і дзеці складалі 58,4 працэнта ўсіх фабрычных рабочых Беларусі. Фактычна былі адменены выхадныя і святочныя дні. Абавязковымі сталі звышурочныя работы. У дробнай і рамеснай вытворчасці працоўны дзень, як і ў XIX ст., працягваўся 15—16 гадзін у суткі.

Ва ўмовах прыфрантавой зоны, перанасычанай войскамі, органамі палітычнай бяспекі і ваеннай контрразведкі, працоўныя Беларусі не маглі даць належны адпор сваім прыгнятальнікам. Тым не менш адчайнае становішча, у якім знаходзіліся працоўныя людзі, вымушала іх уступаць у барацьбу за выжыванне, за хлеб надзённы, супраць гвалтаў і здзекаў.

Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1. С. 443—448.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Гомельскі павет у час Кастрычніцкай рэвалюцыі

Удзел Расіі ў 1-й сусветнай вайне прывёў яе да сацыяльна-эканамічнага крызісу. Немагчымасць правячых колаў вырашыць узнікшыя праблемы рэпрэсіўнымі метадамі прывяло да перамогі Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Уся ўлада перайшла да Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Выканаўчая ўлада са згоды Петраградскага Савета перайшла да Выканкома Дзяржаўнай думы, які ўтварыў Часовы ўрад. У сваёй дзейнасці ўрад абапіраўся на існуючыя думскія, земскія ўстановы і кіраваў з дапамогай камісараў.

Такое размеркаванне ўлады адбылося таму, што большасць у Савеце складалі меншавікі і эсэры. Яны былі прыхільнікамі паступовага рэфармавання існаваўшай сістэмы, класавага міру і вырашэння пытання далейшага развіцця краіны праз Устаноўчы сход.

1 сакавіка вестка аб перамозе рэвалюцыі дайшла да Гомеля. Яна выклікала ў горадзе рэвалюцыйны выбух. Рабочыя і салдаты абяззброілі жандармерыю і паліцыю, захапілі воінскія склады. 2 сакавіка ў горадзе адбылася нарада гласных Гомельскай думы з удзелам прадстаўнікоў левых партый. На ёй было вырашана перадаць выканаўчыя паўнамоцтвы грамадскому «Камітэту грамадскай бяспекі і дабрабыту». Адначасова левыя партыі сумесна з салдацкімі прадстаўнікамі вялі падрыхтоўку да склікання Гомельскага Савета. 4 сакавіка адбылося першае пасяджэнне Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Быў выбраны выканком. Яго старшынёй стаў прапаршчык паветраплавальнага парка П.М.Сяўрук.

Такім чынам, Гомель стаў адным з першых гарадоў Паўночна-Заходняга краю, які пачаў рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Хуткай перамозе рэвалюцыі ў горадзе спрыяла тое, што на тэрыторыі павета знаходзіліся шматлікія прадпрыемствы.

Горад меў значныя рэвалюцыйныя традыцыі, вопыт барацьбы ў час рэвалюцыі 1905 года. У ім дзейнічалі буйныя рэвалюцыйныя арганізацыі расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, Бунда, Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі «Паалей Цыён».

Перамога Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі прывяла да станаўлення асноўных палітычных свабод. З падполля выйшлі бальшавікі. Аднак па прычы-

не адарванасці кіраўнікоў бальшавіцкай партыі ад жывой работы ў масах яны не мелі дастатковай палітычнай арыенціроўкі. Узнікаюць аб'яднаныя арганізацыі РСДРП. 6 красавіка прайшло арганізацыйнае пасяджэнне бальшавікоў горада пад кіраўніцтвам эмісара бюро ЦК партыі бальшавікоў М.М.Хатаевіча. На пасяджэнні быў выбраны партыйны камітэт з 5 чалавек, які захаваў ранейшую назву Палескі камітэт РСДРП(б). Праграмай яго дзейнасці сталі Красавіцкія тэзісы У.І.Леніна. Бальшавікі пачалі барацьбу за ўладу праз падпарадкаванне сабе большасці ў Саветах. Сацыяльнай апорай бальшавікоў сталі салдаты гарнізона і рабочыя гарадскіх прадпрыемстваў. Падтрымка па-бальшавіцку настроеных вайсковых часцей дазволіла стварыць у Гомельскім Савеце бальшавіцкую фракцыю і адпаведна з тым атрымаць тры месцы ў выканкоме. Галоўнымі лозунгамі, накіраванымі на атрыманне падтрымкі з боку насельніцтва, сталі: «Далоў вайну!», «Зямля — сялянам!». Пачалася працяглая барацьба за ўладу паміж бальшавікамі і блокам «левых» партый.

Чым жа ў гэты час жыве насельніцтва Гомельскага павета?

Вядома, што галоўнай марай сялян на працягу доўгага часу была зямля. Да вёскі даходзяць звесткі аб рэвалюцыі. На мітынгах і сходах горада і ў мястэчках гучаць словы аб свабодзе, аб праве сялян на зямлю; партыі абяцаюць вырашыць усе пытанні сялянства, рабочых і інш. Каб перацягнуць на свой бок сялянства, бальшавікі заклікаюць сялян: «Захоплівайце землі памешчыкаў!», «Паліце маёнткі!», «Сячыце панскі лес!».

Заклікі бальшавікоў, зразумела, атрымалі падтрымку ў сялян павета. У вёсках пачынаецца своеасаблівая сялянская «рэвалюцыя».

«Крестьяне деревни Задоровка постановили самовольно захватить ближайшие леса кн. Паскевича. Началась рубка леса, участковый лесничий тяжело ранен крестьянами. Для устранения недоразумений выехала милиция и представитель Совета рабочих и солдатских депутатов». (Газета «День», 2.6.1917.)

«Из уезда продолжают поступать сведения о захвате крестьянами в некоторых местах помещичьих земель, особенно выгонов для скота. На место захватов выезжала группа агитаторов-интеллигентов с мандатами от местного Совета рабочих и содатских депутатов для увещевания крестьян и уездный правительственный комиссар, присяжные поверенные». (Газета «Гомельская копейка», 8.5.1917.)

Урад спрабуе навесці парадак у вёсках. Да сялян звяртаецца міністр земляробства А.Шынгароў: «Имуществом и землями помещиков, так же, как и всеми иными владениями, имеет право распорядиться только всенародное Учредительное собрание. До тех пор всякий самовольный захват земли, скота, инвентаря, рубка леса и т.п. являются незаконным и несправедливым расхищением народного богатства и могут обездолить впоследствии других, может, еще более нуждающихся граждан». (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 116. Воп. 1. Спр. 1. Л. 102.)

Растлумачэннем указа ў павеце займаюцца прадстаўнікі Савета, камісар урада, міліцыя. Але ўсё застаецца па-ранейшаму. Урад пераходзіць да рэпрэсіўных метадаў у адносінах да самавольства сялян. У распараджэнні Часовага ўрада губернскаму камісару гаворыцца: «Имеющие место в Могилевской губернии переходы частновладельческих земель и инвентаря в распоряжение волостных комитетов и вмешательства последних в управление хозяйствами противоречат постановлениям Временного правительства и являются противозаконными. Лица,

допускающие самовольный захват чужой собственности и инвентаря, подлежат законной ответственности по уезду». 11 июня 1917 г. (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 198. Воп. 2. Спр. 113. Л. 72.)

Сярод спраў аб свавольстве сялян большасць іх датычыцца высечкі лясоў і патравы пасеваў. Захопы памешчыцкіх зямель былі даволі рэдкімі. Чаму так? Магчыма, сяляне зразумелі, што грошы можна атрымаць, не пацеючы на цяжкай сялянскай ніве. Гомельскі павет да лютаўскіх падзей спецыялізаваўся на нарыхтоўцы драўніны і пастаўцы яе ў паўднёвыя раёны краіны. Грошы за гэтыя пастаўкі атрымлівалі мясцовыя гаспадары з ліку памешчыкаў. Пасля рэвалюцыі былыя пастаўшчыкі спынілі лесараспрацоўкі. І вось іх месца ў гандлі пачалі захопліваць новыя гаспадары — сялянскія земствы. Гэты промысел даваў такія даходы, што цяжка было ад яго адмовіцца, нягледзячы на ўсе забароны.

У чэрвені пачынаецца другі этап «сялянскай рэвалюцыі». Пачатак яму паклала выступленне У.І.Леніна 22 мая на І Усерасійскім з'ездзе сялянскіх дэпутатаў. Ён патрабаваў ад дэлегатаў з'езда рашучай канфіскацыі памешчыцкіх зямель і перадачы яе сялянам. Выступленне дало станоўчыя вынікі. «25 июля 1917 г. По постановлению Временного правительственного надзора крестьяне с. Прибытки переданы суду за самовольный захват и раздел имения помещика Кухановича. Имение это было передано в аренду военному ведомству и губернскому конному тыловому отряду». (Газета «День», 27.7.1917.)

А тым часам у горадзе адбываліся шматлікія бальшавіцкія і салдацкія мітынгі, вялася барацьба за ўладу.

К восені становішча ў краіне пагоршылася. Масавая незадаволенасць насельніцтва ўдзелам Расіі ў вайне, крызіс гаспадаркі, рэвалюцыянізацыя арміі і, як вынік, рост папулярнасці бальшавіцкіх праграм прывялі да пераходу Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў пад кантроль радыкальных партый. Па ініцыятыве бальшавікоў пры Петраградскім Савеце быў утвораны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, якому было даручана ліквідаваць Часовы ўрад і стварыць умовы для пераходу ўлады да новага рэвалюцыйнага ўрада.

25 кастрычніка адкрылася пасяджэнне II Усерасійскага з'езда Саветаў. Ён прыняў заяву аб пераходзе ўлады ў краіне да Саветаў. На з'ездзе быў зацверджаны новы склад урада на чале з У.І.Леніным. У выніку ўзброенага пераваротy члены Часовага ўрада былі арыштаваны.

Вестка аб падзеях у сталіцы была атрымана ў Гомелі 26 кастрычніка. У гэты дзень Палескі камітэт РСДРП(б) арганізаваў мітынгі і сходы рабочых і салдат з заклікам падтрымаць рашэнні II Усерасійскага з'езда Саветаў.

Але большасць Гомельскага Савета не прыняла пастановы аб пераходзе ўлады ў горадзе і павеце да Савета, хоць Савецкі ўрад і падтрымала. Гомельская дума выступіла супраць перадачы ўлады Савету Народных Камісараў і ўтварыла «Камітэт выратавання радзімы і рэвалюцыі».

30 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Гомельскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў адначасова з выканкомам павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў. На пасяджэнні бальшавікі дамагліся прыняцця наступнай рэзалюцыі: «Временное правительство своей контрреволюционной политикой поставило страну перед второй революцией, происшедшей 24—25 октября и завершившейся победой петроградского пролетариата и гарнизона. Временное правительство свергнуто. Россия находится в состоянии гражданской войны. Идет борьба революции с контрреволюцией. От исхода

этой борьбы зависит судьба революции. Для революции настал решительный момент, нужны решительные меры. Всякие колебания грозят гибелью революции... В этот грозный для революции час Гомельский Совет рабочих и солдатских депутатов находит, что единственное спасение революции и страны в едином фронте всей революционной демократии и в сплочении революционных сил вокруг своих полномочных органов — Советов рабочих и солдатских депутатов и в упрочении власти Советов рабочих и солдатских депутатов в центре и на местах». (Газета «Рабочая мысль», 2.11.1917.) На пасяджэнні быў створаны рэўком з 9 чалавек.

Краіну чакалі новыя выпрабаванні. Набліжалася грамадзянская вайна.

М.М.Халюшкоў.

Германская інтэрвенцыя і грамадзянская вайна

18 лютага 1918 г. войскі кайзераўскай Германіі парушылі пагадненне аб міры і пачалі наступленне супраць Савецкай Расіі. У напрамку Калінкавічы — Гомель — Бранск наступаў 41-ы нямецкі корпус. Нямецкія войскі ў кароткі час занялі значную частку тэрыторыі Беларусі.

Горад рыхтаваўся да абароны. Шляхам мабілізацыі «пралетарыяту» былі створаны 1-ы і 2-і Гомельскія чырвонаармейскія батальёны па 500 чалавек у кожным. Насельніцтва горада на падставе «трудовой повинности» будуе абарончыя ўмацаванні. Але калі нямецкія войскі падышлі да горада, «...панические слухи отрицательно подействовали на некоторых членов исполкома Гомельского Совета, которые до прихода немцев покинули Гомель. В городе образовалось безвластие, начались грабежи и насилие над гражданским населением». (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 130. Воп. 2. Спр. 562. Л. 32.)

Жыццё паставіла пытанне аб уладзе ў пакінутым бальшавікамі горадзе. Дэпутаты гарадской думы склікалі пасяджэнне і выбралі спецыяльную камісію з пяці чалавек для кіравання горадам. Але бальшавікі Палескага камітэта, выкарыстаўшы падыход да горада 1-га Мінскага рэвалюцыйнага палка латышскіх стралкоў Р.І.Берзіна, захавалі ў павеце ўладу Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

Камітэт бачыў сваю задачу ў арганізацыйнай рабоце па падрыхтоўцы партызанскіх атрадаў для барацьбы з акупантамі.

Нягледзячы на спробы Чырвонай Арміі ўтрымаць горад, нямецкія войскі 1 сакавіка 1918 г. усё ж занялі Гомель. А тым часам павятовы Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, выконваючы пастаўленую перад ім задачу, выдае адозву да насельніцтва. У больш познія часы яна стала хрэстаматыйным дакументам аб палітыцы акупацыйных улад. Пазнаёмімся з ёю: «На оккупированной территории отбирается от населения и вывозится всё, начиная от довольствия и кончая медными ручками от дверей, забирается у крестьян последняя корова, убивается последняя свинья, режется последняя курица — идёт небывалая вакханалия грабежа». (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 130. Воп. 12. Спр. 13. Л. 67.)

Якая была мэта адозвы? Магчыма, камітэт звяртаўся да кіраўніцтва Заходняга фронту за дапамогай, падкрэсліваючы гатоўнасць мясцовага насельніцтва да барацьбы.

Якім жа сапраўды было становішча ў павеце? Адкінем у бок словы аўтара аб «медных ручках» сялянскіх хат і «последней курице», якія выконваюць эмацыянальную ролю. На самай справе становішча, у адрозненне ад іншых

мясцін Беларусі, было некалькі іншым. Па-першае, у немцаў не было патрэбы забіраць у сялян «довольствие». У Гомелі засталіся ад часоў імперыялістычнай вайны велізарныя запасы правіянту і фуражу. Яны былі пакінуты войскамі Чырвонай Арміі і захоплены нямецкімі войскамі. Таму ўвесь час акупацыі немцы не мелі патрэбы ў канфіскацыі маёмасці ў насельніцтва. Яны нават не вывезлі харчовыя прыпасы. Справаздачы сведчаць, што ўжо ў 1919 г., пасля іх адыходу, склады былі часткова абрабаваны мясцовымі спекулянтамі, а часткова вывезены інтэндантамі ў галоднае Паволжа.

Па-другое. Усё ж некаторыя свае патрэбы нямецкім войскам прыйшлося задавальняць за кошт мясцовага насельніцтва. Інтэнданты ездзілі па вёсках і нарыхтоўвалі для арміі мяса і свежы фураж шляхам закупак. Закупкі вяліся за грошы, якія ўвесь час знаходзіліся ў стане інфляцыі, таму насельніцтва неахвотна прадавала сваю маёмасць. Паміж мясцовымі партызанамі і інтэнданцкімі атрадамі ўзнікалі баі і, адпаведна, рэпрэсіўныя акцыі з боку немцаў.

Для сумеснай барацьбы бальшавікі Палескага камітэта зрабілі спробу аб'яднацца з эсэрамі і выкарыстаць іх уплыў на навакольнае сялянства. Але блок не ўтварыўся, і ў павеце існавалі два рэўкомы.

Для ўзмацнення бальшавіцкага ВРК з Масквы паступала дапамога зброяй, кіраўнікамі атрадаў, прапагандыстамі «Спартака».

У сакавіку 1918 г. штаб Заходняга фронту распрацаваў план партызанскага паўстання і захопу горада з дапамогай агульнага наступлення. Кіраўнікі атрадаў атрымалі загад пачаць больш актыўную барацьбу. Вынікам дырэктывы было правядзенне партызанамі некалькіх акцый. «В Гомеле нашими партизанами взорваны гостиница «Савой» и городской театр, где были расквартированы немцы, также брошены бомбы в кофейню, где ужинал германский штаб. Точные потери неизвестны, но, по имеющимся сведениям, очень значительны». (Разгром немецких захватчиков в 1918 году. Госполитиздат. 1943. С. 136.)

У пачатку мая нямецкае камандаванне перадало Гомель Украіне, утварыўшы Палескую губерню. У горад уступілі гайдамакі гетмана Скарападскага і сумесна з нямецкімі захопнікамі ўстанавілі адзінае кіраўніцтва.

У сярэдзіне жніўня паводле загаду ВРК Украіны пачынаюцца ваенныя дзеянні партызан па захопе ўлады на месцах. Па сваёй задумцы гэта быў даволі авантурны і дрэнна падрыхтаваны план. Сігналам для паўстання атрадаў павінен быў стаць напад на нямецкія казармы і крушэнне цягніка на чыгунцы Кіеў — Гомель. Цягнік быў пушчаны пад адхон каля станцыі Зябраўка ў ноч з 16 на 17 жніўня падпольшчыкамі завода Варшаўскай акругі. Напад на казармы быў няўдалы.

Удзень 17 жніўня выступілі атрады завода Варшаўскай акругі і фабрыкі «Везувій». Яны захапілі казармы ў Навабеліцы, абяззброілі і затрымалі 150 чалавек, знішчылі нямецкую камендатуру. На большае сілы не хапіла, і атрады адступілі ад горада.

У канцы жніўня была дасягнута дамова паміж Германіяй і РСФСР аб эвакуацыі нямецкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі. Палескі камітэт пачаў падрыхтоўку да ўзяцця ўлады ў свае рукі. У адказ правыя партыі ўтварылі ў Гомелі «Камісію па абароне горада ад злачынных элементаў і ўзброеных банд». Члены камісіі звярнуліся за падтрымкай да насельніцтва з мэтай барацьбы супраць анархабальшавізму. Але падзеі 9 лістапада 1918 г. у Германіі, дзе адбывалася рэвалюцыя, спрыялі бальшавікам. Пачалася хуткая

рэвалюцыянізацыя войскаў горада. Утварыўся нямецкі Савет салдацкіх дэпутатаў, але з большасцю ў іх лідэраў правасацыялістычнай арыентацыі. Таму супрацоўніцтва з рускімі бальшавікамі не ладзілася. З дазволу Савета 16—17 снежня адбылася гарадская рабочая канферэнцыя, канферэнцыя сацыялістычных партый. Улада перайшла да гарадской Дырэкторыі. У яе склад увайшлі прадстаўнікі гарадской думы, цэнтральнага савета прафсаюзаў, рабочай канферэнцыі і камітэта чыгуначнікоў. Зноў аднавілася дзейнасць гарадской думы.

У той жа час 16 снежня ў Мазыры адбыліся перамовы паміж прадстаўнікамі нямецкага камандавання 41 корпуса і дэлегацыяй РСФСР аб вывадзе нямецкіх войскаў з Палескай губерні. Адным з патрабаванняў расійскай дэлегацыі быў увод у Гомель часцей Чырвонай Арміі і перадача ўлады бальшавіцкаму ВРК. Нямецкае камандаванне было вымушана прыняць умовы рускага боку.

14 студзеня ў горад увайшлі атрады Чырвонай Арміі, і была ўстаноўлена бальшавіцкая дыктатура. Вывад германскіх войскаў з тэрыторыі Гомельскага павета дазволіў бальшавікам пачаць рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Але ў маі становішча Савецкай Расіі пагоршылася. 8 мая 1919 г. Народны камісарыят па ўнутраных справах выдае цыркуляр аб мабілізацыі. «ЦК РКП и ВЦИК признают основной задачей момента сокрушение Колчаковской контрреволюции. ВЦИК и Советы в своём заседании от 15 апреля приняли декрет о призыве среднего и бедного крестьянства к борьбе с контрреволюцией и, исходя из чрезвычайного положения на восточном фронте, предлагают всем местным партийным организациям довести свою работу на обслуживание армии до высшей степени напряжения и, учитывая, что военная победа нам необходима в самый короткий срок, иначе война приведёт нас к неминуемому экономическому истощению страны и

Гэты групавы здымак зроблены ў 1918 г. на ўспамін аб сумеснай вайсковай службе ў Багунскім палку пад камандаваннем М.А.Шчорса.

Стаяць злева направа: Палевікоў Емяльян Андрэевіч і Палевікоў Андрэй Іванавіч; сядзяць злева направа: Хімчанка Дзмітрый Фёдаравіч і Чуйкоў Агафон Мартынавіч, ураджэнцы в. Раманавічы Улукаўскага сельсавета.

Гэтыя маладыя хлопцы добраахвотна ўступілі ў Чырвоную Армію. Служылі ў першым рэвалюцыйным палку імя Леніна, затым ваявалі ў Багунскім палку супраць немцаў і пятлюраўцаў.

У баях за савецкую ўладу загінулі смерцю храбрых Емяльян і Андрэй Палевіковы. Чуйкоў памёр пасля вайны.

Хімчанка Д.Ф. у гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся супраць фашысцкіх захопнікаў, быў паранены. Пасля дэмабілізацыі ўдзельнічаў у аднаўленні разбуранай калгаснай гаспадаркі.

крушению Советской власти». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 25. Л. 19.)

У Гомельскім павеце, у адпаведнасці з цыркулярам, пачынаецца добраахвотная мабілізацыя. Але сяляне, якія жадалі міру і яшчэ не атрымалі зямлі, адмовіліся ад абароны савецкай улады. Вось якія справаздачы атрымаў павятовы выканком. «На съезде Совета 19 мая в присутствии инструктора ВЦИК Хенкина было решено, чтобы каждый сельский Совет наметил по нескольку человек с тем, чтобы из их числа произвести необходимую мобилизацию добровольно или посредством жребия, но и эта мера не достигает никакого успеха. Советы доносят, что добровольцев нет. Покотская волость». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Адз. зах. 25. Л. 23.)

«Волисполком сообщает, что произвести мобилизацию 10—20 человек по волости честных бойцов за рабочее дело исполкому несмотря на агитацию и воззвания к населению не удалось. Объясняется это тем, что лучшие бойцы за освобождение уже давно состоят добровольцами в Красной Армии. Дятловичская волость». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Адз. зах. 25. Л. 61.)

Складанае становішча Савецкай Арміі вымусіла ўрад перайсці вясной 1919 года да ўвядзення надзвычайных мер. Адбываецца прымусовая мабілізацыя насельніцтва ў Чырвоную Армію, вядзецца рэквізіцыя «излишков» харчовых прадуктаў і фуражу ў сялян. Палітыка «ваеннага камунізму» яшчэ больш пагаршае становішча насельніцтва вёскі. Сяляне адмаўляюцца здаваць прадукты. «Очень трудно получать урожай хлебов от крестьян, засевавших только с части угрозы. Применение вооружённой силы оказывает своё действие, но и то не всегда и везде. Не всё ещё взыскано с Поколюбичской и Дудичской волостей. На неоднократные просьбы о высылке вооружённых отрядов Губпродком каждый раз отказывал, мотивируя свой отказ неимением оружия, посылать же невооружённые отряды, конечно, было бы бесполезно». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 220. Л. 13.)

Незадаволенасць сялянства аграрнай палітыкай і працяг вайны прывялі да паўстання ў павеце, вядомага як Стракапытаўскі мяцеж. Мяцеж быў падаўлены, але праблемы засталіся.

У пачатку сакавіка 1920 г. пачалося наступленне войскаў Польшчы. Чырвонаармейскія часці Гомельскага ўмацаванага раёна не змаглі даць ворагу належны адпор. Асабовы склад умацаванага раёна, які знаходзіўся на мясцовым забеспячэнні, не заўсёды атрымліваў нават паўфунта хлеба ў дзень. Поўнасцю была развалена дысцыпліна ў часцях. Масавы характар набыло дэзерцірства. З 25 тысяч чалавек, што лічыліся ва ўмацаваным раёне, у студзені 1920 г. у патрэбны момант не аказалася ніводнага цалкам баяздольнага батальёна.

У канцы мая ў губерні пачалася кампанія барацьбы з дэзерцірствам. Адначасова з прапагандысцкай работай сярод дэзерціраў і тых, хто іх укрываў, ужываліся рэпрэсіўныя меры. Усе вёскі былі падзелены на 3—4 двары. Жыхары іх неслі калектыўную кругавую адказнасць за дапамогу дэзерцірам. Найбольш распаўсюджанай мерай пакарання была канфіскацыя маёмасці і перадача яе сем'ям чырвонаармейцаў. Рэпрэсіі далі станоўчыя вынікі. З 1 па 20 чэрвеня «добраахвотна» з'явіліся 36 324 чалавекі.

5 чэрвеня ўгарраўком выдаў загад № 37. «В связи с близостью фронта к Гомельскому уезду и на основании приказа военного командования необходимо в срочном порядке организовать работу по укреплению позиций, исправлению дорог, мостов и др. срочных задач военно-полевого строительства, а потому объявляет до сведения всех

Волревкомов, сельских Советов о точном, неуклонном проведении в жизнь следующих приказов:

1. Привлечь к полевым окопным работам в порядке трудовой повинности граждан обоего пола мужчин от 19 до 55 лет, женщин от 19 до 40 лет волостей Вылевской, Гомельской, Дятловичской, Поколюбичской, Носовичской, Телешковской и Марковичской.

2. Ежедневно представлять в распоряжение военного-полевого строительства этого района для выполнения работ по 4000 человек чернорабочих и 300 квалифицированных — плотников, столяров, каменщиков и др., ведя поочерёдный наряд на деревни вышеперечисленных волостей.

3. Приступить к проведению настоящей трудовой мобилизации со дня опубликования сего приказа.

Приказ считать боевым. Ответственность за невыполнение или задержки в поспешности выполнения нарядов на людей и подводы ложится полностью на личный состав волревкомов и будет строго караться по законам военно-революционного времени.

5 июня 1920 г. Предугорревкома Селиванов». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1616. Воп. 1. Спр. 31. Л. 15.)

Савет Народных Камісараў прыняў тэрміновыя меры дапамогі Заходняму фронту. На фронт няспынна прыбываюць новыя рэзервы, паступае зброя, боепрыпасы, абмундзіраванне, харчаванне. Супраць польскіх войскаў накіроўваюцца самыя баяздольныя часці Чырвонай Арміі.

5 чэрвеня 1920 г. 1-я Конная Армія прарвала фронт на паўднёвым захадзе ад Кіева і накіравалася па тылах праціўніка. 4 ліпеня перайшлі ў наступленне войскі Заходняга фронту. Пачалося масавае адступленне польскіх войскаў. Да сярэдзіны жніўня 1920 г. Чырвоная Армія падышла да Варшавы, але ў выніку грубых памылак, дапушчаных камандаваннем, была разбіта. Частка войскаў перайшла на тэрыторыю Германіі і была інтэрніравана, а астатнія адступілі на тэрыторыю Беларусі. Але і Польшча не мела магчымасці аднавіць Рэч Паспалітую і была вымушана ўступіць у перагаворы з Расіяй. 18 кастрычніка спыніліся ваенныя дзеянні на савецка-польскім фронце. У выніку дамоўленасці заходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад Польшчы, а ўсходнюю захавала за сабой Расія. На землі Пасожжа прыйшоў мір.

М.М.Халюшкоў.

Актыўныя ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

ГАДУНОЎ Савелій Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1891 г., жыхар вёскі Галавінцы. У чэрвені 1917 г. служыў на лінкоры «Гангут», быў абраны ў суднавы камітэт. У складзе каманды абараняў ад юнкераў Зімні палац. Удзельнічаў у барацьбе за ўстанаўленне савецкай улады ў Маскве. Калі пачалася грамадзянская вайна, быў у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі, ваяваў на Украіне. За актыўны ўдзел у барацьбе за ўладу саветаў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

КАВАЛЁЎ Сцяпан Мікалаевіч, нарадзіўся у 1894 г. у в. Галавінцы. Калі пачалася грамадзянская вайна, юнак добраахвотна ўступіў у першы Гомельскі пралетарскі батальён. Мужна змагаўся з белапалякамі. Загінуў у час баявых дзеянняў.

КУКАЛЕЎ Філіп Сысоевіч, нарадзіўся ў 1886 г. у в. Скіток. У 1914 г. быў прызваны ў царскую армію, удзельнічаў у баях першай імперыялістычнай вайны. У кастрычніку 1917 г. абраны салдацкім дэпутатам і накіраваны спачатку ў Петраград, а потым прадстаўніком савецкай улады ў г. Броды. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны працаваў старшынёй сельсавета на радзіме (в. Скіток).

МАЙДЗЁНАЎ Залман Шоламавіч, жыў у в. Улукаўе. У 1918 г. працаваў у Гомелі. Калі нямецкія войскі захапілі горад, пайшоў у партызаны. Змагаўся на Чарнігаўшчыне з памагатымі немцаў гайдамакамі. У час выканання баявога задання разам з аднавяскоўцам Лаптуховым А.Я. трапіў у рукі гайдамакаў, якія прыгаварылі іх да расстрэлу. Ноччу Лаптухову ўдалося збегчы. Майдзёнаў З.Ш. разам з іншымі арыштаванымі быў расстраляны.

ПАДЛІПСКІ Адольф Фердынандавіч, нарадзіўся ў 1893 г. у м. Пяскі Віленскай губерні. У сакавіку 1918 г. дэмабілізаваны з войска і накіраваны ў Гомельскі павет па месцы жыхарства. Удзельнік партызанскага руху і падпольнай барацьбы супраць нямецкіх і польскіх акупантаў, а таксама разгрому Стракапытаўскага мяцяжу.

ПЛОТНІКАЎ Фёдар Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1913 г. у сялянскай сям'і. Васемнаццацігадовым юнаком добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію. У час рэвалюцыі прымаў актыўны ўдзел у раззбраенні жандараў і паліцыі. Змагаўся супраць войскаў Калчака і Урангеля. Служыў у Самаркандскай дывізіі. У яе складзе ўдзельнічаў у баях пад Перакопам, фарсіраваў Сіваш. Змагаўся з бандамі Махно, Марусі, Іванова, Злотнікава, польскіх акупантаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Адзначаны многімі ўрадавымі ўзнагародамі.

ПРОЦКІ М. М., Улукаўскі сельсавет, падпольшчык, расстраляны палякамі 7.5.1920 г. у Мінску.

ФЕАКЦІСТАЎ Я. Н., удзельнічаў у барацьбе супраць германскіх інтэрвентаў у 1918 г.

ХІМАКОЎ Іван Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1899 г. у в. Бабовічы. З сялян. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг., Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У час падрыхтоўкі Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнічаў у затрыманні эшалонаў карнілаўскіх войскаў на ўчастку Гомель—Жлобін. У час нямецкай акупацыі 1918 г. на падпольнай рабоце ў Гомелі, адзін з арганізатараў і кіраўнік забастоўкі чыгуначнікаў у ліпені 1918 г., удзельнік аднаўлення савецкай улады, камісар чыгуначнага вузла. Пасля грамадзянскай вайны — старшыня транспартна-спажывецкага таварыства Заходніх чыгунак. З 1929 г. дырэктар Гомельскага паравозарамонтнага завода. На XIII і XIV з'ездах КП(б)Б выбраны членам ЦК. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР. Памёр у 1937 г. Яго імем названа вуліца ў Гомелі.

ЦВЯТКОЎ М. П., удзельнік рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, пертызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну.

С.С.Гадуноў.

С.М.Кавалёў.

З.Ш.Майдзенаў.

М.М.Процкі.

М.П.Цвяткоў.

Я.Н.Феакцістаў.

Дакументы сведчаць

ПЕРСПЕКТЫВА ГАСПАДАРАК ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

1919 г.

Главную отрасль хозяйства составляют лесные богатства, и в этом отношении все отрасли промышленности, основанные на разработке леса, должны получить должное развитие. В данный момент основная задача местных хозяйственных органов — использовать самым интенсивным образом ближайшие наделы для накопления на берегах и у железнодорожных станций дровяного топлива. В накоплении этих запасов заинтересована вся Россия, ее фабрики и заводы, ее железные дороги. Местные нужды могут быть удовлетворены... отделом уездного продовольственного комитета. Что же касается фабрик и заводов, то им должна быть предоставлена возможность использовать имеющиеся у них хозяйственные аппараты для заготовки топлива.

Такого рода строгое разграничение функций проводится фактически лесным отделом Гомельского Совета народного хозяйства. Задача этого отдела — напряжение всех сил и средств для достижения максимальной заготовки и вывозки дровяного топлива. И не приходится сомневаться в том, что при обилии частных заготовительных аппаратов в нашем районе, широко используемых лесным отделом на основании декрета Совнаркома, удается достигнуть довольно благоприятных результатов.

...Гомель издавна обслуживает южные рынки изделиями своих лесопильных заводов. Теперь же особенно, когда натуральный обмен между различными областями России начинает завоевывать все более и более обширные рынки, изделия наших лесопильных заводов будут играть немаловажную роль в общем товарообмене. То же относится к фанерному производству.

В то время как русская фанера имела очень небольшой сбыт на внутреннем рынке и направлялась главным образом в Англию, теперь она может употребляться не только для нужд армии, но и для повседневных нужд населения.

Новобе́лицкие лесопильные заводы подчинены теперь деревообделочному подотделу лесного отдела Совета народного хозяйства.

Богатые хвоей леса Гомельского района могут быть источником для целого ряда вспомогательных производств: одна из важнейших — смолокурение. Смола, с одной стороны, может быть употреблена в мыловарении, с другой — путем переработки может дать клеевое вещество гарпиус. Во втором продукте весьма остро нуждается наша писчебумажная Добрушская фабрика, являющаяся одной из крупнейших бумажных фабрик России.

Консерватизм Российской частной предпринимательской инициативы тормозит развитие производственных сил России. Ныне к жизни вызваны новые силы и нет сомнения, что как ни тяжело общее экономическое положение — удастся сделать то, что было не под силу капиталистической буржуазии в благоприятных условиях мирного времени.

Известия Гомельского ревкома. 1919. 10 лютага.

У САВЕЦЕ СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

15 студзеня 1918 г.

З пасяджэння выканаўчага камітэта

Докладчик Дятловичской волости т. Дубоделов докладывает, что население утопает в анархии: власть есть, но ее не видно. Земская управа влачит жалкое существование... По словам товарища докладчика, идет сильная анархия, хищения и грабеж. Земство к населению относится очень плохо ввиду недостатка средств, чем оплачивается жалование служащим. Главным образом докладчик предусматривает наступление весны, разделы земли, а также обсеменения полей. Масса расхищения народного богатства — лесов. Волостное земство организовало революционную дружину, которая теперь препятствует хищению, даже она воздействовала морально на хищников, которые хитили раньше лес, с которых пришлось взыскать часть денег за порубку лесных материалов, не замечается, что население относится враждебно к революционной дружине. Была надежда на солдат с фронта, но увы — надежды не оправдались: они не только не помогли делу, но внесли анархию. Указав на недостаток интеллигентных сил, также культурно-про-

светительность, он подчеркивает, что на местах нет власти. Докладчик просит приготовиться к весне. Необходимо на население не только действовать морально, но и физически, т. е. применять вооруженную силу, если такая потребуется. Было ограблено одно имение с участием фронтовиков.

Докладчик по Поколюбичской волости т. Гобарев докладывает, что отношения масс к советской власти на местах хорошее, но является двоевластие, власть фронта и власть Совета Крестьянских Депутатов. Но после некоторых разъяснений т. фронтовики подчиняются власти Совета. Население критикует Советы потому, что они не проявляют свою волю. Об организации власти докладчик указывает, что они пытались несколько раз организовать исполнительные комитеты на местах, но безуспешно, т. к. члены бесплатно работать не хотят. О грабежах и рубке леса — березняк рубят на дрова беспрепятственно, т. к. нет власти.

Больше всего производят беспорядки солдаты, не бывшие на фронте, а сидевшие в тылу… Грабят те, у кого всего достаточно. После чего докладчик сводит к тому, что нет власти на местах, таковую нужно создать и подчинить себе массу.

Известия Гомельского ревкома. 1918. 2 лютага.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ГОМАБЛСЕЛЬГАСА ЗА 1919 г.

2 марта 1919 года образован Гомельский Гомоблсельхоз. В истекшем году работа в Гомсельхозе шла очень слабо, так [как] уезд очень часто подвергался контрреволюционным репрессиям, в особенности работа сильно пострадала во время мартовского восстания, длившегося 3—4 дня… Организационная работа шла очень медленно, так, не было достаточно опытных инструкторов. Но всё же, несмотря на все препятствия, было организовано 13 коллективных хозяйств: 2 коммуны, 11 артелей. Общая площадь земли 1214 1/2 дес.; имеется на ней 1483 едока.

1. Коммуна «Раннее утро», занимает Севскую лесную дачу близ Добруша. Лошадей — 4, коров 8, свиней 5, поросят 8, кур 30, кроликов 8, плугов 2, борон 3, телег 2; площадь земли 100 дес.; едоков 33.

2. Любенская артель школьных работников г. Гомеля обрабатывает участок в имении Любны. Коров 7, лошадей 5, свиней 6, уток 3, гусей 3, плугов 4, борон 4, сеялок 1; площадь земли 100 дес.; едоков 275.

3. Коммуна «Красный пахарь» занимает земли имения «Зеефельд». Лошадей 17, коров 24, жеребят 9, телят 5, плугов 20, борон 20, веялок 2; площадь земли 164 десятины; едоков 61.

4. Новиковская артель железнодорожных учителей занимает участок Больших Новиков. Коров 3, лошадей 2, плугов 2, борон 1, возов 1, вёдер 25, лопат 10; площадь земли 121 десятина; едоков 112.

5. Переростовская артель занимает имение «Петровск». Лошадей 32, коров 33, телят 52, свиней 60, поросят 10, кур 102, плугов 20, борон 26, лопат 1, веялок 1, сеялок 1, кос 1; площадь земли 410 десятин; едоков 116.

6. Новобелицкая артель железнодорожных и советских служащих возле имения «Улуковье». Площадь 5 десятин, едоков 244.

7. Носовичская артель занимает участок имения «Носовичи». Лошадей 1, плугов 1, лопат 4, копаниц 1, вёдер 2, сбруя 1; площадь земли 6 десятин; едоков 91.

8. Старо-Крупецкая артель «Красное знамя» занимает земли у Старого и Нового Крупца. Лошадей 5, коров 11, телят 1, овец 1, свиней 9, поросят 9, кур 20, плугов 5, телег 5, борон 4, соломорезка 1; площадь земли 76 десятин; едоков 36.

9. Артель «Труд» занимает земли имения «Ветка». Лошадей 7, коров 46, коз 4, плугов 5, борон 2, повозок 1, телег 7; площадь земли 40 десятин; 272 едока.

10. Артель «Заря новой жизни» занимает земли у села Жгунь. Лошадей 9, коров 10, свиней 5, кур 40, плугов 18, борон 6, телег 5, хомутов 10; площадь земли 10 десятин; едоков 26.

11. Артель «Вперёд» занимает участок в 11 верстах от Гомеля за Новобелицей с правой стороны шоссе. Грабли 3, лопаты 3, копаницы 5, пила 1, хомут 1, сани 1; площадь земли 10 десятин; едоков 26.

12. Уваровичская артель занимает участок в 4-х верстах от с. Руденца. Лошадей 6, коров 13, молотилок 1, веялок 1, кос 15, лопат 5, телег 6, плугов 3, борон 3; площадь земли 13 десятин; едоков 75.

13. Гомельская трудовая артель «Пионер» обрабатывает урочище «Малые Новики». Лошадей 2, коров 1, плугов 3, борон 3, телег 1; площадь земли 11 дес.; едоков 71.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 430. Л. 91—93.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ІНСТРУКТАРА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

26 красавіка 1919 г.

С 24 по 28 марта 1919 года в Гомеле произошло восстание. Восстание носило чисто погромный характер и окончилось зверским убийством десяти товарищей коммунистов, работавших до восстания при уездном исполкоме ответственными работниками. Многие дома города были разрушены, 4-дневный мятеж причинил городу большие убытки, затормозил транспорт, увеличил разруху, и вследствие этого возросли бедствия населения.

Прежде всего я коснусь Гомеля — это узловая станция. Город расположен почти что в прифронтовой полосе и стоит между богатой Украиной и голодной Великороссией. Это самое удобное место для развития спекуляции. Затем при освобождении Гомеля от немецких войск, как рассказывают, в городе были громадные запасы продуктов. С восстановлением якобы Советской власти на эти запасы набросились десятки Чрезвычайных и других закупочных организаций из голодных мест России. На все продукты цены быстро возросли, и перед восстанием вместо 1—2 рублей фунт хлеба стоил 7—8 рублей. Затем положение в городе ещё больше ухудшилось с размещением нескольких полков красноармейцев. Две трети запасов продовольствия упродкома отпускались Красной Армии, город голодал, гарнизон недоедал, а поэтому недовольство росло как среди тех, так и среди других.

Далее — жилищный вопрос. Все казармы были оставлены немцами в запущенном состоянии. Все имеющиеся военные части пришлось размещать по частным квартирам. Буржуазия и черносотенцы имели удобный случай развращать красноармейцев.

По уезду.

По уезду настроение крестьян спокойное. Некоторые из волостей и сёл принимали участие в контрреволюционном мятеже. В данный момент один за другим проходят волостные съезды, которыми избираются депутаты в горсовет, согласно положению. На 22 мая созывается Гомельский уездный съезд Советов.

Инструктор инструктивного отдела Народного комиссариата внутренних дел Соловьёв.

Расійскі цэнтр захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. Ф. 17. Воп. 6. Спр. 68. Л. 193—195.

З ДАКЛАДА ІНСТРУКТАРА ПАКАЛЮБІЦКАЙ ВОЛАСЦІ

2 снежня 1919 г.

В деревне Лопатин был проведён митинг гражданами д. Лопатин под председательством т. Зубарева. На митинге присутствовало двести человек. На митинге было пояснено о текущем моменте. Международное положение и обустройство избы-читальни и каковое их направление. Мы граждане д. Лопатин всё выше изложеным остаёмся довольны и поддерживаем и выносим своё Постановление всем общим собранием т. Сотникову и отделу Управления и просим чаще посылать нам агитаторов.

Что отдел управления даёт возможность, идёт навстречу для устройства в деревне библиотеки избы-читальни. Какова необходима нужна для населения, почерпнуть духовное знание. Мы гр. д. Лопатин со своей стороны можем выносить только лишь привет нашей Рабоче-крестьянской власти и поддерживаем таковую. Мы граждане д. Лопатин на первый зов согласны выступить на защиту Советской власти. Да здравствуют вожди пролетариата тов. Ленин, Троцкий, Калинин и др. Да здравствует рабочая Красная Армия. Да здравствует всемирная революция и международная братская любовь. Да здравствует третий Коммунистический Интернационал.

Председатель Забаров, секретарь Свиридов

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 79. Л. 13.

З ПРАТАКОЛА З'ЕЗДА СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ ПАКАЛЮБІЦКАЙ ВОЛАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

1 чэрвеня 1919 г.

По § 2 об охране жел. дороги и мостов. После доклада т. Романьковым всех распоряжений по этому вопросу. Съезд имея в виду, что в р-не волости имеется кроме полотна ж.

д. еще два моста по грунтовой дороге Гомель – Ветка: первый мост на границе Прудок – Поколюбичи и второй в урочище «Хавхлица». Постановил: охрану первого моста между Прудком и Поколюбичами поручить гражданам села Поколюбичи и второй мост урочища «Хавхлица» гражданам села Старого. Охрану железной дороги ЛР от семафора Гомель сортировочный по направлению на ст. Костюковка до переезда поручить гражданам д. Залипье, от переезда до урочища «Кривая» на границе с. Красного, от урочища «Кривая» до Еременского кладбища гражданам с. Еремина, от Еременского кладбища до семафора входного ст. Костюковка на граждан д. Лопатино, от семафора входного ст. Костюковка до семафора за Костюковку на гр. д. Костюковка, от семафора за Костюковкой до Минковой будки на граждан д. Пыхони, от Минковой будки до границы Руднецкой волости на гр. дер. Замостья и села Данилович. Сельские Советы обязаны ввести очередной наряд на ежедневную высылку двух и более человек на эти шаги по усмотрению железнодорожной администрации.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 79. Л. 100.

З ЗАГАДУ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННАГА КАМІСАРЫЯТА

20 чэрвеня 1920 г.

1. На основании приказа по Западному военному округу за N 183 и приказа по войсковым частям и учреждениям Гомельского губернского комиссариата по военным делам от 15 июня с. г. N 231 возлагается на начальников учреждений, управлений в семидневный срок проверить списки личного состава рабочих и служащих мужского пола и лично убедиться, что в их числе нет дезертиров.

2. О всех лицах, которые оказались незаконно находящимися и подлежащие передаче в ряды войск, немедленно должно быть сообщено.

3. Независимо сего, в недельный срок необходимо передать в Красную Армию тех лиц, которые хотя бы и правильно воспользовались отсрочкой. При выделении должно быть обращено особое внимание на возможность использования для армии 8 младших возрастов от 1901 до 1894 г. рождения.

Гомельский Уездный Военный Комиссар
Шершнев
Военный руководитель
Титов
Начальник мобилизации отделения
УТКО

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 882. Воп. 1. Спр. 21. Л. 12.

З ПІСЬМА ЎПАЎНАВАЖАНАГА РЭЎКОМА С.КУЛЯШОВА

19 мая 1920 г.

Тов. Селиванов!

Сообшаю Вам, что я нахожусь при волости Поколюбичи по поручению угрревкома. Я здесь ознакомился с делами. Что касается работы волостьревкома – лучшего нельзя было бы требовать, люди, что называется, на своих местах. По всей волости много бегущих дезертиров с фронта, которые представляют угрозу, если не принять соответствующие меры. В некоторых местах дезертиры действуют самостоятельно: грабят, воруют у крестьян.

Бороться с дезертирами не можем, т.к. нет вооруженной силы. А нужен отряд, чтобы обезоружить дезертиров. Это если бы я имел точные сведения по всей волости и сообщил вам, то вы бы тоже призадумались.

Если взять одну маленькую деревушку д. Старое, то получается такая цифра – 136 человек, которые должны быть в Красной Армии, а 103 чел. точно дезертиры, которые сидят дома. А в больших селах по 600 чел. дезертиров сидят дома. Теперь для вас будет понятно, какие от этого последствия могут быть. Сейчас они больше всего действуют провокационной агитацией, что отражается сильно на населении.

В Вол. ревком есть предписание из Красной Армии о задержании убежавших дезертиров из части, но нет силы для задержки, т.к. имеется 3 человека милиционеров с винтов-

ками без патронов и 4 человека красноармейцев при Волвоенкоме совсем без винтовок. После всего выше изложенного шлю вам товарищеский привет и лучшие мои пожелания.

Остаюсь
С.Кулешов

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 109. Л. 2.

З УСПАМІНАЎ І.І.ЛАБУДЗЕВА

Я призван в пятнадцатом году. Был физически сильным. Офицер из призывной комиссии пощупал мои мускулы, заглянул в зубы, как лошади, и что-то черкнул на моей голой спине. Вышел я в комнату, где толпились такие же обнаженные парни, и попросил первого попавшегося посмотреть, что написано. Говорит — УПК. Что это значит, никто понятия не имел. Только потом писарь разъяснил: учебная пулеметная команда. Увезли в Вязьму. После учебы — фронтовая окопная жизнь. Бои. Отступления. Был ранен. Отлежался. Про Февральскую революцию узнал в теплушке, возвращаясь на фронт. Вскоре стало известно, что Временное правительство решило продолжать войну до победного конца. Началось переформирование частей. Нас, группу опытных пулеметчиков, направили в Сибирский корпус, который занимал оборону на участке Молодечно—Залесье—Сморгонь. Среди солдат велась большевистская агитация против войны, за мир и власть Советов. Сибиряки говорили местным, мол, чего ждете, вы же здешние, разбегайтесь по домам.

Мы с Евменом Сидоренко так и сделали. Вернулись в свою родную Зябровку, что недалеко от Гомеля, скинули шинели, пошли работать на дровяные склады. После Октябрьской революции нас, фронтовиков, закружило, будто в водовороте. Митинги, речи, призывы защищать Отечество и революционные завоевания. А от кого защищать, на чьей стороне? Это разъясняли агитаторы Полесского ревкома, который начал создавать красногвардейские отряды. В самом Гомеле сформировали 4 отряда — один состоял из рабочих железнодорожных мастерских, в другом были рабочие депо, в остальных — крестьяне окрестных волостей. А всего в одном только Гомельском уезде действовало более 15 таких формирований.

Отряд, в который мы с Сидоренко записались, назывался 2-й Гомельский крестьянский. Как только в нем появились пулеметы, меня назначили начальником пулеметной команды.

Шли годы. Я с гордостью следил за тем, как Родион Яковлевич Малиновский поднимался по ступеням воинской службы. Есть у меня карта, на ней помечен путь армии и войск фронтов, которыми командовал мой сослуживец. Помнил ли он нас, своих белорусских друзей по гражданской войне? Конечно, помнил! Когда я написал ему по личному вопросу (Родион Яковлевич был тогда министром обороны СССР), буквально через несколько дней получил ответ на бланке депутата Верховного Совета СССР, Маршала Советского Союза Р.Я.-Малиновского. Он сообщал, что просьба моя удовлетворена. Под машинописным текстом от руки была сделана приписка: «Желаю долгих лет жизни и крепкого здоровья, старый боевой товарищ!»

Друкуецца па кн.: «В огне гражданской войны». Мн., 1987.

Першыя пераўтварэнні пад час грамадзянскай вайны

Пытанне аб зямельнай маёмасці паспрабавала вырашыць Земская павятовая ўправа. Але на яе пасяджэнне прыехалі прадстаўнікі толькі ад трох валасцей. У рабоце з'езда прынялі ўдзел прадстаўнікі ВРК. Старшыня камітэта М.Хатаевіч выступіў з прамовай аб неабходных задачах. «Настроение крестьян после десяти месяцев гнёта немцев, гайдамаковцев, большевистское. Необходимо создать рабоче-крестьянскую твёрдую власть. Во многих местах революционной власти ещё нет. Существуют земские кулацкие советы и т. д. Они могут быть перекрашены, но они остаются, несмотря на перемену обстановки, теми же врагами Советской власти. Связь между городом и деревней необходимо наладить, и только тогда эта связь будет создана, когда будет созван съезд крестьянских депута-

тов, который будет верховной властью в уезде. Но для этого нужно наладить рабоче-крестьянскую власть в тех местах, где она ещё не имеется. В уезде создаётся инструктивно-информационный отдел, цель которого является инструктирование уезда». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 14. Л. 20.)

Бальшавіцкі настрой насельніцтва заключаўся ў тым, што сялянства спадзявалася на перадачу яму ў прыватнае карыстанне памешчыцкіх зямель згодна з абяцаннямі бальшавікоў. Таму яно лаяльна адносілася да новай улады.

Але выхад «Положения о социалистическом землеустройстве и мерах перехода к социализации земли», выдадзенага СНК у лютым 1919 г., выклікаў сярод іх незадаволенасць. Яно падвяло рысу пад спадзяваннямі сялян на атрыманне зямлі, на сваю заможную гаспадарку.

Далейшыя падзеі паказалі, што Савецкі ўрад, выдаўшы «Положение...», зрабіў памылку і ва ўмовах грамадзянскай вайны пазбавіў сябе падтрымкі з боку сялян. За дэкларатыўнымі артыкуламі заявы аб сацыялізме і камунізме малаадукаваныя сяляне ўсвядомілі адно, што лепшай долі ад новай улады чакаць не даводзіцца. Чакаюць жа іх нейкія камуны і арцелі, у якіх сяляне не мелі вялікай патрэбы.

Становішча ў павеце выклікала разгубленасць сярод улад. 22 мая 1919 г. на II павятовым з'ездзе Саветаў паўстала пытанне аб зямельнай уласнасці. З'езд прыняў рэзалюцыю наступнага зместу: «Учитывая не созревшее настроение широких крестьянских масс по отношению к общественной обработке земли, а с другой стороны сознавая, что земельные наделы не в состоянии были в кратчайший срок своего существования справиться со своею задачей — оборудовать и обслужить советское хозяйство, съезд подтверждает правильность постановления земельных отделов, по которому все свободные земли больших помещичьих имений сдать под свободный засев в первую очередь беднейшему, во вторую — среднему и в третью — зажиточному крестьянству, устанавливая в таком случае единоличное пользование землей». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 4. Л. 5.)

Уступка, зробленая ўладамі на карысць сялян, не вырашыла канчаткова пытання аб зямлі, але ў іх зноў з'явілася надзея на магчымасць рэформаў.

У гэты час у павеце адбываецца стварэнне камун і арцелей па апрацоўцы зямлі. Восенню 1919 г. былі падведзены вынікі работы. Справаздача сельгасаддзела ад 19 кастрычніка: «В ответ на ваше отношение от 10 октября 1919 года за № 1675 ... сообщаю, что к 1 ноября в Гомельском уезде организовано 12 комплектов: 10 артелей и 2 коммуны. В уезде формируются 4 коллектива.

В общем пользовании земли 1204,5 дес.: засеяно было яровыми посевами 125, 7 дес. Озимый посев на 1920 год — 119,5 дес., снято озимых в 1919 году с 46,5 десятины. Общее число едоков 1483. Отношение окружающего населения к сельским хозяйствам хорошее.

Благодаря тому, что 5 коллективов было организовано слишком поздно, [они] не сумели приступить к яровым посевам и не сумели получить достаточного количества семян... Помимо того, пригородный коллектив как то: артель «Любенская», «Новиковская», «Пионер» были разгромлены проходившими красноармейскими частями. Из них артель «Пионер» была совершенно разорена.

Сдано было продорганам: арт. «Пионер» 500 п. яблок, 100 п. картофеля, 27 п. капусты. «Новиковская» 200 пуд. капусты, «Переростовская» 200 п. бураков, 600 пуд. огурцов.

Положение коллективных хозяйств в данный момент безрадостное помимо 2-х коммун, обеспеченных до следующего урожая. Запасы продуктов остальных коллективов уже давно исчерпаны, и чем продержаться зиму, неведомо.

Сельскохозяйственные коллективы в данный момент нуждаются в железе и скобяных изделиях, живом и мёртвом инвентаре, предметах первой необходимости — соли, керосине, мыле и т. д.». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 37. Воп. 1. Спр. 430. Л. 81—82.)

У чым былі прычыны крызісу сельскагаспадарчых арцелей, камун? Галоўная з іх бачыцца ў складзе іх членаў — беднякоў. Яны не мелі вялікага жадання да працы на зямлі. Спадзяванкі на дапамогу з боку ўлады не здзейсніліся, і пачаўся крызіс гаспадаркі. Аб гэтым сведчаць радкі справаздач інструктара выканкома. «В Носовичской артели во время обхода по огороду было замечено: огород обрабатывается очень плохо, мусорная трава совсем покрыла все овощи, между членами артели получились распри по отношению к работе, после чего они разделили весь посев на участки по равному числу на каждого члена. Причём один работает, а другой нет». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 430. Л. 85.) І далей: «В коммуне «Красный пахарь» имеются клеверные семена пудов 60 с лишним никуда не использованные и совместно с отрубями до 2000 пудов кормов и до сих пор гниют. Между тем как везде и всюду советские лошади и коровы пропадают без корма». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 422. Л. 36.)

Лёс насельніцтва вырашаўся вынікамі грамадзянскай вайны. Краіна атрымала магчымасць падлічыць страты і намеціць шляхі выхаду з крызісу. Нягледзячы на тое што на тэрыторыі павета не адбывалася буйных ваенных падзей, гаспадарка панесла значныя страты. «Период Гетмановщины и германской оккупации можно характеризовать как агонию производительной жизни нашего края. Окраинное положение губернии ещё более усилило царившую здесь спекуляцию. Все предприятия оказались бесхозными и советской власти прежде всего пришлось заняться приведением в известность всего того, что осталось от капиталистического хозяйства». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 71. Воп. 1. Спр. 5. Л. 126.)

Асабліва цяжка было з прадуктамі харчавання і палівам. Чырвонаармейцам Гомельскага ўмацаванага раёна выдавалі толькі паўфунта хлеба ў дзень. Каб выйсці з гаспадарчага крызісу, патрабаваліся надзвычайныя меры.

У лютым 1920 г. былі створаны губернскія, павятовыя і валасныя камісіі па ажыццяўленні ўсеагульнай працоўнай павіннасці. У іх задачу ўваходзілі ўлік і размеркаванне рабочай сілы, вяртанне рабочай сілы на вытворчасць, барацьба з працдэзерцірствам, правядзенне рознага роду кампаній па рамонце дарог, прадпрыемстваў і грамадзянскіх будынкаў, па нарыхтоўцы паліва, сыравіны і інш. Усе рабочыя і служачыя былі замацаваны за прадпрыемствамі на становішчы мабілізаваных, і самавольны адыход з прадпрыемства разглядаўся як дэзерцірства.

Масавай з'явай сталі шматлікія кампаніі — «дзён», «тыдняў». З красавіка па жнівень 1920 г. у губерні былі праведзены тыдні «расшырэння пасяўной плошчы», «умацавання арцеляў, саўгасаў і камун», «рамонту транспарту», «дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў», «барацьбы з непісьменнасцю», «развіцця пралетарскага мастацтва», «барацьбы з эпідэміямі», «добраахвотнай яўкі дэзерціраў».

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны зноў узнікла «сялянскае пытанне». Якую палітыку патрэбна праводзіць у дачыненні да сялян? Як перацягнуць іх на бок рэвалюцыйных пераўтварэнняў? Якая дапамога патрэбна вёсцы? — гэтыя і іншыя пытанні ўзніклі на з'ездзе прадстаўнікоў валрэўкомаў у ліпені 1920 г. Разгарнулася дыскусія.

З выступлення старшыні Упрхарчкома Пярно: «Развёрстка прошлого года выполнена в размере 1 процента: всё-таки приходится прибегать к изъятию из деревни, что даёт малые результаты. На будущий год эти мероприятия применяться не будут: продукты будут взыскиваться с каждого селения по определённой развёрстке».

З выступлення старшыні ўгаррэўкома Селіванава: «При нашем разрушении транспорта и необходимости передвижения войск и военного снаряжения нам приходится забирать у деревни как людей, так и лошадей и подводы. Всё, что диктует настоящий момент, должно быть преодолено».

Сялянскае пытанне абмяркоўвалася і на пасяджэннях V Гомельскай губернскай канферэнцыі РКП(б) 28 жніўня 1920 г. Канферэнцыя перш за ўсё адзначыла слабую пастаноўку агітацыйна-прапагандысцкай і культурна-масавай работы сярод сялянства. У рашэнні канферэнцыі ўказана на неабходнасць падабраць для работы ў вёсцы інструктараў, стварыць камуністычныя ячэйкі, арганізоўваць суботнікі, нядзельнікі, стварыць у кожнай вёсцы хаты-чытальні. Значнае месца ў рабоце з насельніцтвам адводзілася ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, адкрыццю школ.

Паўстала пытанне аб лёсе арцелей і камун. У выступаючых на дыскусіі ўзнікалі розныя меркаванні.

«Шевченко: «При разделах земель крестьянам дают столько, что приходится воровать. У крестьян забирают не излишки, а последнее».

Евстафьев: «Совхозы не оправдали на практике возложенные на них надежды, и их польза является сказкой».

Смирнов: «Развёрстка слишком далека от действительности и доказывает необходимость свободной торговли».

Лесамбров: «Крестьянская масса темна и задача Советской власти на практике доказать, насколько лучше коллективные хозяйства против чересполосицы».

Барабанов: «В Уземотделе ещё нет определённого плана и системы раздачи земли и лесов. Один получает и лес, и земли, а другие ничего».

Седов: «Крестьяне считают совхозы своими врагами и пускают на посевы лошадей и говорят, что совхозы не оправдали себя».

Партийский: «Население вело себя по отношению к совхозам невозможно и за полгода поступило 500 жалоб на самовольствия крестьян» (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 428. Воп. 1. Спр. 205. Л. 194.)

Але палітыка стварэння арцелей і саўгасаў засталася галоўнай у дзейнасці ўрада. Ствараюцца ўмовы для іх колькаснага росту. Вынікі былі станоўчыя. У канцы 1920 г. у Гомельскім павеце існаваў 31 саўгас. Для параўнання: у 1919 г. было 2 камуны і 10 арцелей. У склад саўгасаў уваходзіла, галоўным чынам, сельская беднота, якая спадзявалася палепшыць свой дабрабыт. Аб гэтым сведчаць іх заявы ў органы мясцовага кіравання. «В виду тяжёлого экономического положения, неимоверной дороговизны на предметы продовольствия и отсутствия земли, где можно было бы приложить свой труд и получить скромную долю продуктов сада и огорода для своего существования и своей семьи, организовать трудовую артель «Польза» и просить Гомельский уземотдел утвердить таковую об отводе участка земли и сада Лазаря Попова в Верхнем Брилёве Гомельской волости. Пред. Галкин». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 220. Л. 187.)

Падтрымка саўгасаў становіцца галоўным напрамкам рэформы ў вёсцы. На прыкладзе «образцовых» саўгасаў распаўсюджваецца перадавы вопыт работы. Да працаўнікоў сацыялістычных гаспадарак у газетах друкуюцца звароты. «Всем ударным колхозам в Гомельский Уколхоз. Товарищи! Губсовет колхозов и губхозов приветствует Вас по случаю зачисления Вас в группу ударных Губернского значения. Вы доказали своей работой и идейным направлением, что можете быть организованным товариществом, где будут отсутствовать эксплуатация человека человеком. Вы сделали подход к осуществлению «братского идеала», и если этот подход недостаточно гладок и шероховат в неких частях, то это прежде всего от неопытности, и этих обстоятельств смущаться нечего. Будущее за нами, если только мы будем идти тесным строем и плотно держать плечо к плечу. Мы, товарищи, заметили Ваш рост и пожелали стать с Вами как с искренними друзьями, в первый ряд, чтобы чувствовать Ваше плечо.

Если мы называем Вас ударными, то скорее для себя, а не для Вас, ибо Вы ещё не есть ударники, но нам нужно сделать Вас ударными. И только когда мы общими силами приведём Ваше количество в образцовый порядок в отношении: хо-

зяйственном, политическом и культурно-просветительском. Только тогда Вы будете ударять по окружающих Вас темноте и бедноте, просвещая её и вразумляя. Как достичь довольства и настоящей человеческой культуры жизни, когда посредством таких ударов коммуны будут искоренять народную темноту и невежество. Член Совета колхозов. Журневич». (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 375. Воп. 1. Спр. 470. Л. 26.)

М.М.Халюшкоў.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЕПІСЬМЕННАСЦІ

1920 г.

Статистические предположения показали, что в 17 уездах Гомельской губернии имеется около 1 1/2 миллиона неграмотного населения от 14 до 50 лет включительно. Пропустить с успехом через школу грамоты всю эту массу безграмотных, в количестве 36 возрастов их, по условиям переживаемого момента допустимо только в строго определенной очереди, примерно 4 возраста в каждый учебный семестр, который определён длительностью в 4 месяца или 73—96 учебных часов. Причём решено пока ликвидировать элементарную безграмотность, для чего воспользоваться наличным аппаратом трудовой школы...

Гомельский уезд — передовой и высококультурный уезд располагает солидными научно-педагогическими силами и учебно-просветительными средствами. Но ликвидацию безграмотности в нём удалось наладить только с большим трудом. В данный момент он представляет весьма пёструю картину. Большая группа волостей, как, например, Поколюбичская, идёт в передовой линий, а другие, например, Ветковская, ещё не сдвинулись даже с места. В самом Гомеле тоже не видно живости в планомерной работе. Но при всех недочётах в Гомельском уезде работа по ликвидации безграмотности в общем ведётся удовлетворительно.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 433. Воп. 1. Спр. 326. Л. 20—21.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ПРАЦОЎНАЙ ПАВІННАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА З 1 ДА 30 ВЕРАСНЯ 1920 г.

За отчётный период в порядке трудповинности работа по уезду:

По поступившим сведениям (Поколюбичской, Покотской, Дятловичской, Красно-Гудской, Руденецкой, Гомельской, Вылевской, Носовичской, Речковской, Поповской и Дудичской волостей) видно, что в порядке трудовой повинности по уезду работало: рабочих 17 062, подвод 15 099.

Из общего числа рабочих 8241 человек были привлечены к работе на жел. дороге по ремонту, разборке, очистке пути и т. д., 5400 — по ликвидации лесных и торфяных пожаров; 400 по погрузке дров на плоты и баржи Райсплаву; 200 на погрузке, сбору фруктов и продуктов; 360 рабочих по уборке полей семей красноармейцев; 250 на лугах Госфонда (уборка, перевозка сена); 1518 для других всевозможных работ по нарядам Угоркомтруда.

Из общего числа 15 094 подвод — 338 работали на перевозке военного имущества, продуктов воинских частей, расположенных в пределах уезда; 953 — для перевозки сена; 334 по перевозке реквизированных продуктов и скота; 216 для перевозки дров Райлескому; 5663 по перевозке и подвозу дров другим организациям; 170 по перевозке дров госпиталей; 740 для перевозки фруктов Упродкома; 720 для разъездов командированных лиц по служебным делам; 453 для обработки полей семей красноармейцев и 368 для прочих местных нарядов.

За отчётный период вывезено 547 куб. саж. дров, перевезено 5000 пуд. сена, 350 дручков и пр.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 32. Л. 40.

З ЗАГАДУ ГОМЕЛЬСКАГА ГУБЕРНСКАГА ХАРЧОВАГА САВЕТА

28 кастрычніка 1920 г.

Наступает зима.

Красная Армия, рабочие фабрик и заводов должны быть во что бы то ни стало накормлены. Всероссийский ЦИК и II Губернский съезд советов дали боевой приказ — закончить выполнение всей развёрстки по продуктам не позднее 1-го декабря.

Всем крестьянам в течение указанного срока сдать все причитающиеся по развёрстке продукты, во избежание столкновения с отрядами продорганов, выполняя развёрстку, как боевую задачу.

Всякое нерадивость и непорядок в быстроте и точности исполнения настоящего приказа должностным лицом, всякое противодействие Уполномоченным Упродкомов просто со стороны крестьян, выполняющих развёрстку, будут рассматриваться как контрреволюционные, и виноватые будут подвергнуты высшей мере наказания.

Предгубпродсовета Бранденбурский.

Предгубисполкома Колотилов.

Предгубчека Волленберг.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1611. Воп. 1. Спр. 1. Л. 153.

З ТЭЛЕГРАМЫ 3.6.1920 г.

Могилев начальнику Соварму 16. Докману. Военно-срочная.

Положение Гомельском уезде удовлетворительное. На почве выкачивания хлебной развёрстки и скота возникают некоторые инциденты, которые устраняются. Дезертирство уезде сильно развито, вылавливаем иногда организованные отдельные группы, пытающиеся оказать сопротивление продотрядам. Решительные меры борьбы дезертирством применены. Можно полагать, что с этой работой при наличии имеющихся сил и помощи стоящих частей Ревком справится. Уездные Волревкомы организованы, организационная и агитационная работа усилена.

Предугорревкома Селиванов.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 428. Воп. 1. Спр. 243. Л. 26.

З ПАЛІТДАВЕДКІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

1 снежня 1920 г.

В области восстановления промышленности в Гомельском уезде сделано следующее: находящиеся в Гомельском уезде винзаводы: Уваровичский, Носовичский, Новобелицкий, ректификационный завод вполне отремонтированы, пущены в действие и функционируют в полной исправности.

На предприятиях химической промышленности имеются: Добрушская писчебумажная фабрика, спичечная фабрика «Везувий» в Новобелице, химический завод «Иегель» в Новобелице, мыловаренный завод ГСНХ «Коммуна» в Гомеле, лаковый завод Вильнера в Новобелице, завод колёсной мази в Гомеле и технохимическая мастерская ГСНХ.

По ведомству Губтекстиля в Гомельском уезде имеются: Гомельская ткацкая мастерская (23 машины, 28 рабочих, 2-х нед. выр. 6621 арш.). Гомельская прядильня (7 рабочих, 2 колеса, 2-х нед. выр. 58 пуд.). Ветковское канатно-верёвочное предприятие (28 раб., 4 колеса, 2-х нед. выр. 558 пуд. 15 фун.).

Под ведомством Губодежды за отчётный период сделано: открыта мастерская по изготовлению полушубков для нужд Красной Армии, в которой работает 25 рабочих; в городе открыт раздаточный пункт, который даёт работу гражданам на дом. В пункте зарегистрировано 600 граждан.

За отчётный период оборудован утилизационный завод примитивного характера, при 14 человек рабочих по утилизации разных продуктов. Оборудована кузница из 5 рабочих, изготовляющая хозяйственные предметы общего пользования.

Продразвёрстка: картофель 379 149 пудов, хлеб 57 067 пудов, крупа 23 381 пуд, овёс 47 435 пудов, масличные семена 9655 пудов, овощи 11 260 пудов.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 428. Воп. 1. Спр. 186. Л. 50.

Нэп — прабліск надзеі

У эканоміцы Расіі канца 1920-х гадоў Гомельская губерня ў вытворчых адносінах займала «...далеко не первое место. И это несмотря на то, что природные условия и ресурсы вполне позволяли широко развивать здесь некоторые производства».

На стан спраў у эканоміцы губерні,

вядома ж, негатыўна адбіваліся і агульная гаспадарчая адсталасць Расіі, разбуральныя падзеі першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, дзве эвакуацыі ў гады інтэрвенцыі, прыфрантавое становішча воласці, размяшчэнне на яе тэрыторыі мнагатысячнага войска. І тым не менш ужо ў канцы 1920 г. удалося пачаць рух наперад у аднаўленні галін мясцовай прамысловасці, перш за ўсё лесанарыхтовак.

Выкананню заданняў па лесанарыхтоўках надавалася асаблівая значнасць. Гомельскі ляском быў у ліку пяці ўдарных ляскомаў у РСФСР па забеспячэнні рэспублікі палівам і лесаматэрыяламі. Гомельскі валляском забяспечваў таксама сыравінай фабрыкі па вытворчасці паперы і кардону ў Добрушы, Суражы, Шклове. Усе гэтыя прадпрыемствы ў 1920—1921 гг. ужо дасягалі амаль чвэрці даваеннага аб'ёму вытворчасці.

Наяўнасць у воласці значнай колькасці ліставых парод дрэў дазваляла забяспечыць сыравінай выраб вобадаў, палазоў, дэталей экіпажнай і саннай вытворчасці, асінавай клёпкі і інш.

На долю Гомельскага валаснога ляс-гаса прыпадала значная частка распрацовак і немалы аб'ём прадукцыі. Выканаць высокія заданні можна было пры наяўнасці дастатковага кантынгенту працоўнай сілы, транспарту, матэрыяльных і фінансавых сродкаў. На лесанарыхтоўкі і лесавываз прыцягвалася амаль усё працаздольнае насельніцтва воласці. Выканком дзейнічаў жорсткімі «военно-коммунистическими» метадамі працоўных мабілізацый і гужпадатковых абкладанняў. Зразумела, што асноўным пастаўшчыком рабочай сілы і гужавога транспарту было сялянства.

У Гомелі на пасяджэнні работнікаў валвыканкомаў павета выступаючыя з месцаў гаварылі: «...подводная повинность ложится тяжелым бременем на население волости, и, если и было какое-то сочувствие к Советской власти, то подводная повинность убила его, ...население просто сбито с толку разверсткой упродкома ... представители уездной администрации на все это не обращают должного внимания».

Да канца 1920 г. у павеце мела перавагу саматужная вытворчасць прамысловых тавараў.

Вылучыліся пяць груп галоўных відаў саматужных промыслаў: промыслы па апрацоўцы дрэва, мінералаў, металаў, жывёльных прадуктаў.

Заняткі сялян неземляробчым промыслам тлумачыліся вострай патрэбай у пабочных заробках. У сярэднім у губерні на кожны дзесятак сялянскіх двароў прыпадаў адзін двор, які займаўся саматужным промыслам, а з кожнай сотні сялян неземляробчым промыслам займаліся 4—5 чалавек, прычым на трох саматужнікаў у сярэднім прыпадала два адыходнікі.

У ліку сямі валасцей губерні, дзе пераважаў адыход сялян на фабрыкі і заводы, Гомельская воласць займала першае месца. З агульнай колькасці прамысловых сёлаў у воласці меліся такія, якія па колькасці сялян-прамыславікоў называліся гнёздамі. Так, у лесавывозным промысле вылучалася як гняздо вёска Хведараўка, у бандарным — в. Церуха, у сталярным — Грабаўка, па пляценні кошыкаў — Клімавічы, Міхалькі, Раманавічы і інш.

Смалакуры-саматужнікі выраблялі неачышчаны шкіпінар, сасновыя і бярозавыя смолы, дзёгаць. Аб'ём прадукцыі быў значны.

Промыслы па апрацоўцы мінералаў перавышалі вытворчасць цэглы, мелу, ганчарных вырабаў і інш. Развівалася ткацтва, апрацоўка пянькі, выраб вяровак. Былі промыслы па вырабе сукна, шкур. Асабліва шырока былі развіты шавецка-рымарныя рамёствы. Гэтаму садзейнічала наяўнасць у воласці промыслаў скураной вытворчасці. Шавецка-рымарным рамяством у

воласці займаліся часам цэлыя сёлы, як, напрыклад, Сямёнаўка, Ляды і інш.

У даваенны час прадметам масавага экспарту за межы губерні з'яўляліся шчэць, пянька, нават у неапрацаваным, сырым выглядзе.

У канцы 1920 г. у воласці толькі часткова працавалі дробныя маслабойні, вінакурныя і крухмальныя саматужныя прадпрыемствы. З 74 млыноў працавала толькі 9, астатнія альбо былі разбураны, альбо прастойвалі, таму што адсутнічала сыравіна.

Аднаўленне і перавод мясцовай вытворчасці на выпуск мірнай прадукцыі патрабавалі па тым часе значных зваротных сродкаў і капітальных затрат, абнаўлення абсталявання і забеспячэння сыравінай. За кошт мясцовых сродкаў вырашыць гэтыя праблемы воласць не магла. Менавіта па гэтай прычыне большая частка саматужных, традыцыйных для воласці промыслаў у паслярэвалюцыйныя гады скарацілася больш як у пяць разоў.

Да пачатку 1921 г. прамысловыя прадпрыемствы Гомельскай воласці вырабляліе толькі 13% даваенных аб'ёмаў вытворчасці. Востра адчуваўся недахоп спецыялістаў і кваліфікаваных рабочых.

У цяжкім становішчы знаходзілася і сельская гаспадарка.

У Гомельскай воласці каля 33% тэрыторыі займалі чарназёмныя землі, 25% — суглінкі і прыкладна столькі ж — супескі. 9% зямель прыпадала на падзолістую глебу, 28% — на пяскі. Усяго пад ворывам было 255 852 дзесяціны і 113 501 дзесяціну складалі сенакосы.

На аднаго жыхара прыпадала па 0,6 дзесяціны ворыўнай зямлі, каля 75% двароў адносіліся да бедных гаспадарак, з якіх прыкладна 13% двароў былі без рабочай жывелы, 7,4% — бескароўныя, 23% маламоцныя гаспадаркі. Беспасеўныя гаспадаркі складалі прыкладна 10,3% сялянскіх двароў.

На гэтым фоне 2% гаспадарак, якія мелі 10—12 дзесяцін ворыўнай зямлі, 3—4 каровы, 2—3 кані, 2—3 свінні, 10—12 авечак, лічыліся заможнымі ці, як іх называлі, кулацкімі.

Вайна пакінула большасць сялянскіх гаспадарак воласці без мужчынскіх рук. Увесь цяжар сялянскай працы і побыту клаўся на плечы жанчын, старых і падлеткаў. Усе гэта, зразумела ж, адбілася на стане сельскай гаспадаркі.

На пачатку 1921 г. галоўным заставалася пытанне аб зямлі. Канфіскацыя памешчыцкіх зямель і маёмасці да пачатку 1920/21 гаспадарчага года ў воласці была завершана. Большая частка зручных для земляробства канфіскаваных зямель перайшла ў дзяржаўны зямельны фонд. Лепшыя землі ў адным масіве, як правіла, выдзяляліся пад саўгасы, камуны, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі.

Паводле звестак Гомельскага губземаддзела па стане на 1 кастрычніка 1921 г. у воласці дзейнічала 8 калгасаў і 15 сельскагаспадарчых кааператываў.

Сельскагаспадарчыя арцелі складаліся на аснове абагуленых сялянскіх гаспадарак, іх ворыўнай зямлі, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, сельскагаспадарчага інвентару. І менавіта на такіх прынцыпах былі арганізаваны сельскагаспадарчыя кааператывы ў Горках, Васільеўцы, Дзятлавічах, Раманавічах. Былі створаны арцелі «Земля и труд», «Работник», «Свой труд», «Неутомимый», «Назарет» і інш.

У сакавіку 1921 г. Савецкім урадам быў зроблены круты паварот ад жорсткіх і рашучых рэвалюцыйных мер у эканоміцы да пераводу народнай гаспадаркі на адраджэнне і развіццё эканомікі. Упор быў зроблены на вяртанне ў мінулае з тым, каб эфектыўна выкарыстоўваць у эканоміцы ўжо добра вядомыя

насельніцтву рычагі рыначнага механізма гаспадарання.

21 сакавіка 1921 г. сесія УЦВК РСФСР зацвердзіла «Закон о продовольственном налоге». Праз некалькі дзён пасля сесіі УЦВК Савецкі ўрад выдаў дэкрэт «О размерах натурального налога», дэкрэт «О свободном обмене, покупке и продаже сельскохозяйственных продуктов в губерниях, закончивших развёрстку».

Новая эканамічная палітыка прымалася Савецкай дзяржавай «всерьез и надолго». На аснове механізмаў новай эканамічнай палітыкі ішлі пошукі трывалага звяна, якое б звязвала інтарэсы рабочага класа і сялянства з інтарэсамі ўсяго грамадства. З увядзеннем нэпа грамадзяне атрымлівалі свабоду прадпрымальніцтва.

У мясцовага чыноўніцтва і кіраўнікоў нэп выклікаў неразуменне і разгубленасць. Працоўныя ж выказвалі сваю поўную падтрымку новага курсу эканамічнай палітыкі.

Пробным каменем нэпа сталі пасяўныя падатковыя кампаніі. Вясной 1921 г. для правядзення пасяўной кампаніі сельскія Саветы арганізавалі пасяўкомы, галоўнай мэтай якіх стала барацьба за павелічэнне пасяўных плошчаў. Вяснова-пасяўная кампанія ў воласці прайшла паспяхова. У шэрагу месцаў пасяўныя плошчы наблізіліся да ўзроўню 1916 г. Воласць выканала план сяўбы і азімых культур. У выніку пасяўныя плошчы ў воласці склалі прыкладна 83,6% ад узроўню 1916 г.

Не менш сур'ёзным экзаменам для новай эканамічнай палітыкі была першая харчпадатковая кампанія. У ліпені 1921 г. прайшоў «Ударный продовольственный месячник» па збору харчпадаткаў. У жніўні — верасні прайшлі «Картофельные двухнедельники». Да канца 1921 г. воласць на 100% выканала харчпадатак па хлебе, ішло паспяховае выкананне харчпадатку па іншых прадуктах.

З увядзеннем харчпадатку непарыўна было звязана і развіццё гандлю. Арганізуючы тавараабмен, валвыканком імкнуўся атрымаць значную колькасць хлеба звыш паступленняў па харчпадатку. Галоўную ролю ў здзяйсненні тавараабмену ў вёсцы адыгрывала кааперацыя. У чэрвені 1921 г. у воласці кааператыўныя лаўкі адкрыліся ва ўсіх сельскіх Саветах. Кожная сельская кааператыўная лаўка абслугоўвала ў сярэднім да 6000 чалавек.

Прыняты Саўнаркомам у маі 1921 г. дэкрэт «Об обмене» дазваляў куплю і продаж прадуктаў сельскай гаспадаркі, якія заставаліся ў насельніцтва пасля выканання харчпадатку. Гандаль у воласці станавіўся рэнтабельным звяном у развіцці гаспадаркі.

Такім чынам на аснове нэпа пачынаўся шматгранны і далёка не лёгкі працэс аднаўлення гаспадарак воласці, зацепліўся прамень надзеі на свабоднае і шчаслівае працоўнае жыццё.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СА ЗВЕСТАК АБ СКЛАДЗЕ ГАСПАДАРАК ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

1920 г.

... Гомельская волость включала 2452 крестьянских двора и 48 владельческих хозяйств. Всего 2500 хозяйств. Хозяйства объединяли всего сельскохозяйственного населения — 13 180 человек. Они имели лошадей 2971, коров — 3287, нетелей — 241 голову. Всего рогатого скота — 4790 голов. Овец — 1388, коз — 16, свиней — 6390. Всего скота — 15 555 голов.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 31. Т. 2. Л. 433, адв. 436, адв. 449, адв. 450.

З РЭЗАЛЮЦЫІ АГУЛЬНАГА СХОДУ СЯЛЯН в. ЦІЦЯНКІ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

красавік 1921 г.

...Заслушав доклад о замене разверстки налогом, собрание постановило: приветствовать нашу рабоче-крестьянскую Советскую власть как единственную и истинную выразительницу воли трудящихся, власть, идущую навстречу нуждам и интересам рабочих и крестьян. Мы, все как один, заявляем, что наши мозолистые руки сумеют восстановить разрушенное войной хозяйство. Мы твердо будем отстаивать завоевания Октябрьской революции.

Новая деревня. 1921. 17 апреля.

З УЛЁТКІ ГУБКОМА РКП(б) І ГУБВЫКАНКОМА

16 сакавіка 1921 г.

Усилиями Красной Армии последний враг Советской России барон Врангель уничтожен.

Советская власть берется за устройство хозяйственной жизни, и в первую очередь за укрепление и развитие крестьянского сельского хозяйства. Война оторвала от деревни много работников, фабрики не могли во время войны изготовлять сельскохозяйственные машины в количестве, необходимом крестьянскому хозяйству. Все это очень плохо отразилось на состоянии нашего крестьянского хозяйства.

Посевная площадь, начиная с 1917 г., сильно сокращается. Чем больше сокращается посевная площадь, тем меньше хлеба получает Советская Россия для рабочих. Чем меньше хлеба получает рабочий, тем хуже он работает и тем меньше мануфактуры, соли, сельскохозяйственных машин может получить крестьянин. Вполне понятно, что Советская власть взялась за помощь крестьянскому хозяйству. В первую очередь работа Советской власти в области улучшения крестьянского хозяйства направлена на расширение посевной площади. Для этой цели создается государственный семенной фонд (запас), ибо для расширения посевной площади необходимы семена, а между тем у некоторой части крестьян имеются излишки, которые для государства пропадают, а с образованием фонда эти семена пойдут на улучшение крестьянского хозяйства.

Так как крестьянство кровно заинтересовано во всех мероприятиях Советской власти по улучшению крестьянского хозяйства, то вполне понятно, что оно привлекается к самой активной работе во всех этих мероприятиях. Для проведения всех мер, намеченных Советской властью, для улучшения крестьянского хозяйства в губерниях, уездах, волостях образуются комитеты по расширению посевной площади (посевкомы).

В состав посевкома входит представитель от крестьян данной местности.

Посевком: 1) составляет план засева по губернии, уезду, волости;

2) усиливает работу учреждений, оказывающих помощь сельскому хозяйству, например, расширяет ремонтные мастерские и т. д.;

3) помогает уборке и обработке полей в тех хозяйствах, где чувствуется недостаток в рабочих руках;

4) улучшает постановку сельскохозяйственного образования и т. д.

Вот что должны сделать посевкомы. Каждый крестьянин должен прийти на помощь посевкому и тем самым на помощь всему сельскому хозяйству.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 33. Воп. 1. Спр. 42. Л. 26.

З ПРАТАКОЛА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ

16—20 мая 1921 г.

ПОТАШКОВ. Я получил наказ от крестьян сообщить, что все блага обещанные пока остаются только на бумаге, а между тем костер нарисованный светит, но не греет. Недостаток земли, за что мы дрались, по-прежнему у многих крестьян наблюдается и сейчас. Кто не отходит [от] коллектива, тому и земля и вся помощь с условием у них 3 года ничего не брать. Агрономы, посланные в деревни учить крестьян, сами ничего не знают. Необходимо вынести резолюцию, чтобы все земельные вопросы решались по согласию всех граждан.

БУ[К]ОВСКИЙ. Я видел гнет помещика. Совхозы — тот же гнет. Они нам не нужны. Земли надо разделить на поселки крестьянам в единоличное пользование каждого. Государство упадет, если будем работать коллективно. Коллективизм — тот же гнет: земля наша.

Коллективы не должны препятствовать деревне. В колхозах нарождаются новые паны из крестьян. Власть поддержим, но землю надо отдать крестьянам.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 882. Воп. 1. Спр. 3. Л. 8, 10.

З РЭЗАЛЮЦЫІ МАРКАВІЦКАГА ВАЛАСНОГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ

красавік 1921 г.

«...С'езд выражает полное доверие Советской власти и призывает своих избирателей, не покладая рук, трудиться над восстановлением своего хозяйства, так как только победа над разрухой, вызванной войной, выведет крестьян и рабочих в светлую, свободную и счастливую жизнь»...

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 393. Воп. 28. Спр. 78. Л. 222.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ

4 мая профсоюзом водников было устроено торжественное открытие домов отдыха в Кленках. Пароход с представителями различных организаций и учреждений, украшенный зеленью, портретами и плакатами выехал в Кленки. В Кленках устроено 3 дома отдыха для детей, мужчин и женщин. Имеется летний театр и кухня. Дома окружены большим садом.

Тов. Сидоров от имени работников водного транспорта рассказал присутствующим о цели организации домов отдыха. После этого выступил с приветствиями целый ряд товарищей. Для всех присутствующих был устроен ужин, после чего состоялся концерт. В 12 часов ночи пароход отправился обратно.

Полесская правда. 1921. 7 мая.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ

Хороший почин

Дер. Липы Дудичской вол. Гомельского у. приступила к усердному проведению шестидневной топливной кампании.

За 1 и 2 июня вывезено более 1500 шпал на станцию Уза. Расстояние от места вывозки до станции 23 версты. Таким образом, почин сделан и сделан успешно. Нет сомнения, что крестьяне деревни Липы выполнят с честью свой долг перед республикой.

Крестьяне всей Гомельской губ. должны последовать примеру липовцев, памятуя, что если будет топливо, то будут плуги, серпы, косилки, одежда, обувь, соль и пр.

Крестьяне Л.Розенков, И.Вишенков

Новая деревня. 1921. 18 июня.

ЗВЕСТКІ АБ ПАДЗЕЯХ У ГОМЕЛЬСКІМ ПАВЕЦЕ

1921 г.

В с. Холминке Дятловической волости пятнадцатью вооруженными грабителями были разоружены и избиты 2 милиционера.

В р-не Дятловической волости при д. Абакумы на р. Сож бандитами в числе 100 человек сожжены 2 парохода и 2 баржи. Для преследования банд и расследования дела командирован начальник 3-го района т. Любомудров с 10-ой полуротой.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 882. Воп. 1. Спр. 31. Л. 13а.

З ЗАГАДУ ПА ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

Из доклада предгубкомбанд выясняется, что главным тормозом в работе борьбы с бандитизмом является пассивное выполнение советскими и даже некоторыми военными органами всех требований комиссии по борьбе с бандитами, носящих в большинстве случаев военный экстренный характер.

Губисполком напоминает всем губернским и местным органам, что [в] комиссии по борьбе с бандитизмом в губернии и уездах есть временный революционный орган, ответственный за успешное проведение ударной кампании по борьбе с бандитизмом в губернии (уездной в уезде).

Все приказания и распоряжения Губкомбанд в отношении борьбы с бандитизмом обязательны для военных, гражданских и судебных учреждений, и невыполнение таковых будет беспощадно караться самым строжайшим образом, как саботаж, поддерживающий бандитизм.

Предгубисполкома Пестун
Предгубкомбанд Володько

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 382. Воп. 1. Спр. 31. Л. 15.

З РАПАРТА НАЧАЛЬНІКУ ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБМІЛІЦЫІ

Секретно

Доношу, что сегодня, 2-го июля 1921 г., явился в управление младший милиционер Медведев Михаил и сообщил, что 30-го июня сего года в село Терюху Дятловической вол. приезжал отряд кавалерии около 50 чел., назвавший себя Галковцами, которые просили есть у жителей, но они не давали, тогда они пошли к председателю сельсовета, но такового дома не оказалось. Была дома жена, которая сказала, что ей нет чем покормить. Они тогда стали делать обыск сами, нашли масло, собранное гражданами с. Терюха согласно приказа Упрочкома — продналог — и взяли масла около 10 фунтов, кроме того они говорили, что в 3—4-х верстах от села Терюха они убили еврея, и в тот же вечер неизвестно куда они уехали.

Кроме того, 1-го июля с/г в с. Терюху приезжал отряд кавалерии около 150 чел., вооруженный винтовками и пулеметами, форму нельзя было заметить, т. к. было темно. Отряд по селу двигался медленно и выехал за село неизвестно куда.

Нач. гом. уезда

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 1. Л. 46.

З ДАНЯСЕННЯ СТАРШЫНІ ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА

Секретно

С апреля м-ца 1921 г. на территории Гомельского уезда оперировали следующие банды.

Марковической и Дятловической волостях — Галак и «Добрый вечер».

Поколюбической вол. — Попченко.

Политическая сторона — стремление уничтожить коммунистов и ответственных работников.

Работа банды Галака носит более политический характер, чем уголовный, т. к. каждое насилие, разорение и нападение имеет цель — подрыв Советской власти. По сведениям частного характера Галак имеет связь с бандитскими организациями Минской губ. Банда уничтожена.

Банда Павленко и Попченко работала исключительно в уголовном направлении и ликвидирована милицией.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 8. Л. 188.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ АБ РЭЗАЛЮЦЫІ АГУЛЬНАГА СХОДУ СЯЛЯН в. ЦІЦЯНКІ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

...Заслушав доклад о замене разверстки налогом, собрание постановило: приветствовать нашу рабоче-крестьянскую Советскую власть как единственную и истинную выразительницу воли трудящихся, власть, идущую навстречу нуждам и интересам рабочих и крестьян. Мы, все как один, заявляем, что наши мозолистые руки сумеют восстановить разрушенное войной хозяйство. Мы твердо будем отстаивать завоевания Октябрьской революции.

Новая деревня. 1921. 17 апреля.

СА СПІСА КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

кастрычнік 1921 г.

Гомельская волость	**Основаны**
«Новиковский»	20.3.1921 г.

«Утренняя заря»	6.1921 г.
«Землероб»	6.1921 г.
«Любны»	4.1919 г.
«Назарет»	5.1921 г.
«Романовский»	1.2.1919 г.
«Литва»	1.5.1921 г.
«Культурный труд»	1.5.1921 г.

Сельскохозяйственные кооперативы	**Основаны**
«Стасенское» х. Борки	2.7.1921 г.
«Дятловичское» ст. Дятловичи	30.8.1919 г.
«Романовское» Романово	17.6.1919 г.
«Поповское»	10.6.1919 г.
«Ново-Терешковское» Дятловичи	20.6.1919 г.
«Михальская» Васильевка	15.3.1920 г.
«Улуковье» Улуковье	20.7.1920 г.
«Ново-Белицкое»	27.11.1920 г.
«Земля и труд» Гомель	1.8.1920 г.
«Работник» Гомель	1.10.1920 г.
«Ново-Белицкий огород»	5.8.1920 г.
«Свой труд» Гомель	
«Дружба» Гомель	
«Неутомимый» Гомель	
«Пчеловодство» Гомель	

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 13. Воп. 1. Спр. 2796. Л. 11, 12, 15.

СА ЗВЕСТАК АБ СКЛАДЗЕ ГОМЕЛЬСКАГА ВАЛВЫКАНКОМА

красавік 1920—снежань 1921 гг.

...АРАШКЕВИЧ Михаил Иванович, ПЛЕССКИЙ Иван Иосифович, ДЕРГАЧЕВ Парфен Семенович, СИВАКОВ Александр Максимович, КИРЬЯНЧИКОВ Кирилл Михайлович, АРАШКЕВИЧ Кирилл Михайлович, МИХАЙЛОВА Прасковья Максимовна, ПЛЕССКИЙ Иван Васильевич, БЕРЕНЧИКОВ Иван Ефимович, АРАШКЕВИЧ Евдокия Ивановна, ШВЕДОВ Василий Маркович, СИВАКОВ Аполлон Максимович.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 74. Л. 2.

З АКТА АБСЛЕДАВАННЯ КАЛГАСА «НАЗАРЭТ» ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

1922 г.

Колхоз «Назарет» был основан в мае 1921 г. в составе 9 семей на бывших землях помещика Фащева, где колхозу было выделено 159 десятин пахотной земли. В составе 9 семей основателей этого колхоза были баптисты-евангелисты. Две семьи переселились на вновь выделенные хозяйству земли и перенесли свои постройки. Семь других семей оставались жить в своих поселках. Из 9 семейств 5 были безземельные крестьяне, 4 семьи — малоземельные. Всего в составе колхоза 61 едок. Умеющих читать и писать 30 человек, остальные 31 — неграмотные. Из общего числа членов крестьян-земледельцев — 8, одна семья ремесленника. По национальности все белорусы и русские.

Из 61 едока — 32 мужчины (13 — в возрасте 16—32 г., 2 — старше 55 лет, 14 человек — до 12 лет) и 29 женщин (из них 9 — в возрасте 16—32 г., 5 — старше 55 лет, 11 человек — до 12 лет).

В 1922 г. хозяйство засеяло 20 д. зерновыми культурами и 15 д. вспахали под зябь.

В хозяйстве было 8 лошадей, 12 коров, 1 бык, 2 нетели, 4 головы молодняка рогатого скота, 3 свиньи и 9 поросят, 11 овец и 7 ягнят. Имелось 9 плугов, 10 борон и др. инвентаря, 1 веялка.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 13. Воп. 1. Спр. 2757. Л. 1, 2, 10.

Умацаванне Саветаў

12 жніўня 1920 г. Рэўваенсаветам Заходняга фронту быў выдадзены ўказ аб аднаўленні на тэрыторыі Гомельскай губерні абраных органаў Савецкай улады. Па ўсёй губерні прайшлі выбары ў сельскія, валасныя, павятовыя, гарадскія Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў.

На выбарах 15 жніўня 1920 г. старшынёй валаснога выканкома абралі Міхаіла Іванавіча Арашкевіча, членамі выканкома — Мікалая Маркавіча Іванова-Ткачова, Сідара Мітрафанавіча Сінчукова, Уладзіміра Апанасавіча Злотнікава, Івана Іванавіча Сарокіна, Паўла Міхайлавіча Жалезняковіча.

З пераходам да нэпа новыя ўмовы патрабавалі і сур'ёзнай карэкцыі правоў і абавязкаў пасялковых і валасных органаў дзяржаўнай улады. Нізавы апарат Саветаў станавіўся тым асноўным звяном, ад эфектыўнай дзейнасці якога залежаў поспех.

Вастрэйшай праблемай, якая патрабавала карпатлівага і ўзважанага вырашэння, заставалася аграрнае пытанне: рэгуляванне зямельных адносін, задавальненне зямлёй шырокіх колаў малазямельных сялян. З увядзеннем нэпа першачарговай практычнай задачай сельскіх Саветаў стала арганізацыя збору харчпадатку.

У красавіку 1921 г. усе сельскія Саветы воласці абмеркавалі пытанне аб развіцці кааператыўнага гандлю. Прайшла «нядзеля кааперацыі». Праз кааперацыю дзяржава імкнулася ізаляваць прыватны гандаль. Дзейнасць Саветаў накіроўвалася на тое, каб ператварыць сельскія кааператывы з выключна размеркавальных у нарыхтоўчыя арганізацыі. Клопатам валвыканкома стала стварэнне абменнага фонду тавараў. І хоць шырокай разнастайнасці тавараў атрымаць не ўдавалася, але ўсё ж за кошт мясцовых запасаў мануфактуры, запалак, аконнага шкла, тачыльных брускоў, прадметаў галантарэі была нарыхтавана значная колькасць хлеба і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў. Практыка паказала мэтазгоднасць развіцця грашовых формаў гандлю.

Дзякуючы актыўнай дзейнасці валвы-

Дэлегаты Гомельскага павятовага з'езда Саветаў. 5—7 снежня 1923 г.

канкома ўжо з пачаткам ажыццяўлення нэпа ў воласці ўнутраны гандаль у дзяржаўных і кааператыўных формах станавіўся галоўным звяном эканамічнай палітыкі. Гандаль быў полем эканамічнай барацьбы. Вынік яе прама залежаў ад таго, хто хутчэй зможа абслужыць вёску ў рыначным звароце, задаволіць эканамічныя інтарэсы сялянства.

Блізкасць да гарадскога гомельскага рынку дазваляла прыватнаму рознічнаму гандлю ў воласці мець даволі шырокую сетку лавак, праяўляць гібкасць і абслугоўваць большую частку спажыўцоў сяла.

Важную ролю адыгрываў і прыватны аптовы гандаль.

Новая эканамічная палітыка выклікала неабходнасць карэннай перабудовы і рэарганізацыі спажывецкай кааперацыі зверху да нізу. На плечы мясцовых Саветаў лягла ўся арганізацыя і тлумачальная работа. У губерні і ў воласці прайшла карэнная рэарганізацыя спажывецкай кааперацыі. У склад яе кіруючых органаў увайшлі маладыя ініцыятыўныя мясцовыя кадры. Развіццё гандлю ішло праз пераадоленне сур'ёзных цяжкасцей, крызісу збыту, які ўзнік ад рэзкага разыходжання цэн на прамысловыя і сельскагаспадарчыя тавары. Так званыя «нажніцы цэн» неспрыяльна адбіваліся на развіцці сялянскай гаспадаркі.

У пераадоленні цяжкасцей гандлю важную ролю адыграла грашовая рэформа 1922—1924 гг. Рэформа заклала асновы для фарміравання цвёрдых цэн і цвёрдай заработнай платы.

Летам 1921 г. пачалася здача асобных прадпрыемстваў у арэнду прыватным прадпрымальнікам і кааператывам. Вызначэнне прадпрыемстваў, будынкаў і збудаванняў, якія падлягалі перадачы ў арэнду, і рашэнне аб іх перадачы арандатарам прымаў валвыканком. У першую чаргу ў арэнду перадаваліся дробныя слаба забяспечаныя вытворчасці. Арэндныя дагаворы заключаліся на адзін—тры гады. Найменш жыццяздольныя вытворчасці ліквідаваліся. Частка дробных вытворчасцей дэнацыяналізавалася. Дзяржаўныя прадпрыемствы ў воласці перайшлі на гаспадарчы разлік.

Арэнда ў воласці набыла шырокі размах. Валвыканком пакідаў за сабой права кантролю за выкарыстаннем абсталявання, за рамонтам дарог і за выкананнем абавязкаў па дагаворах. У гэтыя гады ён максімальную ўвагу аддаваў развіццю сельскай гаспадаркі, павелічэнню прадукцыйнасці ў агародніцтве, паляводстве, садаводстве і жывёлагадоўлі.

Дзейнасць савецкага апарату была накіравана на тое, каб па магчымасці ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць цераспалосіцу, надзяліць малазямельныя гаспадаркі зямлёй і такім чынам стварыць магчымасць сялянам воласці цалкам выкарыстаць сваю працу. Правядзенне розных кампаній у гэтых напрамках станавілася метадам дзейнасці. З увядзеннем раённага бюджэту валвыканком ужо больш мэтанакіравана праводзіў гаспадарчае і культурнае будаўніцтва.

У практычнай рабоце валвыканкомы і сельскія Саветы абапіраліся на актывістаў з бядняцкіх і серадняцкіх сялянскіх мас, на рабочых, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, камсамольцаў і грамадскія арганізацыі. З дапамогай вясковага актыву Саветы паспяхова вырашалі праблемы гаспадарчага, сацыяльна-палітычнага і культурнага жыцця.

У сваю чаргу добрым экзаменам на сталасць і аўтарытэтнасць для актывістаў былі выбарчыя кампаніі. Тое, што на выбарах у Саветы ў большасці месцаў праходзіла больш як 50% кандыдатаў, прапанаваных актывістамі, у значнай ступені тлумачылася тым, што актывісты — выхадцы з бядняцка-серадняцкіх слаёў адлюстроўвалі інтарэсы беднаты і сераднякоў.

У 1920-я гады сельскі актыў быў палітычнай катэгорыяй. Узбуйненне воласці пашырыла яго колькасць. У 1922—1924 гг. у складзе савецкіх актывістаў было 325 чалавек. З іх дапамогай сяляне куплялі пародзістую жывёлу, вялі праверкі якасці як калектыўных, так і асабістых гаспадарак, дапамагалі менавіта маламоцным гаспадаркам.

Сельскія актывісты рабілі аналіз гаспадарчага стану сялян вёскі. Дзякуючы сельскім актывістам жанчын сталі выбіраць у склад Саветаў, у сялянскія камітэты грамадскай дапамогі, а дзе-нідзе і прадстаўнікамі такіх камітэтаў і нават у валасныя органы ўлады.

Апора на масы дапамагала Саветам вырашаць нялёгкія праблемы развіцця

гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Саветы арганізоўвалі і праводзілі сельскія сходы, вечары памяці ахвяр рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, святы чырвоных дат календара. Праз актывістаў сельскіх Саветаў валвыканком выяўляў бездаглядных дзяцей, арганізоўваў сельскі ўсенавуч, работу пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці і інш.

Дзейнасць сельскіх Саветаў станавілася шматграннай і складанай. Сялянства ўважліва сачыла за практычнымі мерамі савецкай улады. Валвыканкому не раз даводзілася разглядаць заявы і скаргі на парушэнні законнасці з боку мясцовых Саветаў альбо асобных яго прадстаўнікоў.

Кампаніі выбараў у склад сельскіх і валаснога Саветаў праходзілі ў абставінах вострай класавай барацьбы. Ва ўмовах нэпа гэтая барацьба з вобласці палітыкі перамясцілася ў эканоміку. Эканамічныя праблемы, асабліва ў вёсцы, набылі характар палітычных.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З ЦЫРКУЛЯРНАГА ПІСЬМА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА

2 сакавіка 1920 г.

...Волостной исполнительный комитет избирается волостным съездом числом 3—7 человек. В волости с населением 15 000 человек — 7 членов. Аппарат исполкомов избирается на шесть месяцев, т.е. на период между съездами. Волостной исполнительный комитет (ВИК) включает председателя и его заместителя. Эти работники переизбираются только решением Уисполкома. В составе аппарата ВИК — управление земельное, военное, социального обеспечения и народного образования...

...В поселениях с населением не менее 3000 человек избираются Сельские советы из расчета 1 делегат на 100 жителей, но не более 50 человек.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 31. Т. 1. Л. 57, 57 адв.

З ПАЛАЖЭННЯ АБ АБАВЯЗКАХ АПАРАТУ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

...председатель волисполкома является распределителем кредитов, осуществляет общее руководство работой исполкома, заведует военным столом и ЗАГСом. Его заместитель руководит земотделом и является председателем волземкомиссии: второй помощник — волОНО и коммунхозом: третий — заведует налоговым столом.

...В составе исполкома четыре секции: сельскохозяйственная, здравоохранения и санитарии, культурно-просветительная и коммунальная.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 705. Л. 7 адв.

Землеўпарадкаванне

У воласці землеўпарадкавальныя работы практычна пачаліся ў канцы 1919—пачатку 1920 г. і мелі на ўвазе развязаць гаспадарчую ініцыятыву, ліквідаваць прымусовы севазварот, зменшыць аграрную перанаселенасць, стварыць умовы для росту сельскай гаспадаркі. Але ўмоў для адначасовага і раўнамернага гаспадарчага росту ўсіх слаёў насельніцтва не было. Ішло паглыбленае расслаенне сялянства. Марнела і бяднела большасць абшчынных гаспадарак. Нават землеўпарадкаваная частка сялянства аказалася не ў стане ўзняцца з галечы і жабрацкага стану і ўзнімала пытанне аб новым землеўпарадкаванні. І толькі маленькая частка вёсак дзякуючы рацыянальнаму размеркаванню ўчасткаў пачала прыкметна расці, узнімацца. Першымі былі землеўпарадкаваны сяляне вёсак Пыхань, Данілавічы, Краснае, Касцюкоўка, Рандаўка, Урыцкае. Атрымаўшы зямлю, сяляне з небывалым уздымам імкнуліся ўмацаваць свае гаспадаркі. На жаль, землеўпарадкавальныя работы ў воласці не паменшылі, а яшчэ больш ўзнялі затраты сялянскай гаспадаркі.

Не знікла і шматпалосіца. На пачатак 1925 г. у воласці 50,2% сялянскіх гаспадарак мелі ад 20 да 40 палос, 34,9% гаспадарак — ад 10 да 20 палос, а 10% — ад 40 да 60 палос.

Пасля рэвалюцыі ў Гомельскай воласці было арганізавана больш камун і арцеляў, чым у іншых валасцях губерні. Але амаль 40% з іх неўзабаве распаліся.

У адпаведнасці з дэкрэтам 1920 г. «Аб перадзеле зямлі» і законам 1921 г. «Аб агульнай зямельнай палітыцы» пачаўся новы этап землеўпарадкавання. З адменай прыватнай уласнасці на зямлю былі адменены і ўсе акты па замацоўванні зямлі ў прыватную ўласнасць.

Такім чынам, у час землеўпарадкавання сяляне не атрымлівалі зямлю. Значная частка бедных сялянскіх гаспадарак, што засталіся ў абшчынах, пакутавала ад малазямелля.

Бывала і так, што атрыманыя ва ўласнасць надзелы зямлі беднякі былі не ў стане апрацоўваць і зямля заставалася пустэчай. Гэтая сітуацыя была прыкрай яшчэ і таму, што надзельныя землі былі з ліку лепшых па якасці і блізка размешчаны да пасяленняў.

Меркавалася, што падчас раяніравання будуць створаны пасёлкі па 10—12 землеўпарадкаваных гаспадарак. Аднак у воласці такіх пасёлкаў аказалася вельмі мала. Большая частка арганізаваных пасёлкаў налічвала па 40—60, а часам і 100 двароў. На справе ўсё вярталася да той жа абшчыны, паўтарала яе. А гэта захавала шматпалосіцу і цераспалосіцу. Напрыклад, пасля развёрсткі зямлі ў в. Лапаціна лік палос на адну гаспадарку перавышаў 50 і больш.

На Гомельшчыне развёрстка зямель праходзіла вельмі балюча і нярэдка канчатковае вырашэнне пытанняў аб зямлі заставалася за судовымі органамі. Так было ў Галавінцах, Заліп'і, Красным, Лапаціне і іншых вёсках.

На тэрыторыі Гомельскай воласці Губсаўгастрэст меў шэраг саўгасаў: «Галы» (в. Дзятлавічы), «Пяскі», «Васілеўскі», «Новікі», «Брылёў», «Прудок». Слабыя гаспадаркі саўгасаў, камун і арцеляў вымусілі мясцовыя органы ўлады ўвесці ў дзеянне Дэкрэт Саўнаркома аб прыпісцы саўгасаў да аб'яднанняў, прамысловых прадпрыемстваў і дзяржаўных арганізацый. У воласці практычна ўсе саўгасы былі перададзены такім арандатарам.

Да 1928 г. у раёне на адну гаспадарку прыпадала ўсяго крыху больш за тры дзесяціны раллі і паўтары дзесяціны сенажаці. Змянілася і структура севазвароту. Знікла традыцыйнае трохполле. Севазварот становіцца шматпольным. Земляробства і жывёлагадоўля робяцца асноўнай крыніцай прыбытку. Значна скарачаецца адыходны промысел.

Гомельская воласць адносілася да ліку найбольш перанаселеных валасцей губерні. У сувязі з малазямеллем улады з пачаткам нэпа неаднаразова спрабавалі ажыццявіць перасяленне часткі насельніцтва на новыя землі з наступным іх землеўпарадкаваннем. У 1924 г. пастановай УЦВК было дазволена перасяленне ў Самарскую і ў Саратаўскую губерні, а ў 1925 г. пачалося масавае перасяленне малазямельных сялян на цалінныя землі Крыма, Украіны, Сібіры, Далёкага Усходу, Паўночнага Каўказа.

Складаным з'явілася пытанне землеўпарадкавання яўрэйскага насельніцтва ў воласці. У дарэвалюцыйныя гады яўрэі ў сваёй большасці займаліся невытворчай працай. Паводле перапісу 1897 г. вытворчай працай займалася толькі 37% яўрэйскага насельніцтва. У занятках астатніх пераважаў дробны гандаль.

Ва ўмовах нэпа і развіцця гандлю і кааперацыі гэтыя гандляры апынуліся ў цяжкім становішчы. У Гомельскай воласці яўрэі складалі да 60% жыхароў мястэчак. Па сацыяльным становішчы прыкладна 35% яўрэяў былі саматужнікі, столькі ж — гандляры, з якіх 20% — беднаты, 15% — людзі без пэўнай прафесіі, якія жылі за кошт дабрачыннай дапамогі абшчыны з Амерыкі, і толькі 7% — саматужнікі арцеляў і 5% — земляробы. Такі сацыяльны расклад сведчыў аб беднасці і патэнцыяльным бяспраўі яўрэйскага насельніцтва.

У пачатку местачковае яўрэйскае насельніцтва воласці нерашуча падыходзіла да земляробскай справы, не верыла, што землеўпарадкаванне яўрэяў у воласці ва ўмовах малазямелля наогул рэальна. Выяўлялася і няўпэўненасць у сваёй сіле і здольнасці, каб далучыцца да зусім новага ўкладу жыцця земляроба. І такія сумненні мелі зусім пэўныя падставы.

У новых пасяленнях у яўрэяў у карыстанні аказаліся сялібныя землі, на якія прэтэндавалі некаторыя сяляне. Цыркулярнае пісьмо Губземупраўлення, накіраванае ўсім зямельным упраўленням

Гомельскай губерні растлумачвала: «п. 1... земли оставить в пользование евреев на общем основании в соответствии со статьей 4 и 9 Земельного Кодекса.

п. 2. При землеустроительных работах к еврейским землям относиться в соответствии со ст. 9 Земельного Кодекса и отводить им земли на общих основаниях.

п. 3. Стремиться наделить землей и тех евреев, кто хочет заниматься сельским хозяйством по ст. 46 Земельного Кодекса».

У воласці на гэты час толькі 2% яўрэйскага насельніцтва займалася земляробствам.

Каб не закранаць інтарэсы мясцовага сялянскага насельніцтва, яўрэям выдзяляліся плошчы дзяржфонду. У воласці на свабодных землях ствараліся яўрэйскія калгасы. Выкарыстоўваліся кінутыя садова-агародніцкія ўчасткі. Значным рэзервам зямельнага фонду з'явіліся тэрыторыі прыпісных саўгасаў. На свабодных землях такіх гаспадарак стваралі яўрэйскія альбо змяшаныя нацыянальныя працоўныя калектывы. На тэрыторыі саўгасаў, дзе сялянства ўжо было землеўпарадкавана, але існавала магчымасць без парушэння іх інтарэсаў размясціць дадатковыя гаспадаркі, ствараліся яўрэйскія земляробчыя калектывы. І, вядома ж, меліярацыйныя ўчасткі і тыя, якія патрабавалі раскарчоўкі і нязначных па аб'ёмах меліярацыйных работ.

На гэтых землях у воласці была працаўладкавана толькі нязначная частка яўрэйскіх сямей. Землеўпарадкаванне яўрэйскага насельніцтва патрабавала значных матэрыяльных і фінансавых затрат. У воласці спадзяваліся, што для ўладкавання насельніцтва Масква выдзеліць хаця б па 200 р. на сям'ю на набыццё працоўнай і прадукцыйнай жывёлы.

Але Масква ў крэдытах адмовіла. Скласці сельскагаспадарчыя калектывы змяшанага нацыянальнага тыпу не ўдалося. Жадаючых працаваць у такіх калектывах сялян не знайшлося. Таму што сумясціць дзве групы, два асяроддзі, адно з местачковай псіхалогіяй і другое з псіхалогіяй вёскі, аказалася немагчымым. Узмацнілася стыхійная міграцыя яўрэяў. У выніку ўжо ў 1925 г. па асобных населеных пунктах воласці перасяленне набыло даволі масавы характар. Адбілася і гістарычная традыцыя — імкненне да захавання дыяспары, што і пераўтварыла міграцыйны працэс у стыхійны паток. Але гэта ўжо іншыя праблемы.

У цэлым землеўпарадкавальныя работы павялічылі пасяўныя плошчы ў Гомельскай воласці ў 1925 г. супраць 1916 г. на 16%, значна павялічылася колькасць жывёлы: коней — на 18,1%, буйной рагатай жывёлы — на 19,8%, авечак — на 76,3%, свіней — на 5,1%, у 15 разоў скарацілася колькасць беспасяўных гаспадарак, зменшылася колькасць гаспадарак, што не мелі кароў і коней. Тым не менш у разліку на аднаго жыхара колькасць жывёлы яшчэ заставалася меншай, чым у 1916 г.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны ў асноўным дакументы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл.

У.Я.Райскі, Т.В.Чарнышова.

ЗВЕСТКІ АБ НАСЕЛЬНІЦТВЕ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА СА СТАТЫСТЫЧНАЙ СПРАВАЗДАЧЫ ЗА 1927 г.

Название нас. пункта	Число хозяйств	Число мужчин	Число женщин	Нац. состав глав хоз. русских	белорусов
Волотова, село	107	233	274	94	9
Плесы, околица	30	75	73	23	1
Гриневичи, хутор	4	8	11	3	1
Коновальчиков, хутор	1	3	2	-	1
Полевиков, хутор	1	2	3	-	1
Головинцы, село	123	239	294	121	1
Ерохово, поселок	18	45	52	18	-
Знамя Труда, поселок	34	94	67	33	1
Медвежий Лог, поселок	15	46	29	15	-
Новый Двор, поселок	107	266	297	102	-
Еремино, село	390	944	1064	26	363
Залипье, деревня	162	410	465	149	11
Красное, село	170	424	450	6	164
Лопатин, деревня	331	904	916	156	195

Поколюбичи, село	343	863	950	298	43
Прибор, деревня	119	298	323	3	107
Романовичи, село	332	755	862	19	313
Улуковье, деревня	77	179	201	74	3
Якубовка, деревня	92	182	225	6	83
Березки, деревня	45	122	123	-	45
Победа, поселок	1	1	3	1	-
Урицкое, деревня	235	564	602	60	167
Севрюки, околица	235	564	602	72	108
Михальки, деревня	290	789	808	225	61
Нов. Дятловичи	212	616	548	15	190
Ст. Гута, деревня	115	299	333	3	112
Каменная Гора, поселок	10	24	29	-	10
Терюха, село	239	498	554	8	228
Шарпиловка, деревня	253	654	678	81	171
Глубоцкое, село	356	825	885	-	356
Зябровка, деревня	342	769	813	205	121
Диколовка, деревня	76	192	202	75	-
Семеновка, деревня	49	143	143	49	-
Марковичи, село	397	891	973	252	140
Прибытки, село	179	435	443	174	5
Телеши, село	289	760	823	19	259
Ст. Белица, село	134	296	339	28	104
Рудня Телешовская, дер.	203	502	524	77	166
Нов. Терешковичи, дер.	197	486	512	28	167
Рудня-Маримонова, дер.	181	518	525	10	152
Тереничи, село	220	583	628	216	2
Итого:	11 774			42 375	23 338

ЗВЕСТКІ АБ МЕСТАЧКОВЫМ ЯЎРЭЙСКІМ НАСЕЛЬНІЦТВЕ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

1925 г.

Еврейское население в местечках составляет 50—60% общей численности их населения. По социальному положению они разделяются на: кустарей — 30—35%, земледельцев — 5%, торговцев — 35%, из коих 20% — беднота, 10—15% — люди без определенной профессии, живущие за счет посылок из Америки.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 1007. Л. 230, 233.

Адзіны сельгаспадатак

10 мая 1923 г. савецкае кіраўніцтва ўвяло адзіны сельскагаспадарчы падатак. Ён спаганяўся на 40% натурай (жытам ці пшаніцай) і на 60% грашыма. З увядзеннем нэпа некаторы час сяляне па-ранейшаму плацілі 13 відаў падаткаў (зерне, сала, малако, масла, яйкі, птушка, лён, воўна, скуры і інш.). Пры вызначэнні памеру падатку Гомельская воласць была аднесена да 7 разраду ўраджайнасці і ёй было дадзена права выплачваць 80% падаткаў грашыма.

Палітыка дзяржавы зводзілася да таго, каб селянін пасля разліку па падатках станавіўся больш заможным у гэтым годзе, чым быў у мінулым. Гэта імпанавала сялянству. Валасная беспартыйная сялянская канферэнцыя ў сваёй рэзалюцыі абвясціла: «...задачай сялянства з'яўляецца дакладнае і бездакорнае выкананне падатковых абавязкаў перад Савецкай рэспублікай».

Адзіны сельгаспадатак налічваўся з памеру надзелу раллі. Сяляне былі незадаволены тым, што падаткам абкладаўся не толькі надзел, але і маладняк жывёлы. Дзеля таго, каб скараціць памеры падаткаў, у вёсцы сталі скарачаць пагалоўе жывёлы.

Шмат нараканняў было і на тое, што захоўваюцца нізкія закупачныя цэны на сельскагаспадарчыя прадукты і сыравіну, а цэны прамысловых тавараў па-ранейшаму застаюцца высокімі. Унесці падаткі ў вызначаныя тэрміны было цяжка, асабліва для бедных сялян, што перасяліліся на хутары. Не спяшаліся здаваць падаткі і заможныя сяляне, спа-

дзеючыся на павышэнне цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю.

Жорсткія меры па вымаганні падаткаў параджалі сярод сялянства размовы аб тым, што савецкая ўлада рабуе мужыка таксама, як гэта рабілі ўраднікі пры цару.

Падатковая палітыка ў вёсцы насіла класавы характар. Асноўны цяжар падатковага абкладання прыходзіўся на заможныя слаі насельніцтва. Гэта таксама выклікала незадаволенасць, а часам і ўзброенае супраціўленне.

У дакладзе аб рабоце міліцыі ў час сельскагаспадарчай кампаніі 1924 г. адзначалася, што колькасць неплацельшчыкаў няўхільна расце, падаткі выплачваюцца не ў вызначаныя тэрміны. «Бедняки говорят, – паведамляў дакладчык, — ...и рад бы уплатить, да нет чем... берите уже последнюю корову, а то водили ее продавать к мяснику-спекулянту, а он дает всего 15 рублей. Между тем, как у него мясо фунт стоит 15 копеек».

І, як падкрэслівалася ў дакладзе, «...для острастки, для того, чтобы создавать в деревне известный подъем и побудить массу крестьянства к скорейшему взносу сельхозналога, применялись меры административного воздействия путем заключения отдельных граждан под стражу до взноса ими причитавшегося налога. После предъявления квитанции о сдаче налога они освобождались».

У вёсках працавалі сесіі выязных судоў. Пры гэтым кожны прысуд суправаджаўся канфіскацыяй маёмасці на суму ад 10 да 50 рублёў і поўнай выплатай падаткаў.

Гаспадарчыя цяжкасці выклікалі нараканне сялянства. Узнікалі канфлікты. «Падазроныя элементы» выяўляліся і забіраліся.

У.Я.Райскі.

З ПІСЬМА ФРАКЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА

Укому, Фракции Губисполкома, Дорпрофсоюзу, Залинейному райкому, Уполномоченному НКПС по Зап. ж. д.

Фракция Гомельского уисполкома, заслушав сообщение представителей волисполкомов по вопросу об отношении крестьянского населения к единому сельскохозяйственному налогу, выявила, что в докладах Уваровичского, Карно-Будского, Носовичского и Гомельского волисполкомов красной нитью проходит, что железнодорожные рабочие на Зап. ж.д., связанные с сельским хозяйством, проживающие в районах вышеуказанных волостей, относятся к единому сельхозналогу враждебно и своим отношением разлагающе действуют на остальную массу крестьянства, что, если не принять своевременных мер может привести к срыву кампании по единому сельхозналогу. Во избежание могущих иметь место нежелательных явлений и учитывая серьезность работы по взыманию сельхозналога, фракция Уисполкома просит принять соответствующие меры воздействия на лиц, ведущих противоналоговую кампанию, и вообще провести среди них соответствующую агитработу и считает, что все железнодорожные рабочие, связанные с сельским хозяйством, должны внести единый сельхозналог в первую очередь, чем послужить примером для остального сельского населения и явиться побудителями к внесению налога. Для того, чтобы рабочие могли внести этот налог своевременно, фракция уисполкома просит Правление Зап. ж. д. в случае необходимости выдавать таким рабочим аванс в счет их зарплаты. О принятых мерах сообщите фракции УИК.

Секретарь фракции уисполкома (Хандогий)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 1007. Л. 236.

Кааперацыя

З пачаткам нэпа Гомельскі валвыканком і сельскія Саветы разгарнулі энергічную працу па аб'яднанні бядняцкіх і серадняцкіх слаёў сялянства ў кааператывы. Найбольш распаўсюджаны ў пачатку 1920-х гадоў былі вытворчыя кааператывы: камуны, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і інш. Былі камуны, дзе «разам выконваліся праца і спажыванне». Функцыяніравалі арцелі, у якіх дзеля супрацоўніцтва аб'ядналася пэўная колькасць сялян. Яны сумесна працавалі і вялі разам гаспадарку, а вынікі дзейнасці дзялілі паміж сабой.

Ствараліся і паасобныя вытворчыя кааператывы дробных вытворцаў дзеля выканання асобных відаў працы ў гаспадарцы. Такімі былі таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі (ТАЗы), таварысты па сумесным карыстанні машынамі і прыладамі, племяннымі жывёламі-вытворнікамі, для асушэння балот, аблясення сыпучых пяскоў, таварыствы садова-агародніцкія, масларобныя і інш.

Непасрэдную дапамогу ў развіцці кааператыўных гаспадарак аказваў горад. Шэфства горада над вёскай у воласці зарадзілася ў 1922 г. Тады шэфы займаліся культурна-асветніцкай дзейнасцю, аказвалі сялянам воласці арганізацыйна-гаспадарчую дапамогу. Яны садзейнічалі развіццю вытворчай, гандлёвай і крэдытнай кааперацыі, дапамагалі ствараць машына-пракатныя пункты, набываць сельскагаспадарчыя машыны і інвентар.

У 1923 г. колькасць вытворчых кааператываў стала прыкметна скарачацца. Адбываліся вострыя працэсы рыначнай канкурэнцыі. У шмат якіх месцах арцелі альбо зачыняліся, альбо зліваліся з больш канкурэнтаздольнымі. Рэзка скараціўся лік ТАЗаў і камун. Зусім спынілі сваю дзейнасць таварыствы па сумесным карыстанні машынамі і прыладамі, садова-агародніцкія і іншыя таварыствы. Затое лік земляробчых арцелей павялічыўся ў пяць разоў. Павялічылася таксама колькасць меліярацыйных, малочных і іншых сельскагаспадарчых кааператываў.

Узбуйненне кааперацыі станавілася тэндэнцыяй. І гэта зразумела. Дзеля таго, каб захаваць свае гаспадаркі і вытрымаць ва ўмовах рыначнай канкурэнцыі, беднякі і серадняк аб'ядноўваліся ў сельскагаспадарчыя і прамысловыя кааператывы.

З другой паловы 1920-х гадоў у воласці складваюцца насцярожаныя адносіны да арганізацыі кааператыўных гаспадарак. І гэта не было выпадковасцю. Пры вострым недахопе спецыялістаў, нізкім стане механізацыі вытворчасці, пры адсутнасці вялікіх плошчаў ворыўнай зямлі іх прадукцыйнасць была больш нізкай, чым прадукцыйнасць зямель працалюбівага земляроба-аднаасобніка.

Надаючы высокае значэнне дзяржаўным і кааператыўным гаспадаркам, валвыканком стараўся аказваць ім максімальную дапамогу з тым, каб зрабіць іх узорнымі па метадах вядзення гаспадаркі, па ўраджайнасці і прадукцыйнасці. Менавіта з гэтых гаспадарак сяляне-аднаасобнікі павінны былі атрымаць палепшаныя гатункі насення, пародзістую жывёлу, гатунковыя пладовыя сажанцы, парады па аграноміі і жывёлагадоўлі, наглядны прыклад выкарыстання машыннай тэхнікі, прымянення ўгнаенняў і інш.

Арганізаваць сельскую беднату, згуртаваць яе з сераднякамі савецкая ўлада спрабавала праз кааперараванне. У 1925 г. на тэрыторыі воласці дзейнічалі ўжо саўгасы — «Яроміна», «Улукаўе», «Лугенцы», «Прудок», «Грабаўка», «Галы», «Пяскі», «Васілеўскі», «Малыя Новікі», «Брылёў», «Прыбыткі», «Дуянаўка», «Засоўе».

Саўгас «Яроміна», напрыклад, меў 64 дзесяціны ворнай зямлі, 8 дзесяцін пад агародамі, 38 дзесяцін пад садам і 40 дзесяцін сенажацей. У гаспадарцы было 24 каровы, 13 коней, 18 галоў маладняку рагатай жывёлы, 44 свінні. Асноўны профіль гаспадаркі — агародніцтва, садаводства і часткова жывёлагадоўля.

У сваёй большасці саўгасныя гаспадаркі воласці спецыялізаваліся на забеспячэнні жыхароў Гомеля прадуктамі харчавання, а прадпрыемствы — сыравінай. Валвыканком надаваў вялікае значэнне прадукцыйнасці гэтых гаспадарак. Перавага аддавалася развіццю традыцыйных накіраванняў у земляробстве і жывёлагадоўлі. З размяшчэннем у саўгасе «Прудок» дзяржаўнага конезавода воласць станавілася базай для развіцця пародзістых коней.

У верасні 1925 г. па праблемах жывёлагадоўлі ў воласці пачалі працаваць двухтыднёвыя курсы. Прайшла серыя экскурсій у перадавыя гаспадаркі з мэтай абмену вопытам працы, у сямі сельскагаспадарчых гуртках ішлі заняткі па аграноміі, у якіх веды набывалі 127 слухачоў.

На фермах саўгасаў і арцелей практыкавалася развядзенне пародзістай жывёлы, а ў палявых брыгадах — паказальныя ўчасткі высокаўраджайных караняплодаў і іншых культур. Распрацоўваліся і распаўсюджваліся рэкамендацыі выкарыстання сельскагаспадарчых машын, мінеральных угнаенняў, укаранялася шматполле.

Развіццё гандлёвай кааперацыі ў Го-

мельскай воласці стымулявала яе непасрэднае размяшчэнне вакол губернскага прамыслова-гандлёвага цэнтра — горада Гомеля, блізкасць да чыгуначных магістралей і водных артэрый.

У 1924 г. у воласці працавала 11 кааператыўных аб'яднанняў, адно крэдытнае таварыства, адно сельскагаспадарчае і адно машыннае таварыства, пяць арцелей і тры адзіныя спажывецкія таварыствы. У жніўні 1924 г. было арганізавана Краснянскае таварыства. Яно аб'яднала больш за 300 пайшчыкаў. Асартымент тавараў да 80% быў сялянскім. Таварыства мела 3 млыны і адну маслабойню. Гаспадарка працавала рэнтабельна. У 1924 г. кааператыўныя аб'яднанні воласці ўключалі 674 пайшчыкі. Аддзяленні Гомельскага спажывецкага таварыства ў 1925 г. былі амаль ва ўсіх буйных населеных пунктах воласці. А гэта каля 10 тыс. пайшчыкаў.

Нэп дазволіў практычна за тры гады ліквідаваць крызісныя з'явы ў пасляваеннай эканоміцы. На аграрным рынку панавала танная прадукцыя прадпрымальнага і ўмелага гаспадара — селяніна. Памкненні ўлады згарнуць рознічны гандаль і перайсці да поўнага дзяржаўнага забеспячэння таварамі пайшчыкаў азначала, што абвешчанае новай эканамічнай палітыкай права свабодна распараджацца сваімі таварамі фактычна перастала дзейнічаць.

Ужо ў 1924 г. партыйныя і савецкія ўлады на месцах распачалі жорсткую барацьбу з прадпрымальнікамі і рыначнай канкурэнцыяй. Новая эканамічная палітыка згортвалася пад уціскам адміністрацыйна-таталітарнай сістэмы.

Натуральна, такі паварот палітыкі не мог не выклікаць незадаволенасць з боку сялянства. Асабліва той яго часткі, якая адносілася да заможнай і мела даволі значны патэнцыял развіцця таварнай вытворчасці.

Аналіз эканамічнага стану кааператыўных гаспадарак дазволіў выявіць станоўчыя і адмоўныя з'явы. Асновай эфектыўнай дзейнасці спажыўкааперацыі на сяле была наяўнасць зваротных сродкаў. На жаль, шэраг кааператываў у воласці зусім не імкнуліся да прымнажэння зваротных сродкаў. Яны выкарыстоўвалі даход для павелічэння заработнай платы, а не дзеля павелічэння вытворчых магутнасцей, асноўнага капіталу. У выніку — не атрымлівалі даходу і распадаліся.

Сельская гаспадарка тым часам заставалася адсталай, малапрыбытковай, а ўраджайнасць палеткаў — малой. Невысокай была і прадукцыйнасць жывёлы. На ўзбраенні бядняцкіх і большасці серадняцкіх гаспадарак асноўнымі прыладамі працы заставаўся прымітыўны інвентар. Да таго ж сялянскія надзелы увесь час здрабняліся сямейнымі раздзеламі. Падала таварнасць сялянскай вытворчасці. Сельская гаспадарка раёна да канца 1920-х гадоў так і не выйшла на ўзровень, які б задавальняў уласныя патрэбы ў хлебе.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл.

У.Я.Райскі.

ПАВЕДАМЛЕННЕ Ў ГАЗЕЦЕ «ПОЛЕССКАЯ ПРАВДА» АБ БАРАЦЬБЕ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ З КУЛАКАМІ Ў в. ГРАБАЎКА НАСОВІЦКАЙ ВОЛАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

26 сакавіка 1922 г.

В с. Грабовке Носовичской вол. было отделение Носовичского ЕПО. За короткое время своего существования это отделение заготовило более 125 пуд. хлеба. Нэп вдохновил алчущих «горлопанов» села, которые стали убеждать крестьян в том, что лучше закрыть отделение ЕПО и открыть собственное товарищество на паях.

«Тогда, — говорили они, — сотни пудов хлеба пойдут не в ЕПО, а в ваше село!»

При поддержке одураченной бедноты богатеям села удалось осуществить свой замысел. Закрыли отделение ЕПО, товар продали с аукциона и возвратили пайщикам. Затем образовали товарищество из 7 чел., самых богатеев села. Из бедноты, разумеется, никто не попал.

Сельсовет предоставил товариществу помещение и инвентарь закрытого отделения ЕПО.

Члены товарищества внесли раньше по 5 пуд. хлеба и 1 миллиону рублей, а затем еще по 15 пуд. хлеба, который обменяли на товары.

Когда привезли товары, члены товарищества сразу обнаружили свои «бескорыстные» наклонности, накинув на себестоимость 200 проц. Тогда беднота опомнилась и убедила бывшего заведующего отделением ЕПО снова открыть отделение, поехать в волостное ЕПО за товарами и начать борьбу со спекулятивным товариществом.

Он привез немного товара, и воскресшее ЕПО стало конкурировать со спекулянтами, отпуская товар на 25—50 проц. дешевле его.

В результате, товарищество закрыло свою лавку, но подготавливает новый план борьбы с ЕПО, которое привлекает крестьян и пользуется их доверием. Необходимо поддержать воскресшее отделение ЕПО и вернуть ему его помещение, занятое до сих пор товариществом.

Грабаўскія майстры

У Маскве на Краснай плошчы стаіць Маўзалей У.І.Леніна. Гэты архітэктурны і гістарычны помнік цікавы нам яшчэ і тым, што будавалі яго майстры з вёскі Грабаўка, нашы землякі. На жаль, час не захаваў імёны ўсіх будаўнікоў. Нам вядомы толькі дванаццаць з 19 прозвішчаў членаў грабаўскай брыгады. Кіраваў ёй Пётр Андрыянавіч Грыгор'еў. Разам з ім працавалі яго сын Мікіта Пятровіч, Кузьма Васільевіч Фамянкоў з сынамі Мікітам, Цімафеем і Іванам, Арцём Трафімавіч Башлакоў, Спірыдон Якаўлевіч Стахаўцоў, Якаў Спірыдонавіч Стахаўцоў, Марк Сіманавіч Чачанкоў, Раман Гаўрылавіч Чачанкоў і Іван Дзямідавіч Чачын. Усе яны працавалі на той час у будаўнічым трэсце «Мосбуд». Адных толькі муляраў было ў ім некалькі тысяч, але сярод іх выдзяляліся сваім майстэрствам менавіта грабаўскія майстры. Іх заўважылі і даручылі адказнае заданне — будаўніцтва маўзалея.

Яны будавалі Маўзалей У.І.Леніна ў 1929 г. Стэнд у Грабаўскай школе.

Сваё ўмельства грабаўскія будаўнікі перадавалі з пакалення ў пакаленне. Яны будавалі Ноўгарад, Растоў, Адэсу, Гомель, Петраград, Крамянчуг, Слуцк, Кіеў і іншыя гарады. Працавалі добра, надзейна, таму і прыйшла да іх павага і слава.

Тады, у 1929—1930 гг., грабаўскія будаўнікі паспяхова справіліся з адказным заданнем. Усе яны за сваю работу былі прэміраваны. У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі захоўваюцца некаторыя дакументы будаўнікоў: працоўныя кніжкі, даведкі аб кваліфікацыі, узнагародах, фотаздымкі і г.д.

Цікавы паслужны спіс Р.Г.Чачанкова. Пражыў 90 гадоў (1883—1973). Апрача маўзалея працаваў на Днепрабудзе, узводзіў заводы і ваенныя аб'екты на Украіне, Беларусі. Будынак Грабаўскай школы ўзведзены таксама яго рукамі.

П.А.Грыгор'еў застаўся працаваць у Маскве. Памёр у 1943 г. Яго сын Мікіта потым працаваў на аўтазаводзе імя Ліхачова, загінуў на фронце.

А.Т.Башлакоў пэўны час працаваў на рэстаўрацыі Крамлёўскай сцяны і яе веж, будаваў маскоўскія заводы, Палац Саветаў, а потым рэзка памяняў прафесію і стаў артыстам Маскоўскага тэатра аперэты.

Пазней пераехаў у Мінск, працаваў у філармоніі. Памёр і пахаваны ў Мінску.

І.Дз.Чачын таксама працаваў на розных будоўлях неабсяжнай краіны — СССР. Быў узнагароджаны ордэнам, медалямі, памёр у 1949 г., пахаваны ў роднай вёсцы.

К.В.Фамянкоў — родапачынальнік дынастыі мулярaў. Яго сын Іван потым вярнуўся ў родныя мясціны, працаваў старшынёй калгаса. З першых дзён вайны на фронце, дзе і загінуў. Цімафей Фамянкоў вярнуўся з вайны без рукі, працаваў вартаўніком калгаснага саду ў Грабаўцы. Загінуў ад рук грабежнікаў, ратуючы калгасную маёмасць.

У 1982 г. не стала М.К.Фамянкова. На яго рахунку не толькі дзесяткі пабудаваных аб'ектаў, але і яшчэ адна вельмі важная справа — ён многае зрабіў, каб сабраць матэрыялы пра грабаўскіх будаўнікоў і тым самым захаваць пра іх памяць.

С.Я.Стахаўцоў за сваё доўгае жыццё (а пражыў ён 102 гады) зрабіў шмат добрых спраў. Адна з іх — абеліск вучням-камсамольцам Грабаўскай школы, які ён узвёў разам з М.К.Фамянковым.

Пра грабаўскіх майстроў пісалі ў газетах, знялі дакументальны фільм «Зямны паклон». Выпускнік Грабаўскай школы беларускі паэт Міхась Башлакоў прысвяціў ім свае паэтычныя радкі. Гэтыя людзі дастойны добрай памяці.

Пад час «вялікага пераломy»

У канцы 1920-х гадоў у Гомельскім раёне на тэрыторыі плошчай 2100 кв. кіламетраў пражывалі 81 193 чалавекі. На адзін кіламетр тэрыторыі прыходзілася болей 40 жыхароў. Прыкладна 50% насельніцтва займалася сялянскай гаспадаркай і столькі ж — сялянскай гаспадаркай і адыходнымі промысламі.

Да ліку чыста аграрных адносіліся паселішчы, размешчаныя каля Гомеля (Прудок, Ціцянкі, Стараселле, Касцюкоўка, Запрудаўка, Кантакузаўка і інш.) і ўздоўж чыгункі. Прыгарадныя сялянскія гаспадаркі вырошчвалі садова-агародныя культуры, разводзілі жывёлу. Зямля раёна не вызначалася ўрадлівасцю. Дакументы сведчаць, што ўраджаі былі невысокія. Так, у 1929 г. у раёне пад жыта было засеяна 14 876 га. Пры ўраджайнасці 50—60 пудоў з гектара валавы збор збажыны склаў 818 180 пудоў. Толькі для харчавання насельніцтва раёна патрэбнасць (з разліку 30 фунтаў на едака ў месяц) складала 730 782 пуды, насенны фонд яшчэ 133 784 пуды. Такім чынам не хапала 46 586 пудоў хлеба.

Па даных статыстыкі ў раёне ў 1929 г. было 14 080 коней, 26 788 кароў, 13 168

С.Я.Стахаўцоў (злева) і М.К.Фамянкоў шмат цікавага маглі расказаць грабаўскім вучням.

галоў маладняку рагатай жывелы, 10 795 авечак і свіней. Амаль 10% сялянскіх двароў не мелі працоўнай жывёлы, 27% — сельскагаспадарчага інвентару. Асноўнымі прыладамі працы заставаліся сохі і косы.

Асноўнымі таваравытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі ў раёне былі індывідуальныя сялянскія двары. Пры нізкай прадукцыйнасці іх таварнасць заставалася нізкай. У 1928 г. яна складала толькі 23% ад даваеннай.

У гэтых умовах улады канфіскоўвалі «лішкі» хлеба ў сялян на карысць дзяржавы. 25% канфіскаванага збожжа перадавалася для размеркавання сярод беднякоў і маламаёмных сераднякоў па нізкіх дзяржаўных цэнах альбо ў парадку доўгатэрміновага крэдыту.

Да суда прыцягваліся не толькі гаспадары спекулятыўных запасаў зерня, але і вельмі ўмераных лішкаў у серадняцкіх гаспадарках. Суды аўтаматычна выносілі рашэнні аб канфіскацыі як таварных лішкаў хлеба, так і запасаў зерня, неабходных для вытворчасці і ўласнага выкарыстання.

Да вясны 1929 г. надзвычайныя меры сталі ўжывацца ўсё шырэй і больш жорстка. Прэс санкцый і надзвычайных мер у 1928—1929 гг. разбурыў у раёне «моцныя» гаспадаркі. Пад цяжарам непасільных умоў мясцовыя ўлады станавіліся на шлях павальных вобыскаў і арыштаў. Парушэнне законнасці і гвалт над людзьмі выклікалі адкрытыя пратэсты сялянства.

У канцы красавіка 1929 г. выразна вызначылася палітыка дзяржавы ў адносінах да аднаасобнага сялянства. Яна была сфармулявана ў новым законе «Аб сельскагаспадарчым падатку», па якім беднякі вызваляліся ад падаткаў, на сераднякоў ён значна змяншаўся. А асноўны цяжар нарыхтовак і падаткаў перакладаўся на заможныя гаспадаркі.

Саветы сталі абмяжоўваць памеры і тэрміны арэнды зямлі. Шэрагам дзяржаўных актаў былі абмежаваны правы па найме працоўнай сілы. Заможныя, так званыя кулацкія, гаспадаркі амаль поўнасцю пазбавіліся дзяржаўных крэдытаў.

Рэакцыя на гэтыя меры ўлады была адназначная — заможныя сяляне скарацілі пасевы. Праяўляліся спосабы сарваць вясенні сеў 1928—1929 гг. На раённым з'ездзе Саветаў у 1930 г. была дадзена такая адзнака палітычнага настрою сацыяльных груп насельніцтва: «...адносіны насельніцтва да савецкай улады негатыўныя... [з-за] праводзімых мерапрыемстваў на вёсцы, а іменна, хлебанарыхтоўка, нарыхтоўка бульбы, кантрактацыя і калгаснае будаўніцтва... Назіраецца актыўная абарона кулацтва ўсімі праслойкамі, і ў некаторых населеных пунктах галоўнымі арганізатарамі абароны з'яўляецца беднота і чырвоныя партызаны».

Аб'яднанне беднякоў і сераднякоў вёскі ў адзіны калгас зрабіла заможнага селяніна наогул «лішнім» чалавекам у вёсцы. Пастанова СНК СССР ад 21 мая 1929 г. дазволіла адносіць да «кулакоў» тых, хто меў хоць бы адну з наступных прыкмет: сістэматычна ўжываў наёмную працу, меў у гаспадарцы млын, крупадзёрку, сушылку агародніны альбо іншую вытворчасць з тэхнічным рухавіком, здаваў у арэнду сельгасмашыны з механічным рухавіком, займаўся гандлем і г.д.

У раёне да кулацкіх аднеслі ўсе гаспадаркі сялян-адыходнікаў, а іх было не менш за 75%.

За гады нэпа ў раёне сфарміраваўся новы заможны слой сялян, што меў тыя рысы, па якіх у канцы 1920-х гадоў іх прылічылі да кулакоў. У гістарычнай літаратуры такіх сялян называюць «наш кулак», маючы на ўвазе, што ён вырас дзякуючы Савецкай дзяржаве і яе новай эканамічнай палітыцы. Як ні дзіўна, але гэта, аказваецца, увайшло ў супярэчлівасць з адміністрацыйна-камандnай сістэмай кіравання і таталітарнай дыктатурай.

З 1928—1929 гг. на ўзбраенне ўлад была ўзята ўстаноўка на ліквідацыю ку-

лацтва як класа. Кулацкія гаспадаркі дзяліліся на тры катэгорыі. Да першай адносілі кулацкі актыў, які падлягае да пазбаўлення волі ў канцлагеры. Другая катэгорыя высялялася ў аддаленыя раёны краіны, а трэцяя — у спецыяльна вылучаныя для іх месцы рассялення. Такімі месцамі былі ў асноўным раёны Поўначы, Усходу, Сібіры і інш.

Большая частка сялянства негатыўна аднеслася да высялення землякоў. Нярэдка можна было пачуць ад сялян: «... у нас няма кулакоў, няма каго высяляць; мы з вёскі нікога не аддадзім, нехай бяруць усё сяло; чаму высяляюць добрых людзей і добрых гаспадароў?».

Тым не менш на месцах у спешным парадку па лініі партыі і дзяржавы былі разасланы зусім сакрэтныя дырэктывы і планы па правядзенні масавых высяленняў. Кулацтва ліквідавалася як клас, а разам з ім і ўзорнае, высокарэнтабельнае гаспадаранне на зямлі.

У архіве захаваліся спісы кулацкіх сямей, што падлягалі высяленню. У іх прозвішчы і іншыя звесткі пра членаў сямей з Гомельскага, Давыдаўскага, Данілавіцкага, Прудкоўскага, Прыбыткаўскага, Раманавіцкага, Рудня-Марымонаўскага, Цярэшкавіцкага сельсаветаў, н.п. Улукаўе, Ціцянкі, Яроміна і інш. У сямі вагонах былі вывезены 62 сям'і ў складзе 94 мужчын, 78 жанчын і 116 дзяцей. Усяго — 288 чалавек.

У працы мясцовых Саветаў пераважаючым стаў адміністрацыйна-камандны стыль. Толькі за 1929 г. выканком Гомельскага Савета 6 разоў разглядаў пытанне аб калектывізацыі ў раёне, 25 разоў — аб развіцці сельскай гаспадаркі, 15 разоў — пытанні фінансавання, 8 разоў — народнай адукацыі, 6 разоў — аховы здароў'я, 15 разоў — нарыхтовак, 20 разоў — пытанні палітычнага характару. Надзвычайныя меры і адміністрацыйна-сілавы стыль сталі метадамі працы партыі і дзяржавы. Гэта выклікала незадаволенасць і стыхійны пратэст сялянства. З асаблівай сілай гэта адзначалася пасля прыняцця ў студзені 1919 г. калгасцэнтрам СССР цыркулярнага ліста па абагульванні 100 працэнтаў працоўнай жывёлы, 100 працэнтаў кароў, 80 працэнтаў свіней і 60 працэнтаў коз, якія належалі тым, каго заганялі ў калгасы. Пры гэтым жывёла і інвентар абагульваліся без грашовай кампенсацыі. Таму ў раёне шмат сялян перад тым, як уступаць у калгасы, забівалі частку жывёлы. Гэта прывяло да таго, што ў лютым — сакавіку 1930 г. пагалоўе жывёлы ў раёне зменшылася болей, чым на трэць.

З прыняццем 3 сакавіка 1930 г. пастановы ЦВК і СНК СССР «Аб мерах супраць драпежніцкага забою жывёлы» і прыцягненнем да крымінальнай адказнасці за парушэнне гэтай пастановы напружанасць у вёсках узмацнілася.

Дазволенае дзяржавай «права» прысвойваць сабе чужую маёмасць разбэшчвала людзей, стымулявала «пошук ворагаў» у сваім сялянскім асяроддзі. Па сутнасці адраджалася камбедаўская палітыка, але пад іншай назвай. Савецкая ўлада перайшла да ліквідацыі цяпер ужо «нашага савецкага кулака» як класа, да рассяляньвання сялянства.

У.Я.Райскі.

Першыя камсамольцы

З успамінаў Героя Савецкага Саюза Івана Антонавіча Каўшарова

Гэта было ў 1927 г. Моладзь вёскі сабралася ў народным доме. Прыехаў інструктар з райкома камсамола. Ён распытаў аб удзеле моладзі ў грамадскай рабоце, а потым сказаў: «Вы заслужылі права быць камсамольцамі, хто жадае ўступіць у камсамол?». Такое жаданне выказалі шэсць юнакоў: І.Каўшароў, Ф.Кушняроў, Н.Пасекуноў, С.Смолікаў, І.Барысенка, І.Прыходзька. І яны неўзабаве сапраўды на справе даказалі, як даражылі званнем камсамольца. Гэта быў перыяд, калі партыя ўзяла курс на індустрыялізацыю. Краіне патрэбен быў

лес. І мы адправіліся ў Церахоўскае лясніцтва на лесанарыхтоўкі. Нам выдалі пілы, сякеры, напільнікі. З абутку з сабой мы прыхапілі па дзве пары лапцей. Усю зіму працавалі, не шкадуючы сіл і часу. Удвух нарыхтавалі па 12—15 кубаметраў рудстойкі. А вясной прыехалі ў вёску. Да таго часу камсамольская арганізацыя выросла. Усе мы з энтузіязмам удзельнічалі ў мітынгу 1 мая 1928 г. Але доўга не заседзеліся дома.

Мае сябры Смолікаў і Прыходзька па камсамольскіх пуцёўках паехалі ў Данбас, Кушняроў і Барысенка паступілі на рабфак, а Каўшароў і Пасекуноў падаліся на будоўлі Беларусі.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ БЕДНАТЫ І АКТЫВА в. СТАРЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ

3 лютага 1929 г.

Присутствовало 55 человек

Резолюция

Общее собрание бедноты и актива села Ст. Дятловичи, заслушав вопрос о реконструкции сельского хозяйства путем сплошной коллективизации целых районов, в число коих входит и наш район, считаем, что коллективизация мелких убыточных индивидуально-батрацких и середняцких хозяйств есть действительно единственный правильный путь поднятия сельского хозяйства. Наряду с этим общее собрание отмечает яростное сопротивление классового врага трудящихся — кулака и подкулачника, кто всеми мерами стараются сорвать организацию коллектива и всех мероприятий партии и сов. власти на селе, что мы имеем в нашем селе. Поэтому закон о раскулачивании целиком и полностью одобряем и удаление из нашего села Грушинова Антона, Самуйленко Исака, Лобанова Дмитрия, Лобанова Осипа, Осипова Никодима, Чернова Давида как активных врагов советской власти, активно ведущих борьбу против всех мероприятий партии и сов. власти на селе, считаем необходимой мерой социальной защиты. Только беспощадная борьба с кулаком и изоляция его [от] батрака, бедняка и середняка скорее приблизят нас к социализму.

Собрание считает необходимым усилить бдительность за всякими вылазками классового врага и выявлять всех, кто будет препятствовать строительству социализма на селе.

Руководитель собрания

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Спр. 45. Л. 52.

Галавінецка-Улукаўская камсамольская ячэйка. Здымак 1920-х гадоў.

ТЭЛЕГРАМА З МАСКВЫ

8 сакавіка 1930 г.

Правительственная. Председателям Совнаркома Союзных и Автономных республик, краевых и окружных исполкомов и исполкомов автономных областей

В дополнение к распоряжению о мерах по борьбе с кулачеством предлагаю руководствоваться следующим: не подлежат выселению и конфискации имущества бывшие красные партизаны и действительные участники гражданской войны (участвовавшие в боях, имеющие ранения или другие какие-либо заслуги) по отношению к ним, указанные меры применяются только тогда, когда они превратились в кулаков, ведущих активную борьбу с коллективизацией и участвовавшие в контрреволюционных группировках. Однако, во избежание ошибок, необходимо стремиться к тому, чтобы каждый отдельный случай был обязательно рассмотрен в местном руководящем партийном органе.

НР 1089 Опубликованию не подлежит.

Председатель Совета Народных комиссаров СССР

А.И.Рыков

Секретарю Гомельского райкома КП(б)Б

Прилагаю при сем копию телеграммы в отношении хозяйств Красных партизан, бывших участников гражданской войны. Окружком предлагает руководствоваться этими указаниями.

Секретарь ОК КП(б)Б Хлебников

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 73. Л. 19.

З ІНСТРУКЦЫІ АБ ВЫСЯЛЕННІ ЗАМОЖНЫХ СЯМЕЙ

Для руководства тов.

1. Все выделенные лица (из которых один руководитель) для проведения выселения из отдельной деревни кулацких семейств должны прибыть в намеченную деревню, сельсовет не позже как за 3 дня с момента выселения. С приездом в деревню объявить сельсовету о цели приезда и немедленно поставить в известность о том, что деревня выселяется за пределы округа, и дать срок на подготовку 3 дня. Проделать это спокойно, деловито, без всякой суматохи и паники. Выселенным объявить, что за всеми справками они должны обращаться к Вам (руководителю выселением из этой деревни).

2. Одновременно выселяемым объявить, что они с собой могут взять багажа 25 пудов в мягкой таре. Особо предупредить выселяемых, чтобы запаслись одеждой.

3. После того, как будет объявлено выселяемым все, что указано в пункте 1-ом и 2-ом этого перечня, нужно будет каждую семью все время иметь в виду, т. е. следить за тем, чтобы она не скрылась или же один из членов семьи. Предупредить об этом сельсовет, актив бедноты, комсомольцев и членов партии, а если будет нужно, то обставить это формально (арест в тех случаях, когда будут попытки или подозрения к бегству).

4. В это время (3 дня) пока семьи будут готовиться к высылке, Вам необходимо подготовить к этому общественное мнение, сколотить вокруг себя актив бедноты и колхозников, на которых опираться в своей работе. На подготовку общественного мнения нужно обратить особенное внимание. Если нужно, то провести беседы и доклады среди бедноты, колхозников и середняцкой части, на которых объяснить политику партии и советской власти в деревне на данном этапе, контрреволюцию кулака и необходимость ее изоляции, в общем обеспечить себе полный успех в работе и разъяснить правильность данной работы.

5. Ко времени самого выселения подготовить необходимое количество подвод, число сопровождающих и производящих погрузку семей определить заранее.

6. На подъем семьи, т. е. погрузку подводы должно быть потрачено не больше 2 часов времени. Все время должен быть соблюден строгий порядок, каждый должен знать свое место.

7. С момента погрузки семей выселяемых на подводы нужно усилить охрану до максимальных размеров. С этого времени выселяемых считать под арестом и из этого исходить при сопровождении. Двигаться только днём.

8. На семьи, которые не будут обеспечены продовольствием, написать справку — почему и сдать ее коменданту сборного пункта.

9. В период подготовительной работы по возможности информировать о ходе работы, настроениях, задержке и неясностях, с которыми встретитесь на местах. Это необходимо, чтобы район был в курсе проводимой работы на местах и мог в нужный момент помочь живой силой или указаниями.

10. Руководитель выселения из данной деревни идет вместе с семьями с момента их выселения из хаты, наблюдая все время за порядком, и сдает по списку каждую семью на сборном пункте.

11. С приездом на место немедленно донести, кого из семьи дома нет или кто скрылся, сколько имеется больных. Нужно иметь в виду, что тяжело больных нужно оставлять на месте.

Секретарь ГСМ РК КП(б)Б (Брель)
Пред. Гомельского РИКа (Герасименко)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Л. 38.

З ПІСЬМА ДА ІНСТРУКЦЫІ

6 лютага 1930 г.

«Гомкалгассаюз»
№ 812
Усім райкалгассаюзам, спецыяльным саюзам, старшыням раённых камісій...

1. Прыкладае пры гэтым інструкцыі па чыстцы калгасаў ад кулацкіх нэпманскіх, антысавецкіх элементаў Акркалгассаюз прапануе тэрмінова правесці чыстку калгасаў, якую закончыць не пазней 5 мая 1930 г.

2. Для кіравання чысткай калгасаў у раёнах стварыць раённыя камісіі ў складзе прадстаўніка Акркалгассаюзу (Старшыня камісіі), прадстаўнікоў РВК, саюзу сельгаспрабочых, КСТ і аднаго калгасніка.

3. Старшынямі Райкамісіі вылучаны па Гомельскаму раёну Рыхцікаў.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 95. Л. 9.

ІНСТРУКЦЫЯ ПА ЧЫСТЦЫ КАЛГАСАЎ АД КУЛАЦКІХ І АНТЫСАВЕЦКІХ ЭЛЕМЕНТАЎ

17 студзеня 1930 г.

Чыстка калгасаў мае мэтай вызваленне калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў як класавых ворагаў калгаснага будаўніцтва.

Чыстка калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў з'яўляецца важнейшай палітычнай задачай, накіраванай на прысячэнне ўсялякіх спроб кулацтва разлагаць і падрываць калгасы.

Чыстка калгасаў праводзіцца калгаснай сістэмай пры шырокім удзеле рабочых і батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас калгаснікаў і вясковай беднаты і мясцовых савецкіх, кааператыўных і грамадскіх арганізацый.

Выключэнню з калгасаў падлягаюць: 1. Кулакі і нэпманы; 2. Асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў; 3. Асобы, сістэматычна вядучыя работы па падрыве калгасаў; 4. Асобы, якія сістэматычна скарыстоўвалі да ўступлення ў калгасы наёмную сілу, альбо займаліся іншай эксплуататарскай і антысавецкай дзейнасцю, але па розных прычынах захавалі выбарчыя правы.

Увага: У калгасах можа застацца тая частка беднаты, пазбаўленая выбарчых праў, якая раней не займалася вытворчай працай, а займалася дробным гандлем, але не эксплуатавала чужой працы і ў сучасны момант на працягу не менш аднаго года не займаецца гандлем і цяпер сумленна працуе ў калгасе.

Праўленне Калгассаюза

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 95. Л. 21.

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ БЕДНАТЫ ВЁСКІ ДАНІЛАВІЧЫ

17 лютага 1930 г.

Прысутнічала беднякоў 49 чалавек.

Павестка дня:

1. Аб разглядзе гаспадарак, якія абкладзены ў індывідуальным парадку, і іх высяленні.
2. Бягучыя справы.

Слухалі: Інфармацыю т. Глушакова аб разглядзе гаспадарак, якія абкладзены ў індывідуальным парадку, і іх высяленні.

Спрэчкі.

Шныпаркова. Т.Шныпаркова ўказвала, быццам кулакі вельмі добра ўмеюць працаваць, а бедната не ўмее, а дзеля гэтага трэба іх аставіць, каб яны навучылі працаваць.

Шныпаркоў Ф. Гэты тав. супярэчыў т. Шныпарковай.

Беднякі яшчэ лепей могуць працаваць, толькі даць ім дапамогу. Усё багацтва, якое маецца ў кулакоў, нажыта не сваім трудом, а чужым; трымае батракоў штогод і мала ім плаціць.

Разгляд індывідуальна абкладзеных

1. Дзядкоў Павел.

Шныпаркоў: Дзядкоў П. заўсёды карыстаўся наёмнай сілай. І не толькі ён, а яго бацька, дзед. Да суда меў мельніцу.

Анапрэйчанка: Дзядкоў П. з'яўляецца кулаком. Яго адносіны да беднаты дрэнныя, кулацкія. З боку некаторыя казалі быццам т. Дзядкоў вельмі добры чалавек, аказваў дапамогу. Адносна Дзядкова пастанавілі на галасаванне.

Справядліва абкладзены (23 чал.)

2. Ружанцоў Захар.

Справядліва абкладзены (27 чал.)

3. Маршын Сяргей.

Скрыпчэнка: Маршын С. з'яўляецца кулаком. Пасля забойства бацькі і яго сям'і Маршын разбазарыў жывёлу. Яго бацька заўсёды эксплуатаваў батракоў, а сам Сяргей акрамя хутара мае добрую гаспадарку.

Шныпаркоў: Усе рэчы, якія засталіся пасля забойства, ён разбазарыў. Хутар не аддаў на агульную апрацоўку камітэту беднаты. Маршын С. справядліва абкладзены ў індывідуальным парадку, але трэба і брата абкласці, бо ён на службе і непрацоўны даход мае з хутара.

Справядліва [абкладзены] (22 чал.)

Несправядліва [абкладзены] (5 чал.)

4. Дзядкоў Янка.

Шныпаркоў: т. Дзядкоў абкладзены за тое, што мае млын, шэрстабітку і карыстаўся наёмнай сілай.

Справядліва абкладзены (18 чал.)

Несправядліва [абкладзены] (7 чал.)

5. Батурын Сямён.

Абкладзены за тое, што мае хутар, які апрацоўваецца не сваім трудом. У Гомелі мае хату і атрымлівае непрацоўны даход. Батурын вучням у школе казаў аб калектывізацыі, але сам не ўступаў у калгас.

Чуяшкоў: Батурын абкладзены ў індывідуальным парадку справядліва.

Справядліва абкладзены (22 чал.)

Несправядліва [абкладзены] (9 чал.)

6. Мішчанка Яўхім.

Марозаў: Мішчанка мае ўсяго 2 дзесяціны. Жонка з'яўляецца батрачкай. Іншыя выступаючыя таксама ўказвалі, што яго абкласці ні ў якім разе нельга. З 2-х дзесяцін жыць нельга, а па-гэтаму з боку знайшоў заработак.

Абкласці — 7 чал.

Не абкласці — 32 чал.

Пастанавілі: Мы, беднота вёскі Данілавічы, сабраўшыся на агульны сход і дэталёва абсудзіўшы гаспадаркі, якія абкладзены ў індывідуальным парадку, знаходзім, што ўсе раней абкладзеныя гаспадаркі за выключэннем Мішчанка Яўхіма, гаспадарку якога з'яўляецца серадняцкай, абкладзены індывідуальна справядліва і з'яўляюцца кулацкімі гаспадаркамі без усялякіх сумненняў. Адначасова ад беднаты патрабуем ад вышэй стаячых органаў як можна хутчэй усіх асоб гаспадаркі, якія з'яўляюцца кулацкімі, высяліць з тэрыторыі нашай вёскі, якая з'яўляецца суцэльна калектывізаванай, так як гэтыя асобы з'яўляюцца ворагамі калектывізацыі, агітуюць супраць калгасаў і гэтым перашкаджаюць перабудове сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 36. Л. 38—41.

З АБСЛЕДАВАННЯ ХУТАРА КАЗЛОВЫХ ПЯСОЧНА-БУДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

1930 г.

Было много материалов о том, что совхоз «Прибытки» укрывал кулацкие хозяйства, и это послужило тому, что они не были обложены налогом.

На хуторе живут 4 брата и им принадлежало более 200 десятин пахотной земли, 10 десятин овсу, 8 дес. саду, землей они пользовались до 1924 года, после чего земля у них была отнята и оставлена по количеству едоков, а всем остальным они пользуются. Козлов Порфирий выслан и раскулачен, остальные хоз-ва остались там на месте. Они всякими способами укрывали свое имущество. Состав сельсовета помогал их укрытию. Совхоз «Прибытки» взял эти хозяйства под свое прикрытие. Все кулаки были зачислены рабочими совхоза «Прибытки», и когда сельсовет приступил к доведению до кулацкого двора твердого задания заготовок и выявлению кулацких хозяйств для обложения, совхоз «Прибытки» от 9.9.30 г. сообщает Песочно-Будскому Сельсовету о том, что Козловы Федор и Николай с сего числа зачислены рабочими с-за и добровольно сдали свое имущество и урожай с-зу, а на самом деле это фикция, и кулаки использовали момент и растранжирили свое имущество.

Одновременно с этим произошло полное срастание между работниками с-за и кулаками.

Совхоз отпустил 9 пудов сахара кулакам для корма пчел, но по показаниям бедноты они использовали большую часть сахара на варку варенья.

Лукерья Козлова скрылась, когда у нее было обнаружено 87 р. серебром, а совхоз охраняет ее имущество.

Во время учета объектов обложения эти кулаки учли только по одной корове, а скот укрывали в совхозном стаде (8 коров, 6 овец, 2 жеребца).

Кроме того, установлено, что кулаки полностью ликвидируют свое имущество. Вывезена полностью рожь и все остальные культуры.

Исходя из вышесказанного устанавливаем, что хозяйства являются бесспорно крупными кулацкими хоз-вами и с-з «Прибытки» укрывал эти хоз-ва.

Зав. хоз. Погосов был непосредственным укрывателем этих кулаков и сросся с ними, вместе управляют с-зом Моринов, зная все эти безобразия не принимают конкретных мер.

При этом прилагается докладная записка.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1а. Спр. 7а. Л. 352–353.

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ КАРНАЛІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

18 лютага 1930 г.

Присутствовало: бедняков — 30, середняков — 33.

Слушали: О ликвидации кулачества как класса.

Постановили: Общее собрание бедняков и середняков, заслушав информацию о ликвидации кулачества как класса и выселении их из района Карналинского с/с как района сплошной коллективизации, самых активных и агитируемых против Советской власти и ее мероприятий выселить за пределы республики с их семьями следующих кулаков: Евтушенко Евсея Д. с его семьей.

Подлинник с надлежащими подписями.

С подлинным верно: Секретарь

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 38. Л. 120, 122.

З ІНФАРМАЦЫІ АБ НАСТРОЯХ РОЗНЫХ СЛАЁЎ СЯЛЯНСТВА І ЎДЗЕЛЕ КАЛГАСНІКАЎ У ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

1930 г.

Вопросу ликвидации кулачества было уделено много внимания со стороны советско-партийных организаций, и как результат этого организационная сторона этой работы прошла успешно.

Все выделенные товарищи в количестве 23 человек к 12 часам были уже на месте, а к утру уже были доставлены кулаки, склонные к бегству. В селении Еремино к утру 10.11.30 г. были подняты имевшиеся там 3 кулацких семьи и доставлены также на сборный пункт. То же самое проделано в д. Рудня-Прибытковская. В этих населенных пунктах о поднятии кулацких хозяйств до утра население не знало.

На местах колхозники, беднота, актив в деле выселения кулачества принимали активное участие. В д. Терешковичи колхозники оказали уполномоченным по выселению гро-

мадную поддержку. Особую активность выявили в задержании тех лиц, которые склонны были к побегу. В д. Рудня-Маримоновская крестьяне к выселению кулаков отнеслись безразлично. Вследствие этого имело место бегство кулаков. Так из одной семьи в количестве 12 душ скрылось 4.

При выселении кулаков в д. Новые Дятловичи, председателю колхоза т. Даниловичу, чл. КП(б), было заранее предупреждено о необходимости подготовки соответствующего количества подвод для доставки выселенных кулаков в г. Гомель. Последний оставил только 2-х лошадей и те [оказались] непригодными, а сам умышленно скрылся.

Настроение колхозников, бедняков, основной части середнячества в основном бодрое. Выселение не внесло в настроение никаких изменений. В д. Новые Дятловичи бедняцкая часть населения высказала свое мнение, чтобы выселили еще два хозяйства. «Почему оставляете других двух, они также враги и держали тесную связь с выселяемыми». В д. Старые Дятловичи бедняцкая часть населения высказывает свое мнение и говорит, что только при таких условиях, т. е. если мы выселим всех кулаков из деревни, то скорей проведем коллективизацию, и партия правильно подошла к этому вопросу.

Но зафиксированы вместе с положительным отношением основной части [населения] к выселению кулачества и отрицательные суждения.

В д. Рудня Маримоновская бедняки не только не оказывали содействия скорейшему проведению выселения, но даже допустили некоторое сопротивление. К последним присоединились даже середняки. К дому выселяемого кулака собралась толпа крестьян в количестве 20 человек, которые подстрекали кулака не ехать: «Не надо вам ехать и ничего не сделают». Во время подъема и выезда со двора толпа стала на воротах и не допускала выехать, крича «Выслать мы не дадим». В это время милиционером был произведен выстрел, после которого толпа рассеялась и подводы выехали со двора. Аналогичное явление имело место в д. Новые Терешковичи. В д. Даниловичи в толпах крестьян слышался разговор: «Вот до чего дожили, не знаем, может это и с нами будет».

В д. Костюковка 10 ноября 1930 года Гавриленко Б.Л., середняк, в присутствии 5-ти человек по вопросу ликвидации кулачества говорил: «Выселяют не кулаков, а тружеников. На следующий год и нас обложат индивидуальным налогом и также выселят». Возражая ему, бедняк Евтухов М. сказал: «Туда им и дорога. Вечно нас эксплуатировали и нашими кровавыми мозолями наживали богатство. Довольно им барствовать, пусть хозяйство отдадут нам».

В общем следует отметить, что процесс выселения кулачества 3-й категории не вызвал широких разговоров. Характерно отметить отношение населения всех прослоек д. Новые Дятловичи, где мы имели массовые выступления женщин в момент операции по изъятию кулаков, бежавших из мест высылки. В настоящее время в этой деревне никем не было оказано ни малейшего сопротивления. Во время подъема кулацких семей население даже не подходило ко двору того или иного выселяемого, за исключением родственников. Наблюдается, что в процессе хода ликвидации кулачества зажиточная часть начала подавать заявления о вступлении в колхозы. Особенно это заметно в Дятловичском с/с, где в момент выселения 4 крепких середняка подали заявления о вступлении в колхоз. В Грабовке были приняты заявления от 3-х крепких середняков о вступлении в колхоз.

Цифровые данные

Подлежало выселению 17 семей — 110 душ. Две семьи в составе 8 душ скрылись за 2 месяца до начала выселения. Две семьи освобождены на Гомельском сборном пункте с наличием 10-ти душ в них. Две семьи с наличием 7 душ не подняты вследствие того, что мужчины уехали за 2 месяца до выселения. Одна семья при наличии 11 душ не выселена, т. к. взрослые 3 мужчины и 1 женщина накануне выселения скрылись, в семье остались только дети.

Всего выслано 10 семей с количеством 74 души. Из этого количества оставлены на опеку родственников 14 детей, стариков 2, женщин по болезни 2, и скрылось мужчин 2, женщин 3.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 56.

З ПЯЦІДЗЁННАЙ ІНФАРМАЦЫІ

1930 г.

Представленное дополнительное задание по хлебозаготовкам по Гомельскому району, составляющее в общем 200 т, внесло известное ослабление в темп заготовок. Поколюбичский с/с, стремясь формально и казенно выполнить директиву вышестоящих органов, при

распределении дополнительного задания допустил целый ряд перегибов в вопросе обложения бедняцких хозяйств, в противовес середняцким, которые облагались в меньшем размере. Таких хозяйств около 10.

В Даниловичском с/с при получении дополнительного задания по хлебозаготовкам организационная работа была поручена комиссии содействия хлебозаготовкам, в составе которой имелись зажиточные крестьяне. Вследствие этого комиссией было произведено разверстание не среди 13 зажиточных хозяйств, а среди 52 хозяйств. В Севруковском с/с дополнительная норма до населенного пункта не доведена.

Еще хуже обстоит дело в проведении заготовительной кампании в Романовичском с/с, где не проявляют никакой инициативы в деле усиления работы по заготовке. Не было созвано ни одного собрания бедноты. Комсомол и [...] не вовлечены в работу, не мобилизована активность бедноты.

Уполномоченный РНК Толкачев в группе учителей высказывался: «...в настоящее время в деревне наша беднота ничего не дает нам ни экономически, ни политически. В бедноте остались либо пьяницы и растяпы, не сумевшие выйти из бедняков в середняки, либо маскирующиеся под бедняка зажиточные крестьяне». Это мнение развивал и поддерживал уполномоченный РНК Седневец, говоря: «Наша опора — сознательный середняк». В этом с/с дополнительное задание по хлебозаготовкам было разверстано среди всего населения. В силу подобной поспешной раскладки в сельский совет ежедневно поступают заявления от бедноты о снятии наложенных норм.

По Гомельскому району общее количество 805 т. подлежащее выполнению, выполнено только на 20%.

Не лучше дело с хлебозаготовками протекает среди коллективного сектора, в коем из 103 т. выполнено только на 50%.

Настроения разных прослоек крестьянского населения

Наряду с положительным настроением, выявленным со стороны основной массы бедняцкой и середняцкой прослоек крестьянского населения к кампаниям, проводимым на селе, выявлено целый ряд отрицательных настроений, главным образом к вопросу проводимой коллективизации.

Крестьянин-бедняк д. Даниловичи Климков выразился: «Колхозы не должны существовать, они существуют только до тех пор, пока пройдет сравнение с индивидуальным хозяйством, нет сомнения в том, что единоличное хозяйство гораздо выгоднее, т.к. оно в товарном отношении прибыльно».

Чуешов Г., середняк: «Я никогда в колхоз не пойду, лучше все продам и не буду находиться в подчинении каких-то правителей-босяков».

В Поколюбичском с/с в разговоре крестьян середняк Хомякова С. по вопросу коллективизации [высказался]: «Пока босяки будут у власти, у нас будет голод». Один из участников этого разговора выразил нескрываемое желание о падении советской власти и о ликвидации колхозов.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 56. Л. 42—46.

З ПАРТЫЙНАЙ ДЫРЭКТЫВЫ

1930 г.

Совершенно секретно

Всем секретарям РК КП(б)Б Гомельского округа

С получением сего ОК КП(б)Б предполагает приступить к выявлению и учету всех кулацких хозяйств Вашего района, подлежащих расселению по 3-ей категории. Подлежат выявлению и учету все кулаки третьей категории, оставшиеся по разным причинам кулацкие семейства первой и второй категории, в том числе и возвращенные обратно из ссылки по мотивам старости и многосемейности.

Одновременно с проведением учета кулацких хозяйств, подлежащих переселению по третьей категории, Вам подлежит также взять на учет все орудия производства, скот, строения, кормовые и пр. семена. Категорически запретить кулакам распродажу и порчу имущества. При обнаружении таких случаев имущество конфисковать, виновных привлечь к уголовной ответственности.

Параллельно с проведением учета кулацких хозяйств Вам надлежит через земельные органы наметить соответствующие участки худшей земли для расселения кулаков третьей

категории. В принципе исходить из того, чтобы расселение допускалось только небольшими поселениями в 15–20 хозяйств. В соответствии с наличием кулацких хозяйств в районе и наличием свободных земель для их устройства наметить и составить фактические планы переселения, учитывая размер необходимых затрат материальных и физических сил на переселение.

Всю подготовительную работу закончить не позже 13 августа 1930 г. и материалы предоставить в ОК КП(б)Б, после чего получите конкретные указания по фактическому переселению.

Секретарь ОК КП(б)Б

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 69. Л. 1.

СА ЗВОДКІ ДПУ № 79

19.5.1930 г.

15 мая председатель сельсовета Новые Дятловичи Зубкус и бригадир Аронов приступили к проверке документов у кулаков, вернувшихся в Новые Дятловичи из Северного края с мест ссылки. Когда председатель сельского Совета Зубкус и бригадир Аронов начали обходить деревню, разнеслись слухи, что они приехали с той целью, чтобы обратно выселить вернувшихся из ссылки кулаков.

Со всех концов деревни группами начали собираться женщины, которые приближались к зданию, ранее принадлежавшему высланному кулаку, где теперь помещалась канцелярия правления колхоза. Всего собралось примерно 300 человек, преимущественно женщины, вооруженные вилами, палками и кольями и с криками «...где те гады, что приехали забирать обратно этих людей, что только что прибыли, давайте их сюда, мы их разорвем как тряпку».

Собравшиеся выломали ворота, вошли во двор, окружили канцелярию правления колхоза со всех сторон, выломали двери и ворвались в хату и схватили бригадира Аронова, но последнему как-то удалось вырваться и убежать.

Председатель сельсовета Зубкус также находился в канцелярии правления колхоза, видя, что дело принимает серьезный характер, начал успокаивать собравшихся, заявив, что они пришли не забирать бежавших, а, наоборот, вернуть им имущество и землю и оплатить расходы, понесенные ими при выселении.

Это заявление немного успокоило собравшихся женщин, но однако же они набросились на семью колхозника, проживавшего в этом доме, выбросили на улицу детей, выбрасывали постельные принадлежности и одежду и избили жену колхозника.

Все это сопровождалось криками: «...если не освободите этот двор, то передавим всех колхозников, как гадов, за одну ночь. Мы заявляем, что если соберемся всей деревней, то не дадим никому ничего сделать и разгоним весь колхоз».

Наиболее активно в этом выступлении проявили себя 8 женщин, по имущественному положению – середнячки. Сбор женщин к месту выступления провела беднячка Семенчукова Анна Степановна, которая обежала все улицы с криком: «...ходите скорей, уже снова приехали брать Лавренова и Ренчукова семьи».

Здесь же при выступлении с палками в руках стояли 3-е мужчин-середняков, причем один из них Суржиков Федор при этом заявил: «...мою сестру сослали, все равно убью Чубукова Афанасия, Чубукова Кирилла и Балаева Степана (местные активисты), если встречу ночью, то сразу убью».

Выступление обошлось без жертв, ибо колхозники находились в поле на полевых работах.

По возвращении с поля, узнав о происшедшем, колхозники заявили: «...если бы приехали тогда на лошадях, то убили бы не менее 100 женщин».

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 714. Л. 503–504.

СА СПЕЦІНФАРМАЦЫІ № 8 АБ ХОДЗЕ ЎБОРАЧНАЙ І НАРЫХТОЎЧАЙ КАМПАНІІ І РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

1930 г.

Со стороны советско-партийных органов была проявлена активность в вопросе ликвидации создавшегося среди единоличников отказа идти в колхозы работать. Благодаря проведенным собраниям в районе единоличники почти повсеместно вышли на помощь

колхозникам по уборке картофеля бесплатно (это Дятловичи, Терешковичи). Однако наряду с этими имеется еще ряд хозяйств, где значительная часть урожая еще не убрана.

Благодаря бесхозяйственности, систематическому пьянству и отсутствию заинтересованности со стороны председателя правления колхоза «Пионер» Карнолинского с/с не убрано картофеля с пл. 9 га. Кроме этого в колхозе имеется 65 дес. сенокоса, к снятию которого еще не приступали. В колхозе «Новый путь» Носовичского с/с благодаря не прекращающейся конкуренции совхозов с колхозами в части найма рабочей силы имеется 23 га не убранного картофеля и 50 га нескошенного луга. Угрожающее положение в колхозе «Долголесье», где не убрано на пл. 40 га.

По заготовке картофеля. По Носовичскому с/с подлежит заготовить 770 т, а заготовлено только 174 т. Не лучше дело обстоит в Карнолинском с/с, из 236 т заготовлено только 3 т. В ходе заготовки картофеля в Даниловичском с/с отмечен случай явного перегиба и искривления классовой линии. По этому сельскому Совету имеется 25 хозяйств, относящихся к кулацко-зажиточной прослойке, вместе с тем норма доведена до 50 хозяйств. Главным образом затронуто 25 середняков нормой, предназначенной для кулацко-зажиточной части.

Ход реализации займа. Популяризация значения займа среди крестьянского населения в начале развертывания этой кампании дала известные результаты в том отношении, что некоторые сельские Советы перевыполнили задания, например, по Терешковичскому с/с было представлено к реализации на сумму 1500 р., а реализовано на 1595 р., в Носовичском намечено 6000 р., а реализовано 6575 р. Наряду с этим, имеются сельские Советы, где существенного сдвига в реализации займа не чувствуется. Это Песочно-Будский, Бобовичский, Шарпиловский сельские Советы. В процессе проведения работы по распространению займа в одном из случаев отмечен практикующийся принудительный метод реализации займа, например, Шарпиловский с/с отдал распоряжение в лавку сельпо взимать с граждан, которые покупают больше 1 л. водки, 50 коп. на заем.

По плану намечено по Гомельскому району разместить заем на сумму 98 500 р., а размещено на 82 916 р.

Настроение вокруг проводимых кампаний

Наряду с положительным отношением основной массы крестьянского населения к проводимым кампаниям на селе нами выявлен целый ряд отрицательных настроений со стороны отдельных групп бедняков и середняков в проведении этих мероприятий. По вопросу оказания помощи колхозам в уборке урожая крестьянин д. Новые Дятловичи Пугачев Анисим З. середняк высказывал: «Если колхозы набрали себе много земли, то пускай хоть лопнут, а убирать сами должны». Наиболее резко эти настроения были выражены со стороны колхозника колхоза «Коминтерн» Даниловичского с/с Морозова С. Когда единоличники направлялись на уборку урожая колхоза, он неоднократно повторял: «На какой черт вы идете к нам на помощь, а мы сами хотим бросить и уходить из колхоза».

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 56. Л. 28–33.

ТЭЛЕГРАМА З ЦЭНТРА

Минск 22.10.30 года
2 часа 50 минут

В связи с предстоящим выселением кулаков срочно приступите совместно с председателями ОГПУ к тщательной проверке списков кулаков, находящихся в настоящее время в районе.

Списки семейств кулаков всех категорий, указанием имущественного положения прошлом и настоящее по утверждении передать ГПУ.

Всю работу закончить в пятидневный срок.

Немедленно передать всем секретарям районных комитетов КП(б)Б и представителям районных исполкомов.

Секретарь ЦК

Председатель Совнаркома

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 3. Спр. 56. Л. 12.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ НАРЫХТОЎКАХ, КАНТРАКТАЦЫІ І СІЛАСАВАННІ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

10 кастрычніка 1930 г.

Заготовительная кампания по Гомельскому району в основном проходит успешно.

Намеченный ранее годовой план по району выполнен с превышением на 11%. Дополнительное задание на 40% до некоторой степени внесло известное ослабление темпов заготовок, т.к. последнее вызвало дополнительное доведение до двора норм заготовки. И в этот организационный отрезок времени темп заготовки приостановился. Все же, несмотря на это, мы имеем в заготовительной кампании по некоторым сельским Советам положительные результаты. Об этом ярко свидетельствуют нижеследующие факты. Улуковский с/с выполнил задание на 117%, Носовичский — на 108%. Помимо этого, отмечены такие случаи заключения социалистического договора, как, например, Дятловичский с/с, развив темп заготовки, заключил соц. договор на 100% выполнения заготовки к 10 сентября с.г. с Михальковским и Жеребинским с/с. Последний в силу своей бездеятельности и бездействия комиссии, договор не выполнил, задание выполнено только на 14%. Дятловичский с/с выполнил задание на 90%, а Михальковский на 50%.

Карнолинский с/с выполнил задание на 14%, несмотря на то, что в данном с/с преобладающее большинство середняков и крепких середняков. Старо-Мильчанский с/с на 45%, Терюхский — на 36%, Климовский — на 48%.

Аналогичное положение имеет место в целом ряде других сельских Советов. В Шарпиковском с/с выполнено задание на 36%. Это объясняется тем, что население от сдачи уклоняется, мотивируя неправильной контрактацией и тем, что озимая рожь поражена была морозом.

В Носовичском с/с отмечен случай халатного отношения взыскания хлеба с крестьянских хозяйств. В данном с/с имеется 8 кулацких хозяйств, на коих было наложено 7 т., а взыскано только 3 т.

В текущую заготовительную кампанию первенствующую роль играет бедняцкая прослойка, которая в заготовке принимает самое активное участие, и почти повсеместно сдает гораздо больше, чем середняки.

Выполнение плана по району

По плану среди индивидуального сектора подлежит заготовке 7175 ц., заготовлено 4183 ц.

В значительной степени в заготовке отстают колхозы. По плану от колхозов должно было поступить 1230 ц., поступило 632,35 ц., что составляет 51,35% выполнения годового плана.

Заготовка картофеля

В деле заготовки картофеля нет еще должной раскачки. Сельские Советы в большинстве своем заняты организационной работой, то есть проводится работа по доведению до зажиточно-кулацкого двора и подготовке и организации красных обозов, следствием чего и выполнение плана далеко не достаточное, а именно: среди индивидуального сектора по плану необходимо заготовить 7187 т., заготовлено 465 т., что составляет 6,4%. По коллективному сектору по плану 2836 т., поступило 207 т., что составляет 7,3%. В селении Лагуны отмечается недовольство крестьян на почве сдачи картофеля в Новобелицу на расстоянии 20 верст. Это недовольство отражается и на заготовке. В Песочно-Будском с/с при доведении нормы до зажиточно-кулацкого двора имеет место явное нарушение классовой линии, затронуты явно середняцкие хозяйства, чем и вызывает разное возмущение последнего.

Силосование

Партийные органы этому вопросу уделяли мало времени. В результате — этот вопрос сорвался. Колхозы своими силами не могли заняться работой по устройству ям и башен в силу отсутствия рабочих рук.

По плану необходимо было устроить и зарыть по 9 колхозам 9 ям с общим количеством силоса 4500 т. Устроено же и закрыто 4 ямы с общим количеством силоса 1531 т. Из 23 колхозов нужно было засилосовать 7200 т. Засилосовано же 1170 пудов в 5-ти ямах. Вместо 22 ям устроено только 9.

Контрактация

Контрактация озимых посевов на сегодняшний день находится в угрожающем положении. По плану среди индивидуального сектора следует законтрактовать 3428 га, а законтрактовано только 228 га, что составляет 6,6% выполнения плана. Контрактация проведена только по 2 сельским Советам.

Наряду с положительным отношением основных прослоек к заготовительной кампании зафиксировано и отрицательное отношение.

Например, в д. Новые Дятловичи во время организации «Красного обоза» крестьянин-бедняк Ронгуков Иван упрекал члена сельского Совета, организовавшего «Красный обоз»: «С нас дерешь три шкуры, а сам ты думаешь завоевать на этом авторитет». В с. Старые Терешковичи за время движения «Красного обоза» с хлебом крестьянин-середняк Николай Климович в группе крестьян, поддерживающих его, говорил: «Дурак тот, кто сдает им хлеб. Если бы мы все не повезли, то силой не взяли бы. Я в прошлом году не сдал и мне ничего не сделали». Помимо этого имеет место в отдельных случаях выражение вокруг хлебозаготовительной кампании антисоветских настроений, например, в д. Новые Дятловичи во время сдачи колхозам законтрактованного член колхоза Чубуков Макар, член ЛКСМБ, выразился: «Мы все отдаем жидам, а сами голодаем».

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 56. Л. 3–7.

ТЭЛЕГРАМА АКРКАЛГАССАЮЗА АКРПЛАНУ

1930 г.

Акракалгассаюз наступным паведамляе, што скупка жывёлы ад кулацкіх гаспадарак з ліквідацыяй кулакоў як класа спынена і адабраная маёмасць ад кулакоў перадаецца калгасам дарэмна, а пагэтаму крэдыты на пакупку жывёлы ад кулакоў зараз не патрэбны. Што датычыцца крэдытаў наогул на папаўненне стада жывёлы ў калгасах, дык гэтыя крэдыты адпушчаюцца с/г банкам.

Праўленне калгассаюзу (Здановіч)
Заатэхнік (Аарон)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 53. Л. 129.

НАВІНЫ З НОВЫХ ДЗЯТЛАВІЧ

1930 г.

В д. Новые Дятловичи в феврале 1930 г. организовался колхоз под названием «Чырвоны партызан». В этот колхоз вступило 10 семей и 6 одиночек. Имущество и землю все, кроме одиночек, абобществили. У одиночек есть отдельные хозяйства, в которых они получают от сданных продуктов премировки, кроме этого, одиночки в к-зе получают премировки больше, чем семейные примерно на 25%. За счет семейных одиночки обогащаются. На почве этого в колхозе стал отлив семейных, а прилив одиночек. Кроме этого в к-зе не дают продукты ни детям, ни больным, ни старикам, не способным к труду. Последним кооперация тоже не дает продуктов, заявляя, что они пользовались с колхозов. На почве этого большие недоразумения в колхозе. В колхозе, кто имеет свой общественный скот, тот получает по 2–3 л молока, а у кого нет свиней, а только есть сало свое и мясо, то таковому к-з продает раскулаченных свиней за низкую цену, а то, что в колхозе есть беднота и нет дневного оборота жиров, аб этом колхоз не беспокоится. В к-зе происходят систематические кражи овец, коров раскулаченных и колхозной сбруи, посевов отдельными лицами. Колхозники избивают колхозников до смерти обухом, а колхоз мер не принял, в к-зе систематические пьянки и невыход на работу. Замята критика и самокритика со стороны отдельных колхозников в лице правления т. Сазара, ныне секретаря Дятловичской партячейки. Он не только зажимает самокритику, но щупает селькоров «Полесской правды». В колхозе бесхозяйственность в уборке сена, овса, гречихи, картофеля и т.д. и за это отвечают невиновные.

В к-з передан кулацкий скот и сено. В акт передачи записали меньше, чем было в наличии, и излишек сена явился для к-за бесплатным. Между тем сельсовет в лице Зубкуса это бесплатное сено забрал в с/с на свои потребности. Этого излишка было примерно 1000 пудов. К-зу не хватило 2000 пудов сена для прокорма скота. В к-зе есть прокатный пункт. Лошадьми пользуются т. Сазар. Сазар отъявленный пьяница. Водка является врагом коллективизации.

Лишний скот зарывается так, что нечего обобществлять. Зубкус выдвиженец. Его брат и тесть в к-з не идут, и все имущество остается на индивидуальном хоз-ве. Вот вам выдвиженец Зубкус. Сазар, Зладеев, Силькович — это троица пьяниц.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1а. Спр. 7а. Л. 305.

З ВЫНІКАЎ АБСЛЕДАВАННЯ ЎСТАНОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ДЗЯТЛАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

За апошні час арганізаваны і афармлены калгасы ў Старых Дзятлавічах, пасёлку

Чарнічны і ўзбуйнен новы калгас «Чырвоны партызан», а таксама есць глеба на суцэльную калектывізацыю ўсёй вёскі Нов. Дзятлавічы.

Не выканана нарыхтоўка шэрсці, льновалакна, сена, саломы. Партвучоба не арганізавана. Адносіны паміж камуністамі дрэнныя, п'янкі сярод партыйцаў і камсамольцаў. Ёсць моманты зажыму крытыкі. Не дапускаліся заметкі ў насценгазеты.

Працоўная дысцыпліна сярод калгаснікаў недапушчальна дрэнная, ударніцтва і спаборніцтва не арганізавана, пэўная безгаспадарчасць у калгасе. Зусім няўмелае кіраўніцтва з боку старшыні калгасу т. Даніловіча, дзякуючы чаму часць ураджаю пагібла на полі, пэўная непадрыхтаванасць гаспадаркі да зімы. Камісія адзначае, што пры размеркаванні ўраджаю было дапушчана рвачаства з боку партыйца Чубукова К., якое выразілася ў імкненні атрымаць надбаўку к зарплаце без [уліку] працоўных дзён. Па некалькі месяцаў не разглядаліся заявы аб уступленні ў калгас, і ў дадатак частыя спрэчкі ў партыйцаў і камсамольцаў.

Кіраўніцтва камсамольскімі ячэйкамі з боку партячэек адсутнічае. У выніку чаго бюро ЛКСМБ распушчана за п'янкі і хуліганства ў вёсцы (агент ДПУ адняў рэвальвер і прыцягвае Сілковіча да адказнасці). Вучоба камсамольскай і партыйнай арганізацыі адсутнічае.

Сельсавет не пераключыўся да працы па калектывізацыі, большасць членаў с/с у калгас не ўступілі, не гледзячы на тое, што арганізоўваецца і ўзбуйняецца стары калгас «Чырвоны партызан». Культурным будаўніцтвам ні с/с, ні ячэйка не цікавяцца, пастанова ўрада аб абавязковым навучанні і ліквідацыі непісьменнасці не разглядалася. Лікпункты ў Старых Дзятлавічах не працуюць. Камісіі па ліквідацыі непісьменнасці няма, рамонт школ не зроблен, батракі, вучні Дзятлавіцкай ШКМ знаходзяцца ў самым дрэнным становішчы.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1а. Спр. 7а. Л. 216–219.

Да жыцця новага, калгаснага

З лета 1929 г. у калгасы пайшоў серадняк — асноўная маса сялянства. Ужо да 1 кастрычніка 1929 г. у раёне было 12 калгасаў і 7 саўгасаў. У ліку першых — Пакалюбіцкі калгас «Чырвоная ніва», за якім дзяржава замацавала 30 га ворнай глебы і 120 га выгану, а беднякі сабралі на грамадскі двор усё, што мелі. Вясной 1930 г. арганізаваўся калгас «Камунар» (Старацярэшкавіцкі сельсавет). У яго ўвайшлі 32 гаспадаркі (22 — бядняцкія, 6 — серадняцкія і 4 — служачыя). Калгас меў амаль 300 га зямлі, 24 кані, 32 каровы, 52 авечкі.

У гарачую пару на дапамогу калгасу прыходзілі сяляне-аднаасобнікі. Дружная праца садзейнічала поспеху. Пабудавалі хлеў на 50 галоў жывёлы, свінарнік на 30 галоў, стайню на 30 коней. Гаспадарку добра забяспечылі кармамі.

Добрасумленнае вядзенне гаспадаркі прынесла і трывалы прыбытак. За працоўныя поспехі гаспадарку першай у раёне ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга, а па лініі Каапсаюза прэміравалі пераходным Чырвоным сцягам.

Але ў раёне такіх гаспадарак было няшмат, хоць добры прыклад станоўча паўплываў на ход калектывізацыі. І тым не менш тэмпы калектывізацыі не задавальнялі ні высокае, ні мясцовае кіраўніцтва. Было вырашана надаць ім ударны размах і на працягу 2 гадоў калектывізаваць усю сялянскую гаспадарку раёна. З канца 1929—пачатку 1920 г. у калгасным руху пачаўся рэзкі паварот у бок прымусовага стварэння калгасаў. Гэта выклікала масавае абурэнне сялянства.

Ды і было чым абурацца. У сялян-аднаасобнікаў адбіралася зямля, іх пазбаўлялі выбарчых правоў, абкладалі высокімі падаткамі. Вёска паднімалася на сваю абарону.

2 сакавіка 1930 г. цэнтральная прэса змясціла артыкул І.В.Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў», у якім асуджаліся «перагібы ў калгасным

будаўніцтве». Следам за артыкулам Сталіна 14 сакавіка 1930 г. была надрукавана ўрадавая пастанова «Аб барацьбе са скрыўленнем партлініі ў калгасным руху». І артыкул і пастанова непасрэдна выклікалі вялікія спрэчкі і дыскусіі па стане спраў у калгасе. Пайшлі гаворкі і абмен думкамі. У в. Данілавічы на сходзе выступіла сераднячка Багамолава. Яна заявіла, «што ў калгасы ісці не трэба, таму што нам прыйдзецца працаваць толькі на партыйцаў. Камуністы нічога не робяць». Яе падтрымаў бядняк Я.Самойчанка. Ён сказаў: «У калгасе будзе такая ж доля, як з калперацыяй. Раней гаварылі, што шлях да сацыялізму — калперацыя, а зараз атрымліваецца зваротная карціна: прыйдзеш у лаўку, а там нічога няма. Нас і ў калгасе будуць ашукваць».

Яўна антыкалгасны настрой выказаў селянін-серадняк вёскі Дзятлавічы І.Маршын. Ён казаў: «Калгасы робяць толькі адны страты, а ўлада цвердзіць, што яны добрыя. Жадаюць усімі мерамі прывабіць у калгас, але гэта ім не ўдаецца... калектывізацыя не магла праходзіць паспяхова ў гэтых умовах. У калгасах прыйдзецца працаваць толькі на дабрабыт яўрэяў і тых паноў, якія стаяць ва ўладзе».

Хадзілі розныя чуткі. Казалі, што «ў цэнтры вялікае рознагалоссе па пытанню калектывізацыі».

Узмацніўся і стаў масавым выхад сялян з калгасаў. Многія з іх наогул развалiліся. Толькі за 1—3 красавіка 1930 г. у раёне з калгасаў выйшла 109 гаспадарак. За адзін дзень 9 красавіка выйшла яшчэ 40 гаспадарак. У калгасы больш ніхто не ўступаў. Распаўся калгас «Чырвоны авіятар» у в. Клімаўцы. З яго выйшлі 56 двароў з 64. Астатнія 8 гаспадарак лічыліся калгасам, але выдзеленую калгасу зямлю апрацоўваць ужо не маглі.

Весткі аб «прылівах» і «адлівах» сялянскіх гаспадарак у калгасах раёна заставаліся несуцяшальнымі. За адзін дзень 11 мая 1930 г. у раёне з калгаса «Піянер» выйшла 7 гаспадарак, з калгаса «Чырвоны бераг» — 5, з калгасаў «Пралетарый», «Чырвоны маяк», «Чырвоная Беларусь» выйшла 25 гаспадарак. Тое ж было і ў іншых калектыўных гаспадарках, створаных у свой час зусім не на добраахвотнай аснове.

Характарызуючы сітуацыю, супрацоўнік АДПУ раёна пісаў у інфармацыйным бюлетэні: «Артыкул Сталіна носяць за пазухай і тлумачаць па-свойму, што калгасы магчыма не будаваць, яны нам не патрэбны і г.д.» І там жа — «кулакі зашавяліліся ва ўсю. З тэрыторыі калгасаў ніхто высяляцца і не думае. Патрэбна міліцыя і штурхнуць усіх кулакоў і выбыўшых з калгасаў як след, інакш нічога не будзе».

Між тым у раёне працягваліся ўсё тыя ж «перагібы». Адбіралася ў сялян зямля, або выдзялялася для аднаасобнікаў так далёка ад месца іх жыцця, што яны самі ад яе адмаўляліся. Збываліся коні, ішла пад нож жывёла, у прывычнае сялянскае жыццё прыйшоў разлад і хаос.

Пустаўалі землі, адабраныя ў кулакоў. Ад сяўбы на адведзеных землях у в. Прыбыткі адмовіліся 137 гаспадарак, у Старых Цярэшкавічах — 50, у Пясочнай Будзе — 20. Тое ж назіралася і ў іншых вёсках.

Аднаасобнікі не прызнавалі новы перадзел зямлі, не ішлі ў калгасы добраахвотна. З пачаткам вясенне-пасяўной кампаніі выхад з калгасаў зменшыўся, але не спыніўся.

Каб фарсіраваць калгаснае будаўніцтва, у раёне былі створаны 4 ініцыятыўныя групы. У іх увайшло каля 80 актывістаў вёсак Шарпілаўка, Пясочная Буда, Рудня-Марымонава і Прыбар.

Пачалася новая гонка за тэмпамі

калгаснага будаўніцтва. Яна і з'явілася галоўнай прычынай шматлікіх людскіх бед жыхароў раёна. Працягвалася разбурэнне сацыяльна-эканамічных і маральных традыцыйных устояў сялянскага жыцця. А ў 1932—1933 гг. прыйшоў голад. Карэннага аднаўлення і перабудовы сялянскага жыцця на першым этапе калектывізацыі не адбылося, ды і адбыцца не магло.

На мяжы 1932—1933 гг. пачалася некаторая стабілізацыя калгаснага будаўніцтва. А па стане на 1 чэрвеня 1940 г. у раёне было ўжо 57 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 7280 сялянскіх двароў. Усё пад тым жа прымусам было калектывізавана 90,7% гаспадарак. Пасяўныя плошчы калгасаў складалі 20 283 гектары. У гаспадарках калгаснікаў — 2494 га і аднаасобнікаў — 273 га зямлі. Такім чынам, у раёне было калектывізавана 93,8% зямельных угоддзяў.

На 1 снежня 1941 г. у 57 калгасах раёна было 57 прадукцыйных фермаў жывёлы і птушкі, у тым ліку свінафермаў — 53, птушкафермаў — 34. У гаспадарках раёна фермы толькі буйной рагатай жывёлы і авечак мелі 4 калгасы, буйной рагатай жывёлы і свіней — 2, не меў свінафермаў 1 калгас.

Па ўсіх сектарах гаспадарак раёна на 1.1.1941 г. было 16 318 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 10 785 кароў, 13 773 свінні, 5 741 авечка і 5 993 кані.

З 7213 двароў калгаснікаў без усялякай жывёлы было 840 гаспадарак, у тым ліку без кароў — 321, з 1 каровай — 5505, па 2—3 каровы — 3 двары. Без свіней было 2653 двары, без авечак — 6556 двароў.

У 1941 г. на 100 гаспадарак калгаснікаў у раёне прыпадала буйной рагатай жывёлы 86 галоў, у тым ліку 36 кароў, 31 свіння, 56 авечак, 64 кані. На 100 двароў аднаасобных гаспадарак прыпадала: буйной рагатай жывёлы 84 галавы, у тым ліку 76 кароў; 110 свіней, 21 авечка.

У 30-я гады вострай праблемай была арганізацыя, падлік і аплата працы калгаснікаў. Працягвала захоўвацца аплата працы «па паях», пры якой былыя беднякі і жабракі, як бы хораша яны ні працавалі, а за сваю працу атрымлівалі значна менш, чым былыя сераднякі, бо іх пай быў меншы, чым у серадняка. У некаторых калгасах практыкавалася падзёншчына, калі плацілі не за зробленую працу, а за праведзены на працы час. Прыгнятаў і абражаў людзей так званы «ядоцкі прынцып», г.зн. аплата работы на «едака». Выходзіла, што галоўнае ў тым, каб мець «едакоў», а праца ў калектыўнай гаспадарцы — гэта нешта дадатнае, не абавязковае.

Жыццёва важным заставалася пытанне: як жа дзяліць прыбытак? З увядзеннем працадня, ці «палачкі» за працу, як казалі калгаснікі, трэба было яшчэ распрацаваць абгрунтаваныя нормы калгасных работ. А справа гэта была не простая і не лёгкая.

Суцэльная калектывізацыя не адразу прывяла да павелічэння аб'ёму таварнай прадукцыі. Мела месца і зніжэнне ўраджаяў, і рост сабекошту прадукцыі, і іншыя крызісныя з'явы. І тым не менш жыццё не стаяла на месцы. Людзі працавалі, бо трэба было жыць. Узнімалася і калектыўная гаспадарка. Павялічвалася аплата працадня, развівалася асвета, культура, ахова здароўя і ўсё тое, без чаго чалавек жыць не можа.

Другая і трэцяя пяцігодкі сталі і перыядам тэхнічнага пераўзбраення сяла. І гэта прынесла свой плён, пра што сведчаць адпаведныя дакументы.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СПІС КАЛГАСАЎ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА САКАВІК 1930 г.

Назва с/саветаў	Усяго гаспадарак		Колькасць калгасаў	
	Усяго	не ў калг.	камун.	калгасаў
Баршчэўскі	355	320	-	1
Грабаўскі	468	452	1	-
Данілавіцкі	598	406	-	2
Стара-Дзятлавіцкі	396	373	-	1
Яромінскі	473	350	-	1
Жаробінскі	305	267	-	1
Жгунскі	584	410	-	1
Клімаўскі	392	376	-	1
Касцюкоўскі	352	272	-	1
Карналінскі	312	204	-	2
Міхалькаўскі	307	272	-	1
Насовіцкі	1237	1025	-	1
Прудкоўскі	552	547	-	1
Прыбыткаўскі	461	287	-	1
Раманавіцкі	513	483	-	1
Улукаўскі	512	480	-	1
Ст.-Цярэшкавіцкі	507	479	-	1
Цярухскі	457	434	-	1
Пакалюбіцкі	766	766	-	-
Жг.-Будскі	670	670	-	-
Бабовіцкі	575	575	-	-
Давыдаўскі	559	559	-	-
Зябраўскі	566	566	-	-
Ст.-Мільчанскі	634	634	-	-
Пясчана-Будскі	404	404	-	-
Рудня-Марымонаўскі	189	189	-	-
Сеўрукоўскі	355	355	-	-
Урыцкі	612	612	-	-
Ціценскі	637	637	-	-
Шарпілаўскі	382	382	-	-
Прыбарскі	298	298	-	-
Усяго:	15 428	14 084	1	19

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1475. Воп. 1. Спр. 10. Л. 115.

СПІС САЎГАСАЎ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА 1932 г.

Назва гаспадаркі	Месца знаходжання	Дата ўтварэння
Свінаадкормпункт РТСТ	ст. Касцюкоўка	3.05.1931
«Чырвоны маяк»	Яромінскі с/с	9.05.1932
«Васілеўскі»		1.05.1930
Ім. тов. Ланге		
Саўгас РТСТ	п. Высокі	20.03.1931
Сельгасгаспадарка ЗРК		
Ланцуцкага	Касцюкоўка	1.02.1932
Прыгарадная гаспадарка		
Гомельскага ЗРК	Мільчанскі с/с	1.01.1932
Агарод пры цагельні	п. Н-Брылёў	1932
«Пяскі»	Гомельскі с/с	1919
«Брылёў»	Ціценскі с/с	1918
Калгас ЗРК «Камінтэрн»	-»-	5.10.1931
59 конезавод	-»-	1.01.1931
«Даўгалессе»	Карналінскі с/с	1.02.1930
«Белмалочгародаб'яднанне»	п. Бешчынец	1.01.1930

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 625. Воп. 2. Спр. 9. Л. 207.

З ДАВЕДКІ ПРА КАЛГАСЫ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

1 жніўня 1932 г.

В районе 56 колхозов, всего 7275 колхозников и 2264 отходника, т.е. 23,7%. Представляют интерес данные об отходничестве по отдельным колхозам. Так, отходным промыслом занимаются в колхозе «Чырвоная зорка» — 50,9% трудоспособного населения, в колхозе «3-й съезд Советов» — Зябровский с/с — 49,1%, а «Чырвоны пуцілавец» того же с/с — 40,2%. В Давыдовском с/с в колхозе «Чырвоны Кастрычнік» — 58,4%, в колхозе «Шлях да сацыялізма» Прудковского с/с — 38,2%, а кроме того 8 колхозов отходничество занимает более 30% населения.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1476. Воп. 1. Спр. 20. Л. 30.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАЛГАСА «ГРАБАЎКА» ЗА 1933 г.

Урожайность зерновых культур

	посеяно	**собрано**	**урожайность**
рожь	42,3 га	254 ц	6 ц/га
ячмень	10	57	5,7
овес	58,7	367	6,3
просо	4,7	19	4,0
гречка	10,0	50	5,0
вика	5,0	30	6,0
люпин	10,0	60	6,0
Всего	140	8 3 7	

Огородно-бахчевые культуры

	посеяно	**собрано**	**урожайность**
картофель	30 га	3000 ц	100 ц/га
др. культуры	4 га		
Всего	34 га		

Кормовые культуры

	посеяно	**собрано**
кормовые корнеплоды	2 га	300 ц
вика кормовая	5	350
скошено сена	300	3300
засилосовано	700	
Всего в совхозе	486 га	8487 ц

Хозяйство имело лошадей — 3, быков — 2, коров — 30, нетелей — 9, телок — 24, бычков — 16, телят — 26, бычков годовалых — 9, хряков — 11, свиноматок — 73, разоматок — 53, поросят двухмес. — 745, от 2-х до 4-х мес. — 356, старше 4-х мес. — 341. На откорме 59 свиней. Всего 1638 голов скота.

В совхозе тракторов на 1.1.1934 г. — 2.

Скота в совхозе «Грабовка» по состоянию на 1 марта 1935 г.: свиней — 201, рогатого скота — 62, лошадей — 30 (27 рабочих).

По состоянию на 1.1.1936 г.: свиней — 310, рогатого скота — 128, лошадей — 63 (39 рабочих). Получено 695 поросят от 59 маток.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 254. Воп. 1. Л. 3, 11, 24, 31, 34.

Дзяржгасы і машынна-трактарныя станцыі

Першыя дзяржгасы з'явіліся яшчэ ў лістападзе—студзені 1917 г. Тады яны называліся «народныя маёнткі», а з вясны 1919 г. — дзяржгасамі. У 20-я гады яны займалі асаблівае месца ў эканоміцы раёна. У ліку першых дзяржгасаў была гаспадарка «Грабаўка». Яе калектыў паспяхова адаптаваўся да рынкавых умоў нэпа. Што да цэнтралізаванай, планавай сістэмы эканомікі 30-х гадоў, то яна не садзейнічала хуткаму развіццю дзяржгаса. Пераход жа ад гаспадарчага разліку да поўнага дзяржаўнага забес-

пячэння гаспадаркі нядрэнна адбіўся на якасных паказчыках яго вытворчасці.

У 1924 г. саўгас меў 486 га зямлі, у тым ліку пад збожжавымі — 140 га, агародніна-бахчавымі культурамі яшчэ 307 га. У 1933 г. ураджай збажыны склаў: па жыце — 6,0 ц, па агародніна-бахчавых культурах — 100 ц. На балансе гаспадаркі было 1638 галоў жывёлы, у тым ліку 106 — буйной рагатай жывёлы, 73 свінаматкі і болей за 1000 парасят.

Прыкметнай фігурай у гісторыі гэтай гаспадаркі стаў Уладзіслаў Васільевіч Васіленка, які прыняў гаспадарку ў пачатку 1924 г. Тады яму было 43 гады. Ён меў сярэднюю агранамічную адукацыю і добры практычны вопыт. Працаваў аканомам маёнткаў. З 12 красавіка 1919 г. — у апараце Губсаўгаса, а з 1 ліпеня 1922 г. — у апараце Губсельтрэста, адкуль, уласна, і перайшоў на пасаду кіраўніка саўгаса «Грабаўка».

Старшым рабочым гаспадаркі быў Пётр Міхайлавіч Дураў, рахункаводам — Барыс Міхайлавіч Цімафееў. Ён быў паручнікам старой арміі, скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча і меў практычны вопыт бухгалтарскай працы.

Буйным быў саўгас імя А.М.Горкага. За 1936—1940-ы гады гаспадарка павялічыла вытворчыя плошчы больш чым на 1100 га пры сярэднегадавой колькасці працоўных да 243 чалавек. Мяса-малочны накірунак спецыялізацыі вытворчасці вызначаў яго асноўныя фонды. На фермах штогод утрымлівалася 800 і больш галоў рагатай жывёлы, у тым ліку да 400 кароў.

Гаспадарка мела 11 трактароў, шэсць аўтамашын, камбайн і больш за 110 рабочых коней. З 4515 га зямлі пад прапашнымі культурамі было больш за 700 га, у тым ліку да 400 га займалі збожжавыя і да 300 га — харчовыя культуры.

Спецыялізаваныя фермы па адкорме свіней і рагатай жывёлы ў раёне меў і саўгас «Насовічы». У гаспадарцы было больш за 1500 га зямлі. Штогод 300 га зямлі засявалася збожжавымі і больш за 200 га — харчовымі культурамі. Пагалоўе рагатай жывёлы на фермах саўгаса ў розныя гады вагалася ад 190 да 286 галоў, у тым ліку 120 кароў. На адкорме было ад 300 да 500 галоў свіней.

Саўгас меў трывалы па тым часе ўласны парк механізаваных сродкаў: ад 6 да 10 трактароў, 2—3 бартавыя аўтамашыны. Акрамя таго, гаспадарка трымала каняферму — больш 110 рабочых коней. У калектыве штогод працавала 170—180 чалавек.

Бядой усіх саўгасаў у раёне была нестабільнасць кадраў. Высокая цякучасць працаўнікоў тлумачылася перш за ўсё дрэннымі бытавымі ўмовамі. Значная частка іх жыла на хутарах, мела сваю гаспадарку і глядзела на саўгас як на «дойную карову», — так тады гаварылі.

Нестабільнасць кадраў негатыўна ўздзейнічала на прафесіяналізм і якасныя паказчыкі вытворчасці саўгасаў. Востра не хапала спецыялістаў і кіраўнікоў вытворчасці сярэдняга звяна — брыгадзіраў, загадчыкаў фермаў і адкормачных аддзяленняў.

Слабым звяном у аграрным сектары раёна была арганізацыя працаёмкай сельскагаспадарчай вытворчасці. З арганізацыяй некальніх машынна-трактарных станцый (МТС) карэнных змен не адбылося.

Гомельская МТС, якая па стане на 1 снежня 1931 года мела ўсяго 16 трактароў, павінна была абслугоўваць 20 калгасаў раёна. Па стане на верасень 1932 г. у МТС Гомельскага раёна з 16 трактароў у працоўным стане было ўсяго 9 машын. Прастоі трактарнага парка складалі болей 55% працоўнага часу. Не было добрай рамонтнай базы. МТС не мела дастатковай колькасці спецыялістаў, здольных забяспечыць

нармальны ход вясенне-пасяўных і ўборачных кампаній. І ўсё ж МТС станавілася на ногі. Пашыраўся трактарны парк. На 1 снежня 1941 г. Гомельская МТС мела ўжо 34 колавыя, 3 прапашныя і 12 гусенічных трактароў. К гэтаму часу былі трактары і ў асобных калгасах і саўгасах. У раёне працавала ўжо каля 800 механізатараў.

Тым не менш ступень забеспячэння сродкамі механізацыі калгасаў і саўгасаў заставалася недастатковай, і значны аб'ём працы перакладаўся на традыцыйную цяглавую моц сялянскай гаспадаркі — каня.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СА ЗВЕСТАК АБ АБСЛУГОЎВАННІ ЗОН ГОМЕЛЬСКАЙ МТС ПА СТАНЕ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Назва калгасаў	Усяго двароў	Усяго коней	Усяго пашні, га
Яромінскі вытворчы ўчастак			
«Чырвоны хлебароб»	166	90	439,79
«Інтэрнацыянал»	76	62	216,76
«Шлях да сацыялізму»	83	22	110,0
«Чырвоны працаўнік»	98	69	218,0
«Эмэс»	12	13	49,0
«імя Леніна»	91	80	247,06
Бабовіцкі вытворчы ўчастак			
«Новікі»	52	49	224,81
«Светлая зара»	12	17	104,62
«Лапаціна»	23	17	71,03
«Батрак»	56	75	247,0
«Бальшавік»	130	102	535,92
Прыбыткаўскі вытворчы ўчастак			
«Перамога»	133	89	465,7
«Новае жыццё»	73	-	260,5
«Пралетарый»	261	126	1016,5
«Чырвоны пуцілавец»	46	18	117,0
«Камунар»	58	136	559,5
Зябраўскі вытворчы ўчастак			
«1-е Мая»	64	15	117,5
«VI з'езд Саветаў»	70	40	146,7
«Чырвоная зорка-2»	112	52	269,29
«Чырвоны маяк»	174	143	639,6
Усяго:	1790	1263	6057,15

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 584. Воп. 1. Спр. 105. Л. 1.

СА ЗВЕСТАК АБ АБСЛУГОЎВАННІ ЗОН ГОМЕЛЬСКАЙ МТС ПА СТАНЕ НА ВОСЕНЬ 1933 г.

	Яромінскі ўчастак	Бабовіцкі ўчастак	Прыбыткаўскі ўчастак	Зябраўскі ўчастак
Усяго калгасных двароў	613	186	571	420
-»- едакоў	2673	1007	2769	2067
У тым ліку працаздольных	1177	430	1331	945
Рабочай жывёлы	332	174	367	225

Усяго буйн. рагат. жыв.	575	269	504	143
Усяго кароў	323	170	271	80
У тым ліку				
цёлак	298	170	214	50
авечак	42	28	7	8
свіней	62	27	109	69
пашні /га/	1682,07	782,92	2419,2	1172,9
парнікоў /рам/	4522	248	452	450

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 584. Воп. 1. Спр. 105. Л. 2.

СА ЗВЕСТАК АБ НАЯЎНАСЦІ ТРАКТАРОЎ У ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1941 г.

	Всего колесных	В т. ч. СНТЗ и ЛТЗ	Пропашных	Всего гусен.	В т. ч. Сталинец	СТЗ	ХТЗ
Ветковская МТС	25	25	2	4	2	2	-
Закружская МТС	26	26	4	6	-	6	-
Гомельская МТС	34	34	5	10	3	-	7
Н.-Белицкая МТС	10	10	3	12	-	4	8

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1205. Воп. 1. Спр. 6. Л. 36.

Улада, царква, вернікі

Вернікі складалі большасць насельніцтва воласці. Яны спрадвеку наведвалі цэрквы, святкавалі царкоўныя святы, спраўлялі рэлігійныя абрады.

У 1919 г. цыркулярным лістом Магілёўскага губвыканкома на аснове дэкрэта аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы ўсім павятовым выканкомам прадпісвалася перадаваць дамы розных служачых культаў пад клубы, народныя дамы і іншыя патрэбы. Пры высяленні свяшчэннаслужыцеляў рэлігійным абшчынам рэкамендавалася, каб яны паклапаціліся пошукам для выселеных не казённай жылплошчы. Такім быў пачатак ганенняў улады на царкву і вернікаў. Пра свабоду веравызнання ў рэвалюцыйныя часы гаварыць не даводзілася, бо гэта магло быць аднесена да катэгорый контррэвалюцыйных.

У сярэдзіне мая 1923 г. завяршыўся Усерасійскі памесны сабор праваслаўнай царквы. Зусім сакрэтным і цыркулярным лістом Гомельскага губкома ўсім валасным партыйным ячэйкам прадпісвалася «ўмела асвятляць працу і аддзельныя рэзалюцыі сабора», рабіць гэта «надзвычай асцярожна». Рэкамендавалася «праводзіць гэтую працу праз настаўнікаў і беспартыйных», «паставіць справу так, каб ініцыятыва партыі была непрыкметнай». У тэксце дакладна падкрэслівалася, што «савецкая ўлада не збіраецца супрацоўнічаць з царквой і духавенствам».

Аднак ва ўласнасці культавых арганізацый і царкоўных служак захоўваліся гаспадарчыя і жылыя пабудовы, будынкі і зямельныя надзелы. У адпаведнасці з заканадаўствам сельскія Саветы павінны былі перадаваць прыхаджанам па дагаворах у бясплатнае і бестэрміновае карыстанне цэрквы і малітвеныя дамы. У гэтых дагаворах агаворваліся ўмовы, што царква не стане месцам антысавецкай прапаганды. Царкоўным служачым гарантавалася свабода веравызнання, а яны, у сваю чаргу, гарантавалі захоўванне архітэктурных помнікаў і культавых твораў мастацтва.

У «Эканамічнай характарыстыцы Гомельскага раёна (1929—1930)» намеснік старшыні Гомельскага раённага выканаўчага камітэта ўжо выму-

шаны быў адзначыць, што «рэлігійнасць насельніцтва за апошні час значна пачала павялічвацца, рэлігійныя абрады выконваліся. Гэта з'ява асабліва мела месца ў дні святкавання Вялікадня, калі цэрквы былі перапоўнены вернікамі. Рэлігійныя святы насельніцтва праводзіць у даволі рэлігійнай абстаноўцы і святкуе аж па 2—3 дні, нягледзячы на вясенне-пасяўныя работы. Старыя рэлігійныя традыцыі, якія ў мінулым годзе амаль сышлі са сцэны, у гэтым годзе наглядаліся ў значнай ступені. Пачалі аднаўляцца гасцёвыя хаджэнні адзін да другога з пачастункамі ў дні рэлігійных святаў».

Вядома, што актывізацыя вернікаў і ўздым рэлігійнасці і не маглі быць іншымі пры тых адносінах улад да царквы, яе служак і вернікаў, якімі яны былі ў сапраўднасці. Моцны ўплыў рэлігійных абшчын на людзей не зменшыўся. Акрамя праваслаўнай царквы ў раёне дзейнічалі сектанцкія групы. Баптысцкія секты меліся ў Клімаўскім, Грабаўскім, Прыбыткаўскім сельсаветах. Сустракаліся і адзінкавыя баптысцкія сем'і, раскіданыя па ўсім раёне. Найбольш актыўна дзейнічала праваслаўная царква ў Пакалюбічах, дзе пражываў святар старой царквы. Да яго ў рэлігійныя святы сцякаліся вернікі з навакольных вёсак не толькі Гомельскага, але і іншых раёнаў Гомельскай акругі.

У 30-я гады закрыцця цэркваў альбо малітвеных дамоў не было, хоць актывісты-бязбожнікі нярэдка ўзбуджалі такія хадайніцтвы. Больш таго, усім сакратарам РК КП(б)Б Гомельскай акругі быў разасланы зусім сакрэтны ліст пра тое, каб асаблівая ўвага партыйцаў звярталася на самавольства мясцовых улад па закрыцці культавых устаноў. А гэта справа на тыя часы сапраўды была небяспечнай. І тым не менш у другой палове 30-х гадоў большасць культавых устаноў была прымусова закрыта. Святары П.Г.Васількоў, С.Т.Зміцюроў, М.М.Старадомскі, царкоўны староста Д.П. Зайцаў былі рэпрэсіраваны.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З ДЫРЭКТЫВЫ ГОМЕЛЬСКАГА АК І АКК КП(б)Б

4 студзеня 1930 г.

Совершенно секретно

Всем секретарям РК КП(б)Б Гомельского округа.

За последнее время в ряде районов мы имеем явные искривления партийной политики по вопросу об изъятии молитвенных домов, церквей, выразившиеся в том:

1. В Хойникском районе параллельно с вынесением приговоров на общих собраниях о закрытии церкви по инициативе учителя и комсомольской ячейки — был выставлен вооруженный караул для охраны церкви и недопущения богослужения. Причем караул был выставлен из среды безбожников и членов ЛКСМ.

2. В Речицком районе сразу же после вынесения приговора на собрании об изъятии церкви безбожники приступили к закрытию церкви и снятию колоколов.

3. В Чечерском районе такой же факт, но со снятием с дверей икон церкви.

4. Аналогичные факты имеются по Лоевскому району нашего округа.

Ввиду того, что такие незаконные и нетактичные действия со стороны отдельных коммунистов, комсомольцев и советских общественников вызывают ряд недовольств со стороны крестьянства, подчас бедняцкой и середняцкой части его, и не исключена возможность, что на этой почве будут массовые недовольства, вылившиеся в эксцессы — Бюро Окружкома на своем заседании от 30 января с. г. вынесло постановление о том, чтобы молитвенные дома, церкви, костелы, каплицы отчуждались тогда, когда будет проведена достаточная подготовительная работа на местах, как в смысле изучения и преломления настроений крестьянства по этому вопросу, а так же [и в] отношении подготовки и использования

молитвенных помещений для культурных нужд районного центра, деревни и т. д. Кроме того, к изъятию можно приступить только тогда, когда в каждом отдельном случае при предоставлении всех материалов из районов в округе будет постановление фракции Окрисполкома, которое будет высылаться в местные РИК и для исполнения.

А посему ОК и ОКК КП(б)Б категорически предлагает всем секретарям райкомов, под их личную ответственность, провести расследование по всем моментам искривления и незаконных действий со стороны членов партии и советских работников, по предмету привлечения первых — по партийной линии, а вторых, через фракцию РК — по Советской линии к ответственности за нарушение элементарных правил по вопросу об отделении церкви от государства.

Впредь категорически руководствоваться тем, что ни одна церковь и молитвенное здание не может быть изъято до тех пор, пока не будет на это постановления соответствующих органов. Одновременно необходимо усилить антирелигиозную пропаганду подготовительной работы в отношении изъятия церквей в Вашем районе путем вынесения соответствующих решений на общих собраниях и производства подписных листов среди крестьянства.

В каждом отдельном случае при невыполнении и нарушении нашей директивы кем бы то ни было немедленно ставить нас в известность.

4 января 1930 года

Гомель

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 73. Л. 2.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ГОМЕЛЬСКАГА ГАРВЫКАНКОМА

31 сакавіка 1935 г.

СЛУХАЛІ: Хадайніцтва Прудкоўскага с/с аб зачыненні царквы ў в. Валатава і перабудовы яе пад клуб.

ПАСТАНАВІЛІ: Улічваючы хадайніцтва прэзідыума Прудкоўскага с/с, агульнага схода калгаснікаў калгаса «Чырв. працаўнік» і граждан в. Валатава аб зачыненні царквы ў в. Валатава — падтрымаць хадайніцтва Прудкоўскага с/с і грамадзян в. Валатава перад ЦКК БССР аб зачыненні царквы і перадачы яе калгасу для перабудовы пад клуб.

ВЕРНА: Сакратар (Равіковіч)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 296. Воп. 1. Спр. 361. Л. 10.

СА ЗВАРОТУ СВЯТАРА Ў ПЕРШАПРАСТОЛЬНУЮ

Москва, Маховая ул., д. 7-й

Президиуму [Верховного Совета СССР]

2 августа 1935 г.

От церковного приходского Совета Свято-Никольской церкви Гомельского района с. Романовичи того же с/с

Заявление

Настоящим доводим до вашего сведения распоряжение, а также и обращаемся к вам с Великой просьбой и усердно просим Вас обратить внимание не отказать нашей просьбе согласно нашего Заявления [и] рассмотреть [его] по закону СССР. Ввиду того, что как известно, по нашему приходу Свято-Никольской церкви Гомельского района в селе Романовичи, того же сельсовета верующих прихожан насчитывается около 1000 человек. В 1934 году в ноябре месяце у нас умер священник и до настоящего времени у нас в церкви Свято-Никольской в селе Романовичи Гомельского района того же сельсовета служение не совершается с того же времени. После смерти нашего священника задолженностей никаких за нашей церковью Свято-Никольской не причитается. Перед государством все выплачено, сколько полагалось, полностью и мы, как верующие, поэтому и ходатайствуем перед высшими органами власти СССР, чтобы у нас был священник в Свято-Никольской церкви в селе Романовичи Гомельского района Романовичского сельсовета. А также чтобы совершалось служение в нашем вышеупомянутом приходе. Поэтому и заявляем вам о том, что, как известно, со стороны к нам несколько раз присылали священника и райисполком давал распоряжение для служения, а Романовичский сельский Совет Гомельского района с каким-то критическим отношением обращается и не допускает в церковь для служения. В чем и ходатайствуем перед республикой СССР об открытии нашей Свято-Никольской

церкви для совершения служения и просим вас дать постановление Романовичскому сельсовету в случае прибытия к нам священника в наш приход в Свято-Никольскую церковь, то чтобы вышеупомянутый сельсовет не имел никаких сопротивлений против церкви и не порушил общественных порядков и просит вас дать нам постановление [о том] дана ли власть сельскому совету такая, как он поступает, согласно закона СССР или нет.

К сему и заявляем церковно-приходской совет вышеупомянутого прихода Свято-Никольской церкви села Романовичи Гомельского района Романовичского сельсовета.

26.VII.1935 г. Председатель церковного Совета /Семенцов/

Церковный староста

Благочинный священник

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 296. Воп. 1. Спр. 361. Л. 24, 24 адв.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА КУЛЬТАХ ПРЫ ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК БССР

1 верасня 1935 г.

г. Мінск

ПАСТАНАВІЛІ: Хадатайства Прэзідыума Гомельскага РВК Раманавіцкага сельсавета і працоўных вёскі Раманавічы аб зачыненні Раманавіцкай царквы і перадачы яе будынка пад клуб — задаволіць.

Адказны сакратар ЦК па культах пры Прэзідыуме ЦВК БССР

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 296. Воп. 1. Спр. 361. Л. 29.

Народная асвета

Усерасійскі перапіс насельніцтва за 1920 г. паказаў, што ў Гомельскім павеце на 100 душ жыхароў непісьменнымі былі 66 чалавек. У Гомельскай воласці адна школа прыходзілася на 25,3 кв. вярсты, а на адну школу ў сельскай мясцовасці прыпадала 1348 чалавек.

Дзякуючы энергічнай дзейнасці мясцовых Саветаў практычна ўжо ў 1921 г. у воласці ўдалося аднавіць сетку школ амаль у яе даваеннай колькасці, хоць колькасць педагагічных кадраў і скарацілася на 11 працэнтаў ад даваеннага ўзроўню. Большасць школьных настаўнікаў былі выпускнікамі павятовых кароткатэрміновых курсаў. Толькі 3% настаўнікаў мелі адукацыю ў аб'ёме настаўніцкага інстытута, а 8,1% у аб'ёме жаночых гімназій і епархіяльных вучылішчаў.

Адмоўна адбілася на колькасці настаўнікаў так званая чыстка школьнага персаналу ад «рэакцыйных элементаў». Зніклі, з'ехалі, або былі рэпрэсіраваны вопытныя, прафесіянальна падрыхтаваныя кадры настаўнікаў. Колькасць жа навучэнцаў у воласці не паменшылася.

З-за няхваткі сродкаў частка школ была перададзена на ўтрыманне насельніцтва. Тым не менш па стане на 1 верасня 1921 г. у воласці працавала ўжо 90% ранейшых школ. Толькі ў трох вёсках (Лешчынец, Рандаўка, Баркі) з-за адсутнасці памяшканняў школ не было, хоць у кожнай з гэтых вёсак было больш за 45 дзяцей школьнага ўзросту.

Не хапала школьнага абсталявання, мэблі, пісьмовых прылад. Амаль не было кніг для чытання, і ў большасці школ на ўроках вучні карысталіся тэкстамі газет.

У 1921 г. навукова-метадычны савет губана склаў і распаўсюдзіў праграмы для школ 1-й і 2-й ступеней. Былі распрацаваны і даведзены да школ падрабязныя вучэбныя планы. У Гомельскім аддзяленні Дзяржвыда раздрукавалі 60 тыс. экзэмпляраў хрэстаматыі Л.М.Талстога, выдалі каля 30 тыс. буквароў Сатарава. Але ўсяго гэтага было недастаткова. У школах воласці практычна адзін

падручнік прыходзіўся на 10 і больш навучэнцаў.

З-за адсутнасці аконнага шкла шмат у якіх школах заняткі вяліся пры зачыненых аканіцах і пры газавых лямпах.

Народную адукацыю ўлады аб'явілі ўдарным фронтам культурна-асветніцкай дзейнасці. Ва ўсіх школах 2-й ступені ў тэрміновым парадку было ўведзена выкладанне грамадазнаўства, а ўрокі гісторыі даручалі толькі марксістам. Усе прыватныя школы, у тым ліку польскія і яўрэйскія нацыянальныя, былі закрыты. Пад забаронай апынуліся ўсялякія віды дзейнасці хедараў, ішыбата і іншыя.

Пастановай губвыканкома ад 2 чэрвеня 1922 г. за выкарыстанне вучэбных праграм хедараў настаўнік прыцягваўся да адказнасці па арт. 121 крымінальнага кодэкса. У Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці захаваліся матэрыялы судовых спраў такога характару.

У пачатку 20-х гадоў сфарміравалася новая па структуры і прынцыпах сістэма школьнага навучання. У школах дзейнічала самакіраванне з адзінай арганізацыяй навучання. Праблемы навучальнага працэсу вырашаліся на агульнашкольных і дэлегацкіх сходах. Працавалі школьныя камітэты, праходзілі пасяджэнні прэзідыума і пленумы школкомаў.

У цэлым навучальны працэс у школах 1-й ступені нагадваў чаргаванне аўральных кампаній: «Дзень лесу», «Пяцігоддзе савецкай школы», «Пяцігоддзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», «Дапамога дзецям Германіі», «Калядныя і велікодныя антырэлігійныя кампаніі» і інш. А ў школах 2-й ступені асаблівую ролю ў выхаванні адыгрывалі фракцыі ЛКСМ, МОПРа і іншых грамадскіх ячэек. На добраахвотнай аснове і добраахвотных узносах працавалі школьныя часопісна-газетныя чытальні, тэатральныя гурткі.

Сельсаветы ўсяляк імкнуліся аказаць школам матэрыяльную падтрымку, прыцягнуць на дапамогу школам грамадскасць. Арганізоўвалі «Тыдні асветы», «Тыдні дзіцяці» і іншыя мерапрыемствы. У такія «тыдні» з удзелам школьнікаў і настаўнікаў, грамадскасці нарыхтоўвалі дровы, збіралі сродкі дзеля аказання дапамогі дзецям, якія жылі ў нястачы. Пад школы аддаваліся найбольш упарадкаваныя памяшканні ў былых маёнтках, дамы святароў, памяшканні рэлігійных абшчын.

У 1923 г. у воласці ўжо працавала 23 школы 1-й і 2-й ступеней. Навучаннем было ахоплена 65% дзяцей школьнага ўзросту.

Па даных статыстыкі ў 1924 г. з 31 765 чалавек насельніцтва ў воласці пісьменнымі былі толькі 6659 чалавек, 10 320 мелі пачатковую дамашнюю адукацыю, 99 — сярэднюю і толькі 8 чалавек — вышэйшую адукацыю.

З года ў год павялічвалася фінансаванне народнай адукацыі за кошт бюджэту воласці. У 1924 г. на гэтыя мэты затрацілі 26,18%, у 1927 г. — 52,4%, а ў 1928 г. — 52,6% бюджэтных сродкаў валвыканкома. Гэта па тым часе былі значныя сумы. У 1924 г. яны склалі каля 10 тыс. руб., у 1926 г. — больш за 43 тыс. руб., а ў 1928 г. — больш за 200 тыс. рублёў.

11 студзеня 1923 г. губернскі з'езд Саветаў адзначыў значныя дасягненні ў справе пастаноўкі народнай адукацыі і з асаблівым задавальненнем падкрэсліў паварот шырокай масы насельніцтва ў бок Савецкай улады і яе палітыкі ў галіне асветы. Ішло «...рашучае ажыццяўленне політэхнізацыі вучэбнага працэсу, увядзенне вытворчага ўхілу ў гарадскіх і сельскагаспадарчага ўхілу ў сельскіх школах».

Да праблемы політэхнізацыі ў школах падышлі з цікавасцю, але без папярэдняй падрыхтоўкі. Настаўнікам былі дадзены некаторыя парады і

рэкамендацыі. Школы замацавалі за саўгасамі і калгасамі (арцелямі). Аднак працоўныя працэсы ў школах 1-й ступені, за малым выключэннем, у воласці не прывіліся. Толькі ў некаторых школах і дзіцячых дамах вясной засеялі агароды на невялікіх дзялянках.

30 жніўня 1923 г. валвыканком абмеркаваў пытанне аб беларусізацыі ў раёне. Стварылі вопытныя школы для распаўсюджвання беларускай мовы. У рашэнні падкрэслівалася, што пытанне аб беларусізацыі «...нельга звязваць выключна са статыстычнымі звесткамі перапісу насельніцтва 1897 і 1920 гадоў, а, галоўным чынам, неабходна звязваць яго з патрабаваннямі і воляй насельніцтва, што можа выявіцца толькі пры паступовай і сістэматычнай культурнай і школьнай работамі на беларускай мове». Такое рашэнне бадай што адпавядала рэальнай сітуацыі.

Каб вызначыць фактычны нацыянальны склад насельніцтва і яго адносіны да беларусізацыі, у кастрычніку 1926 г. у Гомельскай губерні працавала камісія ЦК ВКП(б). Вынікі работы камісіі даюцца ў раздзеле «Дакументы сведчаць».

Па стане на 1 кастрычніка 1929 г. у 31 сельсавеце, 70 вёсках, 184 пасёлках і 39 іншых сялібах, у якіх пражывала 82 839 чалавек, працавала 76 школ. У іх ліку: беларускіх — 72, рускіх — 2, польскіх — 1, яўрэйскіх — 1 школа. У цэлым сетка асветы ў воласці к канцу 20-х гадоў павялічылася ў 3,5 раза.

К пачатку 30-х гадоў у раёне па-ранейшаму не хапала школ і выкладчыкаў, падручнікаў, мэблі і вучэбных дапаможнікаў. Асабліва востра ўсе гэтыя праблемы стаялі ў нацыянальных школах.

22 жніўня 1930 г. на імя наркома асветы БССР было накіравана хадайніцтва ад жыхароў мястэчка Паддабранкі, у якім гаварылася: «... У Паддабранцы працуе 4-х гадовая яўрэйская школа. Пасля яе заканчэння дзеці вымушаны дзеля прадаўжэння адукацыі выязджаць ва ўкраінскія школы. Патрэбна яўрэйская 7-ка [сямігодка]. Ёсць і кантынгент навучэнцаў». У лісце падкрэслівалася, што класавы склад дзяцей адпавядае палітычнаму напрамку дзяржаўнага падыходу, г.зн., што ў асноўным гэта дзеці з мясцовых яўрэйскіх калгасаў, прадстаўнікоў шавецкай і швейнай майстэрняў. Пытанне аб адкрыцці такой школы ў Паддабранцы вырашана не было.

Першы выпуск вучняў 7-га класа Грабаўскай няпоўнай сярэдняй школы.

Аналізуючы работу раённага аддзела народнай адукацыі за 1929/30 год, райвыканком у прынятай рэзалюцыі адзначыў, што ў шмат якіх школах не завершаны рамонт. Школы не забяспечаны кнігамі і пісьмовымі прыладамі. Не працуюць камітэты садзейнічання школам. Будаўніцтва новых школ амаль што спынена. Сельпо не выконвае пастанову аб забеспячэнні настаўнікаў прадуктамі харчавання. Таму мелі месца выпадкі, калі з-за адсутнасці прадуктаў харчавання настаўнікі пакідалі школы.

Заставаліся нізкімі наведванні заняткаў. Не ўсе дзеці наведвалі школу. У 1929/30 г. у воласці нармальна не наведвалі школьныя заняткі каля 25% навучэнцаў. Прычыны розныя, у тым ліку і адсутнасць школ па месцы жыхарства дзяцей.

На 1 верасня 1938 г. школьная сетка раёна аб'ядноўвала 39 пачатковых, 15 няпоўных сярэдніх, 8 сярэдніх школ і 1 тэхнікум. Тут працавалі 93 настаўнікі пачатковых класаў, 156 настаўнікаў 5—7 класаў, 129 настаўнікаў сярэдніх школ і 15 выкладчыкаў тэхнікума.

Абучалася 2943 навучэнцы пачатковых класаў, 4456 вучняў няпоўнай сярэдняй і 3595 сярэдняй школы, 217 студэнтаў тэхнікума. Па стане на 1 жніўня 1940 г. у школах раёна навучалася 13 200 вучняў. Закончаную сярэднюю адукацыю ў раёне мелі 3519 чалавек, вышэйшую — 141 чалавек, 7889 жыхароў, або 12,8% насельніцтва заставаліся непісьменнымі.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл., а таксама перыядычны друк і асобныя спецвыданні.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СА ЗВАРОТУ СЯЛЯН АБ ДАПАМОЗЕ ШКОЛЕ

Кастрычнік 1921 г.

Товарищи крестьяне!

Рабоче-крестьянское правительство с самого начала своего существования ставило одной из своих ближайших задач широкую борьбу с безграмотностью.

Заботясь о просвещении народа, Наркомпрос издал положение о том, что наша школа есть единая, равная для всех трудящихся классов. Образование стало достоянием всех трудящихся, и широко открыты двери даже высших учебных заведений для всех рабочих и крестьян.

Забота о детях стала одним из наших священнейших лозунгов, и борьба с детской беспризорностью приняла у нас самые широкие размеры.

И если мы в этой области, несмотря на все наши старания, не достигли еще желаемых результатов, если наше школьное хозяйство все-таки разрушено, а учитель голодает, то это не наша вина, а скорее наше несчастье...

И если в период борьбы с контрреволюцией наш лозунг был: «Все для войны и все для победы!», то теперь мы сказали: «Все для борьбы с невежеством, все для просвещения!».

Так сказали и так стали действовать.

Но наступил новый враг и опять разрушил на время наши лучшие планы. Голод охватил своими костлявыми руками 11 лучших и плодороднейших губерний Поволжья. Все наши хозяйственные ресурсы опять направлены на боевой фронт, фронт борьбы с голодом.

Народное просвещение при таких обстоятельствах не может быть в должной мере обеспечено сейчас. Наше школьное хозяйство остается пока разрушенным, а учительство – голодным.

Но то, что не в силах сделать в настоящее время государство одно, то можно сделать при помощи населения, при активном содействии рабочих и крестьян.

К вам, крестьянам Гомельской губ., обращается губисполком с настоящим воззванием: помогите нам строить новую школу, примите участие в образовании и просвещении ваших собственных детей!

Будучи окружены лесом, не давайте школе сидеть зимою без дров; владея все топорами, не давайте школе остаться без ремонта; собирая хороший урожай, не давайте учителю сидеть голодным. Организуйте самообложение (такое право вам дано Гомельским губисполкомом) и обеспечьте учителя. Скажите ему ваше твердое крестьянское слово, что он в этом году голодать не будет, и он, бескорыстный труженик на ниве народного просвещения, удесятерит свою энергию и примется за свое великое дело обучения и просвещения.

Дружно, товарищи крестьяне, за работу, и первое спасибо вам скажут ваши же собственные дети.

Гомельский губернский исполнительный комитет
Совет рабочих и крестьянских депутатов
Гомельский губернский отдел народного образования
Гомельский губернский союз работников просвещения

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 112. Л. 3.

З ПАСТАНОВЫ ГОМЕЛЬСКАГА ГУБВЫКАНКОМА АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЕПІСЬМЕННАСЦІ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА

23 снежня 1921 г.

п. 1

З-ю кампанию по ликвидации неграмотности по Гомельской губ. открыть с 1-го января 1922 г. и закончить к 1 мая 1922 г.

Примечание: в сельских местностях таковую закончить к 1 апреля.

п. 2

В течение этого срока должна быть закончена полностью ликвидация неграмотности среди организованного населения (членов профсоюзов, государственных и частных предприятий).

п. 4

Дополнительно охватить обучением неграмотных сельских волостей Гомельской губ., родившихся в 1889 г.

п. 6

Всех неграмотных, посещающих школы грамоты, освобождать от трудналога из расчета 3 часа за час трудналога, но не свыше 8 часов в месяц.

п. 7

Все подлежащие призыву и уклонившиеся от обучения подвергаются денежному штрафу от 100 тыс. руб. до 500 тыс. руб.

Председатель губисполкома Шнейдер
Председатель губграмчека Кантар

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 128. Л. 247.

СА ЗВЕСТАК АБ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ ЗА 1930/31 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Ліквідаванне непісьменнасці не знайшло належнага месца ў працы партыйных ячэек. Лепшая форма мабілізацыі на барацьбу з прарывамі на культурным фронце мае застацца недаведзенай да шырокіх колаў працоўнага насельніцтва...

Усіх дзяцей у р-не ва ўзросце 8—11 год	8315
Абавязковаму навучанню падлягаюць (8—10 год)	6011
Усяго дзяцей па р-не ва ўзросце 8—12 г.	9155
Навучаецца ў школах	9680
Падлягаюць абавязковаму навучанню	99%
У ШКМ і ФЗО навучаецца	1062

Сацыяльны склад дзяцей у школах:

рабочых — 747, калгаснікаў — 656, батракоў — 93, неплацельшчыкаў падатку — 272

Усяго па раёне школ	76
расійскіх	2

польскіх	1
яўрэйскіх	1
беларускіх	72

Уведзены гарачыя снеданні ў 8-мі школах.

Матэрыяльнай дапамогі дзецям беднаты не было.

Склад настаўнікаў

КП(б)Б	5%	рабочых	20,5%
ЛКСМБ	8%	сялян	13,5%
б/п	87%	сераднякоў	26,5%
		служачых	29,5%
		дзяцей паноў	7,6%
беларусаў	76%	ВНУ	3,7%
яўрэяў	17%	педтэхн.	16%
расійцаў	2%	9-годкі (з ухілам)	20%
		9-годкі (педкурсы)	23,2%

63% настаўнікаў, працуючых у р-не, скончылі савецкія навучустановы.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1а. Спр. 42. Л. 6–8.

СА ЗВЕСТАК АБ СТАНЕ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ Ў ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1937 г.

Всего школ — 63. Учителей: начальных классов — 222, в 5—7 классах — 119 чел., в 8—10 классах — 3 чел., пения — 2.

Учащихся: всего 10 551, в т. ч. в 8—10 кл. — 163 чел., в 5—7 классах — 2565 чел.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 31. Т. 1. Л. 61.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ РАЗВІЦЦІ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ Ў ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1938 г.

Всего в Гомельском районе 39 начальных школ, неполных и средних — 15, средних — 8, техникумов — 1.

Преподавателей: начальных школ — 93, неполных средних школ — 155, средних школ — 129, техникумов — 15.

Учащихся: начальных школ — 2943, неполных средних школ — 4456, средних школ — 3595 и техникумов — 217.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 31. Т. 1. Л. 54.

СА ЗВЕСТАК АБ АДУКАЦЫЙНЫМ УЗРОЎНІ ЖЫХАРОЎ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА 1 ЖНІЎНЯ 1940 г.

Возраст	среднее		высшее		Всего населения	
	муж.	жен.	муж.	жен.	муж.	жен.
от 7 до 19	719	689	10	8	30 521	31 307
от 20 до 24	667	382	-	-		
от 25 до 29	358	122	33	16		
от 30 до 39	278	104	45	6		
от 40 до 49	98	33	19	-		
50 лет и старше	51	17	4	-		
Итого:	2171	1348	111	30	30 521	31 307

В районе неграмотных от 7 и старше лет: мужчин — 1336, женщин — 6553. Учащихся: мужчин — 6966 чел., женщин — 6235 чел.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 73. Л. 9, 9 адв., 10, 10 адв.

СА ЗВЕСТАК АБ ДЗІЦЯЧЫХ САДКАХ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА 1 ЛІСТАПАДА 1937 г.

	Всего дет. садов	В них детей	В них воспитат.
На 1.VIII.1936 г.	6	243	13
На 1.XI.1937 г.	5	132	14
В т. ч. сады ОНО	3	87	7
колхозов	1	15	2

других организаций	1	30	5
В 1937 г. д/с были:			
с/з «Брылёв»	1	30	3
с/з «Лещинец»	1	32	3
с/з М.Горького	1	25	1
конезавод N 59	1	30	5
к-з «Интернационал»	1	15	2

Были расфомированы в 1937 г. д/с в с/з «Василевский» и пос. торфзавода «Большевик».

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 6. Л. 7, 7 адв.

Ахова здароўя

Зімой 1921—1922 гг. з-за наплыву бежанцаў з Паволжа ў Гомельскай воласці распаўсюдзілася тыфозная эпідэмія. Улады прынялі пэўныя санітарныя меры, выдзелілі дадатковыя сродкі на пашырэнне ў воласці сеткі бальніц і медыцынскіх пунктаў. Аднак ледзь удалося лакалізаваць захворванне тыфам, як прыйшла новая бяда — пачалася халерная эпідэмія. З вялікай цяжкасцю распаўсюджванне страшнай хваробы было прыпынена. Але становішча спраў у ахове здароўя заставалася небяспечным. Хваробы бязлітасна касілі людзей. Асабліва гэта тычылася дзяцей і старых, аслабленых голадам і галечай.

Каб умацаваць установы аховы здароўя, выканком правёў кампанію па здачы некаторых лячэбных пунктаў на ўтрыманне насельніцтва на дагаворных пачатках. Мясцовыя органы ўлады і ў гэтых экстрэмальных умовах праводзілі ўсё тую ж класавую лінію нават у ахове здароўя людзей — у першую чаргу дапамогу атрымоўвалі працоўныя і сялянскія раёны. Прымяняўся прынцып бясплатнага медыцынскага забеспячэння лекамі членаў прафсаюзаў. Згодна з рашэннем выканкома частку аптэк у воласці перадалі ў арэнду. Астатнія перайшлі на гаспадарчы разлік. Гэта ў значнай меры палепшыла забеспячэнне медыкаментамі. Дзеля закупкі лекаў быў устаноўлены дадатковы падатак па самаабкладанні ў межах 10—12 фунтаў зерня з кожнага сялянскага двара. Урэшце ў воласці было сабрана болей за 1500 пудоў зерня. Былі спробы стварыць дзіцячыя садкі, дамы дзіцяці, жаночыя кансультацыі.

8 сакавіка 1923 г. у воласці прайшоў «Тыдзень аховы мацярынства і дзяцінства». Медпункты ўмацавалі ўрачамі-спецыялістамі. Замест фельчарска-акушэрскіх пунктаў у воласці пачалі працаваць урачэбна-акушэрскія пункты, кожны ў складзе аднаго ўрача, аднаго фельчара-акушэра і аднаго тэхнічнага працаўніка.

З 19 па 21 снежня 1923 г. была праведзена супрацьтуберкулёзная «трохднёўка». Сабраныя ў ходзе гэтай «трохднёўкі» сродкі пайшлі на паляпшэнне лячэння лёгачных захворванняў дзяцей і дарослых. Каля горада Гомеля ва ўрочышчы Чонкі адкрылі санаторый на 130 месцаў і Дом адпачынку на 20 месцаў, а ў Нова-Беліцы — Дом адпачынку на 130 месцаў.

У гады нэпа прыкметна ўзрос жыццёвы ўзровень насельніцтва воласці. Гадавая норма ўжывання хлеба на душу насельніцтва паднялася з 11,95 пуда ў 1921 г. да 17,6 пуда ў 1926 г. Значны выйгрыш атрымала насельніцтва ад змяншэння цэн на прамысловыя тавары і тавары першай неабходнасці. Толькі за год, з 1 кастрычніка 1924 г. да 1 кастрычніка 1925 г. цэны на цукар зменшыліся на 21,4%, на селядца — на 23,4%, тытунь — на 31,8%, на запалкі — на 15,7%, на цвікі — на 22,6%. Сельскагаспадарчы інвентар і машыны сталі прадавацца

па даваенных цэнах. У той жа час цэны на прадукты сельскагаспадарчай вытворчасці значна падраслі. Вялікай дапамогай для беднаты былі падатковыя льготы, танны крэдыт, вызваленне ад плацяжоў за землеўпарадкавальныя работы.

Новая эканамічная палітыка развязала творчую ініцыятыву людзей, а рыначная эканоміка яе толькі падтрымлівала. Рынак прымушаў дробных таваравытворцаў вышукваць магчымасці і спосабы ўмацавання гаспадаркі, павышаць эфектыўнасць гаспадарання.

З паляпшэннем жыццёвага ўзроўню самых бедных слаёў насельніцтва адступалі і хваробы, хоць да сапраўднай аховы здароўя людзей з боку ўлад было яшчэ вельмі далёка.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ

4 мая профсоюзом водников было устроено торжественное открытие домов отдыха в Кленках. Пароход с представителями различных организаций и учреждений, украшенный зеленью, портретами и плакатами, выехал в Кленки. В Кленках устроено 3 дома отдыха для детей, мужчин и женщин. Имеется летний театр и кухня. Дома окружены большим садом.

Тов. Сидоров от имени работников водного транспорта рассказал присутствующим о цели организации домов отдыха. После этого выступил с приветствиями целый ряд товарищей. Для всех присутствующих был устроен ужин, после чего состоялся концерт. В 12 часов ночи пароход отправился обратно.

Полесская правда. 1921. 7 мая.

З РЭЗАЛЮЦЫІ III ГУБЕРНСКАЙ НАРАДЫ ПРАЦАЎНІЎКОЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

5 верасня 1922 г.

Заслушав доклад завлечсектором губздрава доктора Петельчица об организации сельской медицины в Гомельской губ., губернское совещание констатирует факт сильного упадка сельской медицины в губернии и развитие в связи с этим знахарства, шарлатанства, эксплуатирующих темные массы. Для поднятия сельской медицины на должную высоту совещание считает нужным отметить:

1. Попытки введения платного обслуживания некоторыми уздравами не только не достигают цели, но вредно отражаются на проведении основ советской медицины в жизнь. Поэтому совещание считает недопустимым введение платности за какие бы то ни было виды помощи в сельских учреждениях.

2. Закрытие какой бы то ни было участковой больницы недопустимо, но в связи с тяжелыми экономическими условиями следует сократить число коек и штаты, сообразуясь с фактической потребностью.

3. Признавая недопустимым в дальнейшем оставление населения на попечение фельдшеров, в большинстве ротных, и принимая во внимание экономические условия, совещание предлагает уздравам на первое время, впредь до разработки правильной лечебной сети, образовать в каждой волости врачебный пункт вместо фельдшерского в составе одного врача, фельдшерицы-акушерки и техработника.

4. Для госпитализации больных прикрепить волости к районным больницам. В этих больницах должны быть выделены койки для острозаразных больных, рожениц и нуждающихся в хирургической помощи. Больницы должны быть организованы не менее чем на 10 коек, со штатом — 1 врач, 2 фельдшера, 1 акушерка, 1 сестра милосердия, 1 зубврач, 2 сиделки, 1 кухарка, 1 прачка, 1 сторож. Зубврачей иметь в первую очередь в больницах, находящихся в рабочих районах.

5. Уездная больница как центральная для уезда должна быть не менее чем на 40 коек, с особыми отделениями по специальностям (хирургическим, акушерским, гинекологическим, заразным и общим). Штат уездных больниц должен быть следующий: 2 врача, 1 лекпом, 1 фармацевт, 1 акушерка, 2 сестры милосердия, 1 завхоз, 8 сиделок, 2 прачки, 1 кухарка, 1 судомойка, 2 санитара, 2 рабочих, 1 сторож. При наличии амбулатории при больнице штат пополняется 1 зубврачом, 1 лекпомом, 1 санитаркой.

6. Придавая большое значение распространению санитарно-гигиенических знаний, совещание считает, что санитарно-просветительская работа и обслуживание школ является неотложной обязанностью участкового врача.

7. Для поднятия работоспособности медперсонала уздраву вменяется в обязанность при изыскании местных средств иметь в виду улучшение материального положения медработников.

8. Считаясь с недостатком отпускаемых по сметам средств для содержания медикосанитарных учреждений, необходимо изыскивать средства на местах, для чего образовать больнично-хозяйственные комиссии при всех учреждениях уезда и оживить их работу.

9. Для создания нормальной сети сельских лечучреждений по губернии совещание поручает губздраву детально разработать план проведения этой работы.

10. Для усиления связи между губздравом, уздравами и участками и для выработки практических мероприятий в деле улучшения сельской медицины совещание находит необходимым созывать не менее двух раз в год уездные съезды участковых врачей и один раз в год — губернский съезд.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 433. Воп. 1. Спр. 1395. Л. 139.

З ДЫРЭКТЫВЫ ГАРРАЙКОМА КП(б)Б УСІМ ПАРТЫЙНЫМ ЯЧЭЙКАМ

Согласно общей линии укрепления деревни медицинскими силами Губисполкома постановлено откомандировать в деревни Гомельского уезда 5 гомельских врачей. Эти врачи отказываются от поездки в деревню разными демагогическими причинами и, желая иметь подкрепление своим демагогическим причинам, они идут по предприятиям и указывают рабочим, что, мол, самых лучших врачей забирают из Гомеля, и чтобы рабочие протестовали против их откомандирования и ходатайствовали перед Губисполкомом об их оставлении в Гомеле.

Райком предлагает всем ячейкам предоставить такие ходатайства со стороны рабочих, поставив об этом своевременно в известность предфабкомов.

В таких союзах, где такие ходатайства со стороны рабочих уже были, Горрайком считает это недосмотром со стороны соответствующих. ячеек и считает необходимым поддержание рабочими постановления Губисполкома об откомандировании в деревню врачей, разъясняя рабочим важность этого мероприятия.

Секретарь Хавкин

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 11. Л. 14.

Барацьба з беспрытульнасцю

Цяжкай трагедыяй грамадзянскай вайны была дзіцячая беспрытульнасць. Сетка дзіцячых устаноў воласці была не ў стане прыняць усю «армію» беспрытульных дзяцей і дзяцей, што засталіся без бацькоў. Не хапала сродкаў на стварэнне і адкрыццё дзетдамоў.

Абарваныя, галодныя, хворыя дзеці і падлеткі літаральна запруджвалі чыгуначныя станцыі, туліліся ў халодных і вільготных падвалах ці на гарышчах паўразбураных будынкаў. Яны бадзяжылі, займаліся жабрацтвам, спекуляцыяй, крадзяжамі, бо былі на мяжы фізічнага выжывання. Да таго ж Гомельская губерня ў галодны 1921 г. прыняла з Паволжа каля трох тысяч дзяцей, чые бацькі памерлі ад голаду. Большасць з іх засталася жыць на Гомельшчыне. Сярод прыватных асоб, арганізацый і ўстаноў удалося размясціць толькі 1135 дзяцей, астатніх змясцілі ў дзіцячыя дамы. Як сведчаць архіўныя дакументы, для дзяцей

Б.А.Ігнацюк.

дзіцячых дамоў не хапала больш за 15% харчовых пайкоў. Кармілі, вядома ж, усіх, але ўжо па ўрэзаных нормах, і гэта вельмі моцна адбівалася на здароўі дзетак. Дапамога дзіцячым дамам харчаваннем ішла праз валздраўаддзел і валана па нарадах з цэнтра.

У сувязі з прыёмам дзяцей з Паволжа, на якіх губернскі аддзел народнай асветы аддаў усе запасы абмундзіравання, дзеці сваіх дзіцячых дамоў вельмі абнасіліся і цярпелі вострую нястачу ў вопратцы і абутку.

Валасная дзеткамісія сумесна з грамадскімі арганізацыямі праводзіла збор падарункаў для дзяцей, вопраткі, абутку, прадуктаў харчавання. Грашовыя зборы і выручку ад білетных канцэртаў перадавалі ў фонд дапамогі дзецям. Многія дзеці былі ўзяты ў сем'і мясцовых жыхароў.

Важную ролю ў выхаванні былых беспрытульных і сірот у воласці адыгрывала Улукаўская калонія, у якой на сродкі валаснога «Грамадства сяброў дзяцей» утрымлівалася 50—70 дзяцей, а таксама дзіцячыя гарадкі ў Друянаўцы і Прыбытках, дзе знайшлі прытулак больш за 100 беспрытульных дзяцей і сірот. Дзве трэці выхаванцаў дзіцячых дамоў былі круглымі сіротамі.

На абслугоўванне аднаго дзіцяці вылучалася прыкладна 60—65 рублёў у год. Сродкі мізэрныя. Але ж былі ў сірот і пэўныя «перавагі» — яны ўсе наведвалі школы.

Востра стаяла пытанне аб падлетках. Усіх іх змясціць у школы прафтэхнічнай адукацыі не было магчымасці па шматлікіх прычынах. Таму хлопчыкаў і дзяўчынак, што дасягнулі 14-гадовага ўзросту, у сценах дзетдамоў далучалі да прафесій шырокага профілю — навучалі шыццю на швейных машынах, слясарнай і сталярнай справе і інш. К 16 гадам гэтыя дзетдомаўцы маглі самастойна выбіраць будучую прафесію, абапіраючыся ўжо на ўласны вопыт.

Некаторае выйсце са становішча дала створаная на тэрыторыі саўгаса «Улукаў'е» працоўная земляробская калонія. Тут дзеці і падлеткі знаходзілі прытулак, цяпло, клопат, праяўлялі свае здольнасці, адсюль яны ішлі ў самастойнае жыццё.

Нярэдка сірот бралі на выхаванне мясцовыя вайсковыя часці.

У.Я.Райскі.

Нас аб'яднала жыццё

З успамінаў Барыса Адамавіча Ігнацюка

Выхаванцам 31-га кавалерыйскага палка 6-й Чынгарскай дывізіі, які дыслацыраваўся ў Гомелі, я стаў з 1931 г., калі мне яшчэ не было і шасці гадоў. Памятаю, начальнік штаба палка ўласна прасачыў за тым, каб мне пашылі форменную вопратку чырвонаармейца-кавалерыста. У гэтай форме я і пайшоў у школу — падцягнутым і па-армейску дысцыплінаваным хлопчыкам. Вядома ж, і форма, і вайсковае выхаванне вызначалі мяне ў класе.

Бацька мой, Адам Рыгоравіч Ігнацюк, паляк па нацыянальнасці, закончыў Варшаўскую акадэмію і працаваў у Маскве паштовым служачым. У 1928 г. яго арыштавалі па падазрэнні ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Арышт па абгаворы быў ужо тады ў модзе. Маці мая, Ірына Сямёнаўна, беларуска, родам з Гомеля, застала-

ся пасля арышту бацькі ў Маскве без працы і сродкаў да існавання з двума дзецьмі на руках.

Наша сям'я добра была знаёма з рускім пісьменнікам Уладзімірам Галакціёнавічам Караленкам. І, каб вызваліць бацьку з турмы, маці звярнулася да яго з просьбай дапамагчы нам. І У.Г.Караленка дабіўся вызвалення бацькі. Аднак жыць у Маскве сям'і не дазволілі, і мы прымушаны былі паехаць у Гомель, на радзіму маці. Тут бацька працаваў рознарабочым на будаўніцтве. Яшчэ ў турме ён захварэў туберкулёзам і ў хуткасці памёр.

Жыць стала невыносна цяжка. Голад і неўладкаванасць выкінулі нас на вуліцу. Мы з сястронкай (яна малодшая за мяне на два гады), каб не памерці з голаду, бегалі ў дзіцячы прыёмнік — там кармілі і займалі гульнямі дзяцей-сірот на працягу дня, спаць адпраўлялі дамоў.

Ва Улукаўскі дзіцячы дом я трапіў у 1934 г. Тады ён знаходзіўся ў прыгожым месцы ў будынках былога панскага маёнтка, пабудаваных у стылі «барока» з відам на раку.

Чыстыя, светлыя, прасторныя памяшканні былі добра абсталяваны мэбляй. Было ўсё неабходнае для быту і жыцця. Да гэтага часу дзетдом прайшоў праз розныя формы арганізацыі і меў добра падрыхтаваны калектыў выхавацеляў і настаўнікаў.

На ўсё жыццё ў маёй памяці засталіся дарагія мне імёны выхавацеляў Лелі Лявонцьеўны Кулак, Сцяпана Яфрэмавіча Кулагіна, піянерважатага Алега Халецкага і дырэктараў дзіцячага дома Б.С.Шусцерава і Тарлецкага.

Вучоба, праца і бытавыя заняткі спалучаліся з адпачынкам, гульнямі і забаўляльнымі праграмамі. Працавалі шматлікія гурткі, спартыўныя секцыі. Летам дзетдом ператвараўся ў лагер працы і адпачынку. Разам з выхавацелямі мы апрацоўвалі агарод і зернявы ўчастак, працавалі на жывёльным двары, дзе былі каровы, трусы, свінні, коні. Кожнаму знаходзіўся занятак па душы. Разам працавалі і адпачывалі, займаліся спортам, наведвалі кіно.

Нас аб'яднала само жыццё, агульны працоўны інтарэс, спартыўныя заняткі. Ва ўсіх былі адны і тыя ж радасці і шматлікія агульныя турботы. Памятаю, колькі здзіўлення і радасці прынесла нам электрыфікацыя будынкаў і двара дзетдома ў 1937 г. А адкрыццё майстэрань?! У асобных памяшканнях размяшчаліся класы швейнай справы, слясарныя і сталярныя майстэрні, станочнае абсталяванне. Майстэрні адчыніліся ў 1939 г. У іх мы атрымлівалі свае прафесійныя навыкі. Я, напрыклад, стаў стругальшчыкам. І гэта прафесія мне вельмі спатрэбілася пазней.

І было так, што ўсе выхаванцы, каму споўнілася 14 гадоў, перадаваліся на прадпрыемствы, станавіліся працоўнымі. Ім давалі інтэрнат і бясплатнае харчаванне.

У якасці выключэння мне далі права скончыць сямігодку ў сценах дзетдома. Разам са мной засталіся Ваня Зайцаў, Грыша Рабіновіч, Андрэй Майскі і яшчэ шэсць дзяўчынак. Усе мы і заставаліся ў дзетдоме да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

У вайну дзетдом эвакуіраваўся спачатку ў Данбас, у г. Старабельск, а ў кастрычніку 1941 г. — яшчэ далей — у г. Калывань Кемераўскай вобласці.

У Старабельску хлопчыкаў і дзяўчынак 16—17 гадоў у лістападзе перадалі на аўтатрактарны завод. Я, напрыклад, стаў працаваць стругальшчыкам. У лістападзе 1941 г. завод эвакуіраваўся на Урал.

Па шляху ў г. Кузнецк Пензенскай вобласці дырэктар завода нас, дзетдомаўцаў, высадзіў і сказаў: «працаўладкоўвайцеся самі, бо мне карміць вас няма чым». І мы засталіся. Звярнуліся ў гарком камсамола. Праўда, камсамол дапамог. Працаўладкавалі на завод Кузнецксельмаш. Завод выпрабляў мінамёты. Зброя для фронту — работа адказная, і мы працавалі па-франтавому. У 1942 г., калі разгарнуліся баі за Сталінград, мы з Колем Прусам уцяклі з завода на фронт, дабраліся да Рцішчава, далей не ўдалося — ваенная камендатура затрымала. У Сталінград мы не трапілі. У лютым 1943 г. мяне прызвалі ў Чырвоную Армію. Са жніўня 1943-га пачалося маё франтавое жыццё. На фронце я быў разведчыкам 416-й асобнай разведроты 350-й стралковай дывізіі 13-й арміі. З гэтай часцю ўдзельнічаў у баях за Днепр, у Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, ваяваў у Закарпацці і Чэхаславакіі, удзельнічаў у штурме Берліна і вызваленні Прагі. Быў

некалькі разоў паранены. І зараз у лёгкім сядзіць асколак фашысцкай міны.

Пасля вайны я скончыў ваенна-палітычнае вучылішча і гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У запас з радоў Савецкай Арміі выйшаў у вайсковым чыне падпалкоўніка, праслужыўшы ў войсках каля 30 гадоў. Баявыя заслугі адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі і ордэнам Славы III ступені, ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Улукаўскі дзіцячы дом стаў сапраўднай школай фарміравання людзей цвёрдай волі і мэтанакіраваных. Выхаванцы нашай групы — Наташа Ляшчук — заслужаная настаўніца Рэспублікі Беларусь, зараз пенсіянерка, Яша Крангаўз стаў юрыстам, Каця Фядосава доўгія гады працавала ў апараце Саветаў.

Стаіць у Улукаўі ў лукавіне ракі Іпуць дзіцячы гарадок. Колькі добрых пуцёвак у вялікае жыццё тут атрымалі абяздоленыя дзеці.

З гісторыі Дома міласэрнасці

На беразе Іпуці сярод іншых пабудоў вылучаецца вялікі трохпавярховы дом, у ім жывуць і вучацца дзеці, якіх абдзяліў лёс. Тут, ва Улукаўскай школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, выхоўваюцца зараз 176 хлопчыкаў і дзяўчынак. Трэба мець на ўвазе, што гэта спецшкола. Таму і займаюцца з дзецьмі вопытныя педагогі-дэфектолагі. Перавага надаецца прафесійнаму выхаванню, дзеля чаго тут створана неабходная вучэбная база.

Гісторыя гэтай установы даўняя і цікавая. Як сведчаць дакументы Гомельскага абласнога дзяржаўнага архіва, у Гомельскім павеце на 15 чэрвеня 1923 г. былі толькі 4 дзіцячыя дамы — Ціценскі, Пракопаўскі, Веткаўскі і Добрушскі. А ў пазнейшых крыніцах ужо ўказваецца і такая ўстанова ва Улукаўі, якая была перададзена з губернскай сістэмы сацыяльнага выхавання таварыству «Сябры дзіцяці». Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць пратакол пасяджэння калегіі губернскага аддзела народнай адукацыі ад 22 лістапада 1924 года, на якім разглядалася пытанне аб стане дзіцячых дамоў.

Вялікую цікавасць уяўляе брашура, выдадзеная друкарняй «Палесдрук» у колькасці 600 экзэмпляраў на 20 старонках. Называецца яна «Справаздача Гомельскага камітэта таварыства «Сябры дзіцяці» імя Леніна за сваю работу».

У раздзеле «Расходы таварыства» сказана, што яно ўтрымлівае на свае сродкі Улукаўскую сельскагаспадарчую калонію і школу пры ёй. Пра самую школу ў брашуры гаворыцца: «Улукаўская сельскагаспадарчая калонія ўяўляе сабой працоўную сельгаскамуну, дзе дзеці навучаюцца правільнай апрацоўцы зямлі і падрыхтоўваюцца да больш удасканаленых формаў сельскай гаспадаркі. У калоніі ёсць школа 1-й ступені паніжанага сельскагаспадарчага тыпу, мэта якой звязаць вытворчасць і працу з агульнай адукацыяй»...

Калонія была прынята таварыствам у канцы снежня 1924 г. Гаспадарка яе знаходзілася ў стане заняпаду. Каб наладзіць нармальнае жыццё калоніі, камітэт перш за ўсё звярнуў увагу на правільную арганізацыю гаспадаркі і адначасова прыняў меры да паляпшэння жыцця дзяцей. Было палепшана іх харчаванне, заняткі ў школе пайшлі нармальна, увесь інвентар і матэрыялы калоніі былі ўзяты на ўлік, праведзены тэрміновы рамонт інтэрната.

Для аднаўлення гаспадаркі калоніі камітэт прыняў меры да пабудовы крупадзёркі і вальцовай сукнавалкі, зроблены ўнутраны рамонт старога дома і ўсіх дапаможных і складскіх памяшканняў, арганізавана малочная ферма, для якой набыта дадаткова 26 кароў. Гэта дало магчымасць увесці ў вучэбны план жывёлагадоўлю. У калонію быў праведзены тэлефон, водаправод, у інтэрнатах зроблены ванныя пакоі, распачата будаўніцтва лазні з дэзінфекцыйнай камерай, закладзены хлебапякарня, пральня і амбулаторыя. Набыты жалезныя лыжкі і пасцельныя прыналежнасці, дзеці атрымалі новую вопратку і абутак. Калонія набыла трактар. На той час у ёй ужо быў млын, кузня для рамонту сельгасінвентару. Усе прадпры-

емствы абслугоўваліся дзецьмі, якія атрымлівалі такім чынам добры вопыт у розных галінах гаспадаркі. Быў асвоены севазварот і ўведзены тэхнічныя культуры.

Варта дадаць, што ў 1925 г. у калоніі было занята рознымі культурамі 100,5 дзесяціны зямлі, у тым ліку 20 займаў луг, 5 – сад. Вырошчвалі азімае жыта, лубін, сырадэлю, авёс, бульбу, грэчку, агародніну.

У калоніі жылі, вучыліся і працавалі непісьменныя, малапісьменныя і пісьменныя дзеці, сабраныя з 16 губерняў — рускія, яўрэі, палякі, немцы, латышы, мардвіны, татары. Выпускнікі дзіцячага дома ўладкаваліся ў Гомельскую школу дрэваапрацоўшчыкаў, на завод «Пралетарый», запалкавыя фабрыкі Навабеліцы, Рэчыцы, Злынкі і Навазыбкава. «Усе гэтыя рабяты атрымліваюць на рабоце ад 22 да 35 руб. жалавання ў месяц. Усяго за справаздачны перыяд праз школу прайшло 110 рабят», — гаворыцца ў справаздачы таварыства за 1924 г.

А вось яшчэ радкі са справаздачы, дзе гаворыцца пра 577 дзяцей, якіх таварыства пасля абследавання накіравала ў дзетдамы, калоніі і іншыя дабрачынныя ўстановы, у тым ліку і ў Улукаўе. «Адна трэць азначанай колькасці дзяцей складаецца з круглых сірот вёскі, а дзве трэці складаюць тыповыя дзеці вуліцы, бадзячы элемент, павалжане і часткова сіроты бяднейшых слаёў гарадскога насельніцтва...».

У наступныя гады калонію, або спецдзетдом, усё часцей называюць «дзіцячым гарадком». Гэты тэрмін упамінаецца ў архіўных матэрыялах і ў далейшым. Так, 3 снежня 1926 года на пасяджэнні калегіі губернскага аддзела сацыяльнага выхавання слухалася пытанне аб рабоце Улукаўскага дзетгарадка. Справаздачу рабіў загадчык гарадка Зыкаў. У пратаколе прыводзіцца яго заключнае слова: «У гарадку ёсць 68 дзесяцін ворнай зямлі і 100 — заліўнога выгану. Уся ворная зямля апрацоўваецца сіламі вучняў і ніводнай пядзі ў нас не пустуе. Без наёмнай працы абысціся нельга, праца рабятам не пад сілу, і рабяты перагружаны. Зацяваецца работа сельскагаспадарчага гуртка, у якім будуць прымаць удзел аграном, навучэнцы старэйшых груп і сялянства... Мы ўжо вядзем работу па праграме ШСМ (школа сялянскай моладзі), якая амаль нічым не адрозніваецца ад сямігадовай школы з сельскагаспадарчым ухілам».

Сярод дакументаў за 1929 г. у архіве захоўваецца спіс выхаванцаў, якія вучыліся ў школе. Пералічаны вучні кожнай з 7 груп.

29 сакавіка 1935 г. прэзідыум Гомельскага гарсавета прыняў пастанову «Аб становішчы Чонкаўскага і Улукаўскага дзетдамоў». У ёй сказана: «Прапанаваць загадчыку Улукаўскага дзіцячага дома т. Саю закончыць пабудову ізалятара, сталоўкі і рамонт будынкаў да 1 чэрвеня...». (Ф. 636. Спр. 3. № 85. Воп. 1. Л. 118).

Цікава, што сярод іншых дакументаў таго года ў архіве захаваліся нават планы-схемы будынкаў Улукаўскага дзетдома. Іх было 4, у тым ліку трох-, двух- і 2 аднапавярховыя.

У сувязі з прыбліжэннем фронту летам 1941 г. дзетдом эвакуіраваўся спачатку ў Данбас, а потым у Сібір.

У час вайны ад дзетдома застаўся толькі адзін двухпавярховы будынак. Але пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Улукаўскі дзетдом зноў прыняў выхаванцаў. Размяшчаўся ён у тым самым ацалелым будынку і ў прыстасаваных памяшканнях. У архіве захоўваецца рашэнне Гомельскага аблвыканкома ад 8 снежня 1944 г. «Аб выдзяленні сродкаў на аднаўленне Улукаўскага дзетдома». Са сродкаў мясцовага бюджэту для фінансавання аднаўленчых работ асігнавалася 256 тыс. рублёў. Цяперашні ж трохпавярховы будынак быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1975 г.

Вясной 1944 г. у дзетдоме знайшла прытулак 10-гадовая Валя Падабедава, маці якой памерла, а бацька ваяваў на фронце. Кіраваў тады дзетдомам Міхаіл Сонцаў. А ў 1959 г. па просьбе дырэктара Івана Іванавіча Драбышэўскага Валянціна Іванаўна стала працаваць тут старшай піянерважатай, а затым выхавацелькай. А з 1973 г. яна займае пасаду намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце. Дырэктарам школы-інтэрната вось ужо 17 гадоў працуе Анатоль Леанідавіч Казлоў.

І.І.Пічукоў.

Ад канкурэнцыі да спаборніцтва

З арганізацыяй калгасаў канкурэнцыя сялян згубіла сваю мэту і ўступала месца спаборніцтву. Арганізацыяй спаборніцтва паміж калгаснікамі і рабочымі саўгасаў займаліся партыйныя арганізацыі і дзяржаўныя ўстановы. Пачынаўся зусім новы стыль жыцця як па форме, так і па зместу.

Першымі ў Гомельскім раёне ў спаборніцтва ўступілі рабочыя саўгаса «Васільеўскі». Яны рашылі павялічыць на 20% вытворчасць працы, знізіць на 10% сабекошт прадукцыі. Неўзабаве ў спаборніцтва з васільеўцамі ўступілі рабочыя саўгаса «Новы араты», якія ў сваю чаргу выклікалі на спаборніцтва сельгасарцель «Батрак» і саўгас «Прыбыткі». Калгаснікі арцелі «Усерабземлес» выклікалі на спаборніцтва калектыў калгаса «Фрайтаг». Вакол гэтых з'яў вялася шырокая і паўсядзённая агітацыя і прапаганда.

З восені 1931 г. ва ўдарных брыгадах калгасаў і саўгасаў умацоўваюцца прынцыпы гаспадарчага разліку. Першай у Беларусі на гаспадарчы разлік перайшла ўдарная брыгада трактарыстаў саўгаса «Васільеўскі».

Рознымі сваімі формамі спаборніцтва накіроўвала працаўнікоў сяла на ўздым прадукцыйнасці і эканамічнай эфектыўнасці працы аграрнага сектара. Ішла барацьба за рост колькасных і якасных паказчыкаў вытворчасці ў паляводстве, жывёлагадоўлі, механізацыі працэсаў працы. Гэта вылучала паасобных працаўнікоў, якіх афіцыйная прапаганда рабіла героямі дня. Адной з іх была Марыя Пятроўна Ляшкова — тэхнік-птушніца апорнага пункта Гомельскай інкубатарна-птушкаводчай станцыі. У 1935 г. яна атрымала ад кожнай нясушкі па 144 яйкі. Яе метады працы дэманстраваліся на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. Сваім вопытам Ляшкова дзялілася з дэлегатамі Усесаюзай нарады перадавікоў жывёлагадоўлі ў Маскве. За высокія працоўныя поспехі ў ліку першых 300 перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі, узнагароджаных ордэнамі і медалямі, Марыя Пятроўна Ляшкова была адзначана ордэнам «Знак Пашаны».

Дасягненні наватараў здабываліся працавітасцю і натхнёным энтузіязмам. Даваліся яны нялёгка. Вось як аб гэтым пісала даярка калгаса «Чырвоны хлебароб» Кацярына Бярозкіна: «На нашай ферме ў 1935 г. карова Ада давала ўсяго 500 л малака ў год. Яе лічылі нязважнай і нават хацелі здаць

Выстаўка ўраджаю калгаса імя Молатава Урыцкага сельсавета.

на мяса. Я бачыла, што вінавата не карова, а даярка, якая даглядала за ёю. Настаяла, каб пакінуць Аду на ферме і ўзяла ў свой статак. Стала яе раздойваць. Удой хутка павышаўся. Перагледзела рацыён — надой малака зноў павысіўся. Скора Ада стала даваць па 25 і больш літраў малака ў суткі. Ад групы з 11 кароў, у якой была і Ада, я атрымала за год 22 847 літраў малака». Гэта быў лепшы паказчык — у раёне сярэдні надой на карову складаў толькі 900 літраў за год.

3 сакавіка 1940 г. газета «Гомельская праўда» змясціла фотаздымак даяркі калгаса «Чырвоны працаўнік», узнагароджанай малым залатым медалём ВДНГ дэпутата абласнога Савета А.Д.Маркаўцовай. У артыкуле «Як прыходзяць высокія надоі» Маркаўцова пісала: «З 1930 г. я працую даяркай і заўсёды старанна і ўдарна. У 1938 г. ад кожнай з 11 кароў я атрымала па 2730 л малака. Ад іх жа вырасціла і 14 цялят. А ад каровы Волгі за 269 дзён надаіла 4149 літраў малака».

Даярка калгаса «Чырвоны працаўнік» Фёкла Максімаўна Галушкіна надаіла ў 1938 г. па 2309 літраў малака ад фуражнай каровы остфрызскай пароды.

На свінаферме Яромінскага сельсавета ў 1936 г. было 25 свінаматак. За год тут атрымалі 230 парасят. Свінарка Поля Прахарэнка ад 7 свінаматак атрымала 81 парася і выгадавала іх. Да канца года прывес склаў 4485 кг. Парасяты ад першага апароса за адзін месяц дабавілі ў сярэднім па 20, а ад другога апароса — па 15 кг прывесу. Усяго на ферме за год у разліку на адну свінаматку тут атрымалі больш за тону прывесу.

На раённай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1940 г. свінарка Вольга Кастусёва дэманстравала кабана вагой 260 кг, які за адзін месяц прыбавіў у вазе на 45 кг.

Паказвалі ўзоры добрай працы і паляводы. Хатняя гаспадыня з саўгаса «Бярозкі» Базылева ў 1935 г. вырасціла ўраджай кармавых буракоў па 750 ц, а ў 1936 г. — 1200 ц з гектара.

Незвычайна высокім для свайго часу стаў ураджай бульбы, атрыманы брыгадай калгаса «1 Мая». У 1935 г. гэта брыгада дабілася з кожнага гектара плошчы па 507 ц бульбы, а ў 1936 г. — па 516 ц. Гэта быў рэкорд раёна. Не горшымі былі і паказчыкі па іншых культурах. Брыгада атрымала з кожнага гектара па 5 ц ільновалакна, па 22 ц пшаніцы, больш за 333 ц буракоў.

Брыгадзір паляводчай брыгады Іван Усцінавіч Навіцкі з саўгаса «Брылёў» у 1937 і 1938 г. атрымаў у сярэднім ураджай з аднаго гектара па 735 ц кармавых караняплодаў, 16 ц збожжа. У тым жа саўгасе брыгадзір Ягор Няфёдавіч Папоў атрымаў з аднаго гектара па 82,4 ц садавіны. Звеннявая гэтага саўгаса Ірына Емяльянаўна Цярэшчанка ў 1938 г. атрымала з аднаго гектара па 1050 ц кармавых буракоў.

10 сакавіка 1935 г. СНК БССР прыняў пастанову «Аб арганізацыі адкорму жывёлы ў калгасах і саўгасах». Лепшых вынікаў у справе ажыццяўлення рашэння ў Гомельскім раёне дасягнулі ў 1935 г. калгасы «Чырвоны герой», «Чырвоны партызан», «Чырвоны працаўнік» і інш.

Калгас «Чырвоны герой» Старадзятлавіцкага сельсавета ў 1935 г. адкарміў і здаў на мясакамбінат 10 галоў жывёлы з сярэдняй жывой вагой кожнай галавы па 310 кг.

Калгас «Чырвоны партызан» Старадзятлавіцкага сельсавета адкарміў і здаў у 1935 г. на мясапастаўку 10 галоў жывёлы з сярэдняй вагой 325 кг.

Добрыя паказчыкі былі ў калгасах «Чырвоны хлебароб» Яромінскага сельсавета, імя Гікала Жаробінскага сельсавета і некаторых іншых гаспадарках.

За добрыя паказчыкі ў рабоце па адкорме жывёлы СНК БССР

прэміраваў у 1935 г. малочна-таварныя фермы калгасаў «Чырвоны герой», імя Гікала. А за праяўленую ініцыятыву ў справе адкорму і за сумленную працу ў справе ажыццяўлення рашэння СНК БССР былі таксама прэміраваны загадчык МТФ калгаса «Чырвоны герой» Несцер Карнеевіч Волкаў і скотнік Мікіта Рыгоравіч Волкаў, загадчык МТФ калгаса «Чырвоны партызан» Міхаіл Вараб'ёў і намеснік старшыні калгаса Фрол Клімаў, свінар калгаса «Чырвоны хлебароб» Іван Караўкін і скотнік Самонаў, загадчык МТФ калгаса імя Гікала Анатоль Міхайлавіч Біруля і старшыня калгаса Пакаташкін.

Аб поспехах наватараў сведчылі іх творчая праца і высокія прыбыткі.

Ужо ў 1938 г. нярэдка можна было чуць слова «мільянер» і ў калгасе «Чырвоны хлебароб» Яромінскага сельсавета. І сапраўды, гэтае слова было тут абгрунтавана фактамі. У 1937 г. калгас меў каля 800 тыс. рублёў прыбытку. За 1938 г. гэтая лічба павялічылася да аднаго мільёна рублёў. Паляпшалася і жыццё сялян, хоць і не ва ўсіх гаспадарках. Але ж адкрываліся добрыя перспектывы, акрыялі людзі. У Раманавіцкім сельсавеце 75-гадовы стары Назар Сецкі на сходзе вяскоўцаў казаў: «Нягледзячы на маю старасць, я ўпэўнены, што на свае працадні атрымаў не менш чым 10 аднаасобнікаў, таму што я сумленна працаваў у калгасе». Яго падтрымала 70-гадовая Чыкунова Маруша: «Вельмі цяжка жылося маёй сям'і да ўступлення ў калгас. Вось у гэтым годзе, калі мы ўступілі ў калгас, наша жыццё зусім змянілася. Мы на свае працадні атрымалі больш за 11 вазоў бульбы, вялікую колькасць збожжа, гародніны і грошаў. Усяго атрымана не толькі хопіць для маёй сям'і, а многа чаго зможам і прадаць».

На сходах сялян у гэтым сельсавеце толькі за два дні працы актывістаў у калгас уступіла 37 аднаасобнікаў.

Калгаснік мог ужо купіць на свой заробак самае неабходнае. Сельмаг Дзятлавіцкага сельсавета прадаў сялянам на 19 тыс. рублёў вопраткі, на 16 тыс. абутку, на 2,5 тыс. галёш, на 10 тыс. баваўняных вырабаў і на 8 тыс. рублёў прадуктаў. Многа было прададзена посуду і галантарэйных вырабаў. Такі абарот тавараў сведчыў аб узросце пакупной здольнасці калгаснікаў, аб узросце іх патрабаванняў.

Багацелі калгаснікі, багацелі калгасы і саўгасы. Напрыклад, саўгас імя М.Горкага — найбольшы ў Гомельскім раёне — у сваім карыстанні меў трактары, аўтамашыны, буйную малочна-таварную ферму, лесапільны завод, маслазавод, хлебапякарню і інш. Гэта гаспадарка мела вялікія плошчы зернеагародных культур і 1200 га сенажацей. Моцнымі былі саўгасы «Насовічы», «Брылёў» і іншыя гаспадаркі. Тут працавала многа тэхнікі, меўся пародзісты статак жывёлы, дастатковая колькасць зямлі, спецыялістаў, працоўных.

Па стане на 1 студзеня 1941 г. у раёне мелася 13 383 гаспадарчыя двары. У іх 7738 калгаснікаў, 743 аднаасобнікі, 4902 рабочыя саўгасаў. Калгаснікі раёна мелі 6102 галавы буйной рагатай жывёлы, з іх 5513 кароў, 8016 свіней, 1557 авечак. У 743 гаспадарках аднаасобнікаў мелася 195 кароў, 337 свіней, 27 авечак, 220 коней. Але была яшчэ і беднота.

Не вельмі бурна, але ўсё ж развівалася сацыяльна-культурная база раёна. У 1938 г. у раёне дзейнічалі 28 бібліятэк (кніжны фонд складаў больш за 11 185 адзінак), 14 хат-чытальняў. Працавалі 25 клубаў, 8 стацыянарных кінаўстановак, 20 радыётрансляцый. Дзейнічалі 39 пачатковых, 15 няпоўных сярэдніх, 8 сярэдніх школ, адзін тэхнікум, у якіх працавала 392 настаўнікі. Па стане на 1940 г. у раёне вышэйшую адукацыю мелі 141 жыхар, сярэднюю — 3591. Тым не менш па звестках статыстыкі, непісьменнымі

заставаліся 7389 чалавек, у т. л. 6553 жанчыны.

На 1000 жыхароў у Гомельскім раёне, па стане на студзень 1939 г., каэфіцыент нараджальнасці складаў 37,4, а ў 1940 г. 29,8%, тады як па вобласці ў 1939 г. ён быў 36,6, а ў 1940 г. — 29%. Наводзяць на роздум такія звесткі. Колькасць памерлых да нованароджаных у раёне ў 1939 г. складала 40,7%, а ў 1940 г. гэта лічба вырасла да 50,5%.

Эканамічныя ж паказчыкі аб развіцці раёна, ягонай эканомікі і культурнага ўзроўню сведчылі пра адносны прагрэс. Справа, відаць, у тым, што меў працаўнік ад гэтага прагрэсу. Гісторыя ж сведчыць, што меў ён ад гэтага нямшмат. Але, акрылены надзеяй на будучае, ён стараўся працаваць ударна, верыў у свой урад і партыю і не тое, каб не ўнікаў, а хутчэй за ўсё баяўся ўнікаць у той гвалт, беззаконне і беспадстаўныя рэпрэсіі, ад якіх пацярпелі тысячы нявінных людзей свайго краю. Але пра гэта ў асобным матэрыяле.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл., а таксама газет «Гомельская праўда», «Полесская правда», «Сталінскі сцяг».

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СА ЗВЕСТАК АБ РАЗВІЦЦІ ДЗЯРЖГАСАЎ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

Паказчыкі	1936	1937	1938	1939	1940
1	2	3	4	5	6
	Па конезаводзе № 59				
Зямельны фонд (га)	4376	3670	3613	3650	3694
Пашня (га),	2164	2229	2236	2016	2081
у т. л. збожжа (га)	1057	1036	1021	975	910
кармавыя (га)	651	927	913	891	900
Усяго буйной раг. жывёлы,	223	215	220	239	229
у т. л. кароў	103	66	77	92	73
Свінні	141	89	36	-	-
Коні	456	431	437	441	482
Трактары	25	17	17	17	16
Грузавыя аўтамаш.	3	3	3	3	3
Камбайны	1	1	1	2	2
Сярэдн. гад. кольк. раб.	501	523	473	413	409
	Дзяржгас імя Горкага				
Зямельны фонд (га)	3404	4619	4515	4515	4515
Пашня (га),	964	714	785	624	628
у т. л. збожжа (га)	449	398	356	293	326
кармавых (га)	360	195	316	225	184
Усяго раг. жывёлы,	739	872	775	838	712
у т. л. кароў	335	402	344	359	313
Свінні	17	15	6	10	10
Коні	92	107	118	117	109
Трактары	8	10	1	9	8
Груз. аўтамаш.	1	2	4	5	6
Камбайны	-	1	1	1	1
Сярэдн. гад. кольк. раб.	192	224	239	233	243
	Дзяржгас «Насовічы»				
Зямельны фонд (га)	2103	1440	1410	1432	1392
Пашня (га),	902	1001	615	605	611
у т. л. збожжа (га)	591	536	321	303	314
кармавых (га)	179	332	218	227	161

Усяго раг. жывёлы	190	201	198	258	286
у т. л. кароў	89	111	117	121	130
Свінні	309	323	418	212	521
у т. л. свінаматак	78	53	57	58	50
Коні	119	124	113	117	107
Трактары	9	10	8	6	6
Груз. аўтамаш.	1	3	2	2	2
Камбайны	-	1	1	1	1
Сярэд. гад. кольк. раб.	223	167	187	166	182
Дзяржгас «Брылёў»					
Зямельны фонд (га)	675	675	675	675	675
Пашня (га)	349	362	359	323	372
у т. л. збожжа (га)	123	140	144	109	118
кармавых (га)	134	167	154	161	156
Усяго раг. жывёлы	131	122	142	152	154
у т. л. каровы	63	71	75	80	80
Свінні	29	41	41	30	18
у т. л. свінаматак	6	7	8	4	5
Коні	77	82	93	100	99
Трактары	5	4	3	3	3
Груз. аўтамашын	1	3	3	3	3
Сярэд. кольк. рабочых	231	210	221	183	190

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 95. Л. 3,3 адв., 4, 4 адв., 11, 11 адв., 13, 13 адв.

СА ЗВЕСТАК АБ КАЛГАСАХ І АДНААСОБНІКАХ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА 1 СТУДЗЕНЯ 1939 г.

Всего колхозов — 57, в них — 7193 двора. За 1938 год в колхозы района вступило 745 человек, в т. ч. из других колхозов 69 человек. Выбыло 237 человек. Исключено из колхозов 25 человек. В районе всего единоличных крестьянских хозяйств 979. Процент коллективизации — 88,2.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 21. Л. 6.

СА ЗВЕСТАК АБ ХУТАРАХ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА НА 18 ЧЭРВЕНЯ 1939 г. І ІХ ССЯЛЕННІ

План ссялення — 540 хутароў.

Пераселена 379 хутароў.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1230. Воп. 1. Спр. 19. Л. 37.

СА ЗВЕСТАК АБ КОЛЬКАСЦІ ГАСПАДАРАК ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

	на 1.7.1939	**на 1.1.1940**	**на 1.7.1940**
Колхозники	7437 чал.	7436 чал.	7738 чал.
Единоличники	904 чал.	771 чал.	743 чал.
Всего крестьянских дворов	8341	8207	8481
Дворов рабочих	4841	5115	4902
Всего:	13 182	13 322	13 383

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 98. Л. 6.

СА ЗВЕСТАК АБ НАЯЎНАСЦІ КАЛГАСАЎ, КАЛГАСНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ НА 1 СНЕЖНЯ 1940 г.

Гомельский район: колхозов — 57; колхозных дворов — 7280, дворов единоличников — 771. Всего дворов — 8051. Процент коллективизации — 90,7%.

Посевные площади колхозов — 20 283 га, колхозников — 2494 га, единоличников — 273 га. Всего земли 23 050 га, из них коллективизированный сектор составлял 22 777 га, т. е. 93,8%.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 3. Спр. 98. Л. 11, 25.

СА ЗВЕСТАК АБ ВЫНІКАХ ПЕРАПІСУ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

год	кр. рог. скот	коровы	свиньи	овцы	кони
1	2	3	4	5	6
По колхозам					
1940 г.	7 133	2 773	1 837	3 464	4 588
1941 г.	6 720	2 650	2 277	4 080	4 635
По колхозникам					
1940 г.	6835	5395	7075	1732	
1941 г.	6102	5513	8016	1557	

Сводные данные по всем секторам хозяйств по состоянию на 1.1.1940 и 1.1.1941 гг. по Гомельскому району

1	2	3	4	5	6
1940 г.	18 026	11 011	11 881	5337	6136
1941 г.	16 318	10 785	13 773	5741	5983

По состоянию на 1.1.1941 г. из 7113 дворов колхозников в Гомельском районе без всякого скота было 840 хозяйств, в том числе без коров, но имеющих телок — 321 хозяйство и не имеющих телок — 1444 хозяйства. По одной корове имели 5505 дворов колхозников, по 2—3 коровы — 3 двора. Не имевших овец — 6556 дворов. Без свиней — 2653 двора. По 2—3 свиньи имели 544 двора колхозников.

... В 1941 году в Гомельском районе было 57 колхозов. В них 57 продуктивных ферм скота и птицы. Свиней имели 53 фермы, овец — 55 ферм, птицу — 34 фермы.

В районе 51 колхоз имел одновременно фермы крупного рогатого скота, свиней и овец. Только фермы крупного рогатого скота и овец имели 4 колхоза, а фермы с крупным рогатым скотом и свиньями — 2 колхоза. Не имели свинофермы — 1 колхоз, овцематок — 3 колхоза, а два колхоза не имели овец.

На 100 хозяйств колхозников приходилось

	кр. рог.скота	**коров**	**свиней**	**овец**	**лошадей**
1938	109	42	30	35	68
1940	97	35	25	47	63
1941	86	36	31	56	64

На 100 дворов единоличников приходилось

1938	119	76	190	21
1940	95	75	98	24
1941	84	76	110	21

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 2. Л. 6, 7, 8, 13, 14, 17, 19.

З РАЁННЫХ СТАТЗВЕСТАК

	1937	**1938**
Рождаемость	2052	2412
Смертность	764	909
Браки	389	475
Разводы	17	35

* * *

Общий процент рождений на 1000 человек населения в 1939 году составлял 37,4%, а в 1940 г. — 29,8%, тогда как по области он составлял в 1939 — 36,6%, а в 1940 г. — 29,0%.

* * *

Отношение умерших к родившимся в районе в 1939 году составило 40,7%, а в 1940 году — 50,5%, тогда как по области эти показатели составляли в 1939 г. — 35,7%, а в 1940 г. — 47,9%.

* * *

Процент разводов к бракам составлял: в 1937 г. — 4,4, в 1938 г. — 7,4, в 1939 г. — 9,3, а в 1940 г. — 13,7%.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл.

З ПАСТАНОВЫ КАМІТЭТА ВДНГ АД 15 КРАСАВІКА 1940 г.

Аб узнагароджанні ўдзельнікаў ВДНГ па Гомельскай вобласці

Вялікім сярэбраным медалём:

п. 5. Кунін Зэлік Абрамавіч — дырэктар саўгаса «Брылёў» Гомельскага раёна.

Малым сярэбраным медалём:

п. 10. Васілеўская Анфіса Данатаўна — аграном саўгаса «Брылёў».

п. 12. Галушкіна Фёкла Максімаўна — даярка калгаса «Чырвоны працаўнік», якая надаіла ў 1938 г. 2309 л малака на фуражную карову метысаў остфрызскай пароды.

п. 23. Ляшкова Марыя Пятроўна — тэхнік-птушніца апорнага пункта Гомельскай інкубатарна-птушкаводчай станцыі.

п. 32. Навіцкі Іван Усцінавіч — брыгадзір саўгаса «Брылёў», які ў 1937—1938 гг. дабіўся сярэдняга ўраджаю з 1 га: бульбы — 171 ц, кармавых караняплодаў — 735 ц, зерня 16,06 ц.

п. 34. Папоў Ягор Няфёдавіч — брыгадзір саўгаса «Брылёў», які ў 1938 г. атрымаў з 1 га сада 82,4 ц пладоў.

п. 38. Сарокін Іван Савельевіч — брыгадзір калгаса «Чырвоная Воля», які ў 1938 г. атрымаў па 86 ц канюшыны з 1 гектара.

п. 39. Цярэшчанка Ірына Емяльянаўна — звеннявая саўгаса «Брылёў», якая ў 1938 г. атрымала з 1 га па 1050 ц кармавых буракоў.

п. 41. Фралоў Фёдар Міхайлавіч — брыгадзір калгаса «1 Мая», брыгада якога атрымала па 507 ц бульбы з 1 га.

Гомельская праўда. 1940 г. 8 мая.

З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ ГАЗЕТЫ

Удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі па павільёне друку па Гомельскай вобласці

З Пастановы Глаўвыстаўкома Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Зацвердзіць удзельнікамі ВСХВ з занясеннем у «Кнігу гонару» ВДНГ па павільёне друку:

п. 4. Гомельскага раёна газету «Сталінскі сцяг».

п. 5. Насценную газету «Калектывіст» калгаса «Эміс» Гомельскага раёна.

п. 9. Лапіцкага Канстанціна Васільевіча — адказнага рэдактара газеты «Сталінскі сцяг».

п. 10. Юшпрайха Яфіма Іосіфавіча — рэдактара насценнай газеты «Калектывіст» калгаса «Эміс» Гомельскага раёна.

п. 11. Кулажанку Васіля Мікалаевіча — в. а. загадчыка сельгасрэдакцыі газеты «Сталінскі сцяг».

п. 12. Сібілева Васіля Антонавіча — селькора газеты «Сталінскі сцяг».

Палітшкола калгаса «Камсамол Гомельшчыны». 1936 г.

п. 13. Траянава Івана Сцяпанавіча — селькора.

Гомельская праўда. 1940 г. 8 мая.

Заўвага

Газета «Калектывіст» Прудкоўскага сельсавета мела рэдкалегію ў складзе: намесніка старшыні калгаса І.Н.Котава, рэдактара Я.І.Юшпрайха, настаўніцы школы Е.Я.Дубінінай, М.Г.Казлова, Я.Л.Казлова. Газета нарадзілася ў 1937 г. разам з калгасам. У 1937—1938 гадах выходзіла па 1—2 разы ў месяц, а на пачатку 1939 г. — па 3, 5, 10 разоў у месяц. Выходзіла і штодзённа. У газеце працавала 18 актыўных карэспандэнтаў.

Свята ў калгасе «Клім Варашылаў»

Сёння калгас «Клім Варашылаў» Улукаўскага сельсавета першым у раёне атрымаў акт на вечнае карыстанне зямлёй. Адвечна турботнае для працоўных сялян пытанне аб зямлі, адвечныя пакуты батрака і бедняка на чужой — панскай і кулацкай зямлі, адвечныя слёзы і [бойкі] на мяжы, на вузкай палосцы — зняты савецкай уладай.

Нямала ва Улукаў'і такіх калгаснікаў, для якіх зямля была марай. Сёння дзяржава цвёрда і назаўсёды перадала ім у калектыўнае карыстанне дастатковую колькасць зямлі. ... «Зямля Ваша і Вы яе сапраўдныя гаспадары. Бярыце, працуйце на ёй, з любоў'ю даглядайце яе і атрымлівайце ад яе усялякую карысць».

У калгасе сёння свята. На ўрачыстасць з горада і акаляючых вёсак збярэцца многа гасцей...

ДЗЯРЖАЎНЫ АКТ НА ВЕЧНАЕ КАРЫСТАННЕ ЗЯМЛЁЙ КАЛГАСАМІ
за № 032788

Гэты дзяржаўны акт, выдадзены сельскагаспадарчай арцелі імя Кліма Варашылава в. Галавінцы і Новы Двор Гомельскага раёна Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі, Гомельскім Гарсаветам зацвярджае, што за сельскагаспадарчай арцеллю імя Варашылава замацоўваецца ў бестэрміновае карыстанне і навечна зямля ў колькасці 958,29 гектара згодна ніжэй акрэсленага плана і апісання граніц.

Старшыня Гомельскага Гарсавета МАЛАШОНАК
Загадчык Райземаддзела ШВЕДАЎ
Старшы землеўпарадкавальнік ПРАКАПЕНКА

Полесская правда. 1935. 3 кастрычніка.

З МАТЭРЫЯЛАЎ АБ ВЫПРАЎЛЕННІ ПАРУШЭННЯЎ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА СТАТУТА ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

10 красавіка 1939 г.

Выявлено у колхозников сверх установленных норм коров — 242. Имели в личном пользовании лошадей — 43 хозяйства. В районе сверх установленной нормы земельный надел имели 566 дворов.

... 7 декабря 1938 г. прокуратура Гомельской области выявила грубейшее нарушение ревзаконности в колхозах. Председатель колхоза «Чырвоны бераг» Быковский сдал единоличникам на укос сено на долевых условиях 10 га сенокоса. Быковский привлечен к уголовной ответственности.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1230. Воп. 1. Спр. 17. Л. 2, 28.

З ДАВЕДКІ АБ РАБОЦЕ ГОМЕЛЬСКАЙ АБЛПРАКУРАТУРЫ ПА ВЫКАНАННІ ПАСТАНОВЫ ЦК ВКП(Б) І СНК СССР АД 27 МАЯ 1939 г.

Облпрокуратурой возбуждены уголовные дела против пред. Давыдовского с/с Филимонова, пред. Улуковского с/с Лаптухова, секретаря Улуковского с/с Козлова, которые, имея в своем пользовании приусадебные участки, еще захватили и засеяли: Филимонов в колхозе им. Горького — 0,30 га, Лаптухов в колхозе «Чырвоная воля» — 0,47 га, Козлов в колхозе «Чырвоная воля» — 0,27 га.

К уголовной ответственности по ст. 131 УК БССР за самовольный захват колхозной земли по Гомельскому району [привлечено] 7 человек.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1230. Воп. 1. Спр. 19. Л. 16.

З ІНФАРМАЦЫІ ПРЭЗІДЫУМА ГОМЕЛЬСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

май 1939 г.

По Терюхскому с/с пред. с/с Лазико на президиуме РИКа признался, что они давали ложные сведения относительно обрезки усадеб. По этому с/с 195 колхозных дворов име-

ли приусадебные планы более 0,50 га. В к-зе им. Кагановича колхозники в эту весну захватили колхозной земли и увеличили свои приусадебные планы от 0,65 до 0,75 га. Мер к ним никаких принято не было.

По Грабовскому с/с по к-зу «8-е Марта», рабочий, работающий на подсочке, Новиков, захватил 0,45 га колхозной земли и посеял. Четверо единоличников имеют по 0,60 га земли. В этом же колхозе захватили колхозную землю для расширения своих приусадебных участков, распахивая колхозный луг.

По к-зу «Заход» наемный счетовод, не колхозник, засеял 0,40 га колхозной земли. По этому с/с 178 колхозных хозяйств имели усадьбы сверх предусмотренной нормы в уставе с/х артели.

В самом центре р-на 15 га земли не переданы колхозу, а распределены среди служащих Райисполкома и других организаций.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1230. Воп. 1. Спр. 19. Л. 4–5.

З гісторыі раяніравання

У пачатку 20-х гадоў у склад Гомельскай воласці ўваходзіла 21 пасяленне з насельніцтвам 20 000 чалавек. У ліпені 1922 г. да Гомельскай воласці былі далучаны вёскі: Лапаціна, Замосце, Яроміна, Краснае, Касцюкоўка, Пакалюбічы, Данілавічы, Пыхань (са складу расфарміраванай Пакалюбіцкай воласці), Рандаўка, Прыбар, Урыцкае (са складу былой Целяшоўскай воласці), а таксама Новая Буда і Уза (з былой Дзятлавіцкай воласці). Ад Гомельскай воласці да Добрушскай воласці адышло сяло Ларышча.

Пасля ўзбуйнення ў складзе Гомельскай воласці было ўжо 74 пасяленні з насельніцтвам 34 500 чалавек. Тэрыторыя воласці размяшчалася ў радыусе 20 вёрст ад цэнтра і ўключала 8 сёл, 23 вёскі, 4 гарадскія ваколіцы, 39 іншых населеных пунктаў.

Горад Гомель — цэнтр Гомельскай губерні і павета — адначасова з'яўляўся і цэнтрам Гомельскай воласці.

Раяніраванне дазволіла вызначыцца па пытанні аб правах і абавязках валаснога выканаўчага камітэта. Пры ўмацаванні Гомельскай воласці сыходзілі з рэкамендацый: «...придерживаться экономических признаков и класть в основу экономическое тяготение». Нацыянальныя або іншыя фактары ў разлік не браліся. Менавіта на гэтых прынцыпах 16 сакавіка 1925 г. нарада Гомельскага губплана прыняла рашэнне «...в основу укрепления волостей положить признаки административного, финансового и экономического тяготения. В итоге дискуссии было принято решение считать возможным, в частности, северную часть Носовичской волости передать в состав Гомельской волости».

На гэтым адміністрацыйнае дзяленне ў воласці не спынілася. І 1 снежня 1926 г. тэрыторыя Гомельскай воласці ў складзе Гомельскага павета перайшла ў БССР і была ўключана ў Гомельскую акругу як Гомельскі раён з цэнтрам у г. Гомель. Тады ж у склад раёна ўвайшлі 22 сельскія саветы: Валатаўскі, Галавінскі, Давыдаўскі, Данілавіцкі, Яромінскі, Заліпскі, Замосцеўскі, Касцюкоўскі, Красненскі, Ляшчынскі, Лапацінскі, Мільчанскі (Старамільчанскі), Новамільчанскі, Пакалюбіцкі, Прыбарскі, Прудкоўскі, Пыхальскі, Раманавіцкі, Ціценскі, Улукаўскі, Урыцкі, Хутарскі.

4 жніўня 1927 г. да раёна былі далучаны 17 сельскіх Саветаў ліквідаванага Дзятлавіцкага раёна: Белабярэжскі, Бабовіцкі, Баршчэўскі, Дзятлавіцкі (Старадзятлавіцкі), Жарабінскі, Іванаўскі, Карналінскі, Макееўскі, Міхалькаўскі, Навадзятлавіцкі, Новацярэшкавіцкі, Рудня-Марымонаўскі, Скітоўскі, Слумільчанскі, Студзенагуцкі (Старацярэшкавіцкі), Цярухскі, Шарпілаўскі і яшчэ 6 сельскіх Саветаў ліквідаванага Добрушскага раёна: Вадапойскі, Жгуна-Будскі, Жгунскі, Ларышчаўскі, Новакрупіцкі, Старакрупіцкі, а таксама 14 сельскіх Саветаў ліквідаванага Насовіцкага раёна: Антонаўскі, Грабаўскі, Дуянаўскі, Запрудаўскі, Зябраўскі, Кантакузаўскі, Клімаўскі, Лагунаўскі, Насовіцкі, Пясочна-Будскі, Прыбыткаўскі, Рудня-Прыбыткаўскі, Старасельскі, Хутаранскі.

У выніку рэарганізацыі і ўзбуйнення сельскіх Саветаў 30 снежня 1927 г. замест 58 сельскіх Саветаў у складзе Гомельскага раёна быў зацверджаны 31 сельскі Савет: Бабовіцкі, Баршчэўскі, Грабаўскі, Давыдаўскі, Данілавіцкі, Дзятлавіцкі (Старадзятлавіцкі), Жарабінскі, Жгуна-Будскі нацыянальнарускі, Жгунскі, Зябраўскі, Карналінскі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Мільчанскі (Старамільчанскі), Міхалькоўскі нацыянальнарускі, Насовіцкі, Пакалюбіцкі, Прудкоўскі, Прыбарскі, Прыбыткаўскі, Пясочна-Будскі, Раманавіцкі, Рудня-Марымонаўскі, Сеўрукоўскі, Улукаўскі, Урыцкі, Ціценскі, Цярухскі, Цярэшкавіцкі (Старацярэшкавіцкі), Шарпілаўскі, Яромінскі.

Адначасова былі ліквідаваны сельскія Саветы: Красненскі, тэрыторыя якога была перададзена Ціценскаму сельскаму Савету, Навакрупіцкі і Старакрупіцкі, тэрыторыя якіх перададзена Цярухскаму раёну і ўключана ў толькі што створаны Крупіцкі сельскі Савет.

Такі склад Гомельскага раёна быў зацверджаны Пастановай ЦВК БССР у лютым 1928 г. і праіснаваў да 10 лютага 1931 г., калі Гомельскі раён быў ліквідаваны. Сельскія Саветы Бабовіцкі, Давыдаўскі, Дзятлавіцкі, Жарабінскі, Жгуна-Будскі нацыянальнарускі, Жгунскі, Зябраўскі, Карналінскі, Касцюкоўскі, Клімаўскі, Мільчанскі (Старамільчанскі), Міхалкаўскі нацыянальнарускі, Пакалюбіцкі, Прыбарскі, Прыбыткаўскі, Прудкоўскі, Раманавіцкі, Сеўрукоўскі, Цярэшкавіцкі (Старацярэшкавіцкі), Ціценскі, Улукаўскі, Урыцкі, Яромінскі — былі ўключаны ў гарадскую мяжу горада Гомеля, Данілавіцкі сельскі Савет перададзены Веткаўскаму раёну, а Грабаўскі, Насовіцкі, Пудскі, Цярухскі сельскія Саветы — Лоеўскаму раёну, Баршчэўскі сельскі Савет — Рэчыцкаму раёну.

27 ліпеня 1937 г. Гомельскі раён быў утвораны зноў. У яго ўвайшлі г.п. Касцюкоўка і наступныя сельсаветы: Бабовіцкі, Давыдаўскі, Дзятлавіцкі, Жарабінскі, Зябраўскі, Карналінскі, Клімаўскі, Мільчанскі, Міхалькаўскі, Пакалюбіцкі, Прудкоўскі, Прыбыткаўскі, Раманавіцкі, Сеўрукоўскі, Улукаўскі, Урыцкі, Ціценскі, Цярэшкавіцкі, Яромінскі.

15 лютага 1938 г. Гомельскі раён як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка зацверджаны ў складзе Гомельскай вобласці.

Тады плошча раёна складала 2100 кв.

Фабрыка «Везувій» (фанерна-запалкавы камбінат) у Навабеліцы.

кіламетраў. У раён увайшлі: адзін пасялковы Савет і 25 сельскіх Саветаў. Усяго 198 паселішчаў (110 пасёлкаў і 88 вёсак).

20 красавіка 1939 г. Жарабінскі сельскі Савет перайменаваны ў Чкалаўскі.

На 1 снежня 1941 г. у складзе раёна быў адзін рабочы пасёлак і 20 сельскіх Саветаў.

У.Я.Райскі.

Боль страт

Трагедыя беспадстаўных палітычных рэпрэсій, а з ёю беззаконне, гвалт, разбурэнне гаспадаркі, маралі і ўсяго чалавечага ў людзях не абмінула і Гомельшчыну. Бяда прыйшла ў кожную хату, пасёлак, хутар. Менавіта адсюль для многіх дарога пачыналася да турмы, канцлагера, да далёкага чужога краю, да смерці праз пакуты. Краіну трэсла ліхаманка палітычных працэсаў над «ворагамі народа», «шпіёнамі», «дыверсантамі», «тэрарыстамі». У 1938 г. раённая газета «Сталінскі сцяг» пісала: «Ворагі народа доўгі час арудавалі ў галіне сельскай гаспадаркі Гомельскага раёна, імкнуліся падарваць паспяховае развіццё сацыялістычнай жывёлагадоўлі». Газета заклікала «ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў галіне жывёлагадоўлі». А людзі не разумелі, адкуль тыя ворагі ўзяліся, бо «хапун» хапаў і актывістаў, і камуністаў, і проста звычайных сумленных працаўнікоў. Было шмат пытанняў, але тады, ва ўмовах агалцелай прапаганды супраць тых жа ворагаў пытанні ўслых не задаваліся. Недасведчаныя, адурманеныя і затурканыя людзі слепа верылі ў справядлівасць усяго, што адбывалася, што рабілася навокал пад кіраўніцтвам роднай, самай справядлівай у свеце партыі. Тых, хто разумеў усё, было нямнога. І між тым кожны дзень «хапун» вырываў з актыўнага жыцця родных, блізкіх і проста знаёмых, і яны знікалі назаўсёды немаведама куды.

У 1930-я гады ў Гомельскім раёне беспадстаўныя рэпрэсіі перамалолі каля 800 сямей, а гэта не адна тысяча сялян, інтэлігенцыі, святароў і інш. Страшэннае кляймо «сын ворага народа», «дачка ворага народа», «жонка шпіёна», «бацька дыверсанта», «маці здрадніка» і г д. ачарнілі пакуль яшчэ не падлічаную колькасць сумленных, ні ў чым не павінных людзей.

Казлоў Парфен Іванавіч, 1865 г. нараджэння, з в. Пясочная Буда ў 1929 г. быў «раскулачаны» як заможны селянін і высланы. У 1933 г. вярнуўся з месца зняволення. Працаваў у Гомелі вартаўніком у арцелі інвалідаў. А ў 1937 г. зноў рэпрэсіраваны, на гэты раз нібыта «за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі». Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў 1937 г. у Гомелі. Рэабілітаваны пасмяротна праз сорак два гады.

Жыхар в. Хутаранка Гомельскага раёна Аляксеенка Карней Платонавіч, 1863 г. нараджэння, працаваў дворнікам на фанерна-запалкавым камбінаце ў Навабеліцы. Рэпрэсіраваны ў 1937 г. за тое, што нібыта «рыхтаваў тэрарыстычны акт над старшынёй сельсавета, выказваўся за арганізацыю тэрарыстычных актаў супраць партыйных работнікаў». Быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны ва ўзросце 74 гадоў у Гомелі. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1989 г.

Жыхару в. Уза Гомельскага раёна Прыходзьку Гаўрылу Сямёнавічу споўнілася 75 гадоў, калі ў 1937 г. яго рэпрэсіравалі за «антысавецкую агітацыю» і прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1960 г.

Жарыну Якаву Кузьмічу, жыхару в. Белы Бераг, селяніну-аднаасобніку споўнілася 77 гадоў, калі ў 1937 г. яго рэпрэсіравалі «за антысавецкую агітацыю», прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання і расстралялі ў 1937 г.

Трагічны спіс можна было прадоўжыць. Па папярэдніх звестках у Гомельскім раёне было расстраляна 239 чалавек, з якіх 5 ва ўзросце да 25 гадоў, 13 — ад 25 да 30 гадоў, 32 — ад 30 да 35 гадоў, 35 — ад 35 да 40 і 41 чалавек ад 40 да 45 гадоў, астатнія 119 — ва ўзросце ад 45 і больш. Трагічная, жудасная статыстыка. Не лепшым быў лёс тых, хто загінуў у турмах, лагерах, на пасяленні.

Ніжэй прыводзіцца спіс рэабілітаваных жыхароў Гомельскага

раёна. Па многіх прычынах спіс гэты не можа быць поўным і дакладным. Але з выхадам хронікі «Памяць» Гомельскага раёна пошукавая работа не спыняецца. Будзем спадзявацца, што з'явяцца новыя прозвішчы нашых землякоў, якія будуць занесены на скрыжалі памяці нашчадкаў і землякоў.

Жосткіны — сям'я звычайная, тыповая

У дакалгаснай вёсцы звычайнай з'явай былі вялікія сем'і. Памер сельгасугоддзяў залежаў ад колькасці едакоў. А чым больш надзел, тым больш патрабавалася рабочай сілы, каб апрацаваць яго. Вось такая залежнасць селяніна ад галоўнай крыніцы існавання і абумоўлівала дэмаграфічную сітуацыю ў сельскай мясцовасці. Не была выключэннем і вёска Заліп'е Урыцкага сельсавета, дзе многія людзі вялі аднаасобную гаспадарку вялікімі сем'ямі. Адна з іх жыла на заходняй ускраіне цэнтральнай вуліцы. Гэта сям'я Паўла Гаўрылавіча Жосткіна, у якой было 10 душ разам з яго бацькам. Жосткіны мелі два гектары зямлі ў полі і паўгектара пры сялібе. Трымалі два кані, дзве каровы.

З семярых дзяцей — чатырох сясцёр і трох братоў — самай старэйшай была Таццяна, якая нарадзілася ў 1911 г. А ў самай малодшай, Раі, розніца ва ўзросце, у параўнанні з ёю, у 16 гадоў.

Здарылася так, што на гэту працавітую сям'ю, як і на многія іншыя, у пачатку калектывізацыі звалілася бяда. Аднаасобнікаў прыціскалі непасільнымі падаткамі. Не мінавала гэта чаша і сям'ю Жосткіных. У 1931 г. яна была абкладзена так званым «цвёрдым заданнем», а затым — індывідуальным падаткам, які лічыўся адным з самых цяжкіх. Ні з першым, ні з другім падаткам немагчыма было разлічыцца. І тады ў верасні таго ж года мясцовыя ўлады адабралі ў гэтай сям'і ўсю маёмасць на карысць дзяржавы. А ў лютым 1932 г. прыехалі з Гомеля людзі ў форме, якія забралі з дому і самога гаспадара Паўла Гаўрылавіча. Пры арышце сказалі: «А ты, гаспадыня, заўтра прынясеш урэзак, і мы адпусцім яго». Але ж ніякай зброі ў галавы сям'і ніколі не было.

П.Г.Жосткіна канваіры завезлі ў Гомель на вуліцу Білецкага. Трымалі ў падвале, хоць ён за некалькі дзён да гэтага выпісаўся з бальніцы пасля лячэння ад радыкуліту. Апынуўшыся ў холадзе, Павел Гаўрылавіч зноў захварэў. Тады яго перавялі ў турэмную бальніцу, дзе ён і памёр. Здарылася гэта напярэдадні той радаснай для селяніна пары, калі трэба было выходзіць у поле, 26 сакавіка 1932 г. Так, у 44 гады заўчасна абарвалася жыццё патомнага земляроба, які потам і мазалямі здабываў хлеб сабе і дзецям. І для той жа самай дзяржавы, ад імя якой партыйныя халуі, надзеленыя ўладай, чынілі беззаконне, жорстка і бязлітасна распраўляліся са сваімі «класавымі ворагамі».

Пахавалі Паўла Гаўрылавіча Жосткіна ў Гомелі на могілках каля аўтарамонтнага завода. Родныя хацелі забраць яго і пахаваць на вясковых могілках, але турэмшчыкі-энкэвэдысты не аддалі нябожчыка.

У той змрочны час невыкананне аднаасобнікам задання па здачы заведама непасільнага падатку кваліфікавалася як падрыў дзяржавы. Пакаранне выносілася суровае. Але ў адносінах да П.Г.Жосткіна была сфабрыкавана чамусьці іншая версія, з палітычнай афарбоўкай. А гэта было яшчэ горш. Пра што прама сведчыць выпіска з архіва ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці. У ёй сказана, што селянін-аднаасобнік П.Г.Жосткін рэпрэсіраваны ў 1932 г. за антысавецкую агітацыю. Там жа значыцца: памёр у турме ў 1932 г., рэабілітаваны ў 1989 г.

А вось вытрымка з даведкі пракуратуры Гомельскай вобласці ад 27 лютага 1991 г. № 13-2д-91: «Рашэнне, вынесенае пазасудовым органам 26 сакавіка 1932 г. па справе ў адносінах Жосткіна Паўла

П.Г.Жосткін.

Гаўрылавіча, 1888 г. нараджэння, адменена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб дадатковых мерах па аднаўленні справядлівасці ў адносінах ахвяр рэпрэсій, меўшых месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў» ад 16.01.89 г. Жосткін Павел Гаўрылавіч па дадзенай справе рэабілітаваны».

Дададзім: рэабілітаваны пасмяротна. Але самае трагічнае ў тым, што рашэнне аб пакаранні Жосткіна, якое датуецца 26-м сакавіка 1932 г., супадае з днём яго смерці. Не выключана, што нявінны чалавек быў асуджаны так званым пазасудовым органам (відаць, тройкай) не толькі без яго ўдзелу і прысутнасці, а ўжо калі хворы перастаў жыць або знаходзіўся на мяжы смерці. Ды ці можна было лічыць гэта судом без удзелу сведкаў, адваката, пракурора? То было судзілішча, расправа без віны, без следства, без суда. І так з усімі, хто трапляў пад рэпрэсіўную машыну таталітарнага рэжыму.

Усе турботы аб вялікай сям'і ляглі на плечы маці. Цяжка было і дзецям, на якіх на ўсё жыццё лягло кляймо з-за рэпрэсіраванага бацькі. Але ж Аляксандра Карпаўна дажыла да глыбокай старасці, да 1971 г. Вось што сказала яе дачка Ніна 11 ліпеня 1996 г. пры размове аб лёсе бацькі і сям'і: «Маці не ўмела распісацца, але выгадавала добрых дзяцей. Відаць, бацькі заклалі ў нашы гены дабрыню, сумленнасць, працавітасць. Чырванець нам няма за што». І гэта сапраўды так.

Узяць хоць бы яе самую, Ніну Паўлаўну. У 1936 г. яна скончыла 7 класаў Урыцкай сярэдняй школы, а ў 1939 г. — Гомельскі медтэхнікум. У тым жа годзе яе прызвалі ў армію. Удзельнічала ў вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь, у савецка-фінляндскай вайне. Прайшла ўсю Вялікую Айчынную вайну, якая заспела яе ў Баранавічах. Там ужо ў 10 гадзін раніцы 22 чэрвеня 1941 г. прымала раненых. Зведала пакуты адступлення разам з адыходзячымі войскамі. Дзень Перамогі сустрэла ў эвакашпіталі на станцыі Нікольскае Мічурынскага раёна Тамбоўскай вобласці. У 1956 г. у якасці ваеннага медыка знаходзілася ў Венгрыі, калі там адбываліся крывавыя падзеі. Да выхаду на пенсію працавала ў гомельскім гарнізонным шпіталі. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, у тым ліку «За перамогу над Германіяй». Жыве ў Гомелі.

Удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне і двое яе братоў. Іван, 1916 года нараджэння, вучыўся ў ветэрынарным інстытуце ў Ленінградзе. Там жа ў 1939 г. быў прызваны ў армію з другога курса. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне, быў паранены. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Загінуў на фронце ў 1944 г. пад Ленінградам.

Пётр, які нарадзіўся ў 1922 г., да вайны вучыўся ў Гомельскім чыгуначным тэхнікуме. Са жніўня 1941 г. да восені 1943 г. пражываў на часова акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі. Займаўся сельскай гаспадаркай у в. Заліп'е. Пры адступленні немцы прымусова пагналі яго на работу ў г. Чэнстахоў (Польшча). Пасля вызвалення з няволі савецкімі войскамі ў 1944 г. служыў у дзеючай арміі. Загінуў пад Берлінам у красавіку 1945 г.

Малодшы з братоў, Уладзімір, 1925 г. нараджэння, скончыў 9 класаў. Пасля вызвалення вёскі Заліп'е ад немцаў працаваў у калгаснай бухгалтэрыі рахункаводам. Закончыў Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум, затым Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Займаў пасады інжынера-меліяратара спачатку ў Добрушы, потым у Гомельскім трэсце «Меліяратар». Жыве ў Гомелі.

Сястра Ніна дала яму такую характарыстыку: «працаўнік-брыльянт». Пацвердзіць гэта могуць і землякі з вёскі Заліп'е, якія ведаюць яго. Ніколі ніхто з іх не пачуў ад гэтага чалавека дрэннага, зняважлівага ці брыдкага слова.

Ужо няма ў жывых старэйшых дачок П.Г.Жосткіна — Таццяны і Еўдакіі. Таццяна ўвесь час працавала ў сваёй вёсцы на зямлі. Прайшла курсы краўчых, шыла сям'і адзенне. Еўдакія, 1912 г. нараджэння, закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працавала настаўніцай у Навабеліцкай сярэдняй школе, там яна жыла і памерла ў канцы 1995 г.

На бацькоўскім двары ў Заліп'і засталася самая малодшая ў сям'і — Раіса, якая нарадзілася ў 1927 г. Пасля вайны яна скончыла школу медсясцёр. Працавала ў бальніцы ў Гомелі, пакуль не выйшла на пенсію.

За што ж забілі бацьку такіх дзяцей? Няма адказу...

Вернутыя імёны

Ахвяры масавых палітычных рэпрэсій

АЗДЗЕЛІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АЗДЗЕЛІНА

БАРАНАЎ Мікіта Андрэевіч, н. у 1883. Вартаўнік. Пражываў у г.Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1941. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

КУНІН Марк Уладзіміравіч, н. у 1906. Вайсковы інжынер. Удзельнік ВАВ. Рэпрэсіраваны ў 1942. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у лагеры ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

КУРЫЦКАЯ Афанасія Архіпаўна, н. у 1918. Пражывала ў в. Рагі. Калгасніца. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1993.

МАНЧАНКОЎ Андрэй Мартынавіч, н. у 1881. Пражываў у г. Гомель. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ФІЛІМОНЦАЎ Павел Іванавіч, н. у 1884. Цясляр. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ШЫТАЎ Мацвей Аўрамавіч, н. у 1891. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Пакаранне адбываў у Хабараўскім краі. Вызвалены ў 1944. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЧАРБАКОЎ Дзям'ян Пракопавіч, н. у 1899. Калгаснік. Пражываў у пас. Прыволле Буда-Кашалёўскага раёна. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Пакаранне адбываў у Камсамольску-на-Амуры. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА РАГІ

ГРЫШАЕЎ Трафім Іосіфавіч, н. у 1902. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

КУРЫЦКІ Мікалай Фролавіч, н. у 1903. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1960.

ПЕТРАЧЭНКА Сямён Назаравіч, н. у 1913. Калгаснік. Асуджаны да 6 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Вызвалены ў 1949. Рэабілітаваны ў 1992.

ТУЗАЎ Павел Іванавіч, н. у 1882. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

БАБОВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАБОВІЧЫ

БАНДАРЭНКА Іван Аляксеевіч, н. у 1912. Радавы 305 СП. Рэпрэсіраваны 12.5.1942. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 18.5.1942. Рэабілітаваны ў 1981.

ВАЙЦЯШОНАК Дзмітрый Ігнатавіч, н. у 1891. Настаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ГОПАЎ Гаўрыла Міхайлавіч, н. у 1873. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КУЛІНКІН Васіль Андрэевіч, н. у 1884. Селянін. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

КУЛІНКІН Кірыла Іванавіч, н. у 1874. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1941. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 16.7.1941. Рэабілітаваны ў 1941.

МАЙСЕЕНКА Сцяпан Сяргеевіч, н. у 1895. Пражываў у г.Гомель. Качагар. Рэпрэсіраваны 29.10.1937. Памёр у турме 12.10.1938. Рэабілітаваны ў 1958.

ХІМАКОЎ Васіль Паладзьевіч, н. у 1900. Брыгадзір паравознага дэпо. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 15 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЫЛАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1880. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЦЫКУНЫ

АБРАМОВІЧ Ігнат Максімавіч, н. у 1873. Пражываў у п. Добры Лоеўскага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

БАЛЬШАВІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

РАБОЧЫ ПАСЁЛАК БАЛЬШАВІК

ДУШЭЎСКІ Эміль Іванавіч, н. у 1904. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРПАЎ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1871. Галоўны механік. Рэпрэсіраваны 30.12. 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.1.1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1957.

СКАКОЎСКІ Сымон Антонавіч, н. у 1913. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

В.П.Хімакоў.

СЫС Іосіф Канстанцінавіч, н. у 1894. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ФІДЭЛЬСКІ Іван Пятровіч, н. у 1899. Рэпрэсіраваны 30.12.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.1.1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1957.

ШАПОЦЬКА Якаў Яўгенавіч. Пражываў на станцыі Касцюкоўка. Начальнік чыгуначнага транспартнага завода «Бальшавік». Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1958.

ГЛЫБОЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГЛЫБОЦКАЕ

ГЕРАСІМЕНКА Дзяніс Фёдаравіч, н. у 1878. Пражываў у в. Н.Барсукі Рэчыцкага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1991.

ДУДАРАЎ Арцём Лукіч, н. у 1881. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЛУЦКОЎ Дзмітрый Парфенавіч (Парфіравіч), н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛУЦКОЎ Мікалай Нічыпаравіч, н. у 1912. Настаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЛЮБІЧ Фёдар Аляксеевіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

МЯКІННІКАЎ Іосіф Паўлавіч, н. у 1887. Настаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ПАЗНЯКОЎ Якаў Сідаравіч, н. у 1882. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ПРЫХОДЗЬКА Ціхан Ільіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 1 года зняволення. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАБАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРАБАЎКА

АФОНЧАНКА Мікалай Максімавіч, н. у 1892. Аб'ездчык Маркавіцкага лесаўчастка. Рэпрэсіраваны 20.1.1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1957.

БАШЛАКОЎ Васіль Маркавіч, н. у 1888. Рабочы станцыі Церуха. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1957.

БАШЛАКОЎ Мартын Канстанцінавіч, н. у 1880. Пражываў ў в. Сівец Церахоўскага р-на. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

БАШЛАКОЎ Павел Ягоравіч, н. у 1897. Муляр. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

БАШЛАКОЎ Фёдар Яфімавіч, н. у 1899. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1957.

БАШЛАКОЎ Якаў Нічыпаравіч, н. у 1895. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАЛЬЧАНКА Філімон Мінавіч, н. у 1884. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Атрымаў 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛУКАШОЎ Іван Ціханавіч, н. у 1908. Каваль. Рэпрэсіраваны ў 1941. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ПАПКОЎ Емяльян Міхайлавіч, н. у 1887. Калгаснік. Пражываў у п. Сівец Церахоўскага р-на. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.1.1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1958.

ПАПКОЎ Міна Гаўрылавіч, н. у 1888. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1966.

СТАРОСЦЕНКА Ціхан Кузьміч, н. у 1899. Настаўнік. Рэпрэсіраваны 6.8.1941. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.8.1941.

ТКАЧОЎ Тарас Калінавіч, н. у 1872. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961.

ЯНЧАНКА Гаўрыла Сямёнавіч, н. у 1878. Пражываў у п. Баштан. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЁСКА ПЯСОЧНАЯ БУДА

БАНДАРЭНКА Дзмітрый Фролавіч, н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРАНАЎ Рыгор Майсеевіч, н. у 1903. Старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРОЎКІН Павел Кузьміч, н. у 1917. Слесар. Пражываў у Навабеліцы. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1965.

КАЗЛОЎ Парфірый Іванавіч, н. у 1865. Вартаўнік. Пражываў у г. Гомель. Раскулачаны і высланы ў 1929. Арыштаваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1979.

КІР'ЯНАЎ Фёдар Аўдзеевіч, н. у 1880. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

КРАЎЦОЎ Іван Пятровіч, н. у 1903. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КРАЎЦОЎ Пётр Фролавіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗЕЧНЫ Максім Пятровіч, н. у 1899. Селянін-

аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МУЗЫКІН Навум Дзянісавіч, н. у 1894. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў умоўна. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЛІПЕНКА Еўдакія Рыгораўна, н. у 1877. Пражывала ў в. Церуха, Сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1933. Выслана на Поўнач на 3 гады. Рэабілітавана ў 1989.

ПЫТЫЛЁЎ Майсей Іванавіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

САМУСЕЎ Пётр Раманавіч, н. у 1897. Рахункавод калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў умоўна. Рэабілітаваны ў 1989.

ШКАНДЫБА Іосіф Паўлавіч, н. у 1902. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1990.

ШПАНЬКОЎ Пётр Іванавіч, н. у 1917. Слесар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Пакаранне адбываў у Карагандзе. Рэабілітаваны ў 1963.

ЯЎМЕНЕНКА Пелагея Мітрафанаўна, н. у 1892. Сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1930. Асуджана да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Пакаранне адбывала ў Карагандзе. Вызвалена ў 1934. Рэабілітавана ў 1989.

ВЁСКА ХУТАРАНКА

АЛЯКСЕЕНКА Карней Платонавіч, н. у 1863. Пражываў у Навабеліцы. Дворнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЯКСЕЕНКА Фёдар Іванавіч, н. у 1877. Пражываў у п. Каралін. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАДСАСОННЫ Мацвей Апанасавіч, н. у 1882. Рабочы. Пражываў у п. Каралін. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІМАФЕЕЎ Яўстафій Мітрафанавіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАВЫДАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ДАВЫДАЎКА

АЗЯЎЧЫКАЎ Пётр Яўсеевіч, н. у 1910. Слесар-механік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

АЗЯЎЧЫКАЎ Сямён Фёдаравіч, н. у 1891. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1965.

АЗЯЎЧЫКАЎ Якаў Ісаевіч, н. у 1892. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1965.

АЗЯЎЧЫКАЎ Яўсей Цітавіч, н. у 1887. Конюх. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1959.

ПАНЬКОВА Лідзія Данілаўна, н. у 1923. Пражывала ў г. Гомель. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1993.

ПАНЬКОЎ Іван Пятровіч, н. у 1896. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

ПАНЬКОЎ Мікалай Мікітавіч, н. у 1886. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1965.

ВЁСКА САСНОЎКА

МАРОЗАЎ Ілья Іванавіч, н. у 1892. Радавы. Рэпрэсіраваны ў 1942. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

МАРОЗАЎ Пётр Карлавіч, н. у 1895. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1941. Рэабілітаваны ў 1964.

ВЁСКА УЗА

ДЗЯНІСАЎ Міхаіл Ануфрыевіч, н. у 1871. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1937.

ПРЫХОДЗЬКА Гаўрыла Сямёнавіч, н. у 1862. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ПРЫХОДЗЬКА Сяргей Гаўрылавіч, н. у 1902. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ЦЕРАШКОЎ Антон Васільевіч, н. у 1893. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ДАЎГАЛЕСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ДАЎГАЛЕССЕ

ВЕРАБ'ЁЎ Павел Герасімавіч, н. у 1884. Рэпрэсіраваны ў 1934. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАСЁЛАК БЕЛЫ БЕРАГ

БЫКОЎСКІ Васіль Якаўлевіч, н. у 1875. Вартаўнік. Пражываў у г. Гомель. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у турме ў 1938. Рэабілітаваны ў 1959.

БЫКОЎСКІ Міхаіл Васільевіч, н. у 1909. Рахункавод. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

БЫКОЎСКІ Уладзімір Пятровіч, н. у 1897. Пражываў у в. Васільеўка. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

БЫКОЎСКІ Фёдар Антонавіч, н. у 1875. Пражываў у в. Валкашанская Дуброва Лоеўскага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРЫН Пётр Кузьміч, н. у 1863. Селянін-аднаасобнік. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

ЖАРЫН Якаў Кузьміч, н. у 1860. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

ЖАРЫН Якаў Кузьміч, н. у 1907. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МЯЖЭВІЧ Захар Пятровіч, н. у 1871. Селянін-аднаасобнік. Высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

МЯЖЭВІЧ Лаўрэнцій Іванавіч, н. у 1868. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

МЯЖЭВІЧ Сцяпан Захаравіч, н. у 1910. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

НАВАЛЕТАЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1893. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ФЕЛЬБЕРГ Антон Ігнатавіч, н. у 1882. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1959.

ФЕЛЬБЕРГ Савелій Ігнатавіч, н. у 1890. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ВАСІЛЕВА

ЗОНТАК Карл Антонавіч, н. у 1889. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938 у г. Мінск. Рэабілітаваны ў 1989.

КРУК Рыгор Іванавіч, н. у 1888. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 6.11.1938 у г. Мінск. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛУС Рыгор Фрыцавіч, н. у 1911. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938 у г. Мінску. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА КАРНАЛІН

АБРАМЦОЎ Тарас Канстанцінавіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны двойчы ў 1930 і 1937. Асуджаны да 15 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАЗАНОВІЧ Браніслаў Станіслававіч, н. у 1894. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1959. Рэабілітаваны ў 1989.

БАНДАРЭНКА Ісак Кандратавіч, н. у 1896. Кладаўшчык. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛАВУСАЎ Сяргей Цярэнцьевіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

БЯРНАЦКАЯ Марыя Герасімаўна, н. у 1918. Калгасніца. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край з дзецьмі.

ВЕРАБ'ЁЎ Павел Міхайлавіч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1934. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КВЯТКОЎСКІ Кузьма Пракопавіч. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

НІКІЦЕНКА Антон Аляксандравіч, н. у 1899. Старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАДСАСОННЫ Мацвей Апанасавіч, н. у 1877. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

СЫЧ Стафан Якімавіч, н. у 1896. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1934. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА МІХАЛЬКІ

КАМЯСКОЎ Кузьма Астапавіч, н. у 1900. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КАЎТУНЕНКА Гардзей Пятровіч, н. у 1904. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1964.

КАЎТУНЕНКА Іван Фёдаравіч, н. у 1916. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1964.

КАЎТУНЕНКА Трафім Мартынавіч, н. у 1874. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1964.

КІРЫЕНКА Аляксей Пятровіч, н. у 1896. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1973.

СЛЕПЧАНКА Харытон Сцяпанавіч, н. у 1888. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1964.

СТАЛЯРОЎ Цярэнцій Сцяпанавіч, н. у 1900. Калгаснік. Пражываў на х. Межы. Рэпрэсіраваны 8.2.1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1967.

СТАРАВОЙТАЎ Пётр Пятровіч, н. у 1872. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1964.

СТАРАВОЙТАЎ Пётр Пятровіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІТКОВА Галіна Захараўна, н. у 1920. Медсястра. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1963.

ЦІТКОЎ Дзмітрый Сідаравіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Пражываў на х. Межы. Рэпрэсіраваны двойчы ў 1930 і 1937. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1960.

ЦІТКОЎ Захарый Сідаравіч, н. у 1880. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАСЁЛАК МІРНЫ

БАЛОЦІН Залман Шахнавіч, н. у 1882. Пражываў у г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на Го-

мельскай вобл. Загадчык хлебапякарні. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ВЁСКА СТУКАЧОЎКА

АБРАМЦАЎ Тарас Канстанцінавіч, н. у 1880. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯТЛАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ДЗЯТЛАВІЧЫ

БІБІКАЎ Даніла Філімонавіч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.10.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.10.1937. Рэабілітаваны 30.9.1963.

КАЗАКОЎ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1965. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1963.

ПУГАЧОЎ Анісім Захаравіч, н. у 1872. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1963.

РАНЧУКОЎ Гаўрыла Сямёнавіч, н. у 1878. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 12.10.1937. Расстраляны 27.10.1937. Рэабілітаваны 30.9.1963.

ВЁСКА НОВЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ

БІБІКАЎ Гаўрыла Рыгоравіч, н. у 1873. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Сібір з сям'ёй. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАРЭЛІКАЎ Фёдар Архіпавіч, н. у 1879. Кіраўнік калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Мінск. Рэабілітаваны ў 1989.

КАПАТКОЎ Якаў Філатавіч, н. у 1874. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

КУРНІК Цімафей Томасавіч, н. у 1896. Рэпрэсіраваны 12.10.1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

МАРТЫНЕНКА Сямён Сілавіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Сібір з сям'ёй. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУГАЧОЎ Міхей Захаравіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Высланы на Поўнач на 3 гады ў 1932. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

РАНЧУКОЎ Іван Пракопавіч, н. у 1901. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1963.

РАНЧУКОЎ Мацвей Гаўрылавіч, н. у 1905. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

РАНЧУКОЎ Пракоп Пятровіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

РАНЧУКОЎ Пракоп Пятровіч, н. у 1878. Праживаў у Навабеліцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

Р.Я.Шамраеў.

В.Н.Семенчукоў.

СЕМЕНЧУКОЎ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1901. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

СЕМЕНЧУКОЎ Васіль Яфімавіч, н. у 1921. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

СЕМЕНЧУКОЎ Кірыла Ніканоравіч, н. у 1906. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у лагеры ў 1940. Рэабілітаваны ў 1963.

СУРЫКАЎ Максім Іванавіч, н. у 1896. Селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1960.

ТКАЧОЎ Ціхан Кузьміч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1992.

ШАМРАЕЎ Рыгор Якаўлевіч, н. у 1903. Слесар. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1941. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Вызвалены ў 1951. Рэабілітаваны ў 1960.

ЮРЧАНКА Максім Лаўрэнцьевіч, н. у 1911. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРЧАНКА Панцялей Максімавіч, н. у 1903. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА СТАРЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ

БАГАМОЛАВА Кацярына Давыдаўна, н. у 1896. Калгасніца. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітавана ў 1993.

БАГАМОЛАЎ Цімафей Якаўлевіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Дарафей Цімафеевіч, н. у 1897.

Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1964.

ВОЛКАЎ Захар Астапавіч, н. у 1882. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Лука Цімафеевіч, н. у 1892. Селянін. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Рыгор Ігнатавіч, н. у 1885. Калгаснік. Рэпрэсіраваны двойчы: у 1932 і 1937. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры і 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1867. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Якаў Іванавіч, н. у 1890. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРУШАНАЎ Мітрафан Захаравіч, н. у 1894. Пражываў у в. Дзятлаўка Рэчыцкага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРУШУНОЎ Антон Архіпавіч, н. у 1872. Селянін-аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 да 5 гадоў зняволення. Арыштаваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРУШУНОЎ Марк Сяргеевіч, н. у 1899. Пражываў на ст. Церахоўка. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1990.

ГРУШУНОЎ Міхаіл Антонавіч, н. у 1908. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАБАНАЎ Афанасій Сямёнавіч, н. у 1883. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАБАНАЎ Восіп Дзмітрыевіч, н. у 1898. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАБАНАЎ Іосіф Дзмітрыевіч, н. у 1898. Пражываў у г. Гомель. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАБАНАЎ Мітрафан Сямёнавіч, н. у 1888. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СТРЫЖАКОЎ Лявон Андрэевіч, н. у 1880. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРНОЎ Давід Каленавіч, н. у 1868. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Адбываў пакаранне на Поўначы. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЧКАЛАВА

ГАРНЯКОЎ Гаўрыла Іванавіч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ГУЗАНАЎ Яфім Мітрафанавіч, н. у 1900. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Вызвалены ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАВЫДЗЕНКА Трафім Сяргеевіч, н. у 1892. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1958.

ДЗЯДКОЎ Герман Іванавіч, н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў высылкі. Адбываў пакаранне ў Казахстане. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖОЛУДАЎ Іларыён Ісакавіч, н. у 1903. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖОЛУДАЎ Ісак Міхайлавіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖУКАЎ Павел Іванавіч, н. у 1910. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1990.

ЖЫХАРАЎ Даніла Іларыёнавіч, н. у 1905. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

КАНЦАВЫ Патап Сцяпанавіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРОЛЬ Фядос Палікарпавіч, н. у 1871. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАБАЧОЎ Іван Філатавіч, н. у 1901. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

МАРОЗАЎ Якаў Яфімавіч, н. у 1894. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1964.

ПАРФЯНЦОЎ Фёдар Нічыпаравіч, н. у 1871. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

РАБЦАЎ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1892. Конюх. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Загінуў у 1937. Рэабілітаваны ў 1960.

САВЯНКОЎ Сяргей Іванавіч, н. у 1882. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

САВЯНКОЎ Сяргей Іванавіч, н. у 1886. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3

гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

СУХОЦКІ Барыс Сяргеевіч, н. у 1905. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦУКАРАЎ Адам Іванавіч, н. у 1889. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦУКАРАЎ Ісай Іванавіч, н. у 1872. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦУКАРАЎ Ісак Ісаевіч, н. у 1904. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАПКОЎ Васіль Пятровіч, н. у 1899. Селянін. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.9.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЯБРАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ПАСЁЛАК ГРАЗА

ХАТУЛЁЎ Іван Ягоравіч, н. у 1906. Кандуктар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

ВЁСКА ЗЯБРАЎКА

ДЗЯТЛАЎ Дзмітрый Фёдаравіч, н. у 1872. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1960.

КАВАЛЁЎ Сямён Ільіч, н. у 1892. Пажарнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1943. Рэабілітаваны ў 1960.

КАШАЛАЎ Нічыпар Кандратавіч, н. у 1888. Слесар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Памёр у 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ПАЎЛЮЧКОЎ Аляксандр Пятровіч, н. у 1889. Муляр. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ і 2 гадоў ПП. Пакаранне адбываў у г. Магадан. Вызвалены ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

СЛУЧАНКОЎ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1880. Пражываў у в. Несцераўка Веткаўскага р-на. Хлебароб. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1961.

СЛУЧАНКОЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1860. Пражываў у в. Несцераўка Веткаўскага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1961.

СЛУЧАНКОЎ Ілья Андрэевіч, н. у 1884. Пражываў у в. Несцераўка Веткаўскага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

УЛАСЕНКА Іван Яфрэмавіч, н. у 1906. Сталяр. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1965.

ЯРАШЭНКА Вера Цімафееўна, н. у 1906. Пражывала ў г. Гомель. Рэпрэсіравана ў 1947. Асуджана да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалена ў 1952. Рэабілітавана ў 1960.

ВЁСКА КАНТАКУЗАЎКА

ВІНАКУРАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1887. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

КРАЎЦОЎ Міхаіл Захаравіч, н. у 1896. Токар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

КРАЎЦОЎ Піліп Малахавіч, н. у 1898. Сцэпшчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

КРАЎЦОЎ Раман Макаравіч, н. у 1900. Тэхнічны канторшчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

КРАЎЦОЎ Сцяпан Захаравіч, н. у 1885. Каваль. Рэпрэсіраваны 19.10.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ЛАЗБЕКІН Георгій Нікіціч, н. у 1889. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ЛАЗБЕКІН Іван Лявонцьевіч, н. у 1912. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗБЕКІН Іван Трафімавіч, н. у 1885. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1937.

ЛАЗБЕКІН Лявон Трафімавіч, н. у 1883. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗБЕКІН Пётр Мікітавіч, н. у 1882. Ляснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗБЕКІН Рыгор Трафімавіч, н. у 1888. Пражываў у г. Гомель. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МАРЖАНАЎ Кірыла, н. у 1901. Сталяр. Рэпрэсіраваны 19.10.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

МАРЖАНАЎ Нічыпар Аўксенцьевіч, н. у 1883. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ХАЛЮКОЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1892. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЦЕЛЯШОЎСКАЯ РУДНЯ

ЛЯСНЕЎСКІ Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1896. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОЎ Пётр Рыгоравіч, н. у 1875. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЯЛУШКІН Ісак Максімавіч, н. у 1900. Пражываў у п. Фашчаўка Уваравіцкага р-на. Рахункавод. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРНЯЎСКІ Рыгор Пятровіч, н. у 1900. Пражываў у в. Казанаўка Рэчыцкага р-на. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1958.

ВЁСКА ЦЕЛЯШЫ

ГАРАЕЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАМЯШКЕВІЧ Барыс Венядзіктавіч, н. у 1873. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1956.

ГРАМЯШКЕВІЧ Феакціст Сцяпанавіч, н. у 1879. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ДЖАСАЎ Пётр Кузьміч, н. у 1894. Пражываў у в. Зялёныя Лукі Уваравіцкага р-на. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1939. Асуджаны да 8 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1990.

ДУБРОЎСКІ Лазар Сямёнавіч, н. у 1893. Старшыня Целяшоўскага сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

МАСЛЮКОЎ Гардзей Мікалаевіч, н. у 1899. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1949. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

МЕЛЬНІКАЎ Дзямід Купрыянавіч, н. у 1878. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

МЕЛЬНІКАЎ Каленік Купрыянавіч, н. у 1878. Пражываў у в. Пераход Уваравіцкага р-на. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

НЕДАБОЕЎ Андрэй Барысавіч, н. у 1892. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЛАЙЧЭЎСКІ Фядос Іванавіч, н. у 1904. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ТОЦІКАЎ Канстанцін Іванавіч, н. у 1891. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ТОЦІКАЎ Пётр Іванавіч, н. у 1885. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТРЫФАНАЎ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1896. Пражываў у г. Рэчыца. Статыстык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ЦЯРУХСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КРАЎЦОЎКА

АЛЕНЧЫК Фядот Іванавіч, н. у 1867. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

АЛЕНЧЫКАЎ Сямён Фядотавіч, н. у 1901. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны ў 1961.

АНОХАЎ Нічыпар Антонавіч, н. у 1899. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

ДУБАДЗЕЛАЎ Купрыян Іванавіч, н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ДУБАДЗЕЛАЎ Пётр Раманавіч, н. у 1890. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ЖУКАЎ Фёдар Гаўрылавіч, н. у 1898. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

КАЖАМЯКІН Міхаіл Піліпавіч, н. у 1893. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

КРАЎЦОЎ Сяргей Данілавіч, н. у 1923. Вучань 6-га класа. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАПЕКА Ягор Антонавіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

МАРОЗАЎ Кузьма Гаўрылавіч, н. у 1894. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

СВІРЫДЗЕНКА Трафім Сцяпанавіч, н. у 1882. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

СІМАНЧУК Іосіф Рыгоравіч, н. у 1914. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1946. Рэабілітаваны ў 1958.

СІМАНЧУК Пімен Гаўрылавіч, н. у 1867. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

СІМАНЧУК Сяргей Самойлавіч, н. у 1896. Рахункавод. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

СЯДОЙ Анісім Паўлавіч, н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

ПАСЁЛАК КУСТАРНЫ

СТАРАВОЙТАЎ Антон Паўлавіч, н. у 1897. Сталяр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ВЁСКА СТУДЗЁНАЯ ГУТА

КАВАЛЕНКА Феафан Аляксеевіч, н. у 1883. Пражываў у Навабеліцы. Возчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Праз 3 гады вызвалены. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРАТКОЎ Лявон Архіпавіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1941. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1990.

КУЦЕКА Дзям'ян Якаўлевіч, н. у 1875. Селянін. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ЦІМАШЭНКА Васіль Майсеевіч, н. у 1909. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІМАШЭНКА Яўхім Фядосавіч, н. у 1874. Пражываў у г. Гомель. Стрэлачнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯНДОЎСКІ Міхаіл Самойлавіч, н. у 1889. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА СЯМЁНАЎКА

КАРЭБА Дзямід Максімавіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1961.

РЭПІКАЎ Іван Дарафеевіч, н. у 1894. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 5 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1990.

РЭПІКАЎ Самуіл Тарасавіч, н. у 1904. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

СТОЛЬНІКАВА Марыя Міхайлаўна, н. у 1902. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1945. Асуджана да 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1993.

ВЁСКА ЦЕРУХА

БЛІНЦОЎ Захар Сямёнавіч, н. у 1890. Калгаснік. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ВАРАНКОЎ Нічыпар Яўстратавіч, н. у 1892. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОІНАЎ Фёдар Піменавіч, н. у 1883. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЕРАСІМАЎ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1898. Пражываў у п. Рубеж. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГНІДЗІН Васіль Адамавіч, н. у 1897. Качагар. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

ГНІДЗІН Захар Венядзіктавіч, н. у 1895. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЕРМАКОЎ Мітрафан Сямёнавіч, н. у 1877. Старшыня сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на Поўнач на 3 гады.

ЕРМАКОЎ Нікадзім Варфаламеевіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЕРМАКОЎ Пімен Іванавіч, н. у 1889. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1961.

ЖУКОЎСКІ Пётр Лаўрэнцьевіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1992.

ЗЯНЬКОЎ Андрэй Аўдзеевіч, н. у 1895. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЯНЬКОЎ Карл Ціханавіч, н. у 1901. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЯНЬКОЎ Ціхан Аўдзеевіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1992.

КРОТАЎ Яфрэм Міхайлавіч, н. у 1906. Старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Вызвалены ў 1934. Рэабілітаваны ў 1989.

КРУМКАЧОЎ Дзяніс Самуілавіч, н. у 1896. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МІНАЎ Аляксей Логвінавіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938 у турме. Рэабілітаваны ў 1989.

МІНКОЎ Якаў Аляксеевіч, н. у 1911. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на 3 гады на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Міна Сцяпанавіч, н. у 1875. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1961.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Раман Пятровіч, н. у 1871. Селянін. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1973.

ПІМАХАЎ Купрыян Якаўлевіч, н. у 1903. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУШКА Іван Яўхімавіч, н. у 1894. Калгаснік. Арыштаваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў пазбаўлення волі. Арыштаваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУШКА Павел Яўхімавіч, н. у 1906. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

СІБІРАКОЎ Нікан Захаравіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны ў 1991.

СІБІРАКОЎ Нічыпар Захаравіч, н. у 1894. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

СТАРАВОЙТАЎ Антон Паўлавіч, н. у 1897. Пражываў у п. Кустарны. Пажарнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

СЫЧОВА Ганна Макараўна, н. у 1893. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1937. Асуджана да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалена ў 1943. Рэабілітавана ў 1962.

СЫЧОЎ Еўдакім Макаравіч, н. у 1875. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1961.

ХАЛЯПІНА Марыя Мікалаеўна, н. у 1880. Рэпрэсіравана ў 1937. Асуджана да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалена ў 1944. Рэабілітавана ў 1962.

ШАЎЦОЎ Фама Парфенавіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШКРАБКОЎ Архіп Ісаевіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯШЭНКА Архіп Пятровіч, н. у 1889. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЯРЭНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ІВАНАЎКА

КІЗЕЕЎ Радзівон Філіпавіч, н. у 1898. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАШКЕВІЧ Дзяніс Васільевіч, н. у 1885. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МІРОНЕНКА Рыгор Фаміч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

МІРОНЕНКА Рыгор Фаміч, н. у 1878. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

УЗДОЎСКІ Аўгусцін Адамавіч, н. у 1897.

А.М.Клімовіч.

Паліроўшчык шклозавода. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937 у г. Віцебск. Рэабілітаваны ў 1988.

ШАЙКОЎ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙКОЎ Навум Іванавіч, н. у 1873. Селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Малінаўка. Арыштаваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАСЁЛАК ПРАСВЕТ

ВОІНАЎ Мітрафан Максімавіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАРХОМЕНКА Яўціхій Фаміч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЯРЭШКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АЛЬХОЎКА

КАРЛОЎСКІ Піліп Цімафеевіч, н. у 1892. Настаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

КАРЭБА Лазар Раманавіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУГАЕЎ Мікіта Цімафеевіч, н. у 1888. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАСЁЛАК КАЛІНІНА

БУРАНКОЎ Яўген Іванавіч, н. у 1905. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЁСКА НОВАЯ БУХАЛАЎКА

КЛІМОВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1901. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1963.

ВЁСКА НОВЫЯ ЦЯРЭШКАВІЧЫ

ВІНЧА Андрэй Казіміравіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

ВІНЧА Андрэй Казіміравіч, н. у 1877. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

ГАЛКОЎСКІ Аляксандр Афанасьевіч, н. у 1902. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛКОЎСКІ Макар Рыгоравіч, н. у 1879. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1937. Рэабілітаваны ў 1988.

ГАЛКОЎСКІ Макар Рыгоравіч, н. у 1880. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ГАЛКОЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

ГАЛКОЎСКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1876. Селянін-аднаасобнік. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ДАБРАВОЛЬСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1897. Селянін. Конюх. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1971.

ДАБРАВОЛЬСКІ Сямён Рыгоравіч, н. у 1887. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КЛІМОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1878. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Высланы ў Казахстан ў 1933. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Васіль Акімавіч, н. у 1880. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Іван Нічыпаравіч, н. у 1892. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Мартын Пятровіч, н. у 1881. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Мартын Фокавіч, н. у 1878. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Павел Васільевіч, н. у 1884. Селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 20 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1890. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1937. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1894. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

КЛІМОВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1888. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1937. Рэабілітаваны ў 1988.

КЛІМОВІЧ Сямён Міхайлавіч, н. у 1870. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

КРАЦЯНКОЎ Аксён Сілавіч, н. у 1872. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

СЕРАФІМОВІЧ Васіль Пятровіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

ВЁСКА СКІТОК

КОЗЫРАЎ Фама Фролавіч, н. у 1876. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЦЯРЭШКАВІЧЫ

БАРТНОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1901. Пражываў у г. Гомель. Арыштаваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ і 2 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1991.

БАРТНОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1901. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРТНОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1904. Пражываў у в. Новая Бухалаўка. Старшыня сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1945. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1949. Рэабілітаваны ў 1963.

БАРТНОЎСКІ Пётр Піліпавіч, н. у 1886. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942 у лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРТНОЎСКІ Пётр Піліпавіч, н. у 1884. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРТНОЎСКІ Сцяпан Пятровіч, н. у 1873. Пражываў у в. Уборкі Лоеўскага р-на. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІНЧ Мікалай Казіміравіч, н. у 1873. Селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Старая Бухалаўка. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 15.12.1937 у турме ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛКОЎСКІ Афанасій Канстанцінавіч, н. у 1875. Селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Новыя Цярэшкавічы. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГОЛУБЕВА Сцепаніда Рыгораўна, н. у 1875. Пражывала ў г. Гомель. Рэпрэсіравана ў 1937. Прыгаворана да ВМП. Расстраляна 1.11.1937 у г. Гомель. Рэабілітавана ў 1988.

КЛІМОВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1901. Маёр. Рэпрэсіраваны ў 1938. Расстраляны ў 1938 у г. Усурыйск Прыморскага края. Рэабілітаваны ў 1957.

КРАЎЗЕ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1897. Радавы. Рэпрэсіраваны ў 1944. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1953. Рэабілітаваны ў 1965.

ПЛЕСКІ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1912. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

СУЛІВОНСКІ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1881. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ФЁДАРАЎКА

АСТАПЕНКА Ігнат Піліпавіч, н. у 1882. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1941. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 2.8.1941. Рэабілітаваны ў 1991.

ЧАРАЦЯНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БУДЗІШЧА

БАРАВІЦКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1911. Трактарыст. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 7 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1971.

БАРАВІЦКІ Ціхан Іларыёнавіч, н. у 1894. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Высланы ў Казахстан у 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРОТЧЫК Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1900. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1934. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗАВЕНКА Фёдар Ігнатавіч, н. у 1886. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗАВЕНКА Яфім Якаўлевіч, н. у 1910. Радыст-кадзіроўшчык авіяпалка. Рэпрэсіраваны ў 1943. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Вызвалены ў 1953. Рэабілітаваны ў 1963.

ЦІМАШЭНКА Лука Фёдаравіч, н. у 1915. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 4 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ШАЎШУКОЎ Ілья Гаўрылавіч, н. у 1913. Пражываў у г. Гомель. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1952. Высланы на пасяленне ў Карагандзінскую вобл. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЎШУНОЎ Мікіта Гаўрылавіч, н. у 1909. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЎШУНОЎ Нічыпар Фёдаравіч, н. у 1912. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЎШУНОЎ Фёдар Міронавіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫШКОЎСКІ Мартын Антонавіч, н. у 1883. Пражываў у в. Давыдаўка. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1992.

ВЁСКА ЗАЙМІШЧА

ВАСІЛЕНКА Дзмітрый Рыгоравіч, н. у 1886. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗУНОВА Марыя Мікітаўна, н. у 1911. Калгасніца. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1993.

ПРЫХОДЧАНКА Павел Раманавіч, н. у 1910. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на 5 гадоў у Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

РАБЦАЎ Фядос Карпавіч, н. у 1883. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА МАКАЎЕ

КАВАЛЁЎ Захар Васільевіч, н. у 1904. Пражываў у г. Гомель. Старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1941. Асуджаны да 10 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1957.

КНЯЗЕЎ Майсей Васільевіч, н. у 1890. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЗАРЭНКА Павел Пятровіч, н. у 1890. Пражываў у в. Мадоры Рагачоўскага р-на. Ветэрынарны фельчар. Рэпрэсіраваны ў 1950. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Вызвалены ў 1955. Рэабілітаваны ў 1991.

НАВУМЕНКА Пелагея Іванаўна, н. у 1920. Рабочая. Пражывала ў г. Гомель. Рэпрэсіравана ў 1945. Асуджана да 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1992.

НАВУМЕНКА Сяргей Міхайлавіч, н. у 1906. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

САВАЧКІН Іларыён Уласавіч, н. у 1904. Пражываў у г. Гомель. Галоўны механік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СТАРОСЦЕНКА Міхаіл Мітрафанавіч, н. у 1904. Пражываў у в. Гардуны Добрушскага р-на. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Памёр у 1942 у лагеры. Рэабілітаваны ў 1991.

ВЁСКА ПРАКОПАЎКА

БАРАНАЎ Дзяніс Міхайлавіч, н. у 1885. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

БАРАНАЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1860. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

БАРАНАЎ Ціхан Міхайлавіч, н. у 1902. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

КАВАЛЁЎ Ігнат Пятровіч, н. у 1896. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на 5 гадоў у Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

РАБЦАЎ Фёдар Нічыпаравіч, н. у 1908. Наборшчык газеты. Рэпрэсіраваны ў 1932. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ШКЛЯРАЎ Пётр Ермалаевіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1988.

ПАСЁЛАК ЧАПЛІН

МАДЖАРА Іван Кірылавіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1940. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЧАРАЦЯНКА

БЯЛЯЕЎ Васіль Яфімавіч, н. у 1877. Пражываў у г. Гомель. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1937. Высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1961.

ВАСІЛЕВІЧ Сяргей Паўлавіч, н. у 1894. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1962.

ЗЮЛЬ Дзмітрый Іларыёнавіч, н. у 1882. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ЗЮЛЬ-ВАЙТАВЕЦКІ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1902. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ІВАНЧЫКАЎ Якаў Дзянісавіч, н. у 1882. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ІСАЙЧЫК Еўдакім Іванавіч, н. у 1879. Возчык. Рэпрэсіраваны ў 1942. Асуджаны да 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1989.

НАВУМЕНКА Яўгенія Васільеўна, н. у 1893. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1945. Выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1992.

ПАШКЕВІЧ Захар Васільевіч, н. у 1877. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1988.

САЛОДКІ Іван Ціханавіч, н. у 1891. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

ЧОНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА СЕЎРУКІ

АЛЯКСЕЕНКА Даніла Мікітавіч, н. у 1908. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

ЗОРЫН Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1901. Бухгалтар. Пражываў у г. Гомель. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1988.

СТАЛЯРОЎ Фядос Сцяпанавіч, н. у 1874. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1992.

ФУРСЕЕЎ Максім Іванавіч, н. у 1897. Пражываў у в. Чонкі. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЁСКА ЧОНКІ

ПІСАРЭНКА Рыгор Фрызанавіч, н. у 1904. Пажарнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 4 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1990.

ШАРПІЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ШАРПІЛАЎКА

АФАНАСЬЕЎ Іван Іванавіч, н. у 1908. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1967.

АФАНАСЬЕЎ Карней Кузьміч, н. у 1883. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942 у лагеры. Рэабілітаваны ў 1967.

ГОРЛЕНКА Мікалай Патапавіч, н. у 1885. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1966.

ГОРЛЕНКА Цімафей Мікалаевіч, н. у 1912. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны ў 1966.

МАСКВІЧОЎ Піліп Фядотавіч, н. у 1902. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1967.

МАСКВІЧОЎ Фядот Савельевіч, н. у 1883. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАРФЁНАЎ Парфен Ігнатавіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў зняволення ў канцэнтрацыйным лагеры. Рэабілітаваны ў 1990.

РАБЧАНКА Васіль Іванавіч, н. у 1904. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1950. Асуджаны да 25 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Вызвалены ў 1954. Рэабілітаваны ў 1969.

РАЕЎСКІ Сцяпан Васільевіч, н. у 1905. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1938. Рэабілітаваны ў 1966.

ШЧАРБАКОЎ Ігнат Гардзеевіч, н. у 1877. Пражываў у г. Гомель. Шкіпер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 6 гадоў зняволення ў ППЛ.

ШЧАРБАКОЎ Мікалай Ігнатавіч, н. у 1904. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Высланы ў г. Рыбінск. Рэабілітаваны ў 1965.

ХАЛУПАЎ Якаў Піліпавіч, н. у 1897. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРОМІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ПАСЁЛАК ВІШАНСКІ

ВАЛЬДЗІН Іван Іванавіч, н. у 1885. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 6 гадоў зняволення ў ППЛ і 4 гадоў ПП. Памёр у 1940 у лагеры. Рэабілітаваны ў 1960.

ВЁСКА КАСЦЮКОЎКА

БЛІННІКАЎ Фама Іванавіч, н. у 1889. Рабочы шклозавода. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БУДНІКАЎ Сяргей Васільевіч, н. у 1887. Рабочы шклозавода. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Памёр у 1942. Рэабілітаваны ў 1960.

БУДНІКАЎ Фёдар Васільевіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ГАЎРЫЛЕНКА Платон Мікалаевіч, н. у 1879. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ГУНЬКО Якаў Андрэевіч, н. у 1897. Шкловыдзімальшчык. Рэпрэсіраваны ў 1942. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1942 у турме. Рэабілітаваны ў 1989.

ДВАРЭЦКІ Сяргей Сямёнавіч, н. у 1899. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

ДЗЮБКІН Сяргей Аляксандравіч, н. у 1926. Чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны ў 1945. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Вызвалены ў 1954. Рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЯТЛАЎ Іларыён Рыгоравіч, н. у 1885. Штампоўшчык шклозавода. Рэпрэсіраваны ў 1985. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ЖЫГУНОЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1899. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

КАЗЛОЎ Фёдар Якаўлевіч, н. у 1903. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 4 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

КАЛЕНЧЫКАЎ Фёдар Цітавіч, н. у 1895. Грузчык. Рэпрэсіраваны ў 1938. Асуджаны да 8 гадоў ППЛ і 5 гадоў ПП. Памёр у 1942 у лагеры. Рэабілітаваны ў 1960.

МАЗУРОНАК Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1884. Рахункавод. Рэпрэсіраваны ў 1935. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1961.

НЕСЦЯРОВІЧ Сцяпан Данілавіч, н. у 1888. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1935. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1935.

ПАДНОСАЎ Канстанцін Мікалаевіч, н. у 1880. Возчык. Рэпрэсіраваны ў 1935. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1961.

ПЕТРУЛЁЎ Сямён Максімавіч, н. у 1906. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ПЕТРЫЧЭНКА Андрэй Трафімавіч, н. у 1910. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1883. Водаагляднчык. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ФЕДАСЕЕНКА Іван Гаўрылавіч, н. у 1895. Слесар. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ФЕДАСЕЕНКА Пётр Якаўлевіч, н. у 1897. Кухар. Рэпрэсіраваны ў 1935. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1961.

ХІДКОК Антон Людвігавіч, н. у 1899. Возчык. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЧАРБАКОЎ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ.

ВЁСКА ЯРОМІНА

БАГДАНАЎ Барыс Валянцінавіч, н. у 1892. Муляр. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 8 гадоў зняволення ў ППЛ і 4 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1991.

БЛЯСКІН Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1905. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1940. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гадоў ПП. Рэабілітаваны ў 1990.

БУДЗЬКО Трафім Міхайлавіч, н. у 1891. Цясляр. Рэпрэсіраваны ў 1935. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

БЯРОЗКІН Анатоль Ільіч, н. у 1887. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛЬСКАЯ Ефрасіння Рыгораўна, н. у 1899. Сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1929. Выслана ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1992.

ДЗЁМКІН Павел Карпавіч, н. у 1912. Пражываў у г. Гомель. Эканаміст. Рэпрэсіраваны 23.7.1941. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.8.1941. Рэабілітаваны ў 1991.

ІВАНЕНКА Іван Васільевіч, н. у 1887. Калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1989.

КУЛЯШОЎ Іван Макаравіч, н. у 1898. Агляднчык вагонаў. Рэпрэсіраваны ў 1936. Асуджаны да 2 гадоў зняволення ў ППЛ і 1 года ПП. Рэабілітаваны ў 1992.

ЛЫСЫ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1891. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

МЯРКУЛАЎ Даніла Іванавіч, н. у 1876. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны ў 1960.

НЯТЫЛЬКІН Андрэй Іванавіч, н. у 1888. Вартаўнік. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1989.

НЯТЫЛЬКІНА Ульяна Іванаўна, н. у 1900. Сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1937. Асуджана да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана ў 1973.

ПАЛІТУПАЎ Іван Нічыпаравіч, н. у 1883. Машыніст. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1973.

ПАЎЛЮЧКОЎ Рыгор Ігнатавіч, н. у 1888. Возчык. Рэпрэсіраваны 5.10.1937. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.10.1937 у г. Гомель. Рэабілітаваны ў 1967.

ПАЎЛЮЧКОЎ Яфрэм Іванавіч, н. у 1906. Бухгалтар. Рэпрэсіраваны ў 1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАШЭДА Васіль Пятровіч, н. у 1919. Чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны ў 1942. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1952. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАШЭДА Пётр Рыгоравіч, н. у 1895. Абпальшчык шклозавода. Рэпрэсіраваны ў 1938. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1959.

СЕРДЗЮКОВА Марыя Захараўна, н. у 1908. Пражывала ў г. Гомель. Выслана на 5 гадоў. Рэабілітавана ў 1992.

СЯРКОЎ Павел Лукіч, н. у 1875. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1929. Рэабілітаваны ў 1992.

ХАЎРОЦІН Кузьма Васільевіч, н. у 1904. Аўтамеханік. Пражываў у г. Мазыр. Рэпрэсіраваны ў 1949. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў ПП. Вызвалены ў 1954. Рэабілітаваны ў 1965.

ВЯЗНЯМ ГУЛАГА

Клаўдзія Лукінічна,
Тонкі цень ГУЛага,
З чым прыйшла да фінішу?
З горыччу і страхам?
Калыма далёкая —
Ад снягоў аслепнуць.
Палятала сокалам
Над шырокім стэпам.
«Эй, гармоніка мая,
Дзеўка дураслівая,
Ці была ці не была
Я ў жыцці шчасліваю?»
Праўда дзе, а дзе мана?
З чым ісці да Бога?
І пайшла, пайшла яна
Горкаю дарогай...
Лёс, як дым, хіснецца.
Плакаць слёз няма.
Выстудзіла сэрца
Лютая зіма.
Ні душы навокал.
Колькі год адна.
Калыма далёкая
Бачыцца з акна...

Міхась Башлакоў.

1941

1945

ШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У першыя дні

22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія без аб'яўлення вайны і прад'яўлення якіх-небудзь прэтэнзій, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзенні, раптоўна напала на СССР. Для народаў Савецкага Саюза пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая па сваіх маштабах, жорсткасці, чалавечых ахвярах і матэрыяльных стратах не мела сабе роўных.

Палітычнае і ваеннае кіраўніцтва Германіі, кіруючыся дактрынай «маланкавай вайны», разлічвала знянацку нанесці магутныя рассякаючыя ўдары буйнымі танкавымі і матарызаванымі сіламі, акружыць і знішчыць галоўныя сілы Чырвонай Арміі, выйсці на лінію Архангельск — Волга і за 1,5 — 2 месяцы пераможна закончыць вайну.

На тэрыторыі Беларусі наступала нямецкая група армій «Цэнтр» у складзе 4-й і 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп, усяго 50 дывізій (у тым ліку 15 танкавых і матарызаваных) і 2 матарызаваныя брыгады. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот — 1600 баявых самалётаў.

Стварыўшы на асноўным напрамку трайную, а ў некаторых месцах амаль пяцікратную перавагу, узброеныя сілы фашысцкай Германіі паставілі ў цяжкае становішча савецкія войскі.

Пачатак ваенных дзеянняў для войск Заходняй асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. Заходняга фронту) разгортваліся трагічна. Ведучы абарончыя баі, яны пад націскам намнога большых сіл праціўніка вымушаны былі адступаць. Абарона насіла ачаговы характар. Часці прыкрыцця ўступалі ў бой разрознена і неарганізавана. Паблізу напрамкаў галоўных удараў ворага не было моцных рэзерваў. Адсутнасць суцэльнага фронту давала магчымасць танкавым і матарызаваным злучэнням вермахта абыходзіць вузлы супраціўлення нашых войскаў і наносіць удары ў флангі і з тылу. У выніку гэтага часці і злучэнні Чырвонай Арміі ў шэрагу выпадкаў вымушаны былі змагацца ў акружэнні ці адыходзіць на ўсход. Але ўжо ў першых прыгранічных баях вораг сустрэў упартае супраціўленне

Чырвонай Арміі. Як нераўзыдзены прыклад патрыятызму і гераізму савецкіх воінаў увайшла ў гісторыю Айчыннай вайны абарона Брэсцкай крэпасці. Цяжкія баі разгарнуліся ў раёне Мінска, Лепеля, Бабруйска і іншых месцах. Упартыя баі ішлі на Дняпры, асабліва ў раёне Магілёва, дзе абарону трымалі 172-я стралковая дывізія і атрады народнага апалчэння. Кровапралітныя баі ішлі на Гомельскім напрамку. Моцныя ўдары па ворагу нанеслі савецкія воіны пад Рагачовам і Жлобінам.

Жыхары Гомельскага раёна мужна і без панікі сустрэлі цяжкую вестку аб пачатку вайны. Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1941 г. «Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК СССР, наркома замежных спраў В.М.Молатава» ў раёне прымаліся тэрміновыя захады па пераводу ўсяго жыцця на ваенны лад, праведзены сход партыйна-гаспадарчага актыву, на якім былі абмеркаваны неадкладныя меры ў сувязі з фашысцкай агрэсіяй. На ўсіх прадпрыемствах, у сельсаветах, калгасах, саўгасах, МТС адбыліся мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі свае патрыятычныя пачуцці, нянавісць да нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гатоўнасць аддаць усе свае сілы і сродкі для адпору ворага і абароны Радзімы. Агульны настрой быў неапраўдана ўзнёсла-пераможны. Тады ніхто не ведаў, не мог прадбачыць і нават уявіць, якія выпрабаванні, неймаверныя людскія пакуты і незлічоныя матэрыяльныя страты чакаюць краіну ў бліжэйшы час. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў, працаўнікі сельскай гаспадаркі бралі абавязацельствы перавыконваць вытворчыя заданні, мабілізаваць усе сілы і сродкі для аказання дапамогі фронту. З панядзелка райваенкамат арганізавана пачаў праводзіць мабілізацыю мужчын прызыўнога ўзросту. Не чакаючы павестак, у райваенкамат прыходзілі дзесяткі жыхароў з заявамі аб тэрміновым накіраванні на фронт.

З першых дзён вайны добраахвотна пайшлі на фронт жыхары Маркавіцкага сельскага Савета Іван Іларыёнавіч Угрумаў, Іван Данілавіч Кучма, жыхар Зябраўкі Якаў Адамавіч Траццякоў і іншыя. У рады Чырвонай Арміі ўліліся жыхары Гомельскага раёна Іван Андрэевіч Сабко, Іван Захаравіч Цыкуноў, Фёдар Уласавіч Літвінаў, Іван Андрэевіч Хлебакоў, Аляксей Цімафеевіч Пыталеў і шмат іншых.

Наперадзе патрыятычнага ўздыму была моладзь. Звыш тысячы маладых людзей з Гомельскага раёна ў першыя дні пайшлі на фронт.

З вялікім напружаннем працавалі прамысловыя прадпрыемствы горада. У найкарацейшы тэрмін станкабудаўнічы завод імя Кірава наладзіў выпуск для фронту мінамётаў. Хутка справіўшыся са складанымі тэхнічнымі і арганізацыйнымі праблемамі, міны для іх пачаў выраблять «Гомсельмаш». На гэтым жа прадпрыемстве і на заводзе «Рухавік рэвалюцыі» быў арганізаваны рамонт ваеннай тэхнікі. Асноўнай прадукцыяй Навабеліцкага лесакамбіната і запалкавай фабрыкі «Везувій» сталі процітанкавыя міны, Гомельскай фабрыкі па вырабе ложкаў і электрастанцый — проціпяхотныя міны, металакамбіната — ручныя гранаты. Жыхары Гомеля за кароткі тэрмін падрыхтавалі больш як 10 тысяч бутэлек з гаручай вадкасцю «КС» для барацьбы з танкамі ворага, чыгуначнікі пераабсталявалі пад бронепаязды два цягнікі з платформамі.

Людзі працавалі днём і ноччу, каб дапамагчы фронту. Кожны працаваў за сябе і за тых, хто быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

Не шкадуючы сіл працавалі калгаснікі. Яны выконвалі дзённыя нормы выпрацоўкі на 200—300 %. На працоўныя месцы тых, хто пайшоў на

фронт, станавіліся жанчыны і падлеткі. На ўсход з раёна пераганялася жывёла, калоны трактароў, камбайнаў і іншых машын.

У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б ад 23 чэрвеня 1941 г. усім абкомам, райкомам КП(б)Б і выканкомам раённых Саветаў дэпутатаў працоўных усходніх абласцей рэспублікі аб арганізацыі барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі бюро Гомельскага абкома партыі 24 чэрвеня прыняло пастанову аб стварэнні ў вобласці ўзброеных груп для барацьбы з дыверсантамі і шпіёнамі. У г. Гомель і Гомельскім сельскім раёне ўжо на трэці дзень вайны пачалі ствараць знішчальныя батальёны. Яны фарміраваліся па раёнах. Усю работу па іх стварэнні ўзялі на сябе райкомы партыі: падбіралі камандны састаў, вызначалі прадпрыемствы, дзе фарміраваліся ўзводы і роты, праводзілі мітынгі і сходы, на якіх запісваліся добраахвотнікі.

У Гомелі ў добраахвотныя фарміраванні ўлілося шмат прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Атрад у сто чалавек стварылі слухачы абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. Сярод іх былі старыя выкладчыкі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР М.П.Лаўрынюк, настаўнікі М.В.Шмуглін, А.І.Чарнышоў, В.К.Пруднікаў. Пад ружжо сталі артысты абласнога драматычнага тэатра А.Ф.Цітоў, П.Ф.Бахцін, К.М.Палосін, Р.Ф.Ашчэпкаў, С.І.Франчак і шмат іншых патрыётаў.

З першых дзён свайго існавання знішчальныя батальёны ахоўвалі важнейшыя аб'екты, неслі вартавую службу: на адлегласці 12 км ад Гомеля знаходзілася 12 назіральных пастоў, якія падтрымлівалі прамую сувязь з камандаваннем вайсковых часцей. Але галоўнай іх задачай з'яўлялася барацьба з варожымі лазутчыкамі: парашутыстамі, шпіёнамі і дыверсантамі.

Вораг рабіў усё, каб парушыць работу савецкага тылу, пасеяць паніку і разгубленасць сярод насельніцтва. На Гомельшчыну закідваліся шпіёны, дыверсанты, сігналыпчыкі, распаўсюджвальнікі лжывых чутак. Іх вылоўлівалі байцы знішчальных батальёнаў.

У раёне вёскі Валатава ноччу кружыў варожы самалёт. Аб гэтым паведамілі ў штаб батальёна Цэнтральнага раёна Гомеля. Камандаванне адразу ж накіравала роту для прачэсвання мясцовасці. Узвод на чале з Архіпавым затрымаў 8 парашутыстаў, якія на допыце прызналіся, што ім было дадзена заданне паказваць фашысцкім самалётам цэлі для бамбардзіроўкі і сеяць паніку сярод насельніцтва. Трох парашутыстаў затрымалі ў раёне вёскі Краснае. У дыверсантаў былі рацыя, пісталеты і гранаты.

Каля Касцюкоўкі недалёка ад шклозавода імя Ламаносава байцы знішчальнага батальёна затрымалі легкавую аўтамашыну з чатырма пасажырамі ў форме камандзіраў Чырвонай Арміі. Высветлілася, што «камандзіры» былі нямецкімі шпіёнамі, якія мелі заданне накіроўваць падраздзяленні савецкіх войск па няправільных маршрутах.

У раёне вёскі Давыдаўка ў другой палове ліпеня знішчальным батальёнам было затрымана без дакументаў больш за 40 чалавек.

Патрыёты знішчальных батальёнаў Гомеля абясшкодзілі 115 лазутчыкаў.

7 ліпеня, паводле дырэктывы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 6 ліпеня 1941 г. аб арганізацыі атрадаў народнага апалчэння, на Гомельшчыне пачалося фарміраванне палка народнага апалчэння. Яго камандзірам быў прызначаны начальнік аддзела ваеннага навучання Гомельскага абласнога савета Асаавіяхіма Ф.Я.Уткін, камісарам — С.Р.Шчуцкі. Узроставы склад байцоў палка вагаўся ад 16 да 60 гадоў.

Падраздзяленні гэтага палка фарміраваліся на добраахвотных па-

чатках з людзей, якія пераважна не падлягалі прызыву ў рады Чырвонай Арміі. Усведамленне свайго абавязку перад радзімай, высакароднае пачуццё патрыятызму прывялі ў рады апалчэнцаў такіх людзей, як камсамолка Раіса Школьнікава, паравозны машыніст Антон Лукіч Рубанаў, рабочы Антонаў, перонны кантралёр Гомельскага вакзала Любоў Максімаўна Папкова, рабочыя Пётр Паткоўскі і Іван Пятрэнка, клубны работнік Леанід Юркавец, і многіх іншых.

За параўнальна кароткі тэрмін — сем дзён — фарміраванне батальёнаў народнага апалчэння па раёнах Гомеля было закончана. К 10 ліпеня ў радах апалчэнцаў, зведзеных у полк, было ўжо больш як 2300 чалавек.

Пры ўсіх райвыканкомах Саветаў дэпутатаў працоўных былі арганізаваны штабы па кіраўніцтве народным апалчэннем. У Гомельскім сельскім раёне пры сельсаветах і калгасах было створана 29 груп народнага апалчэння агульнай колькасцю 568 чалавек. Пачалася вялікая работа па арганізацыі ваеннай вучобы. Акрамя навучання валоданню зброяй, тактыцы бою, у мэтах узмацнення дысцыпліны і падтрымкі высокага маральнага стану з апалчэнцамі праводзілася вялікая палітыка-выхаваўчая работа.

У задачы народных апалчэнцаў уваходзіла падтрымка Чырвонай Арміі ў праводзімых ёй аперацыях, у перавозцы грузаў, у арганізацыі сувязі, разведкі, аховы гарадоў, фабрык, заводаў, калгасаў, мастоў, сродкаў сувязі, арганізацыя барацьбы з дэсантамі і дыверсійнымі групамі праціўніка і інш. У выпадку акупацыі мясцовасці ворагам атрады народнага апалчэння павінны былі пераходзіць да метадаў партызанскай барацьбы.

Апалчэнцы актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве абарончых збудаванняў на тэрыторыі раёна. Асаблівую ўвагу ўдзялялі ўмацаванню абароны ў вёсках Прудок, Мільча, Ціцянкі, Лешчынец, па ўсходнім беразе ракі Сож і ракі Іпуць да вёскі Сеўрукі і інш.

Баі набывалі ўсё больш жорсткі характар. Мірныя вёскі і пасёлкі Гомельскага раёна падвяргаліся масавым бамбардзіроўкам ужо з першых дзён вайны. Фашысцкія самалёты неслі смерць не толькі па лініі фронту, транспартных артэрыях, але бамбілі жылыя дамы, школы, неслі смерць дарослым і дзецям. Так, 28 чэрвеня 1941 г. пры бамбёжцы вёскі Улукаўе ў доме загінулі 36-гадовая Марфа Шышына і яе трохгадовае дзіця. Ахвярамі фашысцкага налёту ў ліпені сталі чатыры вучні Улукаўскай школы.

16 ліпеня з Рослаўля ЦК КП(б)Б, СНК і Вярхоўны Савет БССР перабраліся ў Гомель. На працягу месячнага знаходжання тут, абапіраючыся на абласную і гарадскую партыйныя арганізацыі і савецкі актыў, яны ажыццяўлялі штодзённае кіраўніцтва па арганізацыі адпору ворагу і стварэнні абарончых рубяжоў на подступах да горада. Камандуючы ў той час 132-й стралковай дывізіяй генерал-маёр, пазней Маршал Савецкага Саюза С.С.Бірузоў у сваіх успамінах адзначыў, што дзякуючы дакладна наладжанаму ўзаемадзеянню кіруючых партыйных і савецкіх органаў рэспублікі з камандаваннем Цэнтральнага фронту «ў маляўнічых ваколіцах Гомеля самаадданай працай дзесяткаў тысяч жыхароў гэтага буйнога індустрыяльнага цэнтра Беларусі былі пабудаваны шматлікія дзоты, узведзены процітанкавыя загароджы, зроблены мінныя палі. Схілы ўзгоркаў эскарпаваліся, капаліся супрацьтанкавыя равы, абсталёўваліся траншэі і акопы для гармат і кулямётаў. Работа кіпела днём і ноччу. Людзі не ведалі стомленасці»[1]. Каб уявіць памеры праведзеных у той час работ, дастаткова

[1] Бирюзов С.С. Когда гремели пушки. М., 1962. С. 35.

сказаць, што супрацьтанкавы роў каля Гомеля, які акружаў горад, упіраючыся абодвума сваімі канцамі ў Сож, і меў даўжыню 28 кіламетраў, быў выкапаны літаральна за некалькі дзён. На подступах да Гомеля былі створаны мінныя палі, на вуліцах пабудаваны барыкады. На збудаванне абарончых рубяжоў штодня выходзіла больш за 10 тысяч чалавек.

Аказваючы ўсебаковую дапамогу фронту, у горадзе і раёне адначасова праводзілася вялікая работа па эвакуацыі насельніцтва, прамысловых прадпрыемстваў, устаноў, маёмасці калгасаў, саўгасаў, МТС. Для кіраўніцтва работай па дэманціраванні і эвакуацыі абсталявання прамысловасці і іншых матэрыяльных каштоўнасцей абкомам партыі быў створаны аператыўны штаб у складзе сакратароў абкома А.А.Куцака, Ю.Д.Гутнера, намесніка старшыні аблвыканкома Шайкевіча, сакратара гаркома партыі С.Ф.Антонава і інш.

Аб маштабах гэтай работы сведчыць той факт, што для эвакуацыі абсталявання і матэрыялаў трох буйнейшых прадпрыемстваў — станкабудаўнічага завода імя Кірава, «Гомсельмаша» і паравозарамонтнага завода — патрабавалася больш за дзве з паловай тысячы вагонаў. А толькі ў Гомелі былі 42 буйныя прадпрыемствы.

Многія прадпрыемствы былі эвакуіраваны з асноўнымі кадрамі рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў. Гэта давала магчымасць у кароткія тэрміны ўводзіць іх у строй дзеючых на новых месцах. У горад Курган Чэлябінскай вобласці, куды быў эвакуіраваны «Гомсельмаш», прыбыло 290 кадравых работнікаў, 135 інжынерна-тэхнічных работнікаў, больш як 40 служачых.

Разам з абсталяваннем Гомельскага паравозарамонтнага завода на Уфімскі завод у арганізаваным парадку прыбыло 650 рабочых, 200 інжынерна-тэхнічных работнікаў, 76 служачых[1]. Толькі з Гомеля было вывезена больш за 80 тысяч чалавек.

Эвакуацыя насельніцтва і матэрыяльных рэсурсаў патрабавалі каласальнага напружання ў рабоце чыгуначнага транспарту. Ва ўмовах частых налётаў варожай авіяцыі і бамбардзіроўкі станцый, рухомага саставу і чыгуначнага палатна, ва ўмовах святломаскіроўкі працаўнікі чыгункі забяспечылі зладжаную работу транспарту, выканалі пастаўленую перад імі задачу.

Працоўныя Гомельшчыны, каб дапамагчы Чырвонай Арміі, пачалі збор грашовых сродкаў, матэрыяльных каштоўнасцей і прадуктаў у фонд абароны краіны. Працоўныя Гомеля ўнеслі ў фонд абароны больш як 250 тыс. руб., 2,5 кг золата, 18 т каляровых металаў[2]. Члены калгаса «Чырвоны хлебароб» Гомельскага раёна, накіроўваючы свае грошы на вытворчасць узбраення для Чырвонай Арміі, пісалі: «Мы аддадзім усё для перамогі над каварным ворагам. Нічога не пашкадуем для сваёй любімай мацеры — радзімы. Няхай нашы сродкі ператворацца ў грознае ўзбраенне, якое будзе бязлітасна разіць фашыстаў»[3].

У другой палове ліпеня камандаванне Заходняга фронту цалкам было прыкавана да бітвы пад Смаленскам. Таму Стаўка Вярхоўнага Камандавання для зручнасці кіраўніцтва войскамі на Гомельскім напрамку 24 ліпеня на базе 21-й і 13-й армій стварыла самастойны Цэнтральны фронт. Франтавое кіраўніцтва размясцілася ў Гомелі ў палацы князя Паскевіча. Камандуючым фронтам быў прызначаны гене-

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 150. Л. 5, 13.
[2] Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1975. Т. 4. С. 141.
[3] Звязда. 1941. 8 жніўня.

рал-палкоўнік Ф.І.Кузняцоў, членам ваеннага савета — першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка.

Актывізацыя дзеянняў войскаў Цэнтральнага фронту і зусім нязначныя тэрытарыяльныя поспехі фашысцкіх войск пад Смаленскам прымусілі нямецкае камандаванне па-новаму ацаніць абставіны і змяніць свае планы. 28 ліпеня 1941 г. Гітлер сфармуляваў сваё рашэнне наступным чынам: «...Важнейшай задачай з'яўляецца ліквідацыя пагрозы на правым флангу групы армій «Цэнтр» шляхам разгрому варожай групоўкі, якая знаходзіцца ў раёне Гомеля і на поўнач...»[1].

За время оккупации немецкими оккупантами на советских граждан накладывали непосильные налоги и поборы, брали коров, свиней, лошадей, хлеб, мясо, яйца и денежные налоги.

Когда Красная Армия пошла в наступление и немецкие войска отступили на правый берег Сожа и держали оборону в 1943 г., то жителей деревни нашей насильно выгнали под открытое небо и разрушили 364 дома, сожгли 173 дома, угнали весь крупный рогатый скот и мелкий, лошадей. Насильно угнали молодежь в Германию на каторжные работы из Бобовичского сельского Совета.

При отступлении немецкие войска из-за того, что граждане Бондаренко Кузьма Артемович и его жена Бондаренко Агафия Антоновна как старики не хотели эвакуироваться, то их заперли в доме и подожгли. С домом сгорели и старики.

При отступлении немецкие войска из д. Бобовичи и Случ. Мильча эвакуировали 1512 человек, а также 14 ноября 1943 г. при отступлении немецкие войска в д. Случ. Мильча Бобовичского сельского Совета расстреляли мирных жителей в количестве 17 человек, которые скрывались в лесу от насильной эвакуации. Летом 1943 г. немецкий карательный отряд в д. Случ. Мильча сжег 31 двор, т.е. дома со всеми подворными постройками.

Протокол записан из моих слов правильно и зачитан вслух. В чем и расписываюсь.

Пом. опер. уполном. Гом. НКВД мл. л-т милиции (Медюляков)

Секретарь

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1345. Воп. 11. Спр. 11. Л. 11–12.

У змрочныя дні фашысцкай няволі

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны абсталяванне торфазавода «Бальшавік» было вывезена ў глыб краіны. Тады ж эвакуіраваліся і сем'і некаторых работнікаў прадпрыемства. Але не ўсе спецыялісты выехалі, на месцы засталіся галоўны інжынер Іван Антонавіч Хуцкі і галоўны механік Васіль Трафімавіч Ступакоў. Сярод жыхароў рабочага пасёлка яны сталі першымі, з кім у 1941 г. расправіліся нямецка-фашысцкія акупанты. А пасля іх былі і іншыя ахвяры сярод мірных жыхароў.

Вось што расказала жыхарка пасёлка Бальшавік Вольга Рыгораўна Зінчанка, 1925 г. нараджэння, пра той жудасны час.

Прыйшлі немцы, сталі наводзіць жорсткія парадкі, людзі прытаіліся. У пасёлку размяшчаўся нейкі нямецкі штаб, знаходзіўся лагер ваеннапалонных. Школу таксама займалі немцы. А каля пасёлка, там, дзе шаша Гомель — Доўск, было такое страшнае месца, што людзі баяліся хадзіць каля яго, абыходзілі. Там немцы трымалі захопленых партызан, катавалі іх. Мне з сяброўкамі траплялася назіраць з укрыцця, як фашысты білі гэтых людзей. Яны звязвалі ім рукі ззаду і прымушалі падымацца ў машыну па крутой лесвіцы і адначасова дубасілі пры гэтым дубінкамі і бізунамі. Ступіўшы на другую перакладзіну, чалавек траціў раўнавагу і падаў на зямлю. Тады немцы з яшчэ большай лютасцю білі ляжачага.

Да прыходу немцаў сем'і Івана Хуцкага, галоўнага інжынера, і Васіля Ступакова, галоўнага механіка торфазавода «Бальшавік», эвакуіраваліся, а самі яны засталіся ў пасёлку. Аднойчы разнеслася вестка, што немцы арыштавалі іх і кудысьці павезлі на машыне. Як потым стала вядома, абодвух расстралялі ў Навабеліцы. Жыхары пасёлка сталі здагадвацца, што яны засталіся дома невыпадкова, а па заданні — з мэтай арганізаваць супраціўленне ворагу ў яго тыле. Інакш бы яны эвакуіраваліся б разам з заводам і сем'ямі. Але немцы нейкім чынам напалі на след...

Трывога не пакідала людзей. Ад фашыстаў нельга было чакаць літасці. З цягам часу кожны адчуў, што пагроза навісла над усім пасёлкам. У адзін з дзён 1942 г. немцы выгналі ўсіх на плошчу. У тым натоўпе апынуліся і чацвёра з нашай сям'і: я, маці і яшчэ двое дзяцей. Немцы, якія стаялі на трыбуне, патрабавалі назваць таго, хто пашкодзіў тэлефонную сувязь. Тоўсты кабель, што цягнуўся ад штаба па зямлі, хтосьці парэзаў. Хто? Немцы чакалі адказу, але яго не было. Людзі маўчалі. Тады немцы ўзялі заложнікаў — трох хлопцаў і павялі ў школу. Астатніх жыхароў адпусцілі. Два дні немцы трымалі заложнікаў, дапытвалі, збівалі. Аднаго з іх я памятаю — гэта быў Уладзімір Ямішын. Невядома, што было б з хлопцамі, якія пра гэта нічога не ведалі. Хутчэй за ўсё іх чакала смерць. Але нечакана адна жанчына, якая прыйшла ў школу, выдала немцам таго, каго яны шукалі...

Сям'я рабочага торфазавода Пятра Фёдаравіча Пархімовіча, 1886 г. нараджэння, тулілася ў бараку. Жыў ён разам з дачкой Аленай, 1915 г. нараджэння. У гэтай сям'і пры акупацыі ў патаемным месцы (за двайной сцяной) хаваўся афіцэр Чырвонай Арміі. Імя, прозвішча і воінскае званне яго невядомы. Вось гэты вайсковец і пашкодзіў сувязь нямецкага штаба. Пры вобыску немцы знайшлі яго наган. Схапілі афіцэра, гаспадара кватэры П.Ф.Пархімовіча, яго дачку Алену, а заложнікаў выпусцілі. Пасля допытаў фашысты вывелі ўсіх траіх за пасёлак і расстралялі.

У пасёлку жыве жанчына, якая ў дзіцячым узросце стала сведкай яшчэ аднаго злачынства гітлераўскіх вылюдкаў. Яна бачыла, як немцы непадалёк ад пасёлка вывелі з машыны маладую жанчыну з дзіцем на руках. Прама каля дарогі расстралялі іх і паехалі далей. Тут у адзіночнай магіле і засталіся ляжаць невядомыя ахвяры фашызму.

Але як бы ні лютавалі нямецкія галаварэзы, ім не ўдалося беспакарана гаспадарыць на часова акупіраванай тэрыторыі. Іх чакала народная помста. Аднойчы ноччу летам 1943 г. партызаны знішчылі варту і вызвалілі лагер ваеннапалонных у пасёлку.

Астанкі савецкага афіцэра, бацькі і дачкі Пархімовіч у пачатку 1950-х гадоў, калі

пачалі будаваць гараж для тэхнікі і натыкнуліся на іх магілы, былі перанесены на брацкія могілкі, на якіх пахаваны савецкія воіны, загінуўшыя ў пачатку вайны і пры вызваленні пасёлка восенню 1943 г. Тут у адной магіле знайшлі апошні прытулак 24 чалавекі.

А ў цэнтры насупраць двухпавярховага будынка пасялковага Савета ўзведзены помнік у гонар жыхароў, якія загінулі на фронце. 85 жыхароў пасёлка не вярнуліся з вайны, у тым ліку 12 афіцэраў, 13 сяржантаў і 60 радавых.

І.І.Пічукоў.

Згубленае дзяцінства

З успамінаў жыхаркі вёскі Стукачоўка Ніны Мікалаеўны Мельнікавай (Абрамцавай)

Калі пачалася вайна, мне ішоў толькі сёмы год. Добра памятаю увесь жах, усю боль, якую прынесла фашысцкая няволя. Вайна забрала бацьку, забрала мае дзяцінства.

Да пачатку вайны мы жылі ў в. Стукачоўка (зараз Даўгалескі сельсавет). Бацька, Абрамцаў Мікола Яўхімавіч, працаваў у саўгасе імя Горкага, што ў адлегласці 5 км ад вёскі. Па стане здароўя яго не прызвалі ў армію.

У 1930 г. бацька ўступіў у калгас. Там ён працаваў разам з маці. Яго накіравалі на сельскагаспадарчыя курсы. Скончыўшы іх, ён не вярнуўся ў калгас, а пайшоў працаваць у саўгас імя Горкага. За гэты «ўчынак» бацьку арыштавалі і пасадзілі ў турму. Ішоў цяжкі, галодны 1933 г. Людзі на сяле пухлі, паміралі з голаду. А маці засталася адна з двума малымі дзецьмі. Выжылі. Праз паўгода бацьку выпусцілі. Ён добры гаспадар, працягваў працу ў саўгасе. Калі прыйшлі немцы, бацька падтрымліваў сувязь з партызанамі. Маці, Антаніна Іванаўна, пякла хлеб, а бацька адносіў яго на дамоўленае месца сустрэчы. Бывала, самі партызаны наведваліся да нашай хаты.

Сям'я ў нас была вялікая. Трое дзяцей, бабуля, — усяго 6 чалавек. Але ў нас забралі немцы апошнюю карову, выгналі нас з хаты, мы жылі ў склепе, які так-сяк быў прыстасаваны да начлегу.

Другі наш вораг быў голад. Бульбу не выкапалі: немцы не пускалі ў поле. Вядома, фронт. Скаціну, птушак даўно немцы з'елі. Цяжка сказаць, як мы жылі. Трохі бульбы было каля хаты да гарбузы. Ежу варылі адзін раз у дзень. Цяпер толькі разумею, што сярод немцаў былі такія, хто спагадваў нашаму становішчу. Немец, яго звалі Аўгуст, некалькі разоў прыносіў нам ежу. Часам гэта была каша або некалькі кавалачкаў хлеба. Аднойчы Аўгуст прынёс нам малака. А то было зусім дзіўна, калі ён павесіў на дзверы нашага склепа вэнджаны кавалак мяса.

Добра памятаю, калі немцы адступалі. Паблізу нашай вёскі праходзіў фронт. У вёсцы засталіся старыя, жанчыны з дзецьмі. Тыя, хто маглі, пайшлі ў лес, каб схавацца ад фашыстаў. Небяспечна было заставацца ў вёсцы. У гэты час толькі я з маці былі ў вёсцы. Бацька, два мае браты (10, 11 гадоў) былі ў лесе. З намі былі яшчэ дзве жанчыны з трыма малымі дзецьмі, якія засталіся ў нас, прыехаўшы з горада. Былі мы ў вёсцы да таго часу, калі ўжо сталі чутны стрэлы нашай артылерыі.

Аднойчы раніцай немцы вельмі спешна выганялі людзей з хат. Нас пагналі ў бок Рэчыцы. Па дарозе мы збеглі. У лесе сустрэліся з аднавяскоўцамі, сярод іх былі наш бацька і браты.

У лесе мы пражылі некалькі месяцаў да вызвалення. Гэта быў вельмі цяжкі час. Колькі радасці было, калі мы даведаліся, што нашу вёску вызвалілі ад немцаў.

І вось мы дома! Але дома няма. Засталіся толькі сцены ды дах.

Бацька пайшоў на фронт. Зіму мы жылі ў нямецкім бліндажы, які быў у лесе побач з вёскай. Памятаю, як уначы баялася наша маці. Тады па лесе вакол вёскі хадзілі ўсякія людзі, часам узброеныя. Гэта былі былыя паліцаі, якія нагадвалі ваўкоў. Дарэчы, ваўкі хадзілі зусім побач. За вайну яны навучыліся нападаць на людзей.

Вясной, зрабіўшы самае неабходнае, мы вярнуліся ў сваю хату. А як дажылі да вясны? Што елі? Немцы забралі ўсё. Але яны не знайшлі адну невялікую бочку з зернем. Яна была закапана ў зямлю. Вось гэта зерне мы самі малолі, варылі зацірку. Гэтага было вельмі мала, каб паесці, але дапамагала хоць

як-небудзь замарыць голад. Добра, што зімой былі частыя адлігі, таму мы хадзілі ў поле, капалі бульбу. Яна была мёрзлая, але не гнілая. З такой бульбы пяклі аладкі.

Балюча ўспамінаць той час, калі мы даведаліся, што наш бацька загінуў. Пакуль быў жывы, пісаў з фронту. Пісаў, што служыў у разведцы, быў узнагароджаны. Вельмі турбаваўся за нас, наказваў слухаць маці. Гэтыя пісьмы сёння вельмі беражна захоўваюцца. Апошняе пісьмо ён напісаў 5 лютага 1944 г. Затым пісем не стала.

Маці напісала ў вайсковую часць, дзе служыў бацька. Гэта п/п 47632. І вось прыйшоў адказ. У ім было сказана, што Абрамцаў Мікалай Яўхімавіч быў паранены 3 сакавіка 1944 г., выбыў у хірургічны палявы шпіталь № 2324, адкуль у сваю часць не вярнуўся. Аднавясковец расказаў маці, што бацька памер ад ран.

Дачакаліся да Дня Перамогі. Радасць! Але доля сіроцкая горкая. У калгасе маці працавала за «палачкі». Удовам і дзецям, чые бацькі загінулі на фронце, улады ў той час не дапамагалі. Здаралася, наадварот.

Тыя, хто жывымі прыйшлі з фронту, увесь цяжар калгаснага жыцця перакладвалі на плечы жанчын-удоў. Яшчэ душылі падаткі. У нас у двары з'явілася цёлачка. Яе даў нам мой дзядзька. А калі яна першы раз ацялілася, дык да гэтага часу на яе так узрос падатак мяса і малака, што за нядоімкі яе забралі ў нас. Нават суд быў. Забралі і спачатку паставілі на калгасны двор. Добра, што не адразу на бойню. Рабілі гэта тыя, хто вельмі хацеў выканаць планы, хай хоць змочаныя дзіцячымі слязамі. Памятаю такога. Гэта быў фінагент Герасіменка. Але маці ведала, што гэта рабаўніцтва, таму звярнулася да першага сакратара райкома партыі Палавінкі Івана Паўлавіча. Ён дапамог. Было прапанавана вырасціць цяля і здаць дзяржаве ў лік таго падатку, а карову-карміцельку вярнуць.

З успамінаў жыхара в. Церуха Мікалая Палікарпавіча Мядзведзева аб зверствах фашыстаў

Перад адступленнем нямецкіх захопнікаў усе жыхары вёскі Церуха, хто мог ісці, адышлі ў бліжэйшыя лясы. У вёсцы засталіся толькі старыя ды малыя дзеці, якія хаваліся ў сваіх зямлянках. Старыя людзі лічылі, што немцы іх, старых, кранаць не будуць. Але на самай справе аказалася ўсё інакш. Пры адступленні карнікі абышлі ўсе хаты і зямлянкі вёскі, пазбіралі ўсіх, каго знайшлі: старых і дзяцей, змясцілі іх у дом насупраць школы. Потым зачынілі дом, кінулі туды дымавыя шашкі і падпалілі яго.

У доме знаходзілася 50 чалавек, і толькі чатыром з іх пашчасціла ўцячы. Гэта былі сястра маёй маці, цётка Уліта, маці майго сябра і суседа і мая бабуля з унукам. Дзве жанчыны былі цяжка паранены ў плечы, але ўцяклі ад смерці. Мая бабуля была расстраляна ў 30—40 метрах ад хаты. Хлопчык застаўся жывы і быў забіты штыком карніка. Увесь гэты жах адбываўся раніцай, а амаль што ў чатыры гадзіны ў вёску ўступілі вызваліцелі — войскі Чырвонай Арміі.

Калі мы выйшлі з лесу і вярнуліся дадому, дык убачылі жудасную карціну злачынстваў нямецкіх карнікаў: поўнасцю згарэў дом і людзі, якія знаходзіліся там. Пахавалі іх усёй вёскай.

Антыфашысцкае падполле і партызанскі рух

Злачынны акупацыйны рэжым масавага тэрору, жорсткай эксплуатацыі і катаржнай працы павінен быў, па задумах фашысцкіх верхаводаў, навесці страх і жудасць на жыхароў захопленых тэрыторый, у тым ліку і Гомельскага раёна, адбіць у іх усякае жаданне, нават думкі аб супраціўленні акупантам.

Але гітлераўцы пралічыліся. Жыхары Гомельскага раёна, як і ўсёй Беларусі, не скарыліся. Ахопленыя патрыятычным пачуццём любові да роднай зямлі, яны падняліся на ўсенародную барацьбу супраць захопнікаў.

Яшчэ ў перыяд абарончых баёў летам 1941 г. па загадзе ЦК КП(б)Б на прадпрыемствах Гомеля быў наладжаны выпуск прасцейшай партатыўнай тэхнікі для арганізацыі дыверсій. Гомельскім абкомам партыі загадзя былі распрацаваны канкрэтныя мера-

прыемствы па падборы кадраў, камплектаванні падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый і партызанскіх атрадаў, па стварэнні матэрыяльнай базы для іх. У тыле ворага заставаліся лепшыя партыйныя і камсамольскія работнікі. Шэраг з іх прайшлі падрыхтоўку ў Гомельскай спецшколе, арганізаванай ЦК КП(б)Б.

Партыйныя камітэты разгарнулі шырокую работу па стварэнні партызанскіх атрадаў. Звычайна партызанскія атрады ствараліся на базе знішчальных батальёнаў, атрадаў народнага апалчэння, фарміраваліся з воінскіх груп і падраздзяленняў, якія па розных прычынах апынуліся на акупіраванай тэрыторыі, з савецкага актыва, мясцовых жыхароў. Структура партыйнага падполля будавалася ў залежнасці ад мясцовых умоў і канкрэтных задач.

Усёй складанай работай па арганізацыі падполля і партызанскага руху ў раёне кіраваў ЦК КП(б)Б, абком партыі, якія да апошняга дня баёў за Гомель знаходзіліся на тэрыторыі вобласці, а 1-ы і 2-і сакратары ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка і П.З.Калінін былі членамі ваенных саветаў адпаведна Цэнтральнага фронту і 21-й арміі. У часы акупацыі ў вобласці пабывалі ў розныя часы і аказалі значную дапамогу па мабілізацыі працоўных на барацьбу з ворагам сакратары ЦК КП(б)Б І.П.Ганенка, М.Я.Аўхімовіч, сакратары ЦК ЛКСМБ М.В.Зімянін і К.Т.Мазураў.

Яшчэ да акупацыі Гомеля фашыстамі гарадскі камітэт партыі сфарміраваў партызанскі атрад «Бальшавік» пад кіраўніцтвам дырэктара аўтарамонтнага завода І.С.Федасеенкі. Камісарам быў прызначаны першы сакратар гаркома партыі Е.І.Барыкін. Месцам дыслакацыі атрада выбрана Шчакатоўская лясная дача ў трох-чатырох кіламетрах ад шашы Гомель—Чарнігаў. Тут каля «Партызанскай крынічкі» пачаўся баявы шлях атрада.

З першых жа дзён акупацыі партызаны пачалі нападзенні на калоны гітлераўцаў, якія рухаліся з Гомеля на Чарнігаў. Толькі ў другі выхад група з 15 партызан знішчыла нямецкую калону — 8 аўтамашын, на шашы Гомель — Рэчыца было знішчана 12 аўтамашын з гітлераўскімі салдатамі і афіцэрамі. У адказ на актыўныя баявыя дзеянні народных мсціўцаў, якія падтрымлівалі сувязь з падпольшчыкамі, нямецкае камандаванне вырашыла распачаць карную экспедыцыю па прачосванні Шчакатоўскай лясной дачы.

Нешматлікаму атраду прыйшлося змяніць месца дыслакацыі. Позняй восенню партызаны развіталіся з «Партызанскай крынічкай», перайшлі раку каля в. Скіток на правы бераг і пачалі дзейнічаць у вусці ракі Сож і на правым беразе Дняпра.

На шашы Гомель — Чарнігаў дзейнічаў партызанскі атрад Гомельскага сельскага раёна пад кіраўніцтвам

Помнік у гонар Гомельскага падпольнага гаркома КП(б)Б і партызанскага атрада «Бальшавік» ва ўрочышчы Партызанская крынічка.

М.Дз.Кротаў.

былога дырэктара саўгаса імя М.Горкага Бурага Андрэя Фёдаравіча.

Партызанскі атрад быў створаны наспех. Першы сакратар Гомельскага райкома З.С.Кайкоў і старшыня райвыканкома А.Т.Кастрама пайшлі ў дзеючую армію. Першапачаткова атрад складаўся з 30 чалавек. А.Ф.Буры — камандзір атрада, М.Дз.Кротаў сакратар партарганізацыі в. Улукаўе, яго сын — камсамолец Леанід Кротаў, настаўнік Галавінскай школы А.М. Рабека, сакратар абкома камсамола У.Я.Літвінаў, загадчык райдараддзела Г.І.Бяспалы, калгаснікі: М.П.Цвяткоў, Т.П.Кучаравенка, аграном Я.І.Хаменка, старшыня калгаса з вёскі Цыкуны К.Літвінаў, работнікі сельскіх Саветаў М.Л.Сарокін, С.П.Шулдыкаў, лётчык, старшы лейтэнант П.Д.Кавалёў і інш.

У канцы верасня камандаванне атрада «Бальшавік» звязалася з партызанскім атрадам Гомельскага раёна. Адбылося іх аб'яднанне. Першай баявой аперацыяй аб'яднанага атрада быў налёт на нямецка-паліцэйскі гарнізон у саўгасе імя М.Горкага. Ноччу 5 кастрычніка яны акружылі паліцэйскі гарнізон у саўгасе, але паліцэйскіх там не было, яны паспелі ўцячы ў вёску Міхалькі пад абарону немцаў. У канторы саўгаса былі знойдзены спісы мясцовых камуністаў і камсамольцаў, складзеныя здраднікам. Партызаны яго адшукалі, прымусілі асабіста зачытаць складзены ім спіс і па патрабаванні мясцовых жыхароў расстралялі.

Настала цяжкая і халодная зіма 1941—1942 гг. Фашысты кідалі супраць партызан карныя атрады, кадравыя часці, знятыя з фронту. Вораг усімі сіламі імкнуўся выкарыстаць халады і не даць партызанам асталяваца ў лясах, а затым зусім знішчыць іх. Атраду цяжка было маскіравацца ў лясах вакол Гомеля. Па рашэнні падпольнага гаркома ён перайшоў на зіму на поўнач у чачэрскія лясы. Тут партызаны разам з баявымі аперацыямі праводзілі вялікую прапагандысцкую агітацыйную работу сярод насельніцтва, праводзілі сходы, растлумачвалі становішча на франтах, дапамагалі зрываць усе мерапрыемствы акупацыйных улад.

Вестка аб разгроме немцаў пад Масквой удыхнула ў сэрцы патрыётаў новыя сілы і новыя надзеі. Да вясны 1942 г. значна павялічылася колькасць атрада, узрасла яго баявая актыўнасць. Ён вярнуўся з чачэрскіх лясоў у родныя мясціны бліжэй да Гомеля. Пераадолеўшы вялікія цяжкасці, майскай раніцай атрад «Бальшавік» падышоў да вёскі Раманавічы. Фарсіраваўшы раку Іпуць, партызаны спыніліся ў пасёлку Прыазёрны, дзе ў гэты час не было немцаў. Затым атрад перадыслацыраваўся ў вёску Кантакузаўка, у якой знаходзіўся верны сувязны і разведчык атрада Цярэшчанка Захар Тарасавіч. Партызанская разведка паведаміла, што раён «Партызанскай крынічкі» знаходзіцца пад асобым кантролем у немцаў, і кіраўніцтва атрада вырашыла зноў размясціцца ў міжрэччы ў раёне пасёлкаў Міхайлаўскі і Клін. Тут жа каля вёскі Шарпілаўка атрад «Бальшавік» сустрэўся з кіраўніцтвам падпольнага абкома партыі і абкома камсамола І.П.Кожарам і А.Дз.Рудаком і ў далейшым дзейнічаў у цеснай баявой садружнасці з суседнімі партызанскімі атрадамі.

У жніўні 1942 г. ЦК КП(б)Б звярнуўся да беларускіх партызан з

пісьмом, у якім заклікаў да ўзмацнення ўдараў па ворагу. Адной з галоўных задач, якая была пастаўлена перад народнымі мсціўцамі, — усімі сіламі зрываць перакідванне варожых сіл да лініі фронту, дабівацца поўнага знішчэння ў час руху фашысцкіх эшалонаў. Гэта было вельмі важна. На беразе Волгі пад Сталінградам пачалася найвялікшая бітва другой сусветнай вайны.

У адказ на заклік партыі партызаны ўзмацнілі баявыя дзеянні на камунікацыях ворага. Атрад «Бальшавік» вырас колькасна. Летам 1942 г. у яго рады ўліліся падпольшчык з Макееўскага лясніцтва Буры Кліменцій Васільевіч з сынам Васілём, камуністы Міхаіл Абрамовіч, Пётр Марозаў, Ціт Марозаў, якія знаходзіліся на нелегальным становішчы. З імі прыйшла ў атрад жонка Пятра Марозава Агаф'я Цітаўна, дачка Ганна і два сыны Сямён і Сяргей, камсамолка Ірына Цімашэнка – загадчыца дзіцячага садка ў саўгасе імя М.Горкага.

Групу дыверсантаў і падрыўнікоў у атрадзе «Бальшавік» узначаліў сакратар Гомельскага падпольнага гаркома камсамола Аляксандр Ісачанка. Да кастрычніка 1942 г. яны мелі на сваім баявым рахунку 58 варожых эшалонаў, пушчаных пад адхон, 87 аўтамашын, танкаў і браневікоў, тысячы знішчаных гітлераўцаў. На асабістым рахунку Аляксандра было 6 варожых эшалонаў. Ён і загінуў на баявым посту 7 лістапада 1942 г. У 1944 г. А.Л.Ісачанку было прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна.

Зверствы і лютасць немцаў станавіліся ўсё больш жорсткімі. Па Гомелі і яго наваколлі кацілася хваля тэрору і рэпрэсій. Атрад «Бальшавік» пакінуў раён міжрэчча і размясціўся ў хойніцкіх лясах. Да канца верасня 1942 г. ён налічваў больш за тысячу байцоў. У гэтых умовах з'явілася настойлівая неабходнасць у паляпшэнні арганізацыі баявой падрыхтоўкі партызан, паляпшэнні іх бытавых умоў, узнаўленні запасаў харчавання, боепрыпасаў, зрабіць барацьбу больш мэтанакіраванай, аператыўнай. Гэта патрабавала наяўнасці новых формаў кіравання. 20 кастрычніка загадам упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Гомельскай вобласці было прынята рашэнне аб стварэнні на базе атрада «Бальшавік» аднайменнай партызанскай брыгады. Яе камандзірам быў прызначаны І.Ф.Гамарка, камісарам — В.М.Палянічка.

Былыя партызаны брыгады «Бальшавік», жыхары Даўгалескага сельсавета.

У лістападзе 1942 г. пры Гомельскім падпольным абкоме КП(б)Б быў створаны штаб, які аб'яднаў атрады, што дзейнічалі ў паўднёвых раёнах вобласці.

5 лютага 1943 г. штаб партызанскіх атрадаў паўднёвай групы перайменаваны ў штаб кіраўніцтва партызанскімі атрадамі. У сакавіку — красавіку 1943 г. у яго падпарадкаванне былі перададзены ўсе фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі вобласці. Гэтымі мерамі закончыўся працэс стварэння адзінага партызанскага злучэння Гомельскай вобласці.

Актыўна ў барацьбу з ворагам уключыўся камсамол. У цяжкія дні акупацыі ў шэрагу населеных пунктаў Гомельскага раёна былі створаны камсамольскія падпольныя групы. Так, у Міхалькаўскім сельсавеце дзейнічала група з 9 чалавек (С.П.Марозава, С.Ф.Матвеенка, І.Т.Марозава, А.І.Матвеенка, В.Н.Пугачова, Е.М.Пугачова, браты М.Е. і І.Е.Матвеенкі).

Маладыя патрыёты распаўсюджвалі сярод насельніцтва партызанскія лістоўкі, газеты, якія дастаўляліся самалётамі праз лінію фронту, збіралі зброю і боепрыпасы, разбіралі і палілі масты. Па даносе здрадніка члены групы былі арыштаваны і адпраўлены ў гомельскую турму. Па дарозе дваім удалося ўцячы. Пазней збег з турмы яшчэ адзін. Астатнія былі расстраляны.

Але ніякія здзекі над мірнымі жыхарамі, партызанамі і падпольшчыкамі, захопленымі ў палон, не зламалі волі савецкіх патрыётаў. Яны не давалі фашыстам ні хвіліны спакою. Зямля гарэла ў ворагаў пад нагамі.

У вёсцы Брылёва дзейнічала камсамольская група з 11 чалавек пад кіраўніцтвам Міхаіла Цыганкова. Падпольшчыкі здабылі і перадалі партызанам 8 тысяч патронаў, ручны кулямёт, вывелі з горада дзесяткі людзей, якім удалося ўцячы з фашысцкага лагера. Надзейнымі сувязнымі ў Гомельскім падполлі і памочнікамі партызан былі Я.Назарава з в. Заліп'е, Н.Шафранская з в. Целяшы, Э.Л.Семяноўская з Лешчынца, уражэнка в. Яроміна работніца Навабеліцкай МТС М.Я.Сібілева. Аб мужнасці Г.М. Кірыкавай з п. Беленькае памятаюць і сёння тыя, хто яе ведаў.

Народныя мсціўцы ўсюды праследавалі нямецкіх акупантаў і іх памагатых — паліцэйскіх.

Славу сярэдневяковых інквізітараў набылі сярод насельніцтва паліцэйскія ўрыцкага гарнізона. Партызаны вырашылі спыніць зверствы фашысцкіх прыхвасняў. Летам 1943 г. група партызан у адно з рэлігійных свят пад'ехала на падводах да школы, дзе размяшчаўся гарнізон паліцыі, бяскшумна ўвайшла ў памяшканне і знішчыла ўсіх здраднікаў.

У актывізацыі і павышэнні актыўнасці партызанскай і падпольнай барацьбы вялікую ролю адыграў V Пленум ЦК КП(б)Б (люты 1943 г.). Прааналізаваўшы вынікі партызанскага руху на Беларусі, пленум прыняў рашэнне аб узмацненні супраціўлення ворагу, удасканальванні ўсёй работы ў тыле ворага.

Выконваючы рашэнне пленума, партызаны ўзмацнілі палітычную работу сярод насельніцтва. Вось што пісалася ў адной з лістовак гомельскіх партызан: «Браты і сёстры, якія часова знаходзяцца на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Дапамажыце партызанам біць гітлераўцаў, зрывайце ўсе іх планы! Чырвоная Армія недалёка. Яна нясе вызваленне ад фашысцкіх сабак». У другой лістоўцы гаварылася: «Сяляне і сялянкі, юнакі і дзяўчаты, маладыя рабочыя, чыгуначнікі, служачыя, людзі разумовай працы, насельніцтва Гомельскай вобласці! Не працуйце на акупантаў! Ні адзін з вас не павінен рамантаваць дарогі і іншыя пабудовы гітлераўскай улады. Зрывайце кожнае мерапрыемства акупантаў, не давайце

ім ніякіх харчоў. Замест хлеба і сала – вілы ў бок подламу фашысту. Замест малака і мяса кулю ў яго чорнае сэрца. Прыводзьце ў нягоднасць станкі і абсталяванне прадпрыемстваў! Выводзьце са строю паравозы, зрывайце рух эшалонаў на фронт, не давайце вывозіць наша дабро ў фашысцкую Германію». Лістоўкі друкаваліся не толькі для насельніцтва акупіраванай тэрыторыі, але і для салдат арміі працiўніка. Гэта паднімала баявы дух насельніцтва, аказвала ўплыў на далейшае разгортванне барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў.

Станоўча ўплывала на мясцовых партызан і падпольшчыкаў дзейнасць разведвальна-дыверсійных груп, якія былі накіраваны ў тыл ворага камандаваннем Чырвонай Арміі, НКДБ, НКУС. Такія групы дзейнічалі на тэрыторыі Гомельскага раёна. На чале адной з іх стаяў разведчык В.С.Залезей (мянушка «Гром»).

З лета 1942 г. у наваколлі Гомеля дзейнічаў спецатрад НКДБ «Наперад», камандзірам якога быў П.Г. Шамякін. З 4 мая па 18 жніўня ў Гомельскім раёне дзейнічала дыверсійная група Б.Х. Тульчынскага, якой за гэты час было праведзена 18 дыверсій на чыгункі, 15 на шашы. Разам з мясцовымі партызанскімі атрадамі група прымала ўдзел у барацьбе супраць паліцэйскіх і карнікаў.

Шырокую дыверсійную дзейнасць праводзіла спецгрупа «Радзіма» пад камандаваннем маёра М.Ф. Філімонава, група Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генштаба Чырвонай Арміі пад камандаваннем І.І. Баравіцкага (падпольная мянушка «Вера»).

У жніўні 1943 г. у гомельскія лясы прыбыла спецгрупа НКДБ БССР «Бывалыя» на чале з капітанам М.І. Шыбекам.

Асаблівыя надзеі гітлераўскае камандаванне ўскладала на летняе наступленне сваіх войскаў у 1943 г. Бітва на Курскай дузе — а менавіта тут разгортваліся галоўныя падзеі — скончылася бліскучай перамогай савецкіх войскаў. Дзяржаўны камітэт абароны і ЦК ВКП(б) патрабавалі ад партызан і падпольшчыкаў узмацніць барацьбу ў тыле працiўніка, разбураць яго камунікацыі, падрываць чыгуначныя масты, зрываць перакідванне варожых войскаў, падвоз зброі і боепрыпасаў, узрываць і падпальваць ваенныя склады і нападаць на варожыя гарнізоны, усімі сродкамі аказваць дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі.

Сустрэча былых партызан атрада імя Будзённага, ветэранаў Вялікай Айчыннай і грамадзянскай войнаў з Улукаўскага сельсавета.

Пачынаючы з лета 1943 г., партызаны актывізавалі барацьбу на камунікацыях ворага. У жніўні пачынаецца знакамітая «рэйкавая вайна». Толькі партызанамі Гомельскага злучэння было падарвана 7 тысяч рэек. У вёсцы Прудок былі падарваны 2 гарматы і больш за 1000 снарадаў. Усё гэта аказвала вялікую дапамогу Чырвонай Арміі. У лютым — ліпені 1944 г. у в. Чонкі базіраваўся Беларускі штаб партызанскага руху.

У.Ф.Эсмантовіч, Т.У.Язэпава.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ САКРАТАРА ГОМЕЛЬСКАГА ПАДПОЛЬНАГА ГАРКОМА КАМСАМОЛА С.КУПЦОВА

«...Раньше чем установить адреса в Гомеле, я подобрал сеть агентурных работников (связных) от места расположения отряда до Гомеля и с помощью их начал отыскивать гомельчан с советскими настроениями, изучать состояние дел на пути и в городе. По ту сторону Днепра (отряд стоял за Днепром) — левый берег — агентами были в д. Балашевка — комсомолка Дробышевская Мария (позже ушла в бригаду Пономаренко), в д. Доброволец — Сенчук Ганна, в д. Милоград — комсомолка Гребенчук Зина. На эту сторону Днепра — к Гомелю (левый берег) в д. Черное — комсомолка Семукова Люба, в д. Репнице — комсомолка Грицкова Надя, в д. Решетники — Кирикова Галина (принята в комсомол на бюро ГК 16 августа 1943), в д. Задоровка — Ковалева Лидия, в д. Галеевка — комсомолка Лебежкова Феня, в д. Телеши — Шафранская Наташа и ее подруга Устинья (фамилию забыл), в д. Залипье — Назарова Женя, в д. Мильча — Абросимава Нина.

Все они имели для работы цифровые пароли и условные места свиданий. Это первые люди, с которых начиналось осуществление задания...»

Секретарь Гомельского подпольного городского комитета ЛКСМБ (С.Купцов).

22.12.1943 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3334. Воп. 1. Спр. 7. Л. 2.

ДАВЕДКА АБ ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКІМ ПАДПОЛЛІ ВЁСКІ МІХАЛЬКІ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

жнівень 1941 — чэрвень 1942 гг.

Комиссия Гомельского райкома КПБ по изучению партийно-патриотического подполья, действовавшего в годы Великой Отечественной войны, изучив документы и воспоминания бывших партизан, установила, что в селе Михальки Гомельским райкомом КПБ в августе 1941 года была создана инициативная группа для организации борьбы в тылу врага. В состав этой группы входили: Морозов Тит Федорович — председатель колхоза им. Сталина, Матвеенко Никита Ефимович, чл. ВЛКСМ с 1935 года, местный житель; Бурый Клим Васильевич — объездчик Макеевского лесничества, проживавший на страже «Лесничевка». Последнему командованием Гомельского партизанского отряда «Большевик» была поручена также охрана забазированного в урочище «Лесничевка» оружия и боеприпасов.

В течение августа—сентября 1941 года в подпольную организацию были вовлечены свыше двадцати пяти советских патриотов. Ядро организации составляли бывшие бойцы отряда самообороны.

В сентябре на совещании в урочище «Лесничевка» инициативная группа решала организационные вопросы. Командиром комсомольской молодежи, входящей в состав подпольной организации, был назначен Матвеенко Никита Ефимович, а подпольщиков старших возрастов возглавил Морозов Тит Федорович. Обе группы в целях конспирации должны были действовать самостоятельно, а координация действий обеих групп поручалась Бурому Климу Васильевичу, имевшему связь с командованием отряда «Большевик» (см. воспоминания Морозова Т.Ф., л. 2).

В состав группы Морозова Т.Ф. входили Матвеенко А.И., Пугачев В.Н., Морозов А.А., Морозов А. К., Морозова А.Т., Морозов П.Д., Дедкова М.П., Кириенко Е.П., Пугачев М.Н.

В состав молодежной группы Матвеенко Н.Е. вошли: Матвеенко В.А., Матвеенко И.Е., Матвеенко С.Ф., Матвеенко Г.И., Морозов И.Т., Морозов С.П., Тишков Е.К., Каменкова М.И., Морозова Е.П., Тимошенко Илларион Маркович.

Ближайшими помощниками Бурова Клима Васильевича в подпольной антифашистской деятельности стала вся его семья в составе жены Александры Миновны, дочери комсомолки Лидии, сыновей Василия и 12-летнего Владимира.

На страже «Лесничевка» был установлен радиоприемник, по которому практиковалось слушание Московских радиопередач, составление листовок и размножение их на пишущей машинке. Печатал листовки сын Бурова Василий и доставлял их в село Михальки.

В первые месяцы антифашистская деятельность подпольщиков сводилась к сбору оружия на местах былых боев и распространению листовок в соседних селах и поселках.

При создании местных органов оккупационных властей подпольщикам удалось выдвинуть на должность старосты села Михальки своего человека Лесничева Арсения Павловича и писарем Титкова Евгения Кирилловича. Последние обеспечивали подпольщиков бланками пропусков и удостоверений личности немецкого образца. Во время арестов советских активистов староста принимал меры к их освобождению.

С согласия старосты подпольщики спрятали в лесу до двух тонн колхозного зерна для передачи его партизанам.

В сентябре 1941 года на связь с подпольщиками прибыл секретарь Гомельского горкома комсомола т. Купцов Сергей Павлович. Встреча состоялась в доме Каменковой Марии Игнатьевны в поселке. Купцов С.П. поставил перед подпольщиками задачу на развертывание диверсионной деятельности. С этого времени обе группы начали подрывать и сжигать мосты на дорогах, повреждать линии связи. Ими было уничтожено семь мостов, спилены столбы телефонной связи на протяжении 4 километров от д. Дятловичи до Рудни Маримоновой. На шоссе Гомель — Речица подпольщики из группы Морозова подорвали автомашину, в результате чего погибло 10 вражеских солдат.

Фашистская контрразведка усилила внимание к деревне Михальки, начала вербовать среди ее жителей тайных агентов. Одним из агентов СД стал Гапоненко С.Д. Первым его предательством был донос на старосту Лесничева А.П. и писаря Титкова Е.К., которые «передали партизанам колхозное зерно». В конце марта 1942 года полиция арестовала старосту, писаря и лесника Морозова Остапа Карповича. Их зверски мучали при допросе и расстреляли в лесу за селом. Через несколько дней были арестованы и после жестоких пыток расстреляны Кириенко Ефим Прохорович и Пугачев Михаил Никитич.

Подпольщики решили отомстить за смерть павших товарищей. Молодежной группе было поручено забросать гранатами полицейский участок. Диверсия готовилась в день приезда начальника карательного отряда и другого «начальства» с Гомеля. Однако в молодежной группе кто-то проговорился о диверсии своему товарищу Героимову Н.Г., а тот донес в полицию. В результате за день до диверсии прибыли каратели из Гомеля и начались аресты. Полиция арестовала Матвеенко Н.Е., Матвеенко В.А., Матвеенко И.Ф., Матвеенко С.Ф., Морозова И.Т., Морозова С.П., Титкова Е.К., Морозову Е.П., Тимошенко И.М., Матвеенко Г.И.

Арестованных публично истяза-

Помнік падпольшчыкам у в. Міхалькі Даўгалескага сельсавета.

ли возле школы, пытаясь узнать имя руководителя группы. Подпольщики отрицали существование организации. Тогда им скрутили руки и погрузили в машину для отправки в гомельскую тюрьму. По пути в Гомель Матвеенко Никита Ефимович сумел развязать себе руки, помог освободить руки рядом сидящему Сергею Матвеенко и на лесной дороге оба выпрыгнули из кузова машины. Конвоиры открыли огонь, но преследовать не решились, опасаясь побега остальных арестованных.

С помощью гомельских подпольщиков из тюрьмы удалось бежать Семену Морозову. Ефросинью Морозову из тюрьмы отправили на каторжные работы в Германию, Груню Матвеенко отпустили домой под надзор полиции в надежде установить ее связи с партизанами. Остальные пятеро подпольщиков были казнены в застенках СД.

Через два дня, т.е. 10 июня 1942 года были арестованы Матвеенко А.И., Пугачев В.Н., Морозов А.А., Морозова А.И. Первые трое расстреляны, а четвертая заточена в концлагерь.

Руководитель группы Морозов Т.Ф. избежал ареста потому, что еще в начале мая перешел на нелегальное положение и проживал в лесу. Вместе с Бурым К.В. и его сыном Василием Морозов Т.Ф. ушел в партизанский отряд «Большевик». Жена Бурого Александра Миновна, дочь Лидия и сын Владимир еще раньше были арестованы в деревне Огородня-Гомельская и брошены в концлагерь. Из всего подполья вне подозрений остались только Каменкова М.И. и Дедкова М.П., которые до дня освобождения области являлись связными Гомельской партизанской бригады.

Подпольщики села Михальки после разгрома полицейского участка намеревались создать партизанский отряд. Однако подлая рука изменника сорвала эти планы. Большинство патриотов погибло в страшных муках, до конца оставаясь верными матери-Родине, а те, кому удалось избежать арестов, мужественно дрались с фашистскими захватчиками в Гомельском партизанском соединении.

Комиссия. Председатель. Члены.

Падпольшчыкі з вёскі Заліп'е

Восенню 1941 г. у пахмырны дзень, які хіліўся ўжо да надвячорка, воддаль вёскі Заліп'е ў гушчары прытаіліся з вінтоўкамі дружбакі — Федзя Кузюкоў, Коля Волкаў і яго дваюрадны брат Лука Волкаў. Яны заляглі ў старых акопах непадалёк ад дарогі, якая вяла з вёскі Урыцкае на Гомель. Хлопцы чакалі, калі наблізіцца нямецкі абоз, які вез у горад салому. І вось вялізныя фурманкі, запрэжаныя парамі дужых коней, з адкрытага поля сталі павольна ўязджаць у хвойнік. Калі сярэднія вазы апынуліся насупраць засады, раздалося некалькі залпаў. Немцы ад нечаканасці пападалі на мерзлую зямлю, на адной фурманцы загарэлася салома. Пакуль салдаты схамяніліся і адкрылі беспарадкавы агонь з аўтаматаў, хлопцаў і след прастыў.

Так у лістападзе 1941 г. тры камсамольцы вёскі Заліп'е Урыцкага сельсавета ўчынілі першую ўзброеную вылазку супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Іх не спалохала тое, што за захоўванне зброі фашысты каралі смерцю, што за паўмесяца да гэтага карнікі першым у вёсцы расстралялі Івана Антонавіча Пічукова — былога калгаснага брыгадзіра, партызана і інваліда грамадзянскай вайны.

Вось з гэтай баявой тройкі і пачыналася падпольная камсамольска-маладзёжная група, якая была створана ў вёсцы Заліп'е вясной 1942 г. Узначаліў яе Фёдар Кузюкоў, 1921 г. нараджэння, які працаваў да вайны правадніком вагона на прыгарадным поездзе. Адразу пасля нападу фашысцкай Германіі на СССР Фёдар стаў чырвонаармейцам. Пры адступленні ён трапіў у акружэнне і прабраўся дадому, але зброі не склаў. Мікола і Лука Волкавы, нядаўнія школьнікі, былі на два гады маладзей за яго. У падпольную групу ўвайшлі таксама Рыгор Лукіч Масцярской, які да вайны працаваў чыгуначнікам у Гомелі, і яго дзевятнаццацігадовы сын Лёнька, камсамолец, былы вучань сярэдняй школы. Бацька стаў гаспадаром явачнай кватэры, якая аб'ядноўвала вясковых падпольшчыкаў.

Згуртаваць падпольную групу дапамагала Жэня Назарава — сястра Мікалая Волкава. Муж яе Даніла ваяваў на фронце, а яна адразу ж пасля нашэсця акупантаў у 1941 г. стала сувязной Гомельскага падпольнага гаркома камсамола. Жэня жыла разам з маці і братам, у іх хаце была створана адна з явачных кватэр гарадскіх падпольшчыкаў, якія каардынавалі свае

дзеянні з партызанамі. Заліпскія падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, якія перадавала ім праз брата сувязная Жэня. Разам з іншымі вернымі сябрамі яны збіралі і захоўвалі зброю, якая засталася ў наваколлі пасля адступлення савецкіх войскаў.

Дзеля канспірацыі падпольшчыкі дамовіліся нідзе на людзях не набліжацца адзін да аднаго. Перасцярога была недарэмная, бо ў вёсцы знайшліся здраднікі. Гэта ж яны і выдалі на расправу актывіста І.А.Пічукова. Адзін з нямецкіх паслугачоў па мянушцы «Хобат» падаўся ў паліцыю. Ён удзельнічаў у карных аперацыях супраць партызан і мірных жыхароў, вынюхваў антыфашыстаў і ў сваёй вёсцы.

Восенню 1942 г. фашысты схапілі некалькі заліпскіх жыхароў, у тым ліку падпольшчыкаў Фёдара Кузьміча Кузюкова і Луку Яўсеевіча Волкава. Здраднік данёс, што яны захоўваюць зброю. Разам з іншымі арыштаванымі іх расстралялі. Трагічна абарвалася жыццё вясковага веселуна, прыгажуна, на якога заглядваліся дзяўчаты, кіраўніка групы Федзі Кузюкова. Страшэнна катавалі фашысты яго сябра Луку Волкава, дужага хлопца, падобнага на асілка. Пра гэта даведаліся пасля родзічы ад аднаго жыхара вёскі Давыдаўка, якога прымусілі немцы закопваць трупы расстраляных. Калі 6 лістапада 1942 г. фашысты прывезлі людзей на расстрэл у лес, усё цела Лукі Волкава пад парванай бялізнай было акрываўленае, уяўляла суцэльную рану. Раптам ён рвануўся з месца і пабег. Карнікі адкрылі наўздагон агонь, але прамахнуліся. На вялікі жаль, Лука не змог выратавацца ад смерці. Ён наскочыў на іншых немцаў, якія прыгналі ваеннапалонных нарыхтоўваць лес і пачулі страляніну. Варожая куля напаткала яго.

Вясной 1943 г. група адрадзілася. Пасля правалу яе ўзначаліў Мікалай Сцяпанавіч Волкаў. У сакавіку — красавіку 1943 г. ён папоўніў яе новымі сіламі, прыцягнуўшы ў падполле сваіх верных сяброў. Замест двух загінуўшых у рады падпольшчыкаў сталі Яўген Масцярской, яго дваюрадны брат Віктар Жосткін, Дзмітрый Балдачоў — усе яны 1922 г. нараджэння, Уладзімір Волкаў і Іван Траянаў, якім не было яшчэ поўных 17, а таксама шаснаццацігадовы Жора Масцярской, малодшы сын гаспадара явачнай кватэры. Трагічны правал групы восенню 1942 г. не спыніў патрыётаў — даваенных школьнікаў. За выключэннем аднаго, усе былі камсамольцамі.

Падпольшчыкі актывізавалі сваю дзейнасць. Яны здабывалі разведвальныя даныя аб дыслакацыі нямецкіх войскаў, вялі агітацыю сярод моладзі — заклікалі яе ўступаць у рады народных мсціўцаў, зрывалі адпраўку на работу ў Германію. Лістоўкі і зводкі расклейвалі не толькі па вёсцы, але і перад домам старасты. Сувязная падпольнага гаркома камсамола Жэня Назарава дастаўляла з партызанскай зоны таксама газету «Правда», часопіс «Раздавім

Былыя падпольшчыкі Яўген Масцярской, Георгій Масцярской і Мікалай Волкаў каля хаты, якая ў гады вайны была явачнай кватэрай. Студзень 1995 г.

фашысцкую гадзіну!». Усё гэта праз яе брата, кіраўніка групы Мікалая Волкава трапляла ў рукі падпольшчыкаў, а ад іх — аднавяскоўцам, якія нібы атрымлівалі глыткі свежага паветра ад вестак з Вялікай зямлі, даведваліся аб становішчы на франтах, аб тым, як савецкі народ і яго армія б'юцца з ворагам. У людзей з'яўлялася надзея на вызваленне з-пад гітлераўскай няволі.

Падпольшчыкі шмат увагі ўдзялялі здабыванню зброі. Разам з Мікалаем Волкавым у 1941 г. у яе зборы ўдзельнічалі Уладзімір Волкаў і Дзмітрый Балдачоў, якія жылі па-суседску з ім, а таксама Яўген Масцярской. Калі яны ўліліся ў рады падпольшчыкаў, зброя гэта згадзілася па прамым прызначэнні — знішчаць ненавісных акупантаў. І не толькі ім, а і партызанам, з якімі падпольная група трымала цесную сувязь.

З ліпеня 1943 г. маладыя патрыёты выконвалі заданні партызанскай брыгады імя Шчорса Гомельскага злучэння. Партызанскай брыгадзе, якой камандаваў Байкоў, заліпскія падпольшчыкі перадалі 11 вінтовак, звыш 7 тысяч патронаў, два ручныя кулямёты, дзве скрынкі ўзрыўчаткі, нават скрынку мінамётных мін (з іх выплаўлялі тол для дыверсій на чугунцы). Усё гэта па ўсіх правілах было складзена ў дашчаных скрынках і захоўвалася ў зямлі за старымі могілкамі ў хвойніку.

Частку зброі з гэтай схованкі падпольшчыкі пакінулі сабе, яна патрэбна была ім для правядзення баявых аперацый.

Патрыёты ўсё часцей выходзілі на баявыя заданні. У сувязі з узмацненнем і расшырэннем партызанскіх дзеянняў ва Урыцку ў школе размясціўся паліцэйскі гарнізон.

Неўзабаве партызаны аднаго з атрадаў праніклі ноччу ў яго, знішчылі паліцаяў. Выратавацца ўдалося толькі двум немцам, якія спалі ў асобным пакоі і паспелі ўцячы ў адных падштаніках ў Заліп'е.

Калі пачалася бітва на Курскай дузе, заліпскія падпольшчыкі атрымалі заданне выйсці на чыгунку. Мікалай Волкаў з партызанскай зоны прынёс у кошыку міну, якую перадала дэсантніца. Яна і навучыла, як закладваць яе. Назаўтра, 12 ліпеня, на заданне ў лес з ім пайшлі сярод белага дня Яўген Масцярской, Віктар Жосткін, Уладзімір Волкаў і Іван Траянаў.

Небяспечна было паказвацца на чыгунцы і нават каля яе. Апрача таго, што чыгунка ахоўвалася, з кожнага боку шырынёй на 50 метраў ад палатна быў спілаваны і ўбраны лес. Хлопцы занялі зыходную пазіцыю ў гушчары. Вось два мадзьяры, адзін з якіх пасвісцтваў, прайшлі з аўтаматамі міма па шпалах у напрамку паста, дзе на вышцы з біноклем знаходзіўся ўзброены вартавы. Потым праімчаліся два паравозы, счэпленыя разам, а неўзабаве за імі праскочыў чыгуначны бранявік. Калі ён ад'ехаў, Мікалай і Уладзімір Волкавы пад прыкрыццём сваіх сяброў падпаўзлі да чыгункі. Агледзеўшыся, заклалі міну ў якіх ста метрах ад вышкі і вярнуліся паўзком на месца.

Момант быў выбраны ўдала, калі ахова страціла пільнасць, бо толькі што па чыгунцы бесперашкодна прайшлі лакаматывы і бранявічок. А падрыўнікі тым часам хвалявaліся, ці з'явіцца эшалон, а калі з'явіцца, ці спрацуе міна? Нарэшце пачуўся грукат цягніка, які ішоў ад станцыі Прыбар на Гомель. Здавалася хлопцам, што секунды цягнуцца вельмі доўга. Але як толькі колы паравоза наехалі на правадкі міны, паветра страсянулася ад моцнага выбуху. Варожы эшалон з жывой сілай і артылерыяй паляцеў пад адхон. Доўга пасля таго не было руху цягнікоў на тым участку.

Не ў сілах справіцца з партызанамі фашысцкія вылюдкі, наводзячы жах, жорстка распраўляліся з мірным насельніцтвам. У 1943 г. яны спалілі жывымі 87 чалавек у вёсках Галееўка, Аляксееўка і Вясёлае Поле, якія прымыкалі да партызанскай зоны.

Успамінаючы тыя далёкія часіны, Мікалай Волкаў гаварыў: «Я нібы хадзіў па лязу брытвы, быў увесь напружаны, як сціснутая спружына». Падпольшчыкі рызыкавалі не толькі сабой, але і жыццём блізкіх. Кіраўнік жа групы ўсведамляў сваю адказнасць за іх усіх. Аднак вера ў правату сваёй справы надавала патрыётам мужнасць і стойкасць. Юныя мсціўцы не маглі дараваць няпрошаным заваёўнікам смерць і разбурэнні, якія яны прынеслі на нашу зямлю. Падпольшчыкі рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб хутчэй вызваліць родны край ад чужынцаў.

Восенню 1943 г. фронт наблізіўся да Гомеля. Вёску Заліп'е , якая знаходзілася на

захад ад горада, запоўнілі адступаючыя немцы. Падпольшчыкі атрымалі з партызанскага штаба загад пакінуць вёску, бо ўжо нельга было тут заставацца. У ноч на 22 верасня амаль усе члены групы перайшлі ў партызанскі атрад «За Савецкую Беларусь» брыгады імя Шчорса, якая базіравалася ў суседнім Рэчыцкім раёне. Браты Лёнька і Жора Масцярскія засталіся на месцы для сувязі. Мікалай Волкаў, Яўген Масцярской, Уладзімір Волкаў, узброеныя вінтоўкамі, пісталетамі і гранатамі, пад прыкрыццём ночы вывезлі на падводах у партызанскую зону свае сем'і.

Віктара Жосткіна, Мікалая Волкава, Яўгена Масцярскога і Уладзіміра Волкава залічылі ў брыгадную разведку далёкага дзеяння.

Аднойчы Яўген і Віктар разам з разведчыкам Ігарам Падальніцкім каля падыходу да партызанскай зоны чакалі з Гомеля дзяўчат — сувязных. Раптам паказалася падвода, на якой ехалі шэсць узброеных паліцаяў. Як высветлілася, яны, пачуўшы няладнае, вырашылі здацца партызанам, каб змыць сваю віну. На ўсякі выпадак хлопцы іх абяззброілі. І тут Яўген нечакана аднаго з іх апазнаў. Восенню 1942 г. ён разам з немцамі і здраднікам Хобатам, з якім служыў сумесна, удзельнічаў у арышце Яўгена і яго аднавяскоўцаў. Партызанскае камандаванне асобна занялося гэтым перабежчыкам, які спадзяваўся застацца нявінным, хаця і яго рукі былі ў крыві расстраляных падпольшчыкаў і іншых жыхароў Заліп'я.

Шмат было цяжкіх партызанскіх баёў і паходаў. Многае выпала на долю народных мсціўцаў. Пад вёскай Горваль партызаны трапілі ў блакаду. З вялікімі стратамі вырваліся па балотах з акружэння карнікаў, перайшлі Днепр. Потым, пасля чатырохсутачных баёў, пераправіліся праз раку назад, адбілі ў ворага пакінутую тэрыторыю.

Нарэшце 19 лістапада 1943 г. тры партызанскія брыгады злучыліся з Чырвонай Арміяй. Каля вёскі Азершчына партызаны пад прыкрыццём савецкіх воінаў перабраліся хто на чым на правы бераг Дняпра да сваіх. Радасць была бясконцая. Доўгачаканая, хвалюючая сустрэча на вызваленай зямлі з часцямі 65-й арміі праслаўленага генерала Батава кожнаму запомнілася на ўсё жыццё.

Назаўтра партызан размеркавалі па палках і падраздзяленнях. І зноў баі, зноў атакі і наступленні. Заліпскія хлопцы, загартаваныя суровымі выпрабаваннямі ў тыле ворага, сталі ваяваць у радах Чырвонай Арміі, у кровапралітных схватках працягвалі барацьбу за вызваленне роднага краю. Атлетычнага складу Віктар Піліпавіч Жосткін выказаў жаданне пайсці ў дывізіённую разведку. У 1944 г. ён загінуў геройскай смерцю пад Жлобінам.

Яўген Іларыёнавіч Масцярской трапіў у кулямётны разлік. Пры наступленні ў сакавіку 1944 г. на Парычы быў цяжка паранены. Пасля пяці шпітальных месяцаў восенню прыехаў дадому. Адкрывалася рана, і ў наступным годзе яму далі другую групу інваліднасці. За ратныя подзвігі Я.І.Масцярской узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Мікалай Сцяпанавіч Волкаў спачатку ваяваў радавым, зведаў цяжкія зацяжныя баі ў балоцістых лясах пад Парычамі і Азарычамі, дзе быў паранены. Амаль тры месяцы шпіталя, і зноў на перадавую. У сакавіку 1944 г. малодшы сяржант Мікалай Волкаў камандаваў аддзяленнем аўтаматчыкаў. Летам таго ж года, пасля вызвалення Баранавіч, у час атакі зноў быў паранены. У верасні пасля лячэння гвардыі сяржант вярнуўся ў строй. Да дэмабілізацыі ў 1947 г. служыў памочнікам камандзіра ўзвода.

М.С.Волкаў — кавалер ордэнаў Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені, узнагароджаны медалямі.

Дзмітрый Сямёнавіч Балдачоў пасля злучэння партызан з савецкімі войскамі таксама прайшоў цяжкімі франтавымі дарогамі. Першае асколачнае раненне атрымаў пры штурме Кёнігсберга. Потым было яшчэ адно. А трэці раз яму дасталіся некалькі снарадных асколкаў пад Берлінам. Пасля шпіталя інвалідам трэцяй групы ён прыехаў дадому, маючы баявыя ўзнагароды.

У мірныя дні былыя падпольшчыкі, партызаны, салдаты не шукалі сабе палёгкі. Як і ўсе ветэраны, у цяжкія пасляваенныя гады цярпліва аднаўлялі разбураную гаспадарку, залечвалі раны роднай зямлі, за вызваленне якой не шкадавалі жыцця.

І.І.Пічукоў.

Змагаліся разам з вучнямі

Ішла восень 1941 года. Фронт да гэтага часу ўжо адкаціўся далёка на ўсход ад Гомеля. Кіламетраў за 25 на поўнач ад горада жыхары в. Сямёнаўка, якую перасякае шаша на Доўск, кастрычніцкім днём убіралі бульбу за вёскай. Нечакана ўсе, хто працаваў у полі, памкнулі позіркі ў неба. Яны ўбачылі, як падае савецкі самалёт, падбіты ў паветраным баі. І раптам на вачах вяскоўцаў у вышыні раскрыўся парашут. Людзі з трывогай чакалі, што будзе з лётчыкам, асабліва калі заўважылі на шашы немцаў і паліцаяў, якія з'явіліся на яго пошукі. Да вечара прачэсвалі карнікі кусты на балоце, але так і не знайшлі ні пілота, ні парашута.

Сярод жанчын на бульбяным полі знаходзілася тады і Праскоўя Хамянкова, якая выкладала беларускую мову і літаратуру ў Сямёнаўскай сямігодцы. Пад покрывам ночы Праскоўя і яе сяброўка

Помнік камсамольцам-падпольшчыкам каля Узаўскай сярэдняй школы. Правобразам дзяўчыны-патрыёткі паслужыла настаўніца П.Хамянкова.

